Бібліятэка настаўніка беларускай мовы і літаратуры

Л. Ц. Выгонная

ФАНЕТЫКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ШКОЛЕ

Бібліятэка
настаўніка
беларускай мовы
і літаратуры

Л.Ц. Выгонная

ФАНЕТЫКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ШКОЛЕ

Рэкамендавана
Навукова-метадычным цэнтрам вучэбнай кнігі і сродкаў навучання Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь

МІНСК «НАРОДНАЯ АСВЕТА» 1995

ББК 74.268.1Беи
В92
УДК 372.880.826-4

Серыя заснавана ў 1989 г.

В $\frac{3720880826—023}{22—95}$
Н 303(03) — 95
ISBN 985-03-0243-7

© Л. Ц. Выгонная, 1995

Задачы вывучэння фанетыкі ў школе

Культура мовы — адзін з важнейшых элементаў чалавечай культуры. У маўленні, у слове чалавек выкрывае сваё ўнутранае «я», сцвярджае сябе як асобу. Ступень валодання мовай, шырыня і свабода карыстання моўнымі сродкамі ў іх вуснай і пісьмовай формах шмат у чым вызначаюць месца чалавека ў грамадскім жыцці.

Таму праблема развіцця вуснага маўлення заўсёды знаходзіцца ў цэнтры ўвагі пры школьным навучанні. У сувязі з гэтым вывучэнне фанетыкі беларускай мовы не павінна абмяжоўвацца толькі тымі гадзінамі, якія адведзены для засваення фанетыка-графічных звестак. На добры лад, пра якасць маўлення трэба памятаць на ўсіх уроках.

Пра беларускую мову сказана шмат добрых слоў. Прыгадаем Ул. Караткевіча: «Дзве старонкі, дваццаць ці дзвесце... А можа, тысячы тысяч?.. Усё адно, нават іх будзе мала, каб годна ўславіць цябе, родная беларуская мова. Таму што мільёны тваіх людзей самім існаваннем сваім з самага пачатку дзён кожным трапным словам, кожнай любоўнай ці гнеўнай думкай, кожным знішчальным, здзеклівым, іранічным або, наадварот, добрым, лірычным сказам славяць цябе. І славіць будуць, пакуль не скончыцца жыццё людское і думка людская на Зямлі.

Мова Скарыны і Буднага, мова Багдановіча і Купалы, Багушэвіча і Коласа, мова соцень геніяў, што яшчэ прыйдуць. Мова інтэлігентаў беларускіх, імя якім — легіён. Мова настаўнікаў і паэтаў, вучоных і кампазітараў, але перш за ўсё мова дзесяці мільёнаў людзей па ўсім свеце — ад Уругвая да Далёкага Усходу і, галоўнае, на нашай беларускай зямлі.

Мова першай матчынай калыханкі і апошняга «бы-

вай», мова старадаўніх архіваў і новых школ на Палессі, мова пажаўцелых статутаў і мова кахання. Мова плытагонаў, сялян, акадэмікаў і шахцёраў на саляных капальнях. Мова, якая можа ўсё: можа сказаць словы нявыказанай пяшчоты і можа ўдарыць так, што не ўстанеш. Гнуткі, спявучы, адвечна новы інструмент, без якога нельга ўявіць сабе сваё жыццё, як без хлеба, без якога радасць не ў радасць, каханне не ў каханне, бяседа не ў бяседу, сяброўства не ў сяброўства і нянавісць не ў нянавісць.

Няма цябе — і вось няма суцяшэння ў горы. Няма цябе — і вось нямы язык, і нельга сказаць слоў радасці. А калі ўбіць сабе ў галаву цалкам дурную думку, што ў нейкім далёкім будучым цябе не будзе, то ... нашто нам тады такая будучыня?

Таму што ўсе мы — ад настаўніка да паэта — любім цябе, таму што ты — самы важлівы наш здабытак, і мы ў меру сіл нашых не дазваляем і не будзем дазваляць, каб нехта выказваў да цябе пагарду.

Тым больш дзіка, што яшчэ нядаўна зламысныя ёлупы прарочылі табе знікненне. Мала таго, самі дбалі аб ім са стараннем, вартым лепшага ўжывання. Што ж, Іваны Бязродныя вартыя толькі пагарды, як усе тыя, якія, адвярнуўшыся, праходзяць ля матчынай хаты. Яны проста не ведаюць, які ўдзел рыхтуе лёс таму чалавеку, які пазбавіўся мовы. А каб ведалі, то жахнуліся б. Толькі ж нават гэтага не дадзена іхнім бедным мазгам»[1].

Каб для вучняў мова хутчэй зрабілася гнуткім, пявучым, адвечна новым інструментам, трэба мэтанакіравана працаваць над вуснай формай мовы, над станаўленнем трывалых вымаўленчых навыкаў, на што і накіроўваюць праграмы школьнага курса роднай мовы.

У пэўным сэнсе фанетычныя веды — першыя з навуковых ведаў, якія набывае ў сваім жыцці чалавек. У індывідуальным развіцці кожнае дзіця ў першую чаргу засвойвае інтанацыю і гукавы склад, і толькі потым лексіку, граматыку, сінтаксіс.

Нават у першыя месяцы жыцця дзіця пачынае ўважліва прыслухоўвацца да маўлення, і яшчэ да засваення асобных фраз і слоў яно ўпэўнена адрозні-

---

[1] Караткевіч Ул. Родная мова // Зб. тв. у 8-мі т. Т. 8. Кн. 2. Мн., 1991. С. 284—285.

вае інтанацыю. Самыя малыя дзеці супакойваюцца, калі чуюць разважныя словы, кідаюцца ў плач ад гучнага голасу ці ад «сярдзітай» інтанацыі дарослага, «дапамагаюць» сябе люляць і вельмі дакладна ўзнаўляюць пры гэтым рытміка-меладычны рысунак калыханкі.

Моўнае развіццё дзіцяці пачынаецца з авалодання інтанацыяй. Псіхолагі адзначаюць вельмі ранняе ўспрыманне дзецьмі інтанацыі дарослых, лічаць, што да канца першага года жыцця дзіця ўжо засвойвае асноўныя рысы інтанацыйна-меладычнай структуры роднай мовы.

Ці добра рэагуе малы на звернутыя да яго словы? Як ён суадносіць пэўныя спалучэнні гукаў, г. зн. словы, словазлучэнні, з пэўнымі рэчамі і дзеяннямі? Такія пытанні хвалююць дарослых, бо адказы на іх сведчаць, ці нармальна развіваецца дзіця. Амаль кожны крок дзіцяці на шляху да ведаў звязаны з авалоданнем гукавым ладам мовы.

Ва ўзросце ад двух да пяці гадоў маленькі чалавек спасцігае асноўныя заканамернасці фанетыкі бацькоўскай мовы. Калі дзеці мала чуюць гаворку дарослых, яны пачынаюць адставаць у сваім агульным развіцці. Немаўляты называюцца так толькі таму, што яны самі не гавораць, а не таму, што яны не разумеюць або не чуюць мову. (Прыгадаем, што малых называюць не немцамі, нямымі, а якраз немаўлятамі!)

Дзеці прыслухоўваюцца да мовы дарослых, запамінаюць тое, што звычайна гучыць у іх моўным асяроддзі. Такім чынам, засваенне вуснай мовы праходзіць патаемныя слыхава-сэнсавыя фазы развіцця.

Псіхічнамоўнае развіццё працягвае праходзіць кожны вучань пачатковай школы, бо нельга сцвярджаць, што ён да сістэматычных заняткаў па чытанню і пісьму ўжо меў трывалыя фанетыка-фаналагічныя веды. Працягваецца фарміраванне маўленчых навыкаў і далей. На карэкціроўку і ўдасканальванне іх нельга шкадаваць часу, бо вуснае маўленне займае вельмі значную частку камунікатыўных сувязей чалавека, а ў паўсядзённым жыцці наогул пераважае.

Існуюць розныя недахопы маўлення: яны могуць быць звязаны са станам цэнтральнай нервовай сістэмы ці моўных органаў. Адны ўласцівы маўленню вялікіх груп вучняў, другія сустракаюцца толькі ў некаторых з іх. Сярод найбольш пашыраных недахопаў

адзначаюцца невыразная дыкцыя і недастатковае валоданне рытміка-меладычнымі сродкамі мовы.

Дыкцыя (ад лац. dictio — вымаўленне) — манера вымаўлення слоў, складоў і гукаў у размове, мастацкім чытанні і спевах. Як вядома, добрая дыкцыя прадугледжвае выразнае і дакладнае («чыстае») вымаўленне ўсіх гукавых адзінак мовы паасобку і разам, адсутнасць у гаворачай асобы дэфектаў маўлення, якія пры наяўнасці здаровага моўнага апарата з'яўляюцца вынікам няправільна засвоеных у дзяцінстве артыкуляцый, недакладнага функцыяніравання моўных органаў. Таму неабходна настойліва папраўляць няправільныя артыкуляцыі ў дзяцей, каб яны не зрабіліся аўтаматычнымі. Прыгадаем, што дыкцыя залежыць ад работы моўнага апарата, які ўключае язык, губы, зубы, сківіцы, цвёрдае і мяккае паднябенне, маленькі язычок, гартань, галасавыя звязкі. Дакладнай работай усіх органаў забяспечваецца бездакорнасць дыкцыі.

Адрозніваюць арганічныя і неарганічныя моўныя дэфекты. Арганічныя дыфекты ўзнікаюць у сувязі з фізіялагічнымі парушэннямі моўных органаў і для свайго выпраўлення ў большасці выпадкаў патрабуюць медыцынскага ўмяшання. Напр., «цяжкая» мова бывае пры няправільным змыканні сківіц, пры рэзка высунутай уперад ніжняй ці верхняй сківіцы. Рэдкія і крыва пастаўленыя зубы абумоўліваюць няправільнае вымаўленне свісцячых і шыпячых гукаў. (Дарэчы, адсутнасць зубоў у першакласнікаў таксама адбіваецца на чысціні вымаўлення.) Сюсюканне і шапялявасць (узаемазамены свісцячых і шыпячых гукаў) можа быць выклікана доўгім або тоўстым языком, картавасць — кароткай перапонкай пад языком і адсутнасцю вібрацыі кончыка языка. Гугнявасць, калі ўсе гукі пры вымаўленні набываюць насавое адценне, таксама можа быць паталагічнай. Толькі з дапамогай спецыяльнага лячэння аднаўляюць маўленне ў хворых з прыроджанай шчылінай паднябення, з захворваннямі лор-органаў або іх пашкоджаннем і г. д. Спецыяльную работу неабходна праводзіць, калі ў дзяцей назіраюцца парушэнні слыху або заіканне.

Звернем увагу на тое, што некаторыя з адзначаных недахопаў узнікаюць і незалежна ад фізіялагічных парушэнняў моўных органаў. Некаторыя з іх абумоўлены нядбайным выхаваннем мовы дзіцяці, а таксама

тым, што некаторыя дзеці бываюць схільнымі да механічнага пераймання дэфектнай дыкцыі, якая спачатку здаецца ім адмысловай і цікавай, а потым уваходзіць у звычку. Таму, перш чым выпраўляць няправільнае вымаўленне, трэба высветліць прычыну моўных недахопаў у кожнага вучня паасобку.

Заўважана, што дэфектнасць і нарматыўнасць парознаму суадносяцца ў асобных мовах. Так, у беларускай літаратурнай мове ўвулярны і заднеязычны картавы [*р*] лічыцца дэфектным у той час, як, напрыклад, у французскай мове гэта гук нарматыўны. Яшчэ прыклад: [*с″*] і [*з″*] з шапеляватым адценнем у беларускай мове не з'яўляюцца дэфектамі вымаўлення ў сувязі з асабліва мяккім характарам гэтых гукаў увогуле. Такая варыятыўнасць успрымаецца як дапушчальная рыса індывідуальнага маўлення. У рускай мове такое вымаўленне не лічыцца нарматыўным.

Для выразнасці вымаўлення, удасканалення дыкцыі неабходна, каб кожны гук падаваўся ў фанетычна чыстай форме. Зразумела, што ў школе няма магчымасці весці індывідуальную работу з кожным вучнем (тым больш, што пераадоленне дэфектаў маўлення — задача лагапедаў, якія ведаюць спецыяльна распрацаваныя методыкі). Але спецыяльныя практыкаванні, накіраваныя на пастаноўку «чыстага» вымаўлення пэўных гукаў, можна прапанаваць для самастойнай работы, выкарыстаць у гуртковай пазакласнай рабоце. Для выпраўлення недахопаў у дыкцыі трэба звяртаць увагу на правільнае становішча органаў маўлення пры ўтварэнні дэфектных гукаў, выпрацоўваць навыкі па правільнай артыкуляцыі і замацоўваць іх.

У школьных падручніках, а таксама ў спецыяльнай літаратуры можна знайсці скорагаворкі, якія дапамогуць станаўленню дакладнага вымаўлення пэўных гукаў (невыпадкова іх таксама называюць чыстагаворкамі). Звычайна яны выклікаюць добрую рэакцыю з боку вучняў, з'яўляюцца адначасова і цікавымі, і карыснымі.

У школьнай практыцы неабходна звяртаць увагу на тое, каб вымаўленне вучняў было энергічным і дакладным. Бо калі дзеці прызвычаіліся да вялай артыкуляцыі, пры якой гук быццам бы «паўзе» па губах, то ў іх пачынае складвацца неразборлівае вымаўленне, губы і астатнія органы маўлення робяцца маларухомымі.

Гэта карэкцыя асабліва неабходна ў пачатковых класах, бо ў гэты час у вучняў адбываецца фарміраванне артыкуляцыйнай базы нацыянальнай мовы. Як вядома, яе аснову складаюць усталяваныя на працягу стагоддзяў артыкуляцыйныя рухі і дзеянні, якія пераважаюць у пэўнай нацыянальнай мове і абумоўліваюць спецыфічныя для кожнай мовы гукі.

Як заўважае А. Каляда, «сістэматычнае развіццё мовы дзіцяці можна ... працягваць увесь дашкольны і школьны перыяды... Задача настаўнікаў пачатковых і сярэдніх школ заключаецца не толькі ў тым, каб увесці ў памяць дзіцяці літаратурную мову, але галоўным чынам у тым, каб навучыць яго карыстацца гэтай мовай найлепшым чынам»[1].

Вельмі важнымі моўнымі характарыстыкамі з'яўляюцца агульны ўклад моўных органаў і колькаснае размеркаванне гукаў рознага месца ўтварэння. Агульны ўклад моўных органаў аказвае ўплыў на артыкуляцыю кожнага гука. «Вельмі важнай рысай беларускіх артыкуляцый з'яўляецца агульная ненапружанасць, расслабленасць моўных органаў у час гукаўтварэння»[2].

Аднак, хаця ў беларускай мове артыкуляцыйныя органы ненапружаныя, гэта зусім не азначае, што вымаўляць гукі можна вяла і менш дакладна. Наадварот, неабходна больш старанная работа моўных органаў, якая і выклікае слыхавое ўражанне ад беларускага маўлення, як ад больш непасрэднага і «расслабленага». Якраз спалучэнне лёгкасці, пры якой гукі ўтвараюцца амаль што без відавочнага напружання органаў мовы, і адначасовай выразнасці іх гучання абумоўлівае складанасць (здавалася б няцяжкага!) беларускага вымаўлення для носьбітаў іншых моў. Так, ненапружанасць органаў мовы даўно адзначана фанетыстамі і пры артыкуляцыі рускіх гукаў, але яна мае іншы характар, пазбаўлена беларускай адвольнасці, і таму для тых, у каго роднай з'яўляецца руская мова, трэба пэўны час, каб прызвычаіцца да патрабаванняў артыкуляцыі беларускіх гукаў.

Яшчэ большыя адрозненні існуюць паміж беларускай і ўкраінскай артыкуляцыйнымі базамі. Украін-

---

[1] Каляда А. Выразнае чытанне. Мн., 1970. С. 24.

[2] Падлужны А. І., Чэкман В. М. Гукі беларускай мовы. Мн., 1973. С. 252.

скія зычныя з'яўляюцца больш напружанымі, чым беларускія. «Такім чынам, па сваіх агульных характарыстыках і набору гукаў беларуская артыкуляцыйная база адрозніваецца ад артыкуляцыйных баз суседніх славянскіх моў і ўяўляе сабой цалкам арыгінальнае ўтварэнне»[1]. Таму патрабаванні выразнасці і энергічнасці пры вымаўленні беларускіх гукаў на пачатковых этапах навучання садзейнічаюць усталяванню нацыянальнай артыкуляцыйнай базы, ад якой шмат у чым залежыць бездакорнасць дыкцыі.

Распаўсюджанымі і таксама ўласцівымі вялікім групам вучняў з'яўляюцца таксама парушэнні ў рытміка-меладычным афармленні маўлення, якія даволі разнастайныя і шматлікія, але іх можна пэўным чынам згрупаваць. Так, існуе неадпаведнасць часавых (у першую чаргу тэмпавых) характарыстык маўлення вучняў тым нарматыўным, якія існуюць у беларускай літаратурнай мове.

У адпаведным арфаэпіі маўленні разнастайныя змяненні па тэмпу выкарыстоўваюцца для перадачы сэнсавых адрозненняў. Таму, калі вучні абіраюць неадпаведны зместу тэмп маўлення, гэта абцяжарвае разуменне. Так, часам усе паведамленні вучні вымаўляюць у хуткім тэмпе. Прыспешанасць можа тлумачыцца рознымі прычынамі. Іншы раз яна выклікана жаданнем хутчэй паведаміць аб хвалюючых падзеях, няўпэўненасцю, што дарослыя працяглы час будуць іх уважліва слухаць; таму вучні і гавораць больш хутка, таропка. Прыспешанасць, аднак, вядзе да таго, што словы не дагаворваюцца, паміж фразамі знікаюць паўзы і ўсё сказанае робіцца малазразумелым. У гэтым выпадку вінаватымі, па сутнасці, з'яўляюцца дарослыя, якія ўскосна прыспешваюць дзяцей. Аднак, калі паспешлівае маўленне для вучняў робіцца звычайным, гэта прыводзіць да ўзнікнення вельмі ўстойлівых моўных хібаў.

Трэба таксама мець на ўвазе, што носьбіты кожнай мовы адрозніваюцца паміж сабой па індывідуальнаму тэмпу маўлення і што існуе псіхафізіялагічная схільнасць чалавека да пэўнай хуткасці. Адрозніваюцца тры катэгорыі гаворачых: (1) з хуткім, (2) сярэднім і (3) павольным індывідуальнымі тэмпамі маўлення. Вызначыць прыналежнасць канкрэтнага чалавека да

[1] Падлужны А. І., Чэкман В. М. Гукі беларускай мовы. С. 260.

акрэсленай групы гаворачых з рознай хуткасцю асоб можна шляхам правядзення спецыяльных вымярэнняў. Каб упэўнена ахарактарызаваць маўленне па тэмпу, вызначаюць працягласць розных моўных урыўкаў у маўленні адной і той жа асобы і падлічваюць, колькі розных моўных адзінак (слоў, складоў, гукаў) чалавек у сярэднім вымаўляе ў адзінку часу. Пры гэтым звычайна даследуецца тэмп маўлення па вялікіх урыўках з тэксту. Атрыманыя лічбы дазваляюць рабіць вывад аб схільнасці гаворачай асобы да пэўнага тэмпу вымаўлення.

Але звычайна кожны з носьбітаў мовы і без спецыяльнага даследавання, на слых, можа вызначыць, хто гаворыць хутка, хто — павольна і хто — з сярэдняй хуткасцю. Як паказваюць інструментальныя даследаванні, ацэнкі і самаацэнкі маўлення па тэмпу ўнутры адной мовы з'яўляюцца даволі дакладнымі і добра дапасуюцца да атрыманых вымярэнняў.

Інструментальнае даследаванне тэмпавых паказчыкаў індывідуальных варыянтаў маўлення на беларускай літаратурнай мове таксама выявіла існаванне трох груп гаворачых, якія адрозніваюцца па індывідуальнаму тэмпу. Сярэдняя працягласць гукаў у носьбітаў беларускай мовы з хуткім індывідуальным тэмпам складала ад 69 да 80 мс. У маўленні асоб, якія мелі сярэдні індывідуальны тэмп, сярэдняя працягласць гукаў хісталася ад 82 да 88 мс. Для маўлення носьбітаў беларускай мовы, маючых павольны індывідуальны тэмп, была характэрнай сярэдняя працягласць гукаў, якая перавышала 92 мс (ад 92 да 105 мс)[1].

Для педагагічных мэт цікавымі з'яўляюцца лінгвістычныя назіранні, якія сведчаць аб існаванні пэўных тэмпамоўных эталонаў для розных моў. Карысна ведаць, што для носьбітаў беларускай літаратурнай мовы характэрным з'яўляецца больш павольны тэмп маўлення ў параўнанні з тым, які з'яўляецца тыповым для носьбітаў рускай і ўкраінскай моў[2].

Таму паспешнае маўленне на беларускай мове асабліва непажадана. Наогул, калі чалавек гаворыць

---

[1] Фанетыка слова ў беларускай мове: Зб. / Рэд. А. І. Падлужны. Мн., 1983. С. 47—51.

[2] Типологія інтонації мовлення. Зб. / Рэд. А. И. Багмут. Київ, 1977. С. 147—152.

хутка і з невыразнай дыкцыяй, то яго маўленне цяжка ўспрымаць, яно ацэньваецца як неразборлівае.

Кожны настаўнік звычайна ведае, да якой групы гаворачых належаць яго вучні. Таму для тых з іх, хто звычайна хутка гаворыць, больш важным з'яўляецца пераадоленне паспешлівасці. Прыгадаем, што яна часта ўзнікае, калі вучань узрушаны, узбуджаны, таму патрабуецца і псіхалінгвістычная карэкціроўка.

Павольнае маўленне таксама павінна ўпісвацца ў пэўныя часавыя межы, бо інакш замаруджванне тэмпу можа атрымаць неадпаведную сэнсу ацэнку з боку слухачоў.

Сапраўды, ва ўсіх мовах існуе пэўная сувязь тэмпу маўлення з эмацыянальным станам гаворачай асобы. Шматлікія назіранні псіхолагаў і лінгвістаў паказалі, што той эмацыянальны стан, які актывізуе дзейнасць чалавека, паскарае тэмп маўлення, а эмацыянальны стан, які зніжае актыўнасць асобы, замаруджвае яго. Так, тэмп маўлення паскараецца, напрыклад, пры радасці і гневе, пры хваляванні, паніцы, наогул пры эмацыянальнай напружанасці. Хуткі тэмп перадае і ўсхваляванасць, і нецярплівасць, і злоснасць, і страх.

Па назіраннях псіхолагаў, у стане павышанага эмацыянальнага ўзбуджэння для гаворачага характэрна павелічэнне тэмпу маўлення на 15—25%.

Запавольванне тэмпу перадае прыгнечанасць, інертнасць гаворачай асобы. Павольны тэмп суправаджае няўпэўненасць, разгубленасць, раз'юшанасць, пагрозу.

Таму неабгрунтавана паспешнае маўленне можа ўспрымацца слухачамі як празмерна эмацыянальнае, нават агрэсіўнае. Тым больш, што звычайна паскарэнне тэмпу маўлення выклікае павелічэнне яго гучнасці.

З тэмпавай варыятыўнасцю звязана і адпаведная сэнсу рытмічная пабудова фразы. Як правіла, большай працягласцю ў параўнанні з астатнімі адзначаюцца тыя часткі фразы, у якіх знаходзяцца лагічна вылучаныя словы. Яны вымаўляюцца больш павольна. Напрыклад, *Цэлы гай старасвецкіх дубоў раскінуўся на беразе Нёмана.* Першае словазлучэнне з'яўляецца акцэнтна выдзеленым, перадае пэўныя сэнсавыя суадносіны ўсіх частак фразы. Пры правільным вымаўленні гэтай фразы сярэдняя працягласць гука ў першым

словазлучэнні на 30 % большая за тую, якой характарызуюцца гукі з наступных частак фразы.

Выдзяленне большай працягласцю розных членаў сказа падкрэслівае іх важнае значэнне для разумення сэнсу сказанага. «Незвычайнае» месцазнаходжанне даданых членаў сказа з іх адначасовым павольным вымаўленнем павялічвае іх сэнсавую значнасць. Параўн.: *Дыплом я заслужыў, здаецца ж, галавою* (К. Крапіва) і *Я заслужыў дыплом галавою; Поруч з Ганнаю стаяў чалавек — загарэлы, абветраны...* (Я. Скрыган) і *Поруч з Ганнаю стаяў загарэлы, абветраны чалавек.*

Наогул выкарыстанне змяненняў маўлення па тэмпу для выдзялення важнага і няважнага ўласціва ўсім усходнеславянскім мовам. Пры гэтым дзейнічае даволі простае правіла: больш важная інфармацыя паведамляецца ў больш павольным тэмпе. Таму школьнікаў трэба вучыць асэнсавана чытаць фразы на старонках падручнікаў і свядома выдзяляць пэўныя часткі тых фраз, якія ён вымаўляе.

Тэмп маўлення аказваецца звязаным з колькасцю, месцазнаходжаннем і працягласцю паўз. Рытміка маўлення, яго размеранасць шмат у чым залежаць ад перапынкаў у гучанні. Пераканаць вучняў у значэнні паўз няцяжка, але вельмі важна спецыяльна звярнуць на іх увагу на ўроках мовы або літаратуры. Увідавочніць значэнне паўз можна з дапамогай розных практыкаванняў, якія варта праводзіць на працягу ўсяго навучання мове і літаратуры.

1. Карысна прапанаваць з рознай разбіўкай на паўзы прачытаць сказы, якія ў залежнасці ад месца падзелу змяняюць сэнс. Гэтае заданне паказвае ўвідавочкі, як вымаўляюцца сказы ў моўнай плыні, і таму ў свядомасці дзяцей з яго дапамогай фарміруецца ўяўленне аб тым, што неабходна правільна афармляць свае вусныя выказванні. Разгледзім прыклады, у якіх касякамі абазначаны паўзы.

1 *Выходзіць, / нельга чакаць.*
1а *Выходзіць нельга, / чакаць.*
2 *Пакараць смерцю нельга, / памілаваць.*
2а *Пакараць смерцю, / нельга памілаваць.*
3 *Выступаць / вечарам Валодзя адмовіўся.*
3а *Выступаць вечарам / Валодзя адмовіўся.*
4 *Знаёмы Алены / са Слабады прыехаў.*
4а *Знаёмы / Алены са Слабады / прыехаў.*

5 *Людзі плачуць толькі / ў бядзе.*
5а *Людзі плачуць / толькі ў бядзе.*
6 *Хлопчык / прыгожы часопіс чытае.*
6а *Хлопчык прыгожы / часопіс чытае.*

Можна прыгадаць, што ў мультфільме пра мастака (які ведаюць дзеці) паказваецца, як, памылкова зразумеўшы перададзеную па тэлефоне фразу *«Хлопчык квадратны дыван выбівае»*, мастак намаляваў квадратнага хлопчыка, які выбівае дыван. Такі малюнак узнік пры наступнай разбіўцы фразы *Хлопчык квадратны / дыван выбівае.*

7 *Я хацеў увечары / бачыць настаўніцу.*
7а *Я хацеў / увечары бачыць настаўніцу.*
8 *Назіранні над мовай / малых дзяцей.*
8а *Назіранні / над мовай малых дзяцей.*
9 *Асцярожна! // Дзверы зачыняюцца!*
9а *Асцярожна дзверы зачыняюцца.*

2. Можна таксама прапанаваць прачытаць фразы з такім падзелам з дапамогай паўз, які не толькі не адпавядае сэнсу сказа, але і перашкаджае яго разуменню. Тое, што «ірванае» чытанне разбурае цэласнасць фразы і гучыць смешна, можна праілюстраваць на любым узятым з падручнікаў тэксце. Заўважым, што такі просты па сваёй сутнасці інтанацыйны аналіз даступны для школьнікаў рознага ўзросту.

1 *На / ўскраі / вёскі за / аселіцай жыла / была баба.*
1а *На ўскраі вёскі / за аселіцай / жыла-была баба.*
2 *Неяк / раз да / дома / старой падкаціла панская / брычка.*
2а *Неяк раз / да дома старой / падкаціла панская брычка.*
3 *Ехалі / да / яе не / толькі бедныя / мужыкі, але і / заможныя гаспадары.*
3а *Ехалі да яе / не толькі бедныя мужыкі, / але і заможныя гаспадары.*
4 *Ён / выламаў добры / дрын, пабег / да / куста.*
4а *Ён выламаў добры дрын, / пабег да куста.*
5 *Вечарам, калі / ў доме ўсё / сціхла, я / намазаў рукі / смалою і пайшоў / прама ў / аўчарню.*
5а *Вечарам, / калі ў доме ўсё сціхла, / я намазаў рукі смалою / і пайшоў / прама ў аўчарню.*

3. Можна таксама прапанаваць вучням паспрабаваць прачытаць працяглы сказ без паўз. Гэта таксама

выклікае пэўныя цяжкасці: маўленне робіцца манатонным, губляецца сэнс. Такую фразу цяжка паўтарыць: *Не люблю я нашага брата, паляўнічага, за язык доўгі* (В. Шырко); *Міхасёнак зусім не гэтага чакаў, калі думаў пра паездку ў мясціны, дзе некалі партызаніў* (А. Жук).

4. Але нельга думаць, што, чым больш перапынкаў, тым лепш разуменне. Неапраўданыя частыя паўзы таксама абцяжарваюць успрыманне сказаў. Перарывістае вымаўленне фраз часта сустракаецца ў дзяцей сярэдняга і старэйшага ўзросту. *Устаў / ён / з шасці / гадзін, / доўга / і старанна / мыўся / ля калодзежа, / потым / снедаў / разам / з Янакам* (А. Жук).

Вучні робяць празмерна вялікія паўзы. Пры гэтым працяглыя паўзы могуць быць зроблены як доўгі перарыў у гучанні або запаўняцца нейкімі гукамі, якія не нясуць ніякай інфармацыі *(м-м, ну, вось, гэт, гэта самае, як яго, значыць* і інш.). *Я / э-э-э / ужо / э-э-э / казала.*

Звычайна паразітарнымі гукамі і словамі запаўняюцца так званыя паўзы нерашучасці, якія вучні робяць, каб нешта абдумаць, прыгадаць, падабраць словы для перадачы думкі. Напрыклад, такія паўзы часам робяцца пасля прыназоўніка, які моцна звязаны з наступным словам: *За / м-м /хату пабег хлопчык.* Часта пасля такой паўзы нерашучасці робіцца паўтор слова, ужытага да паўзы: *Учора / так / учора Ніну бачыў.*

Звычайна ў вучняў малодшага ўзросту збыткоўныя паўзы абумоўлены абмежаванасцю актыўнага слоўніка. На такі недахоп трэба абавязкова звяртаць увагу, бо ўдасканаленне маўлення спрыяе ўдасканаленню мыслення.

Пры разглядзе метадаў і прыёмаў фарміравання вымаўленчых навыкаў М. Г. Яленскі зазначае: «Адным з найбольш істотных недахопаў маўлення вучняў з'яўляецца інтанацыйная разарванасць, якая заключаецца ў неапраўданых прыпынках мовы. Прычына — цяжкасці ў выкарыстанні лексікі. Другі недахоп — інтанацыйная аднастайнасць, калі фразы ідуць адна за другой, без паўз і лагічнага націску. Прычына — адсутнасць навыкаў логіка-інтанацыйнага аналізу маўлення. Трэці недахоп — невыразнасць інтанацыі пералічэння, зваротку, мелодыкі апавядальных, пы-

тальных, пабуджальных і клічных сказаў. Прычына — слаба развіты інтанацыйны слых вучняў»[1].

З ім згодны В. У. Протчанка. На яго думку, «манатоннасць, інтанацыйная аднастайнасць, экспрэсіўная беднасць і невыразнасць нярэдка характэрны для чытання не толькі малодшых школьнікаў, але і старшакласнікаў. Вучні часта аказваюцца бездапаможнымі, калі ім трэба выразіць інтанацыяй свае пачуцці да той ці іншай асобы, факта, падзеі, перадаць сінтаксічныя адносіны паміж часткамі. Яны не адчуваюць, дзе трэба павысіць ці панізіць тон голасу, робяць неапраўданыя мэтай выказвання лагічныя націскі і паўзы як пры чытанні ўголас, так і ў мове ўнутранай»[2].

Такім чынам, звяртаецца ўвага на яшчэ адзін істотны недахоп (чацвёрты) — недастатковую выразнасць вуснага маўлення.

Выразнасць звязнага маўлення дасягаецца рознымі рытміка-меладычнымі сродкамі: ужо згаданай працягласцю яе элементаў, сілай гукаў, іх вышынёю і тэмбрам.

З дапамогай узмацнення і паслаблення голасу гаворачы надае свайму маўленню выразнасць, бо змяненне вышыні голасу так, як і тэмпавыя варыяцыі, вызначаюць найбольш важныя па сэнсу словы. Меладычнасць таксама павінна быць падпарадкаванай сэнсаваму зместу выказванняў, таму што рух тону — той сродак, які дазваляе злучыць або процістаўіць пэўныя часткі фраз, суаднесці іх па ступені важнасці. Аднак напеўнасць у мове адрозніваецца ад музычнай, таму гаворачаму не трэба зацягваць даўжыню гукаў.

Настаўнік фізікі мінскай сярэдняй школы № 49 В. А. Гербутаў (пераможца ўсесаюзнага конкурсу «Настаўнік года — 91») дае сваім калегам наступную параду: «Улічы, што трымаць вучняў у напружанні ўсе сорак пяць мінут бессэнсоўна! Плануй хвалепадобную падачу найбольш каштоўнай інфармацыі. Зрабі інтанацыйны хранаметраж. Памятай, што манатоннасць — вораг усяго жывога»[3].

---

[1] Яленскі М. Г. Метады і прыёмы фарміравання вымаўленчых навыкаў // Выкладанне беларускай мовы і літаратуры: Зб. / Пад рэд. М. А. Лазарука. Мн., 1983. С. 31—32.

[2] Протчанка В. У. Вывучэнне сінтаксісу ў школе. Складаны сказ. Мн., 1989. С. 4.

[3] «ТББ — трудно быть бестолковым» // Знамя юности. 1991. 11 окт.

Таму пры выхаванні гукавой культуры ў школьнікаў настаўніку неабходна звяртаць увагу на тое, каб маўленне дзяцей (асабліва пры чытанні) не было аднастайна напеўным, каб яно не пераходзіла ў спеў. Дарэчы, такое вымаўленне перашкаджае самому вучню добра разумець тэкст пры чытанні.

Акрамя інтанацыйнай разнастайнасці, выразнае маўленне прадугледжвае добрае выкарыстанне тэмбра гука, які надае пэўную афарбоўку сказанаму (тэмбр — афарбоўка голасу, утвораная абертонамі). Згадаем, што якраз па тэмбру мы пазнаём галасы знаёмых людзей. З яго дапамогай гаворачы можа перадаць не толькі свае адносіны да выказвання, а таксама свае пачуцці. Паміма волі ў тэмбры адлюстроўваецца фізічны і эмацыянальны стан гаворачай асобы. «Змяніць тэмбр немагчыма, аднак зрабіць яго больш чыстым (зняць сіпату, хрыпласць, гугнявасць) можна. Канчаткова тэмбр фарміруецца ў юнацкім узросце»[1].

Вельмі важнай з'яўляецца арганізацыя дыхання, якая прадугледжвае авалоданне рацыянальным тыпам дыхання і мэтазгодным расходаваннем паветра. Моўнае дыханне адрозніваецца ад звычайнага, натуральнага, бо існуе ў час размовы або чытання ўслых і павінна быць глыбокім, спакойным і непрыкметным. Найбольш мэтазгодным з'яўляецца камбінаванае дыханне, якое аб'ядноўвае брушны і рэберны тыпы дыхання. А. Каляда так апісвае яго працэс: «Да таго моманту, пакуль паветра не запоўніць ніжнюю частку лёгкіх, удых выконваецца брушным тыпам дыхання. Затым пры дапамозе паміжрэберных мышцаў расцягваецца сярэдняя частка грудной клеткі, якая запаўняецца паветрам, і толькі пасля гэтага робіцца выдых. Можна вывесці формулу камбінаванага тыпу дыхання: удых (дыяфрагмавы тып дыхання і рэберны) — выдых — паўза»[2].

Пры змешаным рэберна-дыяфрагмавым (брушным) дыханні расходуецца паветра, што змяшчаецца ў ніжніх, найбольш ёмістых долях лёгкіх. Таму пры ім энергічна рухаюцца ніжнія рэбры і дыяфрагма, што выклікае лёгкае выпучванне пярэдняй сценкі жывата пры ўдыху і падцягванне яго пры выдыху.

---

[1] Каляда А. Выразнае чытанне. С. 19.
[2] Там жа. С. 13.

Правільнае выкарыстанне дыхання ў маўленні адбываецца пры эканомным і раўнамерным расходзе паветра і своечасовым і непрыкметным папаўненні на паўзах яго запасу.

Добрае ўражанне робіць голас поўнага гучання, які валодае вялікай свабодай гучнасці. Пры гэтым поўнае гучанне адрозніваецца ад напружанай гучнасці або крыклівасці, пры якіх чалавек узмацняе голас праз сілу.

Для настаўнікаў і ўсіх тых, хто гаворыць перад аўдыторыяй, у вялікім памяшканні, вельмі важнай з'яўляецца так званая палётнасць (лятучасць) голасу. Голас «добра ляціць», разносіцца, калі ў вялікім памяшканні ён не губляе сваёй гучнасці, не пераходзячы ў крык.

Палётнасць забяспечвае добрую чутнасць і пры невялікай сіле голасу.

Індывідуальнымі тэмбравымі асаблівасцямі голасу з'яўляецца яго дыяпазон (які вызначаецца колькасцю даступных для ўзнаўлення нот), гнуткасць (здольнасць лёгка і хутка змяняцца па вышыні, сіле, працягласці і якаснай афарбоўцы) і мілагучнасці, г. зн. чысціня і свежасць тэмбру. Мілагучны тэмбр пазбаўлены пабочных прыгукаў: хрыпу, сіпення, прыціснутасці і да т. п. Паляпшэнне тэмбравых характарыстык голасу заснавана на правільнай сістэме дыхання і пастаноўцы голасу «ў маску», г. зн. на выкарыстанні верхніх рэзанатараў гука, якія ўтвараюцца цвёрдымі часткамі ротавай і насавой поласцей, шляхам адпаведнага пасылання струменю паветра пры выдыху пры вымаўленні галосных і санорных гукаў. Калі рэзананс утвараецца ў цвёрдым паднябенні, то голас вызначаецца сабранасцю, кампактнасцю гука, яго «металічнасцю» (у процілегласць глухому, цьмянаму гуку) і выдатна «ляціць» у вялікіх памяшканнях.

Гнуткасць голасу павялічваецца пры выкарыстанні спецыяльных практыкаванняў. Так, чалавек можа гаварыць гучна і ціха, вышэй і ніжэй па тону, павольна і хутка. Гучнасць, хуткасць і вышыню (узровень) маўлення здаўна называюць «рычагамі тону». Традыцыйнымі практыкаваннямі, якія вядуць да авалодання рычагамі тону, з'яўляецца чытанне вершаваных тэкстаў з паступовым ад верша да верша або ад групы вершаў да іншай групы змяненнем адной з асноўных гукавых якасцей маўлення: сілы, хуткасці або вышыні

пры нязменных астатніх. Зразумела, што асабліва ў пачатку не варта праводзіць практыкаванні на межавых ступенях сілы, хуткасці і вышыні.

Пастаноўка і апрацоўка голасу, канешне, патрабуюць спецыяльных ведаў і вопыту, якія звычайна сістэматызуюцца ў кнігах па аратарскаму майстэрству або выразнаму чытанню.

Аднак, калі ў школе добра пастаўлена выкладанне музыкі і спеваў, то настаўнік мовы можа выкарыстаць тыя веды, якія вучні набылі пры музыкальнай падрыхтоўцы. Прыгадаем, што ўжо ў канцы першага класа вучні павінны ўмець «пець натуральным, звонкім голасам, лёгкім, напеўным, рухомым гукам»[1], «браць дыханне перад пачаткам спеваў і паміж музыкальнымі фразамі... вымаўляць выразна словы... захоўваць зазначаны тэмп, адрозніваць напрамкі руху мелодыі»[2].

Трэніроўкі на дыферэнцыяцыю гукаў і іх спалучэнняў па вышыні, дынаміцы, тэмпу і тэмбру прадугледжаны ў другім класе. У трэцім класе вучні павінны пець у рухомым тэмпе, з рознымі дынамічнымі адценнямі, не губляючы напеўнасці[3]. Такім чынам, ужо ў пачатковых класах вучні атрымліваюць музычныя веды, якія з'яўляюцца дастатковымі для фарміравання неабходных навыкаў пры пастаноўцы голасу.

У класнай практыцы педагог можа абмежавацца патрабаваннем ад вучняў гучнага чытання (ад поўных грудзей) і пры гэтым сачыць за тым, каб вучні не пераходзілі на крык, не гаварылі вельмі напружана, і разам з тым імкнуцца развіваць гнуткасць голасу. Значна больш можна зрабіць для ўдасканалення тых бакоў тэхнікі маўлення, якія забяспечваюць зразумеласць маўлення: яго выразнасць і дакладнасць.

Удасканальванне вуснай мовы вучняў павялічвае патрабаванні як да дыкцыі, так і да інтанацыі настаўніка, якая ў пэўным сэнсе з'яўляецца ўзорам для дзяцей. Уменне дасканала валодаць сваім голасам і пастаноўка голасу, на думку А. С. Макаранкі,— тое, без чаго настаўніку нельга працаваць. У сувязі з гэтым варта прыгадаць наступныя словы А. Каляды,

---

[1] Программы I — IV классов общеобразовательной школы с русским языком обучения. Мн., 1991. С. 195.

[2] Там жа. С. 196.

[3] Там жа. С. 201—215.

узятыя з артыкула з красамоўнай назвай «Жывое слова настаўніка — сродак выхавання, адукацыі, навучання»: «Самыя высокія, прыгожыя і мудрыя словы, вымаўленыя глухім, хрыплаватым голасам, якія перарываюцца шумным дыханнем, выклікаюць у вучняў пачуццё нездавальнення і горычы, а часта і здзеклівыя кпіны, жаданне скапіраваць на пацеху. Калі ж да такога голасу і дыхання дадаецца яшчэ і дрэнная дыкцыя — гаварыць пра эстэтычнае ўздзеянне на вучняў вуснай мовы такога настаўніка-славесніка немагчыма»[1].

Не менш важным з'яўляецца для дзяцей той тон маўлення, які абраны настаўнікам. Так, знаёмая першакласніца неяк тлумачыла, што не хоча ісці ў школу, бо настаўніца гаворыць «праціўным скрыпучым голасам, нібыта ўвесь час злуецца».

Асноўныя патрабаванні да маўлення настаўніка супадаюць з тымі, якія фармулююцца пры пастаноўцы выразнага чытання[2]. Калі выдатны знаўца тэорыі і практыкі мастацкага чытання Г. Ул. Артабалеўскі друкаваў у 1939—1940 гг. у часопісе «Руская мова ў школе» нарысы па выразнаму чытанню, то ён падкрэсліваў, што для настаўніка важным з'яўляецца як выразнае чытанне ў вузкім сэнсе гэтага слова («лагічна выразнае»), якое найбольш адпавядае задачам школьнага навучання, так і выразнае чытанне ў значэнні і «мастацкае», «артыстычнае», якое патрэбна для пазакласнай працы і для асабістага чытання настаўнікам мастацкіх твораў[3].

Уменне валодаць мастацтвам жывога слова неабходна настаўніку таксама таму, што ўзорнае чытанне твора дапамагае вучням эстэтычна ўспрымаць пачутае, лепш разумець мастацка-сэнсавую сутнасць тэксту. Вядомы метадыст В. Астрагорскі зазначаў даволі катэгарычна: «Хто не валодае выразным чытаннем, павінен пакінуць думку пра выкладанне літаратуры».

Разам з тым распрацоўка сродкаў эмацыянальна-

---

[1] Каляда А. Жывое слова настаўніка — сродак выхавання, адукацыі, навучання / Беларуская мова і літаратура ў школе. № 6. 1989. С. 46.

[2] Каляда А. Выразнае чытанне; яго ж. Выразнае чытанне сатырычных вершаў, баек і драматычных твораў. Мн., 1973.

[3] Артоболевский Г. В. Очерки по художественному чтению. М., 1959. С. 1.

вобразнай выразнасці чытання непазбежна спалучаецца з больш глыбокім асэнсаваннем фанетычнай арганізацыі вуснага маўлення, з усведамленнем агульных гукавых заканамернасцей, што дзейнічаюць у кожнай нацыянальнай мове. Такое практычнае спасціжэнне законаў гукавой арганізацыі беларускай мовы дапаможа настаўніку ў вырашэнні ўсіх асноўных задач вывучэння фанетыкі ў школе, дазволіць своечасова праводзіць карэкцыю вымаўлення вучняў.

Пераадолець найбольш пашыраныя недахопы ў вусным маўленні школьнікаў можна толькі ў выніку сістэматычнай навучальнай працы, калі на кожным уроку аддаецца ўвага пытанням развіцця і ўдасканалення вуснай формы мовы.

У працэсе актыўнай моўнай практыкі адбываецца станаўленне ведаў, уменняў і навыкаў, асэнсоўваюцца нормы літаратурнага вымаўлення з боку яго гукавой і інтанацыйнай арганізацыі.

Родная мова і прадмет, і сродак навучання, бо «праз гукавую арганізацыю мовы мы выпрацоўваем асэнсаванне і неабходнасць моўнай гармоніі, сугучнасць афармлення і зместу»[1].

Такім чынам, найбольш важнай задачай вывучэння фанетыкі ў школе з'яўляецца развіццё гукавой культуры мовы вучняў, якое прадугледжвае работу над станаўленнем добрай дыкцыі, выразнага маўлення, адпаведнага нормам літаратурнай мовы. Пры гэтым вывучэнне арфаэпіі мае асабліва важнае значэнне, бо, калі школьнікі паслядоўна і сістэматычна авалодваюць літаратурнай фанетыкай, то яны больш свядома ставяцца да вуснага маўлення, якое яны чуюць па радыё і тэлебачанні, у тэатры і ў побыце. Для выхавання ўласнай моўнай культуры ва ўмовах двухмоўя ім неабходна крытычна ставіцца да пачутага, самастойна рабіць вывады аб адпаведнасці гучання нормам роднай мовы. Мова школьнікаў (асабліва малодшых) знаходзіцца пад уплывам гутарковай мовы. Пры сучасным, часта недастатковым, маўленчым патэнцыяле акаляючага моўнага асяроддзя ад вучняў нельга патрабаваць, каб яны набылі неабходныя вымаўленчыя навыкі толькі шляхам непасрэднага пераймання.

---

[1] Ляшчынская В. Мова вучыць і выхоўвае // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1990. № 4. С. 16.

Развіццё асэнсаванага стаўлення да гукавога боку мовы — таксама вельмі важная задача вывучэння фанетыкі ў школе. Вымаўленчыя памылкі, калі іх пакінуць без увагі, ператвараюцца ў арфаграфічныя і пунктуацыйныя.

Для эфектыўнага навучання мове неабходна, каб дзеці набылі рад навыкаў па гукавому аналізу, каб яны навучыліся: 1) правільна вымаўляць гукі ў слове; 2) чуць кожны гук у слове і адрозніваць яго ад суседняга гука; 3) называць гукі ў слове па парадку і вызначаць іх колькасць; 4) даваць якасную характарыстыку кожнаму гуку ў межах, прадугледжаных школьнай праграмай; 5) адрозніваць на слых блізкія па гучанню беларускія і рускія гукі.

Паспяховасць гукавога аналізу, які праводзіць вучань, залежыць ад развіцця яго моўнага слыху. Сутнасць апошняга паняцця можна лепш зразумець, калі звярнуцца да маўлення на няроднай, другасна вывучанай мове. Сапраўды, мы чуем іншаземны акцэнт таму, што чалавек выкарыстоўвае такія варыянты гучання, якія не тыповыя для аднамоўных носьбітаў мовы. Нават дзіўна, што слухач не толькі ўлоўлівае гэтую розніцу, але і пэўным чынам яе ацэньвае. У кожнага чалавека ў кожны асобны момант часу ў кожнай асобнай моўнай сітуацыі і ў кожнай асобнай моўнай адзінцы гучыць нейкі своеасаблівы непаўторны набор гукаў. «У адну раку нельга ўвайсці двойчы...» Таму ў кожнай мове існуе свой гістарычны і пісьмова замацаваны набор гукаў-сэнсаадрознівальнікаў. Кожны гук, кожны носьбіт мовы можна вымаўляць трошку інакш, але гукі-сэнсаадрознівальнікі, названыя Бадуэнам дэ Куртэнэ фанемамі, нельга бясконца набліжаць адзін да аднаго. Іх нельга блытаць, абазначаць аднымі і тымі ж літарамі. Якраз пра іх І. Курбека гаворыць наступнае:

Літара
Мяняецца—
Сэнс
Другі
З'яўляецца.

«Хітрыя» літары, пра якія гаворыцца ў гэтых вершах[1], служаць для абазначэння «хітрых» гукаў — гу-

[1] Курбека І. Хітрыя літары. Мн., 1991.

каў-сэнсаадрознівальнікаў, фанем. Напрыклад, як [*а*] і [*у*] у словах *суд* і *сад*.

Я грамадзян усіх
Шаную,
Мяне баіцца
Ліхадзей.
Змяніўшы «у» на «а»,
Пачну я
Пладамі
Надзяляць людзей. *(І. Курбека.)*

Можна ўявіць сабе, што беларус, які жыве на польска-беларускім паграніччы ў білінгвістычным асяроддзі, будзе вымаўляць гук [*о*], падобны на польскі — такі, што нагадвае нейкі варыянт літаратурнага [*а*]. Але ён усё ж будзе адрозніваць ад [*а*], і словы *звадка* і *зводка* не будуць блытацца, таму індывідуальнае адхіленне пры вымаўленні [*а*] не будзе перашкаджаць узаемаразуменню гаворачых. Такім чынам, яно знаходзіцца ў межах той унутрымоўнай варыятыўнасці, якая лічыцца дапушчальнай, не закранае моўны (фаналагічны) слых.

Але калі чалавек, для якога родныя гаворкі — укаючыя, замест гука [*ы*] у слове *бык* ужыве гук [*у*], гэта можа выклікаць непаразуменне, бо словы *бык* і *бук* у беларускай мове не з'яўляюцца амонімамі. Дапушчальная мовай варыятыўнасць гука [*ы*] не дазваляе яму набліжацца да [*у*]. Калі ж улічыць, што межы забароненай варыятыўнасці кожны чалавек спасцігае на практыцы, то робіцца зразумелым, чаму іншаземец сваім вымаўленнем выбіваецца з агульнага моўнага асяроддзя. Яго практыка не дазваляе праводзіць патрэбную карэкціроўку гукаў. І ў гэтым выпадку ён, як малое дзіця, блытае такія гукі, якія трэба дыферэнцыраваць.

Моўны слых, фанематычнае ўспрыманне гукаў фарміруюцца ў дзяцей шляхам засваення мовы іх бліжэйшага асяроддзя. Нават ужо ў два-тры гады дзеці асэнсавана ставяцца да свайго маўлення, выпраўляюць памылкі, адзначаюць неадпаведнасць сваіх і чужых гукаў. Але і ў школе трэба працягваць работу па фарміраванню фанемнага слыху. Гукавы аналіз — неабходны этап пры навучанні чытанню і пісьму.

Каб прачытаць слова, вучню неабходна зрокавы вобраз, літару, перавесці ў гукавы, пэўны гук, і на-

бор гукаў паставіць у адпаведнасць з наборам літар. Тое, што ў гэтым выпадку няма адназначных суадносін, няцяжка пераканацца, звярнуўшыся да напісання звычайных беларускіх слоў. Параўнаем гукавую і літарную форму слоў *іней — [йін'ей], рэдзька — [рэ́ц'ка]; барацьба — [барадз'ба́], ледзь — [л'ец']; луг — [лух]*. Як бачым, гукавая форма гэтых слоў адрозніваецца ад той, што прынята ў яе літарным абазначэнні. У сувязі з гэтым, каб прачытаць словы, неабходна ведаць іх гукавую структуру: дзе паставіць націск, колькі вымавіць гукаў; чуць усе гукі; ведаць правілы чытання, гукавое значэнне кожнай літары менавіта ў гэтых словах.

Вялікі і складаны комплекс ведаў, які неабходна мець пры навучанні чытанню, не з'яўляецца непасільным нават для малодшых школьнікаў. Але каб паскорыць працэс навучання, трэба ўвесь час займацца спецыяльным фарміраваннем гукавога аналізу. Зразумела, што дзеці пакуль што не маюць тэарэтычных ведаў аб гуках, таму гукавы аналіз трэба праводзіць з апорай на натуральныя моўныя дзеянні. Такімі першаснымі натуральнымі механізмамі з'яўляюцца ўяўленні аб складападзеле. Прыгадаем, што склад як пэўнага віду адзінка падзелу моўнай плыні без суаднесенасці са значэннем, па Паўлаву, добра ўпісваецца ў маторна-фанічныя рэакцыі жывых істот. Першыя крыкі народжанага дзіцяці носяць складовы характар. Маўленне дзіцяці пачынаецца са склада. Калі ў сувязі з хваробамі ў чалавека адбываецца разбурэнне мовы — афазія, то яна таксама даводзіць маўленне да склада.

Існуючая ў беларускай мове цесная сувязь зычнага з галосным дапамагае падзяляць моўную плынь на спалучэнні «зычны, галосны+зычны, галосны»: *Ма-ма па-ка-та-ла На-та-шу.*

Выкарыстоўванне такіх спалучэнняў для навучання гукавому аналізу неабходна на першым этапе, бо ў спалучэннях ЗГ (зычны, галосны) больш цяжка выдаліць зычны, чым у спалучэнні ГЗ. Звычайна пры выдзяленні першага гука з адкрытага склада дзеці імкнуцца не адрываць яго ад наступнага. Напрыклад, у слове *мама* вылучаецца не [*м*], але [*ма*]. Таму лепш спачатку аддзяліць гэты гук у такіх словах, як *ды*[*м*], *ко*[*м*] і г. д. Калі школьнік навучыцца выдзяляць гук з такіх больш зручных пазіцый і навучыцца яго ха-

рактарызаваць, то яму будзе прасцей пазнаць знаёмы гук у любым ланцужку гукаў.

Мэтазгодным у сувязі з выказанымі меркаваннямі лічацца наступныя прыёмы фарміравання гукавога аналізу:

1) выдзяленне галосных са зручнай пазіцыі, калі перад імі адсутнічаюць зычны і галосны гукі, утварае склад, напрыклад, */і/мжа, /і/рыс, /у/жаць, /у/баку, /а/пранаць, /а/сушыць, /о/го, /о/птыка, /э/ге, /э/венк*;

2) выдзяленне зычных гукаў са зручных пазіцый (ГЗ) у словах тыпу: *ра/к/, са/м/, ко/н'/, но/ч/* і да т. п.;

3) назіранне над артыкуляцыяй выдзеленых гукаў;

4) назіранне над гучаннем (прасачыць: з голасам вымаўляецца гук або з голасам і шумам або без голасу, толькі з шумам; ці свабодна праходзіць паветра ў роце або пры вымаўленні гука ўтвараюцца перашкоды).

Пры вызначэнні парадку гукавога разбору трэба ўлічваць, што галоўная задача — гэта: 1) навучыць вучняў самастойна аналізаваць гукавы склад слоў любой гукаскладовай структуры, таму што гэта патрэбна для практыкі вуснага і пісьмовага маўлення; 2) навучыць вучняў у працэсе гукавога разбору праводзіць адначасова чатыры дзеянні: вымаўляю, чую, выдзяляю, абазначаю[1].

У адпаведнасці з гэтым зручным з'яўляецца наступны алгарытм (парадак) дзеянняў вучняў у працэсе гукавога разбору:

1) Павольна вымаві слова і прыслухайся да яго гучання.

2) Вылучы ў слове спалучэнні ЗГ і тыя гукі, што да іх далучаюцца.

3) Вызнач месца гукаў па парадку ў слове.

4) Вызнач галосныя гукі.

5) Вызнач цвёрдыя і мяккія зычныя гукі ў слове, запішы іх.

6) Вызнач звонкія і глухія зычныя ў слове і запішы іх.

7) Назаві гукі ў слове па парадку.

8) Вызнач націск у слове.

9) Вызнач колькасць складоў у слове, вымаві слова па складах.

---

[1] Гребенкина Р. Т. Изучение в школе фонетики и графики русского языка. М., 1984. С. 14.

Дакладнае вызначэнне межаў складоў — цяжкая справа, таму нельга спадзявацца, што вучні змогуць гэта зрабіць. Больш мэтазгодна, на думку некаторых метадыстаў, імкнуцца, каб вучні называлі толькі колькасць складоў у слове і не размяжоўвалі граніцы складоў у найбольш складаных выпадках, бо практычна дакладны складападзел не патрэбны для набыцця фанетычных або арфаграфічных уменняў[1].

Асэнсаванае стаўленне школьнікаў да гукавой формы слоў шмат у чым садзейнічае фарміраванню трывалых арфаграфічных уменняў і навыкаў. Асноўныя прынцыпы, на якіх пабудаваны беларускі правапіс, гэта фанетычны і марфалагічны. Фанетычны прынцып арфаграфіі заключаецца ў адпаведнасці напісання вымаўленню. Аднак яго сутнасць не зводзіцца да пашыранага тлумачэння: «пішы, як чуеш», бо, як вядома, кожны вымаўляе і чуе гукі па-свойму. Таму адпаведнасць паміж літарамі і гукамі вызначаецца, зыходзячы з агульнапрынятага, літаратурнага вымаўлення. Так, словы *вада, беларускі, білет* у індывідуальным вымаўленні могуць гучаць як *[водá, выдá], [б'іларýскі, б'ьларýскі], [б'ал'э́т], [б'іл'эт]*, але іх трэба вымаўляць *[вадá, б'эларýскі, б'іл'э́т]*, таму і пры напісанні галосных мы кіруемся літаратурнымі нормамі і пішам адпаведна *вада, беларускі, білет.*

Фанетычна абумоўленай з'яўляецца ў беларускай мове перадача на пісьме: 1) чаргавання [*о*] і [*а*], [*э*] і [*а*] у ненаціскных складах пасля цвёрдых зычных; 2) чаргавання [*э*] і [*а*], [*о*] і [*а*] у першым пераднаціскным складзе слоў са славянскай лексічнай асновай пасля папярэдніх мяккіх зычных; 3) чаргавання [*л*] і [*ў*], [*в*] і [*ў*]; 4) падоўжанасці зычных у пэўных пазіцыях паміж галоснымі і г. д.

Такім чынам, фанетычны прынцып накіраваны на тое, каб існавала пэўная адпаведнасць таго, што вымаўляецца, таму, што пішацца.

У адрозненне ад яго марфалагічны прынцып прадугледжвае аднолькавае абазначэнне марфем на пісьме, незалежнае ад іх вымаўлення ў складзе слова.

Захаванне на пісьме графічнага адзінства адных і тых жа каранёў, прыставак, суфіксаў і канчаткаў

---

[1] Богуславская Н. Е. Методика фонетики // Основы методики русского языка / Под ред. А. В. Текучева, М. М. Разумовской, Т. А. Ладыженской. М., 1978. С. 58.

дазваляе хутчэй асэнсаваць марфалагічную структуру слова.

Дакладная пісьмовая перадача зместу выказванняў, якую павінна забяспечваць арфаграфія, дасягаецца з дапамогай абодвух прынцыпаў.

На марфалагічным прынцыпе ў беларускім правапісе пабудаваны многія правілы напісання спалучэнняў зычных на стыку кораня і прыстаўкі, кораня і суфікса (напрыклад, *зс, жс; сч, зч; дч, тч; дц, тц, чц*), прыставак *аб-, ад-, перад-* перад глухімі зычнымі і г. д. Вымаўляем *францу́/с/кі, во́/шч/ык, лёг/ч:/ык*[1], *на рэ/ц:/ы, а/п/садзіць, а/т/тапіць, пра/т/піса́ць, на/т/кало́ць*, а пішам *абсадзіць, абтапіць, прадпісаць, надкалоць, французскі, возчык, лётчык, на рэчцы.*

Аднолькавы запіс марфем робіць больш лёгкім чытанне і разуменне напісанага, дазваляе зрокава размежаваць значную колькасць амафонаў і амаморфаў. Параўн. такія словы, якія маюць аднолькавае гучанне, але рознае напісанне, як *род* і *рот, кос* (ад *каса*) і *коз* (ад *каза*). Розніца ў графічнай перадачы дазваляе хутчэй вызначыць сэнсавыя графічныя асацыяцыі. Чаргаванне звонкіх зычных з глухімі ў вышэйзгаданых словах абумоўлена месцам гука ў слове, з'яўляецца пазіцыйным. Згодна з марфалагічным прынцыпам арфаграфія не адлюстроўвае такія чаргаванні, таму ўсе карані роднасных слоў пішуцца з аднолькавымі зычнымі, звонкімі або глухімі: *каза, коз, казліны, казляня; каса, касіць, касьба, кос* і г. д.

У адрозненне ад пазіцыйных у мове існуюць гістарычныя чаргаванні, якія не звязаны з вымаўленчымі законамі сучаснай беларускай мовы.

Вывучэнне фанетыкі беларускай мовы ў малодшых класах

У малодшых класах пачынаецца і фактычна завяршаецца работа настаўніка над фарміраваннем асноўных навыкаў правільнага беларускага літаратурнага вымаўлення як у школах з беларускай, так і рускай мовай навучання. У гэты час у дзяцей удасканальваюцца розныя аспекты моўнага слыху, асабліва

[1] З дапамогай двукроп'я каля зычнага абазначаецца яго працяглае, падоўжанае вымаўленне.

фанематычнага. У працэсе навучання чытанню і пісьму вучні набываюць цэлы рад фанетычных уяўленняў: пра гукі маўлення, галосныя і зычныя, цвёрдыя і мяккія зычныя, склад, націск.

Школьны курс роднай мовы накіроўвае настаўніка на канкрэтны змест заняткаў з вучнямі па пастаноўцы беларускага літаратурнага вымаўлення, патрабуе, каб ён пастаянна праводзіў карэкцыю і ўдасканаленне вымаўлення. «Навучаць роднай мове — гэта значыць сістэматычна і паслядоўна дапамагаць школьнікам авалодваць фанетыкай, лексікай і граматыкай, літаратурным вымаўленнем і правапісам, выяўленчымі сродкамі і стылістычнай разнастайнасцю мовы»[1].

У праграму па беларускай мове для I — IV класаў уваходзіць: падрыхтоўчы перыяд; уступны моўны курс; граматыка, правапіс і развіццё мовы; чытанне і развіццё мовы.

Асноўная задача падрыхтоўчага перыяду — увесці дзяцей у атмасферу жывога беларускага слова, навучыць іх на слых успрымаць і разумець беларускую мову, заўважаць яе элементарныя лексічныя, фанетыка-арфаэпічныя і граматычныя асаблівасці, пашыраць і актывізаваць іх слоўнікавы запас. Не менш важным з'яўляецца вырашэнне і чыста псіхалагічнай задачы: выклікаць у дзяцей цікавасць да беларускага слова, жаданне авалодаць мовай.

У працэсе ўступнага моўнага курса працягваецца засваенне фанетыка-арфаэпічных і графіка-арфаграфічных асаблівасцей беларускай мовы спачатку ў час слухання казак, а затым — пры чытанні слоў, сказаў, тэкстаў, адказаў на пытанні, пераказаў, вядзенні дыялогаў.

Курс граматыкі, правапісу і развіцця мовы прадугледжвае далейшае фарміраванне элементарных арфаэпічных і арфаграфічных навыкаў; удасканаленне ўменняў адрозніваць гук ад літары, дзяліць словы на склады; знаёмства з відамі сказаў паводле інтанацыі; фарміраванне і далейшае развіццё элементарных навыкаў чытання, гаварэння і пісьма.

Развіццё вуснай і пісьмовай формы мовы лічыцца школьнымі праграмамі адной з галоўных задач навуч-

---

[1] Протчанка В. У. Аб практычнай накіраванасці школьнага курса роднай мовы // Выкладанне беларускай мовы і літаратуры. С. 3.

чання. Пры гэтым падкрэсліваецца, што асновай паспяховага авалодання мовай з'яўляецца выпрацоўка навыкаў літаратурнага вымаўлення.

На малодшыя класы прыпадае найважнейшая, найвялікшая і найадпаведнейшая работа настаўніка з вучнямі над тым, каб прывіць ім любоў і ўвагу да гукавога боку маўлення не толькі як спосабу моўных зносін, але і паказчыку высокага эстэтычнага і культурнага ўзроўню чалавека.

У пачатковых класах асабліва неабходна пільная ўвага да арфаэпічнага вымаўлення, да інтанацыі, паўз, да гукавой варыятыўнасці. Калі нарматыўныя змены гукаў неабходна ведаць для свядомага засваення ўсяго багацця і разнастайнасці гучанняў, то ненарматыўныя — для асэнсаванага супрацьдзеяння і пераадолення іх. Тое, як пастаўлена вымаўленне ў пачатковых класах, прадвызначае і якасць чытання, і разуменне вуснага маўлення, і ўменне гаварыць, і арфаграфічныя навыкі.

У кожным класе вучні сутыкаюцца з розным наборам тэрмінаў і паняццяў, якія ім трэба засвоіць. Зразумела, што вызначэнні тэрмінаў дзецям не прыводзяцца, але яны павінны зразумець і засвоіць іх сутнасць, атрымаць пэўныя слыхавыя, вымаўленчыя і графіка-арфаграфічныя навыкі.

Мэта нашага падручніка — сістэматызаваць і даць настаўніку звесткі аб тых асноўных паняццях, якія трэба растлумачыць школьнікам, а таксама прывесці пэўны моўны матэрыял, які дапаможа зразумець гэтыя паняцці і можа выкарыстоўвацца для выпрацоўкі ўменняў правільна артыкуляваць гукі і спалучэнні гукаў, вымаўляць асобныя словы з правільнай акцэнтуацыяй.

Пры вывучэнні фанетыкі ўсходнеславянскіх моў і засваенні асноўных вымаўленчых норм літаратурнай мовы звычайна выкарыстоўваюцца наступныя віды працы: 1) тлумачэнне артыкуляцыі гука; 2) спасылка і параўнанне на аналагічныя гукі беларускай дыялектнай або рускай моў (у залежнасці ад акаляючага моўнага асяроддзя); 3) супастаўленне і засваенне артыкуляцыі складоў (або і кароткіх слоў), у якіх ёсць той гук літаратурнага вымаўлення, што вывучаецца; 4) дэманстрацыя ўзораў правільнага вымаўлення; 5) выкананне трэніровачных практыкаванняў на вымаўленне і напісанне слоў з узятым для вывучэння

гукам, а таксама фраз, у складзе якіх ёсць словы, насычаныя гэтым гукам.

Пералічаныя прыёмы працы па стварэнню навыкаў прадугледжваюць выкарыстанне імітацыйных спосабаў з адначасовым свядомым засваеннем асобных з'яў арфаэпічнай сістэмы. Імітацыя выкарыстоўваецца для выпрацоўкі вымаўленчых навыкаў, суадносных з пэўнымі слыхавымі вобразамі. Таму з цягам часу яна ўсё больш спалучаецца са свядомым засваеннем, што вымагае тлумачэння неабходнага становішча моўных органаў у даступнай для дзяцей форме. Адзначым, аднак, што засваенне такіх фанетычных з'яў, як склад, націск, інтанацыя, наогул праходзіць выключна імітацыйным шляхам. Імітацыйна-супастаўляльны метад прадугледжвае перайманне ўзорнага маўлення, супастаўленне яго з уласным.

Пастаноўка артыкуляцыі гукаў патрабуе канцэнтрацыі ўвагі на якасці вывучаемага гука як з боку яго гучання (акустычныя, слыхавыя ўражанні), так і з боку асаблівасцей працы вымаўленчых органаў (аналіз моўных рухаў і мышачных адчуванняў). Кантроль слыху — вельмі важная перадумова авалодання арфаэпічнымі навыкамі. Калі чалавек не чуе асаблівасцей гучання беларускіх фанетычных адзінак, то ён не здолее засвоіць іх правільнае вымаўленне.

Даследаванні па фізіялогіі маўлення паказваюць, што слыхавыя адчуванні адыгрываюць галоўную ролю на першым этапе ўзнаўлення гукавой мовы. Успрыманне таго ці іншага гука мовы залежыць не толькі ад фізічных характарыстык гука, але і ад моўных характарыстык слыху. Агульнавядома, што словы адной мовы носьбітам іншай мовы могуць успрымацца як гучанне з іншым значэннем або як бессэнсоўныя спалучэнні гукаў. Такім чынам, успрыманне гукаў мовы залежыць не толькі ад фізічных уласцівасцей гука, але і ад яго моўных характарыстык, ад так званага «фанематычнага слыху» той мовы, носьбітам якой з'яўляецца слухач.

Фанематычны слых абумоўлівае захаванне ў памяці чалавека эталонаў фанетычных адзінак і правіл параўнання з імі. Як лічаць псіхолагі, у працэсе авалодання мовай у чалавека выпрацоўваюцца эталоны гукаў маўлення і эталоны параўнання з імі[1]. Тэрмін

[1] Зимняя И. А. К вопросу о зонной природе восприятия изолированных звуков // Доклады АПН РСФСР. № 2. 1961.

«эталон» ужываецца як зручнае абазначэнне тых адзінак, якія захоўваюцца ў памяці чалавека і на якія абапіраецца ён пры ўспрыманні мовы. Для таго каб у вучняў сфарміраваўся неабходны фанетычны эталон, трэба праводзіць спецыяльную работу.

Трэба, каб арфаэпічна карэктныя гукі супастаўляліся з адпаведнай артыкуляцыяй: правільная артыкуляцыя садзейнічае правільнаму слыхавому ўспрыманню. Аўтаматызаваныя артыкуляцыі садзейнічаюць развіццю правільнага акустычнага ўспрымання.

Спалучэнне слыхавога і артыкуляцыйнага метадаў навучання вымаўленню традыцыйна для беларускай методыкі. Так, Якуб Колас пры аналізе метадаў навучання мове адзначаў наступнае: «Гук, аддзелены ад другіх гукаў таго ці іншага слова, заўсёды будзе гучаць не так, як у слове. Вось дзеля чаго і выходзяць пастаянныя труднасці пры навучанні зліццю. Лепш, калі дзеці будуць разумець кожны гук, а дзеля гэтага трэба даць ім хоць бы агульнае прадстаўленне аб артыкуляцыі асобных гукаў»[1].

На яго думку, азнаямленне з артыкуляцыяй дапаможа пазбавіцца хібаў вымаўлення[2], пры гэтым «самое азнаямленне з артыкуляцыяй павінна засноўвацца на назіранні вучняў над іх вымаўленнем і выкладацца як можна прасцей»[3]. Зразумела, што самому настаўніку патрэбна мець больш поўныя ўяўленні аб артыкуляцыйных характарыстыках маўлення.

Для выкладання фанетыкі ў малодшых класах настаўнік можа выкарыстаць два тыпы практыкаванняў. Па-першае, тыя, што накіраваны на засваенне артыкуляцыйных характарыстык гукаў літаратурнай беларускай мовы і прынятых норм вымаўлення. І па-другое, тыя, што садзейнічаюць выпрацоўцы навыкаў гука-літарнага аналізу.

Відавочна, што такія ж заданні будуць патрэбнымі і для выкладання і ў V, і ў VII, і ў іншых класах. Але вопыт нашых суседзяў паказвае, што трэніровачныя практыкаванні варта выкарыстоўваць ужо ў I — III класах[4]. У сувязі з гэтым асноўныя практыкаванні

---

[1] Колас Я. Збор твораў у 14 т. Мн., 1976. Т. 12. С. 341.

[2] Там жа. С. 350.

[3] Там жа. С. 368—369.

[4] Тоцька Н. І. Фонетика української мови та її вивчення в початкових класах. Київ, 1976; яе ж. Збірник орфоепічних вправ з української мови для 1—3 класів. Київ, 1980.

прыводзяцца ў кнізе без разбіўкі на часткі па прынцыпу, у якім класе іх трэба выкарыстоўваць. Мяркуецца, што выбар можа зрабіць у кожным канкрэтным выпадку сам настаўнік на падставе дыферэнцыраванага падыходу.

Артыкуляцыйныя характарыстыкі гукаў беларускай мовы

Артыкуляцыйныя характарыстыкі гукаў вызначаюцца з улікам работы моўных органаў. Хаця прырода не надзяліла чалавека якімі-небудзь спецыяльнымі органамі, прызначанымі толькі для стварэння вуснага маўлення, але ўмоўна органы цела, якія выконваюць свае прамыя фізіялагічныя функцыі і, акрамя таго, прымаюць удзел і ва ўтварэнні гукаў, называюць моўным апаратам.

Дадатковая сацыяльная нагрузка органаў мовы выпрацавалася ў працэсе ўзнікнення і развіцця мовы.

Маўленчы апарат чалавека складаецца з дыхальнага апарату, у які ўваходзяць лёгкія, бронхі, трахея і з уласна маўленчага апарату (гартань, поласць глоткі, ротавая і насавая поласці). Дыяфрагма, лёгкія, трахея ўтвараюць струмень паветра. Пры фізіялагічным дыханні працягласць удыху і выдыху прыблізна роўная, пры моўным — выдых больш працяглы, чым удых, бо якраз на выдыху і ўтвараюцца гукі мовы. Як вядома, удых для гукаўтварэння амаль не выкарыстоўваецца.

Каб уявіць, як вымаўляюцца гукі на ўдыху, А. І. Падлужны прапаноўвае параўнаць, напрыклад, вымаўленне слова *цаца*, якое ўтвараецца на выдыху, і падзыўное слова для свіней *цо-цо-цо,* што ўтвараецца на ўдыху[1].

Дыхальны апарат забяспечвае працэс маўлення паветрам і энергіяй, неабходнай для яго ажыццяўлення. Дыяфрагма, лёгкія, бронхі, трахея ўтвараюць струмень паветра, якое па дыхальных шляхах выштурхоўваецца з арганізма. Крыніца голасу — галасавыя звязкі — знаходзіцца ў гартані, дзе дзякуючы ім узнікае голас.

Пры тлумачэнні работы органаў мовы можна вы-

[1] Фанетыка беларускай літаратурнай мовы. С. 28.

карыстаць такое яе апісанне: «Калі мы пачынаем гаварыць, то выдыхаем паветра з лёгкіх. Па дыхальнаму горлу яно бяжыць у вузенькую гартань, дзе «жывуць» галасавыя звязкі. Дзіўныя істоты гэтыя звязкі: яны быццам бы баяцца некаторых гукаў. Калі такія гукі ўтвараюцца, звязкі нацягваюцца і пачынаюць дрыжэць. Гэта дрыжанне ператвараецца ў голас.

Звязкі «баяцца», напрыклад, гукаў [*а*], [*о*], [*р*], [*д*]. Затое [*с*] і [*ш*] іх зусім не палохаюць. Калі гэтыя гукі ўтвараюцца, звязкі і не думаюць дрыжэць, таму [*с*] і [*ш*] атрымоўваюцца зусім «безгалосымі».

З вузенькай гартані паветра, якому надакучыла праціскацца праз галасавыя звязкі, з голасам або без голасу, вырываецца на волю і «бяжыць» у рот (вучоныя ў такіх выпадках гавораць: у поласць рота). Так паводзяць сябе амаль усе гукі»[1].

Гартань (лац. larynx) — гэта складаная сістэма храсткоў[2], да якіх прымацаваны галасавыя звязкі. Галасавыя звязкі (якія называюць сапраўднымі ў адрозненне ад несапраўдных) — гэта эластычная абалонка мышачнай тканкі. Мышачныя валокны прымацаваны да шчытападобнага храстка і да галасавых адросткаў пірамідальных храсткоў і накіраваны ад пярэдняй часткі гартані да задняй, дзе яны прымацаваны да чарпалападобных храсткоў. Галасавыя звязкі сыходзяцца ў вугле шчытападобнага храстка і ўтвараюць вуглападобную шчыліну (лац. glottis), накіраваную сваёй пашыранай часткай кпераду. Пры дыханні галасавыя звязкі не напружаны, і паветра свабодна праходзіць у гэтую шчыліну. Пры ўтварэнні голасу яны збліжаны, напружаны і шчыліна паміж імі больш вузкая.

Б. Тарашкевіч у «Беларускай граматыцы для школ» так тлумачыць работу галасавых звязак (якія ён называе «струнамі», «вязямі»): «Галасавыя вязі — гэта два мускулы ў гартані, каторыя, як двое вуснаў, размыкаюцца, змыкаюцца або зусім замыкаюць гартань. Замыкаючыся, яны нацягваюцца падобна да струнаў»[3].

---

[1] Граник Г. Г., Бондаренко С. М., Концевая Л. А. Секреты орфографии. М., 1991.

[2] Фанетыка беларускай літаратурнай мовы. С. 28.

[3] Тарашкевіч Б. Беларуская граматыка для школ. Вільня, 1929. С. 52.

Поласць глоткі (лац. pharynx) размешчана непасрэдна над гартанню. Яна ўяўляе сабой трубку дыяметрам 3 см і глыбінёй 2 см. Пярэднюю сценку глоткі ўтварае надгартаннік і паверхня кораня языка. Верхняя яе частка звязана з поласцю носа. Глотка можа быць аддзелена ад поласці носа мяккім паднябеннем, калі яно паднята і змыкаецца з задняй сценкай глоткі. Задняя сценка ахопліваецца трыма петлепадобнымі мышцамі, якія сціскаюць глотку пры заглытванні ежы. Змяненне з іх дапамогай напружанасці сценак глоткі і яе памераў істотна ўплывае на якасць гукаў.

Паветра з поласці глоткі трапляе ў поласць рота праз праход паміж мяккім паднябеннем (лац. velum palati) і языком, а ў поласць носа праз насаглотку — праход паміж задняй сценкай глоткі і апушчаным мяккім паднябеннем.

Важнейшую ролю ў гукаўтварэнні адыгрывае поласць рота. Яна аддзелена ад поласці носа цвёрдым паднябеннем (лац. palatum durum) і мяккім паднябеннем, якое заканчваецца маленькім язычком (лац. uvula). Пры спакойным дыханні мяккае паднябенне апушчана і адкрывае паветру доступ з глоткі ў рот і ў нос. Пры паднятым мяккім паднябенні паветра трапляе толькі ў поласць рота.

Калі вымаўляюцца ненасавыя гукі, мяккае паднябенне закрывае праход у поласць носа. Пры насавых гуках яно апускаецца, адкрывае гэты праход, і, такім чынам, насавая поласць як дадатковы рэзанатар надае гукам спецыфічную насавую афарбоўку. Самая крайняя частка паднябення, у якой знаходзяцца каранi зубоў, называецца альвеалярным бугром. Альвеолы ўтвараюць як бы ўнутраную частку дзяснаў. Пярэднюю мяжу поласці рота ўтвараюць зубы і губы, з якіх найбольш рухомая ніжняя.

У ротавай поласці самым важным маўленчым органам з'яўляецца язык. Змяненне яго формы, рухі ўперад і назад, уверх і ўніз асабліва неабходны для артыкуляцыі. Задняя частка языка называецца коранем языка, бок, звернуты да паднябення,— спінкай, якую ўмоўна дзеляць на тры часткі: пярэднюю, якая ў становішчы пакою звернута да пярэдніх зубоў і альвеол; сярэднюю, звернутую ў пакоі да цвёрдага паднябення, і мяккую, якая знаходзіцца насупраць мяккага паднябення. У пярэдняй частцы спінкі языка адрозніваюць край языка і яго кончык.

Усе пералічаныя маўленчыя органы можна падзяліць на рухомыя, якія маюць мускулатуру, здольны да самастойных рухаў, і таму гаворачы можа імі свядома кіраваць, і нерухомыя. Першыя з іх называюць актыўнымі органамі маўлення. Да іх належаць ніжнія сківіца, губы, язык, мяккае паднябенне, маленькі язычок (увула), задняя сценка глоткі, надгартаннік, галасавыя звязкі.

Пасіўнымі, нерухомымі органамі маўлення з'яўляюцца зубы, альвеолы, цвёрдае паднябенне, верхняя сківіца.

Адрозненні паміж гукамі абумоўлены характарам рухаў асобных актыўных маўленчых органаў. Якраз актыўныя органы выконваюць усе тыя складаныя, камбінаваныя рухі, якія неабходны для гукаўтварэння. Адны з іх рухаюцца бесперапынна і плаўна, іншыя — вельмі хутка і дынамічна. Пасіўныя органы — нерухомыя, але з імі збліжаюцца або змыкаюцца актыўныя органы.

Кожная мова выпрацавала свае правілы працы моўнага апарату, якія здаюцца носьбітам мовы асабліва зручнымі і мэтазгоднымі. Прыгадаем у сувязі з гэтым радкі з верша Аляксея Русецкага «Роднай зямлі».

Ува мне, ў касцях, вапняк твой цвёрды
і твая шуміць у жылах соль—
мо, таму ў сабе нашу я горда
гонар твой, і голас твой, і боль.
Што я змог і да чаго быў здатны—
дачыненне меў твой лемантар.
Надта ж для яго былі прыдатныя
мой язык, і зубы, і гартань.

На працягу вымаўлення рухі розных органаў увесь час змяняюцца, таму іх становішча апісваецца толькі ў пэўныя моманты часу. Лічыцца, што артыкуляцыя асобнага гука складаецца з трох асноўных фаз: 1) экскурсіі (лац. excursio — пачатак, выхад), г. зн. падрыхтоўкі органаў да гукаўтварэння; 2) вытрымкі, г. зн. захавання імі рабочага становішча і 3) рэкурсіі (лац. recursio — рух назад, вяртанне), або адыходу органаў у пачатковае, нейтральнае становішча. «Можна выбраць і іншыя моманты і ў значна большай колькасці, што забяспечыла б высокую ступень дакладнасці. Але для тых, хто ведае мову і карыстаецца

ёю, падобная інфармацыя ў значнай ступені аказваецца збыткоўнай»[1].

Для каардынацыі рухаў моўных органаў пры звязнай мове неабходна прыслухоўвацца да гучання не толькі свайго маўлення, але і іншых людзей, улоўліваць існую ў іх розніцу і такім чынам выкарыстоўваць слыхавое ўражанне для кантролю і карэкціроўкі.

Найбольш зручна апісваць становішча органаў мовы ў момант вытрымкі, у той фазе, калі прадстаўлены ўсе артыкуляцыі, характэрныя для кожнага гука.

Веданне артыкуляцыі асобных беларускіх гукаў неабходна настаўніку, бо класіфікацыі гукаў з улікам асаблівасцей іх стварэння выкарыстоўваюцца з самых старажытных часоў. Так, ужо ў антычных граматыках гукі падзяляліся на галосныя і зычныя. З фізіялагічнага пункту гледжання гэты падзел абумоўлены тым, што галосныя вымаўляюцца з шырокім раскрыццём рота (у старых граматыках іх называлі «ротаразмыкальнікамі»), а зычныя са слабым («ротазмыкальнікі»). Для галосных уласціва адсутнасць перашкоды, у той час як для зычных характэрнай з'яўляецца наяўнасць такой перашкоды. Заўважана, што пры артыкуляцыі зычных напружанасць выразна лакалізавана ў тым месцы, дзе ствараецца перашкода; тады як пры артыкуляцыі галосных напружанасць размеркавана на вялікай плошчы ўсяго артыкуляцыйнага тракту.

Крыніцай гука пры ўтварэнні галосных з'яўляюцца перыядычныя ваганні паветра, якія ўзнікаюць у выніку дзеяння галасавых звязак. Для таго каб пераканацца, што, калі ўтвараюцца галосныя, паветра праходзіць свабодна, без перашкод, можна зрабіць наступны вопыт. На тупы канец алоўка пакладзіце маленькую, сагнутую ў выглядзе літары *г* паперку. Паднясіце аловак да рота на адлегласць 7—10 сантыметраў і вымавіце галосны гук, напрыклад, [*а*], [*э*]. Паперка не варухнецца. Іншая з'ява назіраецца пры вымаўленні зычных, напрыклад, [*б*], [*ф*]. Паветра сустракае перашкоду, і паперка падае[2].

---

[1] Фанетыка беларускай літаратурнай мовы. С. 33.

[2] Иванова В. А., Потиха З. А., Розенталь Д. Э. Занимательно о русском языке. Л., 1990. С. 7.

Галосныя гукі

Па артыкуляцыйных асаблівасцях беларускія галосныя гукі адрозніваюцца паміж сабой у залежнасці ад рухаў языка і рознага становішча губ.

Галоўную ролю ў артыкуляцыі галосных адыгрывае язык, які можа рухацца ў двух асноўных напрамках: па гарызанталі, што абумоўлівае падзел галосных па раду, і па вертыкалі, з чым звязана адрозненне галосных па пад'ёму. Галосныя, якія ўтвараюцца пры высокім пад'ёме языка да паднябення, калі шчыліна паміж зубамі вузкая, называюцца галоснымі верхняга пад'ёму. А тыя, што ўтвораны пры вельмі нязначным у параўнанні з нейтральным становішчам пад'ёме языка і шырокім праходзе паміж языком і паднябеннем з-за таго, што ніжняя сківіца значна апускаецца і шчыліна паміж зубамі шырокая, называюцца галоснымі ніжняга пад'ёму. Паводле месца пад'ёму языка ў час яго руху па гарызанталі адрозніваюцца галосныя пярэдняга, сярэдняга і задняга рада.

Пры знаходжанні языка ў пярэдняй частцы поласці рота корань яго пасунуты ўперад, кончык ляжыць у ніжніх зубоў, а ўверх звернута і можа быць у той або іншай ступені прыпаднята да цвёрдага паднябення сярэдняя частка спінкі языка, так утвараюцца галосныя пярэдняга рада.

У іншых выпадках кончык языка, адцягнутага назад, адсунуты ад ніжніх зубоў, а задняя частка яго спінкі ў рознай ступені набліжаецца да мяккага паднябення, пры такім становішчы моўных органаў ствараюцца галосныя задняга рада.

Калі зжатае ў гарызантальным кірунку цела языка размешчана ў сярэдзіне поласці рота, а максімальны пад'ём спінкі языка знаходзіцца супраць граніцы паміж мяккім і цвёрдым паднябеннем, ствараюцца галосныя сярэдняга рада. Зразумела, дакладных фізіялагічных граніц, якія аддзяляюць артыкуляцыю галосных аднаго рада ад галосных другога, няма, аднак асноўныя артыкуляторныя тыпы дастаткова выразныя.

Артыкуляцыйна-фізіялагічная класіфікацыя галосных гукаў прадстаўлена на табліцы.

Ва ўтварэнні галосных гукаў важную ролю адыгрываюць губы, што знайшло адлюстраванне ў прыведзенай табліцы.

Удзел губ	Нелабіялізаваныя		Лабіялізаваныя
Пад'ём \ Рад	пярэдні	сярэдні	задні
Верхні (вузкія)	[*і*]	[*ы*]	[*у*]
Сярэдні (сярэднія)	[*э*]		[*о*]
Ніжні (шырокія)		[*а*]	

У школьнай практыцы гэта класіфікацыя не выкарыстоўваецца. Але для пастаноўкі правільнага вымаўлення ў вучняў яе веданне неабходна. Так, нарматыўны гук [*о*] — сярэдняга пад'ёму задняга рада лабіялізаваны (агублены). Але ў маўленні выхадцаў з беларускіх гаворак, якія знаходзяцца на беларуска-польскім сумежжы, сустракаецца менш лабіялізаваны [*о*], што нагадвае [*а*].

Для таго каб выправіць такое памылковае вымаўленне, неабходна параіць вучням больш энергічна выцягваць губы, а таксама з дапамогай люстэрка прасачыць, як працуюць губы пры ўтварэнні розных гукаў.

Дыялектным уплывам тлумачыцца таксама тое, што ў выхадцаў з палескіх гаворак часам гучыць менш напружаны і больш пярэдні [*ы*] (тыпу ўкраінскага гука [*и*]). Пры вымаўленні беларускага [*ы*] язык напружаны, яго пярэдняя частка злёгку адцягнута ад зубоў і высока падымаецца да сярэдзіны паднябення. Наадварот, пры вымаўленні ўкраінскага [*и*] язык расслаблены, прасунуты наперад і трохі ўніз. Таму ў прадстаўнікоў некаторых палескіх гаворак пры аналагічнай артыкуляцыі гучыць [*и*], а ў тым выпадку, калі ён яшчэ і агубляецца, то набліжаецца да [*у*].

Зрух вышэйшага пункта артыкуляцыі ў больш заднюю зону прыводзіць да таго, што ў некаторых прадстаўнікоў паўночна-ўсходніх гаворак [*ы*] пачынае нагадваць [*а*].

У ненаціскным становішчы артыкуляцыі галосных гукаў, як правіла, адрозніваюцца. Так, артыкуляцыя ненаціскнога [*а*] характарызуецца меншай выразнасцю пад'ёму языка і меншай ступенню раскрыцця рота, пры гэтым вышэйшы пункт пад'ёму языка ссоўваецца ў напрамку да сярэдзіны зоны.

На дыялектнай аснове магчымы таксама адхіленні ў вымаўленні [*е*]. Так, у асобных гаворачых гэты гук

можа гучаць як больш вузкі і закрыты і нагадваць [*і*], [*и*], [*ы*]: [*шэ̂рс'ц'і*], [*л'е̂с*], [*хл'э̂п*], што з'яўляецца парушэннем літаратурнай нормы.

З дыферэнцыяцыяй галосных і зычных гукаў, як і з адпаведнымі паняццямі, вучні сутыкаюцца ўжо ў другім класе. Адначасова яны павінны засвоіць і такія звязаныя з галоснымі паняцці, як склад і націск. Праграма не прадугледжвае падрабязнага тлумачэння, на чым заснавана такая дыферэнцыяцыя. Але на частку найбольш простых прыкмет галосных варта звярнуць увагу. Б. Тарашкевіч у «Беларускай граматыцы для школ» зазначае: «Пры вымове галосных гукаў чуваць голас, грудзі дрыжаць. Іх можна доўга цягнуць, пяяць»[1].

Зразумела, што прапанаваны агляд галосных больш падрабязна асвятляе фанетычныя з'явы, чым гэта робіцца ў школьных падручніках (дзе, напрыклад, не звяртаецца ўвага на адрозненні галосных па раду і пад'ёму). Але прапанаваныя заданні (гл. тэму «Галосныя») дапамогуць растлумачыць і канкрэтызаваць фанетычныя з'явы.

У залежнасці ад цяжкасці іх можна прапанаваць вучням розных класаў. Яны могуць абмяркоўвацца на занятках гурткоў і факультатываў па беларускай мове, прапаноўвацца ў якасці пытанняў на лінгвістычных алімпіядах, быць карыснымі для праверкі атрыманых ведаў.

З тых тлумачэнняў асаблівасцей артыкуляцыі галосных, якія можна прапанаваць і вучням, прыгадаем наступныя, прапанаваныя А. Калядой пры пастаноўцы выразнага чытання:

[*і*] — рот раскрыты адвольна, паміж зубамі невялікая шчыліна. Пярэдняя частка языка прыціскаецца да ніжніх пярэдніх зубоў;

[*э*] — рот раскрыты на таўшчыню вялікага пальца, форма губ авальная. Язык трошкі адцягнуты назад і ляжыць каля ніжніх пярэдніх зубоў;

[*а*] — паміж зубамі можна ўставіць два пальцы, пакладзеныя адзін на другі. Язык ляжыць свабодна, пасярэдзіне прадаўгаватае паглыбленне, дакранаецца да ніжніх пярэдніх зубоў;

[*о*] — пры вымаўленні гэтага галоснага ніжняя скі-

[1] Тарашкевіч Б. Беларуская граматыка для школ. С. 46.

віца трошкі апускаецца, губы прымаюць акруглую форму. Язык адцягваецца назад;

[*у*] — губы выцягваюцца ўперад, паміж імі невялічкая шчыліна, якая нагадвае трубачку. Язык адцягнуты назад;

[*ы*] — губы злёгку расцягнуты ў бакі, паміж зубамі можна ўставіць палец. Язык знаходзіцца каля ніжніх пярэдніх зубоў[1].

Звернем увагу на тое, што ў розныя перыяды існавання адна і тая ж мова можа мець розную колькасць галосных. У старажытнабеларускай мове, напрыклад, было 11 галосных. Для параўнання прыгадаем, што ў польскай мове існуе 9 галосных гукаў, у малдаўскай — 7.

Звычайна зычных гукаў у мове ў 3—4 разы больш, чым галосных. (Але ў некаторых каўказскіх мовах налічваецца да 70 зычных і да 2 галосных.)

Зычныя гукі

Зычныя гукі ўтвараюцца з дапамогай шумавой і імпульсна-шумавой крыніц. Артыкуляцыйнай умовай утварэння шуму з'яўляецца ўзнікненне перашкоды або шчыліны, а найбольш агульнай артыкуляцыйнай рысай зычных — узнікненне звужэння або поўнай змычкі галасавых звязак.

Пры класіфікацыі зычных улічваецца некалькі фактараў, што дае магчымасць найбольш поўна ўлічыць усе магчымыя артыкуляцыі і вызначыць якасць кожнага зычнага. Гэта: 1) удзел голасу і шуму (крыніцы гука); 2) спосаб утварэння; 3) месца ўтварэння (дзеючы орган); 4) наяўнасць дадатковай сярэднепаднябеннай артыкуляцыі, якая абумоўлівае мяккасць-цвёрдасць зычных.

Паводле ўдзелу ва ўтварэнні зычных шумавой або галасавой крыніцы гука выдзяляюцца два найбольш буйныя класы зычных: шумныя і санорныя. Зычныя, якія ўтвараюцца шумавой крыніцай, адносяцца да шумных зычных (аб гэтым, дарэчы, красамоўна сведчыць і іх назва). Зычныя, утвораныя з дапамогай галасавой крыніцы (ад перыядычных ваганняў галасавых звязак), адносяцца да санорных. Пры іх артыкуляцыі перашкода нязначная, а паветраны струмень сла-

[1] Каляда А. Выразнае чытанне. С. 25—27.

бы, таму шум амаль што адсутнічае. (Таму па акустычных характарыстыках санорныя бліжэй да галосных.) Санорнымі ў беларускай мове з'яўляюцца [*м*], [*м'*], [*ў*], [*л*], [*л'*], [*н*], [*н'*], [*р*], [*й*]. Усе астатнія зычныя — шумныя. Заўважым, што частка беларусістаў адносяць да санорных таксама [*в*] і [*в'*] (П. Я. Юргелевіч, напрыклад) або лічаць [*й*], [*ў*], [*в*] і [*в'*] — санорна-шумнымі (Л. І. Бурак). У школьнай практыцы мэтазгодна карыстацца больш усталяваным, першым спісам санорных.

Звернем увагу на тое, што дзяленне зычных па ўдзелу голасу праводзіцца двойчы: спачатку вылучаюцца па гэтай прыкмеце дзве буйныя групы зычных (санорныя і шумныя), а потым сярод шумных вылучаюцца звонкія і глухія гукі.



Шумныя зычныя, якія ўтвараюцца з дапамогай толькі шумавой крыніцы гука, называюцца глухімі. Гэта гукі [*п*], [*п'*], [*ф*], [*ф'*], [*т*], [*ц'*], [*с*], [*с'*], [*ц*], [*ш*], [*ч*], [*х*], [*х'*], [*к*], [*к'*].

Калі, акрамя шумавой, у вымаўленні ўдзельнічае галасавая крыніца, утвараюцца звонкія зычныя, да якіх у беларускай мове адносяцца: [*б*], [*б'*], [*в*], [*в'*], [*д*], [*д͡з'*], [*з*], [*з'*], [*д͡з*], [*ж*], [*д͡ж*], [*г*], [*г'*] — шчылінныя і [*ґ*], [*ґ'*] — змычныя (апошнія ў радзе навукова-метадычных выданняў абазначаюцца лацінскімі літарамі [g] і [g']).

Цікавыя заўвагі наконт вымаўлення звонкіх зычных зрабіў Б. Тарашкевіч: «Калі выгаварваем такія зыкі, як *з, ж, д͡з, д͡ж, б, в, д, г, г'*, то вычуваем дрыжэнне галавы і гартані. Галава і гартань дрыжаць ад дрыжэньня галасавых струнаў (галасавых вязяў)...

Калі яны разамкнуты і не нацягнуты, то паветра, праходзячы з лёгкіх, не прыводзіць іх у дрыжэньне, і мы чуем глухія зыкі: *п, ф, х, к, с, ш, ц, ч*»[1].

Блізкі па сэнсу да гэтага апісання вопыт, які прапанавалі рускія педагогі правесці вучням. Вучням раілі заціснуць вушы і вымавіць спачатку гук [*б*],

[1] Тарашкевіч Б. Беларуская граматыка для школ. С. 53.

а потым [*п*]. Вось як быў апісаны вынік вопыту ў пераказе аднаго з вучняў: «Калі я гаварыў [*б*], то ў галаве ў мяне звянела, а калі вымаўляў [*п*], то звону не было. Але шум быў»[1].

Паводле спосабу ўтварэння, г. зн. характару перашкоды і спосабу яе пераадолення, зычныя падзяляюцца на змычныя, шчылінныя, змычна-шчылінныя і дрыжачыя.

Магчымы тры спосабы дзеяння актыўнага органа мовы і, такім чынам, тры тыпы перашкоды: 1) змыканне актыўнага органа з пасіўным, калі моўны канал цалкам закрыты — змычка; 2) збліжэнне актыўнага органа з пасіўным, калі моўны канал звужаны — шчыліна і 3) дрыжанне актыўнага органа ў струмені выходзячага паветра, г. зн. перыядычнае звужэнне і пашырэнне моўнага канала.

Пры ўтварэнні перашкоды адрозніваюць тры фазы артыкуляцыі зычнага:

1. Прыступ, або экскурсія, калі орган маўлення набывае патрэбнае становішча, напрыклад, язык са становішча пакою (або ад артыкуляцыі папярэдняга гука) пераходзіць да становішча пры артыкуляцыі зычнага [*д*] у словах *дом, вада.*

2. Вытрымка, за час якой захоўваецца адносна стабільнае становішча моўных органаў, напрыклад, захоўваецца змычка зычнага [*д*].

3. Водступ, або рэкурсія,— пераход да наступнага гука, напрыклад, ад зычнага [*д*] да зычнага [*ж*] у слове *паджаць,* ад [*д*] да [*а*] у слове *вада.*

Змычнымі называюць зычныя, пры вымаўленні якіх утвараецца змычка органаў моўнага апарату, якая перашкаджае далейшаму руху паветра. Яна звычайна хутка ўтвараецца і хутка знікае. Струмень паветра разрывае створаную органамі мовы перашкоду, і ў выніку ўзнікае выбух. Гэта гукі [*б*], [*б'*], [*п*], [*п'*], [*д*], [*т*], [*к*], [*к'*].

Тыпы змычных зычных адрозніваюцца ў залежнасці ад характару водступу — трэцяй фазы артыкуляцыі. Калі змычка рэзка раскрываецца і адбываецца выбух, узнікаюць змычныя выбухныя. Такімі з'яўляюцца беларускія зычныя ў словах *тата, да.*

Працягласць шуму ў такіх зычных вельмі малая,

---

[1] Иванова В. А., Потиха З. А., Розенталь Д. Э. Занимательно о русском языке. С. 7.

таму яны яшчэ называюцца імгненнымі. Варта звярнуць увагу, што выбухныя [г], [г'] (такія, што гучаць у рускай мове) маюць у беларускай літаратурнай мове абмежаванае ўжыванне.

Падкрэслім, што змычныя зычныя могуць быць і шумнымі, і санорнымі, у якіх размыканне не прыводзіць да ўтварэння відавочнага выбуху. Пры гэтым санорныя часцей з'яўляюцца насавымі, таму што яны павінны мець слабы струмень паветра пры выбуху і слабы шум. Для таго каб стварыліся такія артыкуляцыйныя ўмовы, трэба пры наяўнасці змычкі ў моўным тракце накіраваць паветра ў час вытрымкі ў насавую поласць, тады ў момант раскрыцця змычкі шум фактычна будзе адсутнічаць. У сувязі з гэтым такія гукі яшчэ называюць змычна-праходнымі, бо пры іх вымаўленні адны органы мовы змыкаюцца, а другія ўтвараюць праход для паветра. Калі гэты праход адкрыты ў поласць носа, то ўтвараюцца насавыя зычныя [м], [м'], [н], [н']. (Іх яшчэ называюць назальнымі, лац. nasalis — насавы.) У тым жа выпадку, калі такі праход узнікае па баках языка, атрымліваюцца гукі [л], [л'], якія называюцца латэральнымі (лац. lateralis — бакавы). А. І. Падлужны лічыць, што санорныя больш мэтазгодна раздзяляць на класы па артыкуляцыйных рысах: на насавыя, бакавыя і дрыжачы [р][1].

З характарам перашкоды звязана і вылучэнне шчылінных зычных, што вымаўляюцца пры збліжэнні моўных органаў, у выніку якога ўтвараецца вузкая шчыліна. Праз яе з пэўнай хуткасцю праходзіць паветра, дзякуючы таму, што за шчылінай утвараецца ціск, вышэйшы за ціск паветра ў акаляючым асяроддзі. Ад трэння струменя паветра аб сценкі звужаных органаў узнікае працяглы шум. Таму гэтыя гукі называюцца яшчэ фрыкатыўнымі (лац. fricare — церці). Імі з'яўляюцца: [в], [в'], [ф], [ф'], [з], [з'], [с], [с'], [х], [х'], [г], [г'], [ж], [ш], [ў], [й].

Для таго каб стварыць дастаткова вузкую шумаўтваральную шчыліну, дзеючы моўны орган цалкам закрывае частку моўнага канала. Так, напрыклад, пры вымаўленні гукаў [в] і [ф] ніжняя губа сваёй унутранай часткай датыкаецца да верхніх зубоў, а спераду паміж ніжняй губой і двума пярэднімі цэнтральнымі зубамі ўзнікае вузкая шчыліна. У працэсе ўтварэння губна-

[1] Фанетыка беларускай літаратурнай мовы. С. 60.

губной шчыліны язык адцягваецца назад і некалькі ўзнімаецца ў напрамку да мяккага паднябення.

Да шчылінных адносяцца і гукі [ў̆], [й̆]. Але яны стаяць некалькі асобна. Іх адметнай асаблівасцю з'яўляецца тое, што ў шчыліне відавочнага шуму не ўзнікае. Пры ўтварэнні [ў̆] губы моцна скругляюцца і выцягваюцца наперад, паміж імі і ўтвараецца вузкая шчыліна, праз якую выпраменьваецца гукавая хваля. Акрамя таго, вузкая шчыліна ўтвараецца таксама паміж мяккім паднябеннем і языком. Гук, які ўтвараецца ў выніку вагання галасавых звязак, праходзіць такім чынам праз дзве вузкія шчыліны. Такога гука няма ў рускай літаратурнай мове, і лічыцца, што па характару гучання гэтаму гуку найбольш адпавядае англійскі губна-губны [ẇ].

Звычайна [ў̆] і [й̆] характарызуюцца як санорныя, але ў адмоўных тэрмінах: яны ненасавыя, небакавыя, недрыжачыя. Па форме шчыліны [ў̆], відаць, можна лічыць круглашчылінным, у якім асноўная крыніца досыць слабага шуму — губная шчыліна.

Гук [й̆] існуе ў беларускай мове ў двух варыянтах, якія адрозніваюцца ў залежнасці ад пазіцыі: 1) перад галосным і 2) пасля галоснага перад зычным і перад паўзай.

Перад галосным [й̆] — тыповы зычны шчылінны гук, пры вымаўленні якога краі спінкі языка прыціскаюцца да паднябення і да карэнных зубоў. Плошча прыціскання вельмі вялікая. Язык высока падняты, яго кончык прыспушчаны і знаходзіцца каля ніжняй дзясны, таму паміж паднябеннем і языком утвараецца вельмі вузкая і доўгая шчыліна. Вузкасць шчыліны і абумоўлівае ўзнікненне слабага, не заўсёды ярка выражанага шуму.

Звычайна якой-небудзь прыкметнай мяжы паміж [й̆] і наступным галосным няма.

Варыянт [й̆] пасля галосных перад зычнымі і перад паўзай вызначаецца большай велічынёю шчыліны паміж паднябеннем і языком. Месца ўтварэння шчыліны супадае з месцам найбольшага пад'ёму языка пры вымаўленні галоснага [і]. Розніца паміж імі толькі ў ступені пад'ёму языка. Такі слабы [й̆] адрознівае беларускую мову ад рускай.

У асобную групу вылучаюцца змычна-шчылінныя зычныя. Пры іх утварэнні органы мовы спачатку моцна змыкаюцца, але пры рэкурсіі адбываецца не-

імгненнае плаўнае раскрыццё перашкоды і пры гэтым утвараецца шчыліна і ўзнікае шум. Змычна-шчылінныя зычныя яшчэ называюць афрыкатамі (лац. affricata — прыцёртая). Змычна-шчылінных гукаў у беларускай мове 6: [д͡з'], [ц'], [д͡з], [ц], [д͡ж], [ч]. Як паказвае іх просты пералік, гэта якраз тыя зычныя, якія надаюць беларускай мове своеасаблівае, адметнае гучанне і якія патрабуюць найбольш пільнай увагі пры сваім вывучэнні.

Адрозненні паміж афрыкатамі звязаны ў значнай ступені з якасцю шчыліннага элемента. Кожнаму чыстаму змычнаму адпавядае столькі афрыкат, колькі розных шчылінных артыкуляцый можа быць створана тым жа дзеючым органам.

Змычна-шчылінны характар гукаў [д͡з'], [д͡з] і [д͡ж] перадаецца на пісьме з дапамогай выкарыстання дзвюх літар, адна з якіх звычайна абазначае змычны гук [д], а другая — шчылінныя [з'], [з], [ж]. Б. Тарашкевіч адзначае: «Для гукаў *дз* і *дж* няма асобных літараў, а таму для кожнага ўжываецца па дзве літары. Але трэба ведаць, што вымаўляюцца *д͡з* і *д͡ж* як адзін гук: *д͡зень*, а не *д'зень, сад͡жу*, а не *сад'жу*»[1].

У «Школьнай граматыцы беларускай мовы» Я. Лёсіка[2] прыводзіцца карысная парада ў адносінах да вымаўлення [д͡з']: «хто не ўмее чытаць *«д͡з»*, няхай скажа мяккае *«д»*, тады якраз выйдзе *«д͡з»*.

Адасоблена знаходзіцца з пункту гледжання артыкуляцыі дрыжачы гук [р], які ўтвараецца дзякуючы вібрацыі ў поласці рота языка. Яго яшчэ называюць вібрантам (лац. vibrantis — дрыжачы). Для артыкуляцыі дрыжачага зычнага ў дзеючага органа павінен быць свабодны край. Пры артыкуляцыі [р] кончык языка падымаецца вышэй узроўню верхніх зубоў, злёгку выцягваецца ў напрамку альвеол, задняя частка языка крыху прыўзнята ў напрамку да мяккага паднябення, якое закрывае праход у поласць носа. Ваганні галасавых звязак праходзяць у той час, калі кончык языка робіць вагальныя рухі, то збліжаючыся з паднябеннем, то аддаляючыся ад яго. Часам язык можа дакранацца да паднябення, перашкаджаючы

[1] Тарашкевіч Б. Беларуская граматыка. С. 48.

[2] Лёсік Я. Школьная граматыка беларускай мовы. Менск, 1926. С. 18.

такім чынам на імгненне руху гукавой хвалі. Таму на працягу артыкуляцыі [р] змяняецца сіла гучання ад моцнай, як у галосных (калі кончык языка знаходзіцца на большай адлегласці ад паднябення), да слабай, як у звонкіх зычных, пры набліжэнні кончыка языка да паднябення. Чаргаванне больш моцнага гука са слабым і ўспрымаецца як дрыжанне.

Як ужо гаварылася, якасць зычнага вызначаецца радам фактараў, найбольш важныя сярод якіх можна прадставіць графічна:



Такім чынам, каб больш дакладна вызначыць артыкуляцыю гука, трэба ахарактарызаваць яго з боку працы дзеючых органаў. І ў гэтым выпадку, акрамя крыніцы гука, істотнае значэнне для характарыстыкі і шумных, і санорных зычных мае тое месца ў моўным апараце, у якім яна ўзнікае. Паводле актыўных органаў мовы па месцы ўтварэння перашкоды ўсе зычныя падзяляюцца на губныя (лабіяльныя ад лац. labium — губа), калі актыўны орган — ніжняя губа, і язычныя. Да губных адносяцца [б], [б'], [п], [п'], [м], [м'], [в], [в'], [ф], [ф'].

Да язычных адносяцца ўсе астатнія зычныя. Пры гэтым у залежнасці ад таго, якая частка спінкі языка актыўна артыкулюе, яны падзяляюцца на пярэднеязычныя, сярэднеязычныя і заднеязычныя.

Пярэднеязычныя ўтвараюцца пры актыўным удзеле пярэдняй часткі спінкі языка, якая набліжаецца да пасіўнага органа (зубоў ці паднябення). Гэта гукі [д], [д͡з'], [т], [ц'], [з], [з'], [с], [с'], [д͡з], [ц], [л], [л'], [н], [н'], [р], [ж], [ш], [ч].

Сярэднеязычныя вымаўляюцца пры збліжэнні сярэдняй часткі спінкі языка з цвёрдым паднябеннем. Такі гук у беларускай мове адзін — [й].

Заднеязычныя шумныя ўзнікаюць шляхам збліжэння задняй спінкі языка з мяккім паднябеннем. Гэта гукі [г], [г'], [х], [х'], [к], [к'].

Зрэдку ў беларускіх гаворках сустракаецца яшчэ фарынгальны [ґ], які гучыць больш рэгулярна ва ўкраінскай мове. Ён утвараецца пры збліжэнні задняй

сценкі глоткі з коранем языка (грэч. pharynx, pharyngos — глотка).

Калі ўлічыць пры характарыстыцы гукаў яшчэ і пасіўны орган, то атрымаецца яшчэ больш падрабязнае апісанне ўсіх зычных. Так, сярод губных вылучаюцца дзве разнавіднасці гукаў: губна-губныя, або білабіяльныя (лац. bi ад bis — двойчы і labialis — губны), і губна-зубныя, або лабіядэнтальныя (лац. labium — губа і dens, dentis — зуб).

Ва ўтварэнні губна-губных гукаў ніжняя губа з'яўляецца актыўным органам, а верхняя — пасіўным, бо ніжняя губа збліжаецца з верхняй. Губна-губныя гукі [*б*], [*б'*], [*п*], [*п'*], [*м*], [*м'*], [*ў*].

Губна-зубныя гукі вымаўляюцца пры збліжэнні актыўнай ніжняй губы з пасіўнымі верхнімі зубамі, гэта гукі [*в*], [*в'*], [*ф*], [*ф'*].

Сярод пярэднеязычных паводле пасіўнага органа адрозніваюцца зубныя, альвеалярныя, дарсальныя і пярэднепаднябеннадэнтальныя. Гэта [*т*], [*д*], [*с*], [*з*], [*н*], [*р*], [*л*], [*л'*], [*ц*], [*д͡з*]. Пры іх вымаўленні кончык языка або змыкаецца з верхнімі зубамі, або не датыкаецца да іх, і тады паміж ім і зубамі ўтвараецца шчыліна.

Гук [*р*] адносіцца да альвеалярных, бо пры дрыжанні кончык языка набліжаецца да альвеол або нават да зааль веалярнай зоны. Астатнія пярэднеязычныя з'яўляюцца спінкавымі, або дарсальнымі (лац. dorsalis — спінкавы). У свісцячых [*з'*], [*с'*], [*д͡з'*], [*ц'*], [*ц*] месца артыкуляцыі па пасіўнаму органу ссунута ў зааль веалярную пярэднепаднябенную зону. Да пярэднепаднябенных адносяцца таксама шыпячыя [*ш*], [*ж*], [*ч*], [*д͡ж*].

Сярэднеязычныя гукі вымаўляюцца пры збліжэнні сярэдняй часткі спінкі языка з цвёрдым паднябеннем. У беларускай мове такім з'яўляецца [*й*]. Набліжаюцца да яго яшчэ мяккія [*к'*], [*х'*], [*г'*].

Заднеязычныя [*к*], [*г*], [*х*] узнікаюць пры збліжэнні задняй часткі спінкі языка з мяккім паднябеннем. Таму паводле пасіўнага органа іх называюць заднепаднябеннымі, або велярнымі (лац. velaris — заднепаднябенны).

Па прыкмеце мяккасці-цвёрдасці зычныя беларускай мовы падзяляюцца на два вялікія класы, што абумоўлена наяўнасцю ў мяккіх зычных дадатковай артыкуляцыі, пры якой сярэдняя частка спінкі языка

падымаецца да цвёрдага паднябення, ад чаго значна павышаецца тон і шум.

Да цвёрдых зычных адносяцца: [б], [п], [м], [в], [ў], [ф], [д], [т], [з], [с], [д͡з], [ц], [л], [н], [р], [ж], [ш], [дж], [ч], [г], [х], [к].

Мяккімі з'яўляюцца [б'], [п'], [м'], [в'], [ф'], [д͡з'], [ц'], [з'], [с'], [л'], [н'], [й], [г'], [х'], [к'].

Асаблівасцю беларускай мовы з'яўляецца прысутнасць у ёй побач з зычнымі звычайнай працягласці і падоўжаных зычных. Падаўжацца могуць гукі [д], [т], [д͡з'], [з], [з'], [с], [с'], [ж], [ш], [ц], [ц'], [ч], [н], [н'], [л'], [б], [б'], [п], [п'], [к], [к'], [в]. Напрыклад: *а*[*д:*]*алены, а*[*т:*]*алы,* [*з:*]*аду, пало*[*з':*]*е, адзіна*[*ц:*]*аць, каме*[*н:*]*ы* і г. д.

Больш падрабязна артыкуляцыя беларускіх гукаў разгледжана ў наступных працах: Падлужны А. І., Чэкман В. М. Гукі беларускай мовы. Мн., 1973; Фанетыка беларускай літаратурнай мовы: Зб./Пад рэд. А. І. Падлужнага. Мн., 1989; Кривицкий А. А., Михневич А. Е., Подлужный А. И. Белорусский язык для говорящих по-русски. Мн., 1990.

Прыведзеныя табліцы (стар. 37, 49) можна выкарыстоўваць як даведачныя, бо ў іх адлюстраваны класіфікацыі беларускіх гукаў, праведзеныя з улікам розных фактараў.

Пры выпрацоўцы артыкуляцыйных навыкаў у час вывучэння канкрэтных гукаў можна выкарыстоўваць:

1) апісанне артыкуляцыі, пры якім настаўнік паведамляе аб асноўных момантах дзейнасці органаў маўлення з дапамогай адпаведных схем, табліц, малюнкаў;

2) дэманстрацыю артыкуляцыйнага эталона з выкарыстаннем фоназапісаў;

3) дэманстрацыю схемы і слоўнага апісання з наступнай рэалізацыяй артыкуляцыйнага эталона настаўнікам.

Навучанне артыкуляцыі ізаляваных гукаў і складоў не павінна займаць шмат часу, і варта пераходзіць да слоў. У слове кожны гук змяняе свае артыкуляцыйныя і акустычныя ўласцівасці пад уплывам суседніх гукаў. На якасць галосных значна ўплываюць цвёрдыя губныя гукі і ўсе мяккія зычныя. Калі вылучыць з дапамогай тэхнічных сродкаў [а] пасля мяккіх зычных, то

яго гучанне будзе бліжэй да [э], чым да [а] пасля цвёрдых зычных.

Вялікія змены гукаў у слове адбываюцца ў спалучэнні зычных з зычнымі і галосных з галоснымі. Яны адначасова паказваюць гістарычныя працэсы, увідавочніваюць гукавыя асаблівасці мовы на сучасным этапе і даюць магчымасць рабіць прагноз развіцця фанетычнай сістэмы ў будучым.

Для замацавання і ўдасканальвання вымаўленчых навыкаў у звязнай мове трэба выкарыстоўваць словы, якія больш, чым у звычайным маўленні, насычаны пэўным гукам. Такімі з'яўляюцца гукаперайменальныя словы, скорагаворкі, радкі з вершаў і прымавак, у якіх выкарыстаны з творчымі мэтамі алітэрацыі на пэўныя гукі. Засваенне такіх складаных моўных урыўкаў дапамагае пераўтварыць з цягам часу нязвыклыя артыкуляцыі ў прывычныя.

Пастаноўка вымаўлення кожнай катэгорыі гукаў мае сваю спецыфіку, але агульнымі правіламі пры пастаноўцы артыкуляцыі ізаляваных зычных гукаў з'яўляюцца наступныя: 1) спачатку засвойваюцца прамыя адкрытыя склады, дзе пасля зычнага ідуць галосныя гукі; 2) потым спалучэнні гукаў тыпу «галосны + зычны»; 3) на трэцім этапе праводзіцца параўнанне блізкіх складоў з зычнымі, якія розняцца паміж сабой толькі адной фанетычнай рысай, напрыклад, «цвёрды зычны + галосны» і «мяккі зычны+галосны», «глухі зычны+галосны» і «звонкі зычны + галосны», а таксама папарнае вымаўленне ўжо засвоенага спалучэння з новым.

Правільнае вымаўленне адных гукаў залежыць ад пастаноўкі іншых. Так, каб правільна загучалі змычна-шчылінныя мяккія [$\widehat{дз}$'] і [ц'], трэба навучыцца добра вымаўляць [з'] і [с']. Разам з тым правільнае вымаўленне [ц'] — спрыяльная ўмова для пастаноўкі [$\widehat{дз}$'].

Удасканаленне артыкуляцыі праходзіць на аснове практыкаванняў, якія сістэматызаваны па артыкуляцыйных рысах зычных. Частка практыкаванняў накіравана на тое, каб вучні лепш зразумелі ролю і работу асобных моўных органаў.

Для агульнага гучання беларускай мовы вельмі важнай з'яўляецца правільная пастаноўка цвёрдых і мяккіх зычных гукаў. З імі на ўроках беларускай мовы знаёмяцца ўжо першакласнікі. Вучні павінны

Артыкуляцыйна-фізіялагічная класіфікацыя зычных па актыўнаму органу

Па спосабу ўтварэння крыніцы гука		Па месцы ўтварэння	Губныя		Язычныя					
			цвёрдыя	мяккія	пярэднеязычныя			сярэднеязычныя	заднеязычныя	
					апікальныя		дарсальныя мяккія		цвёрдыя	мяккія
					цвёрдыя	мяккія				
Шумныя	змычныя	глухія	*п*	*п'*	*т*				*к*	*к'*
		звонкія	*б*	*б'*	*д*				*g*	*g'*
	шчылінныя	глухія	*ф*	*ф'*	*с, ш*		*с'*		*х*	*х'*
		звонкія	*в*	*в'*	*з, ш*		*з'*	*й*		
	змычна-шчылінныя	глухія			*ц, ч*		*ц'*			
		звонкія			*д͡з, д͡ж*		*д͡з'*			
Санорныя	насавыя		*м*	*м'*	*н*		*н'*			
	ротавыя	дрыжачы			*р*					
		плаўныя	*ў*		*л*	*л'*		*й*		

засвоіць вызначэнне гэтых катэгорый гукаў, папрактыкавацца ў іх выдзяленні са слоў, потым даведацца, якія гукі ў беларускай мове маюць сабе парныя па цвёрдасці-мяккасці, а якія бываюць толькі цвёрдымі. Пры пашыраным беларуска-рускім двухмоўі для лепшага разумення гэтай тэмы неабходна факты беларускай мовы параўноўваць з фактамі рускай мовы. Пошукі новых методык выкладання мовы паказваюць, што лепш звяртацца не толькі да памяці дзяцей, але «неабходны іншы падыход, іншы змест урока. Варыянтаў тут можа быць мноства (у залежнасці ад вучэбнай тэмы, ведаў аб прыродзе вучэбнага прадмета самога педагога, яго таленту, майстэрства данесці гэтыя веды сваім вучням і г. д.), але сутнасць адна: пазнаёміць дзяцей з агульным законам і навучыць іх карыстацца ім»[1].

Узор урока, пабудаванага з улікам гэтых меркаванняў, прыводзіцца ў раней ужо цытаванай кнізе «Дар слова: говорим по-русски... Гаворым па-беларуску...»: «Тэма нашай працы на ўроку — «Цвёрдыя і мяккія гукі». Цвёрдымі і мяккімі гукамі мы карыстаемся ўвесь час, толькі не звяртаем на іх увагі. А ў нашай з вамі мове гэта вельмі важныя гукі: яны адрозніваюць словы. Вось я назаву цвёрды гук [*н*]. Назавіце і вы яго, паслухайце, як ён гучыць. А зараз назавём слова з гэтым гукам, напрыклад *нос*. Але ёсць яшчэ і мяккі гук [*н'*]. Назавіце яго і паслухайце, як ён гучыць. Што атрымаецца, калі ў слове *нос* я замяню цвёрды гук [*н*] на мяккі [*н'*]? А атрымаецца зусім іншае слова. Давайце разам з вамі яго вымавім: [*н'ос*].

Я вымаўляю цвёрды гук [*л*]. А вы назавіце прадмет, на якім ляжаць мае кніжкі, за якім я пішу. Гэта — [*стол*]. У канцы слова гучыць цвёрды [*л*]. Вымавіце мяккі гук [*л'*]. А цяпер у слове *стол* заменім цвёрды [*л*] на мяккі [*л'*]. Якое слова атрымалася? Скажам усе разам: [*стол'*].

Праўда, цікавыя гэтыя гукі: яны і падобныя і розныя, і іх заўсёды два — адзін мяккі, другі цвёрды. Ведаеце чаму?

Таму, што гукі жывуць згодна закону і строга яго прытрымліваюцца. А закон гэты такі: калі ёсць адзін гук, павінен абавязкова быць другі гук, але супраць-

[1] Савельева Т. М., Еленский Н. Г. Дар слова: говорим по-русски... Гаворым па-беларуску... С. 56.

леглы. Ведаеце, на што гэта падобна ў нашым жыцці: ёсць раніца, а ёсць — вечар, ёсць дзень і ёсць, падказвайце мне,— ноч, бывае дом вялікі і бывае... маленькі. Так і ў жыцці гукаў: мы называем цвёрды гук і ведаем, што ёсць яшчэ і адпаведны яму мяккі гук.

Паспаборнічаем, які рад лепш будзе называць гукі.

Першы рад, падрыхтуйцеся. Я называю цвёрды гук, а вы — мяккі, а калі я назаву мяккі, вы назавяце цвёрды. Адказ рыхтуйце ўсе разам, шэптам абмяркоўвайце паміж сабой, а назваць ваш адказ даручыце каму-небудзь з вучняў вашага рада. Адказваць вы павінны хутка, пакуль я павольна палічу да трох. Гатовы? Слухайце: [*дом*]. Тут гучыць [*д*] цвёрды; параўнайце [*ідзём*]. Назавіце мяккі гук. Раз, два, тры! Слухаем адказ: [*д͡з'*]. Малайцы! Ну, калі ў вас атрымаўся такі цудоўны адказ, задам вам яшчэ адно пытанне: «Мовы беларуская і руская блізкія, вы іх разумееце, і закон для гукаў дзвюх моў адзін і той жа: і ў рускай мове павінны быць цвёрдыя і мяккія гукі. Дык вось пры вымаўленні слова *ідзём* па-руску [*ид'о́м*] ці чуваць там побач з [*д'*] і гук [*з'*] альбо толькі [*д'*]»? — «Чуваць толькі [*д'*]».— «Правільна». Значыць, цвёрды [*д*] ёсць і ў беларускай, і ў рускай мовах, а вось мяккія вымаўляюцца крыху па-рознаму. Пакажам, як: [*д'*] — [*д͡з*].

Паслухаем цяпер, як будзе адказваць другі рад. Другі рад, вы гатовы? Слухайце: [*кал'а ты́ну*], параўнайце: [*на са́жалцы з'б'ірáл'і ц'і́ну*]: [*ты́ну*] — я вымаўляю цвёрды [*т*], назавіце мяккі ў слове [*ц'і́ну*]. Раз, два, тры! Слухаем адказ: [*ц'*]. Выдатна. Вы таксама вельмі добра адказалі, таму задам вам яшчэ адно пытанне: «Пры вымаўленні слова *ціна* па-руску мы вымаўляем гук [*ц'*], як у беларускай мове, альбо гук [*т'*]?» Вымавіце ўслых, прыслухайцеся: [*т'и́на*]. Гукі розныя, значыць, цвёрды [*т*] ёсць і ў рускай (падказвайце мне, і будзем гаварыць разам), і ў беларускай мовах, а мяккія гукі розныя: у рускай (падказвайце мне) — [*т'*], а ў беларускай — [*ц'*].

Трэці рад, увага! Слухайце: [*мы́шка*], параўнайце [*м'і́шка*] (мядзведзь). Назавіце і цвёрды, і мяккі гук. Раз, два, тры! Слухаем ваш адказ: [*м*] — [*м'*]. Малайцы! Дадаткова вам за гэта заданне: паўтарыце ўсе гукі, якія мы называлі: [*д*] і [*д͡з'*], [*т*] і [*ц'*], [*м*] і [*м'*].

А зараз я назаву такія гукі, над якімі мы падумаем

усе разам. Увага! Гук [*р*] — [*рака́*], гук [*ч*] — [*чы́сты*]. Вымавіце гэтыя гукі мякка: [*р'*], [*ч'*]. Напэўна, вы здагадаліся, што ў беларускай мове слоў з такімі гукамі няма. Можа, хто-небудзь са мной паспрачаецца і паспрабуе назваць такія словы? Не атрымліваецца. Але ж мы з вамі помнім закон, што цвёрдыя гукі абавязкова павінны мець адпаведныя мяккія. Можа, гукі [*р*] і [*ч*] не слухаюцца гэтага закону? Такога паміж гукамі не бывае. Мяккія [*р'*] і [*ч'*] ёсць, але толькі не ў беларускай мове. Вымавім словы *рака́, чы́сты* па-руску: [*р'эка́*], [*ч'и́сты*]. Чуеце, як мякка гучаць [*р'*] і [*ч'*]? Што здарылася з мяккімі [*р'*] і [*ч'*] у беларускай мове? Яны раней, вельмі даўно, былі, але потым зацвярдзелі і сталі такімі ж, як цвёрдыя [*р*] і [*ч*]»[1].

Для таго каб дзеці спецыяльна не завучвалі гукі — цвёрдыя і мяккія, але на прыкладах, з пэўнымі словамі спрабавалі асэнсаваць, калі гучыць мяккі гук, а калі — цвёрды і для чаго патрэбны мове такія процілегастаўленыя зычныя гукі, і на іншых уроках варта аналізаваць пары слоў, што змяшчаюць па аднаму рознаму (цвёрдаму ці мяккаму) гуку, але маюць рознае значэнне. Напрыклад, *лог — лёг, лысы — лісы, ліска — Лыска, цэла — цела, быць — біць, маса — мяса.*

Вышэйпададзены ўзор гутаркі і заняткі з пералічанымі парамі слоў могуць быць уключаны настаўнікам як фрагмент урока.

Аналагічна з такой гутаркай можна пабудаваць размову пра глухія і звонкія зычныя, бо ў беларускай мове існуе шмат слоў, якія адрозніваюцца толькі глухасцю-звонкасцю зычнага і маюць розныя значэнні: *пас — бас, піць — біць, шыр — жыр, жыць — шыць, жах — шах, жар — шар, дапіць — тапіць, Тома — дома, дамы — тамы, Дзіма — Ціма, двор — твор, гоні — коні, год — кот, голы — колы, колас — голас, кошка — Гошка, забор — сабор, садраць — задраць, світа — звіта, сляпіць — зляпіць, смок — змог, сорак — зорак.*

Аднак, як падкрэсліваюць Т. М. Савельева і М. Г. Яленскі, «факты навукі, у якой бы прапорцыі, большай ці меншай, ні падаваліся ў падручніку, праблемы не вырашаць. Неабходны падручнікі і адпаведна

[1] Савельева Т. М., Еленский Н. Г. Дар слова: Говорим по-русски... Гаворым па-беларуску... С. 57—58.

такія ўрокі ў школе, калі б даследаваліся універсальныя законы той або іншай галіны ведаў, а правілы выводзіліся з дзеяння гэтых законаў»[1].

Практыкаванні

Органы маўлення. Артыкуляцыя

1. Прачытайце, як утвараюцца гукі.

Здаецца, што гаварыць лёгка: гукі, словы і нават цэлыя фразы быццам бы самі выскакваюць у нас з рота. У сапраўднасці ўсё не так проста: у нашым арганізме ў гэты час працуе цэлы «завод» па вытворчасці гукаў. Замест станкоў на «заводзе» — органы мовы. А гукі — сапраўдныя «эксплуататары». Толькі для таго, каб гук з'явіўся на свет, працуюць лёгкія, дыхальнае горла, гартань, рот, нос, губы, язык. Гэта і ёсць органы мовы. Ім усім хапае работы! А нашы вушы — кантралёры. Яны заўсёды на варце: ледзь чалавек не так вымавіў у слове гук — вуха адразу пачуе. Менавіта вуха паведамляе нам: гэта гаворыць іншаземец, у яго акцэнт. *(Паводле Г. Г. Гранік, С. М. Бандарэнка, Л. А. Канцавой. Сакрэты арфаграфіі.)*

2. Якія органы маўлення згаданы ў наступных устойлівых словазлучэннях, фразеалагізмах і прымаўках? Што значаць прыведзеныя выразы?

Гаварыць з пенай на губах. Зляцець з языка. Трымаць язык за зубамі. Язык аб зубы біць. Язык і Кіева дапытаецца. І жала, і прала, і ткала, а ўсё языком. Выказанага слова за губы не вернеш.

3. Металічны стрыжань у звоне называецца языком. Чаму? Прачытайце наступны верш.

Марыі ноччу сніўся сон:
У падводным царстве чуцен звон...
Цячэ няспынна плынь па дне,
Язык пагойдвае ў зване. *(Аўрамчык.)*

Што агульнага, на вашу думку, у рабоце языка ў ротавай поласці і языка ў звоне?

[1] Савельева Т. М., Еленский Н. Т. Дар слова: Говорим по-русски... Гаворым па-беларуску... С. 56.

4. Прачытайце загадку, адгадайце яе. Як яна магла ўзнікнуць?

За сцяною касцяною Талалай брэша. *(Язык.)*

Які орган мовы параўноўваюць з касцяной сцяной, які — з сабакам за плотам? (Талалай — мянушка сабакі.)

5. Чаму чалавека лепш разумееш, калі бачыш яго твар? Ці закрываецца рот зусім пры маўленні? Прасачыце, колькі разоў рот прыадкрываецца і колькі разоў закрываецца ў аднаскладовых, двухскладовых і трохскладовых словах: *кот, ноч; шыба, нага; раніца, бяроза.*

6. Параўнайце значэнне наступных дзеяслоўных фразеалагізмаў са значэннем аманімічных свабодных словазлучэнняў. Што можна і што нельга зрабіць языком? з языком?

Мазоліць язык — 'упустую, дарэмна гаварыць'
мазоліць можна рукі, ногі, на языку мазалі не бываюць

Малоць языком — 'балабоніць, балбатаць, гаварыць абы-што'
малоць можна жорнамі, язык нічога не можа размалоць

Мыць языкамі — 'абгаворваць'
мыць сябе языкамі, г. зн. вылізваць, могуць кошкі

Пляскаць языком — 'гаварыць многа і абы-што'
пляскаць можна ў далоні:

Зайка скача, плешча ў лапкі:
— Я такой не бачыў шапкі. (А. Александровіч.)

Праглынуць язык — 'замаўчаць, перастаць гаварыць'
праглынуць можна ежу, слізну, а не язык

Прыкусіць язык — 'раптоўна замаўчаць, устрымацца ад выказвання'
пры паспешлівай ядзе да крыві прыкусіць язык

Развязаць язык (каму?) — 'прымусіць разгаварыцца, расказаць сакрэт, тайну'; 'пачаць шмат гаварыць пасля маўчання'
развязаць можна звязаныя



7. Якія якасці мовы чалавека акрэсліваюць наступныя прыметнікавыя фразеалагізмы? Якое значэнне маюць прыметнікі ў гэтых выразах? Назавіце іх прамое значэнне. Які орган мовы прыгадваецца ў выразах?

Языка няма. Бойкі на язык. Востры на язык. Лёгкі на язык. Слабы на язык.

Даведачны матэрыял. Пра маўклівага чалавека, пра чалавека, які не ўмее складна, добра гаварыць. Знаходлівы ў размове, красамоўны. Пра чалавека, які ўмее дасціпна, колка сказаць. Гаваркі, які любіць многа гаварыць. Балбатлівы, нестрыма́ны, які не можа захоўваць тайну.

8. Што абазначаюць наступныя фразеалагізмы са словам *язык*? Дайце разгорнутае апісанне значэння.

Доўгі язык (у каго?). Злы язык (у каго?).

Даведачны матэрыял. Хто-небудзь вельмі балбатлівы, гаворыць многа лішняга. Хто-небудзь злосна, з'едліва, з насмешкай гаворыць аб кім-небудзь.

9. Як трэба разумець сэнс наступных выразаў са словам *язык*? Чаму ў іх ужываецца гэта слова?

Не спускаць з языка. Не сыходзіць з языка. Папасціся на язык. Пацягнуць за язык. Просіцца на язык. Сарвацца з языка. Трапіць на язык. Трымаць за язык. Узбрысці на язык. Цягнуць за язык.

10. Якое значэнне маюць наступныя фразеалагізмы са словам *язык*? Чаму яны ўтварыліся? Якія яшчэ фразеалагізмы з гэтым словам вы ведаеце?

Цяляты язык аджавалі (ад'елі). Чорт пацягнуў за язык. Язык адняўся. Язык гладка ходзіць. Язык добра падвешан. Язык заплятаецца. Язык не завяжаш. Язык не паварочваецца. Язык прысох. Язык развязаўся. Язык свярбіць.

Галосныя гукі

11. Якія гукі расцягваюцца пры спевах для захавання мелодыі? Галосных гукаў у мове менш, але яны часцей паўтараюцца. Ёсць словы, у якіх адзін і той жа галосны паўтараецца да 7 разоў. Прыдумайце такія словы. Напрыклад, *тата* — 2 [*а*]; *патака* — 3 [*а*]; *патапатаць* — 4 [*а*].

12. У адной з граматык пачатку нашага стагоддзя В. А. Багародзіцкі падзяліў усе гукі, зыходзячы з таго, як яны вымаўляюцца, на дзве вялікія групы: «ротаразмыкальнікі» і «ротазмыкальнікі». Якія групы гукаў меліся на ўвазе? Колькі «ротаразмыкальнікаў» і «ротазмыкальнікаў» ёсць у наступных словах: *боб, тата, машына, перасыпка*?

13. Заўважаецца, што, чым гучней мы імкнёмся вымавіць «ротаразмыкальнікі», тым больш трэба раскрываць рот. І наадварот: калі мы вымаўляем «ротазмыкальнікі», то павінны больш энергічна яго закрываць.

Паспрабуйце як мага гучней вымавіць наступныя словы і прасачыце, пры вымаўленні якіх гукаў органы маўлення (губы, язык, паднябенне, сківіцы) змыкаюцца і пры якіх размыкаюцца.

А-а-а!
Ау! О! У! Бр! Хм! С-с!

14. Калі чалавек гаворыць з асаблівым пачуццём, то ён вельмі моцна і працягла вымаўляе некаторыя гукі. Якія гэта гукі? Якія пачуцці выражаюцца паўторамі або працяглым вымаўленнем галосных і зычных гукаў?

Яка-а-а-я вялі-і-ізная! Які паўню-у-уткі! Ж-жах! [*С'-с'*]пёка! Д-д-урніца!

15. Якія галасы жывёл і птушак вы можаце пераймаць? Якія гукі можна вымавіць працяжна ў наступных гукапераймаццях: *Гаў-гаў! Мяў! Му-у! Кра-а! Ціў!*? Галасы якіх жывёл і птушак звычайна так пераймаюць?

16. Для гукапераймання спеваў некаторых птушак у натуралістаў існуе набор спецыяльных «птушыных» слоў, якія перадаюць такія спевы. Вызначце, якімі галоснымі карыстаюцца для гэтай перадачы:

вальдшнэп — *кхру-кхру, кхру-кхру, кхруфіст...;*
аўсянка — *сінь-сінь-сінь-сінь-сінь-сінь-сііі...;*
жаваранак — *ціррірррірлюю, ціррірррірлюю...;*
сініца — *пінь, пінь, пінь! Ціці-ся, ціці-ся....*

Чым адрозніваюцца такія «птушыныя» словы ад звычайных? Ці маюць яны значэнне? Які галосны абазначае больш нізкі голас вальдшнэпа? Які — больш высокія галасы аўсянкі, жаваранка, сініцы?

17. Ва ўрачэбным кабінеце быў запісаны такі дыялог.

— Марына, скажы: «А-аа!»
— Чаму «А»? Я і іншыя гукі ведаю.

Чаму звычайна, каб паглядзець хвораму горла, прапануюць вымаўляць галосны гук [*а*]? І нязручнымі для такіх мэт аказваюцца гукі [*і*], [*у*], [*о*]? (Пры адказе на гэта пытанне трэба звярнуць увагу на становішча вуснаў і языка пры вымаўленні кожнага з гукаў.)

18. Прыдумайце спачатку некалькі пар слоў, якія адрозніваюцца толькі галоснымі гукамі і маюць рознае значэнне *(дом — дам — дым, вораны — вараны)*, а потым некалькі такіх жа пар, у якія ўваходзяць словы, што адрозніваюцца па сэнсу і зычнымі гукамі *(гара — кара, зуб — дуб, кот — рот — пот)*. Якія пары слоў падабраць лягчэй? Чаму?

19. Адгадайце загадку. Запішыце адгадкі. Да кожнага са слоў-адгадак падбярыце слова, якое адрозніваецца ад іх галосным гукам.

З «л» —
Я мэблю пакрываю,
З «б» —
Я вадкасці змяшчаю,
З «м» —
Расту я на градзе,
З «р» —
Сустрэнеш у вадзе. *(І. Курбека.)*

Адгадкі: лак — бак — мак — рак. [Лак — лік — люк; бак — бок — бык — бук; мак — мок — мук; рак — рок — рук — рык.]

20. Адгадайце загадкі. Запішыце адказы. Якім чынам змяніліся колькасць і парадак гукаў? галосных? зычных? Якое месца яны занялі ў слове?

1. Снарад спартыўны.
   Змяні ты
   Слова вязь —
   І, як ні дзіўна:
   Вялікі рускі князь. *(І. Курбека.)*

2. Згадай: ужо даўным-даўно
   я мерай даўжыні лічуся.
   А дапішы мне толькі «о» —
   чыгункаю падземнаю зраблюся. *(У. Бурсаў.)*

Адгадкі: 1) гіра — Ігар; 2) метр — метро.

21. Адгадайце загадкі. Запішыце адказы. Ці адрозніваюцца па гуках словы-адказы? Якое месца займаюць адны і тыя ж гукі ў словах?

1. Слова
   Спераду чытаеш —
   Ім
   Паветра
   Ты ўдыхаеш.
   А чытаеш
   Слова
   Ззаду —
   Адпачыць
   Заўсёды рады. *(І. Курбека.)*

2. Даю я ў спёку цень табе,
   Мяне ты летам часта хваліш.
   Парадак літар памяняй —
   І цэлы лес ты мною звалiш.

3. Кусаю я людзей, скаціну,
   Звіню над вухам надта нудна.
   Паставіш *р* у серадзіну —
   Мяне ты зробіш часткай судна.
   Парадак літарам змяніць —
   На судне буду я служыць. *(В. Паўлоўская.)*

Адгадкі: 1) нос — сон; 2) ліпа — піла; 3) камар — карма́ — марак.

22. Гукі [*а*] і [*э*] у наступных словах вымаўляйце дакладна і выразна ў націскных і ненаціскных складах. Сачыце за тым, каб [*а*] і [*э*] у ненаціскных складах пасля цвёрдых зычных не нагадвалі [*ы*].

Нага, вада, раса, сады. Мора — марак, дрэмле — драмлю, цэгла — цагляны, сэрца — сардэчна, рэбры — рабро.

23. Выразна прачытайце прыведзеныя беларускія і рускія словы. Якая розніца існуе ў вымаўленні гукаў, абазначаных выдзеленымі літарамі?

Гл*ы*ток — гл*о*ток, кр*ы*ві — кр*о*ви, бл*ы*ха — бл*о*ха, кр*ы*шыць — кр*о*шить.

С*а*бака — с*о*бака, м*а*л*а*ко — м*о*л*о*ко, п*а*ра — п*о*ра, б*а*бы — б*о*бы, ст*а*лы — ст*о*лы, т*а*ўст*а*ваты — т*о*лст*о*ватый, в*а*лы — в*о*лы, м*а*л*а*ды — м*о*л*о*дой, к*а*рова — к*о*рова.

Бр*ы*зент — бр*е*зент, тр*ы*вога — тр*е*вога, р*ы*зіна — р*е*зина, р*ы*сора — р*е*ссора.

24. Прачытайце словы. Выразна вымаўляйце [*а*], [*ы*] у ненаціскных складах.

Бачок — бычок, ласуха — лысуха, расісты — рысісты, садзіць — судзіць.

Кажух, рысянё, рыхлаваты, выткаць, вытанчыць.

25. Прачытайце ніжэйпрыведзеныя групы слоў. Пры вымаўленні [*у*] энергічна выцягвайце губы ўперад. Сачыце за дастаткова напружаным агубленым вымаўленнем [*о*] з тым, каб яно выразна адрознівалася ад [*а*], а таксама за выразным гучаннем [*э*], [*а*], [*ы*].

Мох — мух — мах, сом — сум — сам, мора — Мура — мара, бак — бок — бук, вол — вал — выў, дом — дам — дум — дым, гол — гул — гал, пар — пор — пэр, кат — кот — кут, тупаць — тэпаць, топкі — тупкі — тапкі, стук — стык, так — ток — тук — тык.

26. Прачытайце словы, выразна вымаўляйце [*а*] пасля мяккіх зычных у ненаціскных складах з тым, каб яно не набліжалася да [*і*] і [*э*].

Бягом, бяда, бялець, вязаць, вялікі, вярнуць, дзядуля, дзяліць, зямля, пяро, пявуння, пякота, пянёк, сяброўка, сядзець, сямёра, сярдзіты, уцягнуць, уцякаць, уцяпліць.

27. Прачытайце словы, у паслянаціскных складах выразна вымаўляйце [*а*], [*э*].

Певень, палец, палёгеньку, памяць, па-цяперашняму, высяленец, восень, пацеркі, паціхеньку, пісьменны, подмешка, поезд, позненька, высцебаць, выстаяць, зерневы, зязюлечка, зялёненькі.

28. Прачытайце словы, выразна вымаўляйце [э], [а] пасля мяккіх зычных у пераднаціскных складах. Сачыце, каб яны гучалі, як ['э] або як ['э^{а}].

Палешукі, пасябраваць, зеніт, зелянецца, земляны, зязюляня, наверадзіць.

29. Прачытайце словы. Выразна вымаўляйце [э] у прыстаўцы *пера-*.

Перабягаць, перавезці, перавышаць, перагледзець, перадаваць, перакідаць, пераладзіць, перамачыць, перамываць, перапаліць, перасыпаць, ператрудзіць, перахваціць.

30. Прачытайце тэкст спачатку павольна, а потым больш хутка, пры гэтым звяртайце ўвагу на вымаўленне ненаціскных галосных.

У векавечнай бацькаўшчыне клёны
Нячутна пачынаюць аблятаць
На рыжую зямлю, на мох зялёны,
На весніцы, на ціхі стаў, на гаць.
Зямля глядзіць азёрамі-вачыма
На ясны свет, што стыне у красе.
Як чыста, бы святло абшары вымыла,
Як ціха — быццам зніклі людзі ўсе. *(Ул. Караткевіч.)*

31. Бязгучна вымавіце галосныя (так, каб яны не гучалі, а органы мовы рухаліся). Такое трэніровачнае вымаўленне дапамагае сканцэнтраваць увагу на правільным размяшчэнні частак моўнага апарату.

і э а о у ы
ы у о а э і
і у э о ы а

32. Вымавіце галосныя шэптам. Практыкаванне дапамагае дасягнуць артыкуляцыйнай выразнасці.

і э а о у ы
ы у о а э і
і у э о ы а

33. Адгадайце, пра якія словы складзены загадкі-метаграмы. (Метаграма — гэта граматычная гульня-загадка, заснаваная на замене ў слове адной літары на іншую. Каб яе адгадаць, неабходна так замяніць указаную літару, каб атрымалася новае слова.) Якімі гукамі, галоснымі ці зычнымі, адрозніваюцца словы-адгадкі?

1. Я грамадзян усіх
Шаную,
Мяне баіцца
Ліхадзей.
Змяніўшы «у» на «а»,
Пачну я
Пладамі
Надзяляць людзей. *(І. Курбека.)*

2. Звярок я рыжанькі лясны,
У казках, байках я бываю,
Адну мне літару змяні —
Я ўвосень з дрэва ападаю.

3. Я маю сцены і куты,
Усё жыццё служу табе.
Мне *о* на *ы* заменіш ты —
Тады шукай мяне ў трубе. *(В. Паўлоўская.)*

Адгадкі: 1) суд — сад; 2) ліса — ліст; 3) дом — дым.

34. Адгадайце загадкі. Запішыце словы-адгадкі, падкрэсліце ў іх галосныя літары.

1. **Сядзіць панна**

ў чырвоным кафтане.
Як узялі разбіраць —
сталі плакаць, наракаць.

2. **Што за гаспадыня?**

Напячэ аладак
Белых — не замажа,
Хоць сама заўсёды
Чорная, як сажа.

3. **Каму ў дзяжы цесна**

Як пачуеш, прэч
Пудка не бяжы:
Пыхкае, бо ў печ
Просіцца з дзяжы.

4. **Жар-птушка**

Хоча знаць дачушка,
Дзе жыве жар-птушка.
На зямлі?
Ці мо ў блакіце?
Хто даўмеўся,
падкажыце.
(М. Маляўка.)

Адгадкі: 1) цыбуля; 2) патэльня; 3) цеста; 4) вясёлка.

Зычныя гукі

35. Прачытайце, як утвараюцца зычныя гукі.

Вы, канешне, ведаеце, што гукі бываюць галоснымі і зычнымі. Калі паветру ўдаецца вырвацца наверх, не сустрэўшы на сваім шляху ніякіх перашкод, то атрымаецца галосны гук. А калі яму прыйдзецца прарывацца праз барыкады, якія яму ўтвараюць губы, зубы, нос, то атрымаецца зычны гук...

Вымавіце, калі ласка, гук [*ш*]. Чуецца толькі шум. Вымавіце яшчэ раз [*ш*]! Чуеце, колькі шуму? А цяпер вымавіце гук [*ж*]. Што вам давялося «падключыць», каб атрымаўся гэты гук? Канешне, голас. Адзін шум здолець гэтую работу не можа. Дык вось, пры нараджэнні зычных гукаў могуць працаваць і шум, і голас. Пры гэтым шум бывае заўсёды, а голас — не. *(Паводле Г. Г. Гранік, С. М. Бандарэнка, А. А. Канцавой. Сакрэты арфаграфіі.)*

36. Прачытайце народныя жарты. Назавіце спачатку ўсе зычныя гукі, з якіх пачынаюцца прачытаныя словы, а потым — якія сустракаюцца на канцы слоў.

1.— Вось, каб мне такія доўгія вушы, як у зайца, тады я вельмі лоўка падхоплівaў бы ўсе падказкі,— заўважыў Коля.

— Не, не згодзен,— запярэчыў Вася.— Доўгія вушы доўга трэба мыць.

2.— Разумееце, не можам прыняць вашага сына ў музычную школу.

— Чаму?

— Слыху няма.

— А божачкі ж. Няўжо аглух? Учора ж ён яшчэ ўсё чуў.

37. Адгадайце загадкі. Запішыце адказы. Чым розняцца словы-адказы?

1. Каб частка судна
Ды імем стала,
Не будзь марудны —
Работы мала:
Ану,
Мой дружа малады,
Вазьмі і перастаў
Склады!

2. Мэбля бытавая
Зробіцца
Ўзрыўчаткай,
Калі занядбаеш
Літару
Ў пачатку.

(І. Курбека.)

Адгадкі: 1) карма — Макар; 2) стол — тол.

Прыдумайце яшчэ словы, якія б адрозніваліся парадкам складоў; колькасцю зычных гукаў.

Словы для даведак: сіла — ласі, ліпа — палі, навес — вясна, брод — род, брат — рад.

38. Выразна прачытайце верш. Назавіце словы, якія пачынаюцца з зычных гукаў і якія — з галосных. Выпішыце словы, якія маюць на канцы зычны гук.

ЗАЙЧЫК СА СКАКАЛКАЙ

Хто ў лесе скача змалку?
Ён знае, Дзед Мароз,
Ён зайчыку скакалку
І апельсін прынёс.

Усюды снег глыбокі,
Далёка да вясны —
Сумёты, як аблокі,
Укрылі кут лясны.

Ды зайчык не гультайчык,
Яму не страшны снег —
І днём ён скача, зайчык,
І ноччу скача ў сне.

Вясёлы, не заплача,
Аддасць ён апельсін
Таму, хто пераскача
Яго сярод ялін. *(М. Маляўка.)*

39. Адгадайце загадкі. Запішыце адгадкі. Колькі гукаў мае кожнае слова-адгадка? Колькі галосных і колькі зычных?

1. Мы з ім быццам радня,
Ты без нас ані дня.
Я ваду падаю,
Ён жа
У памяць тваю
Веды,
Мудрасць нясе.
І нас любяць усе.
Ты праз нас
Без адрыву ад хаты
І душою,
І целам
Багаты.

2. У мяне —
Нагі чатыры,
На маім
Сядзіш ты карку.
«У» як трачу,
Біўні — пыры,
Хобат мой —
У заапарку.

3. Да ўзвышша
Зычную дадай —
Машыну
Ў стойла заганяй.
(І. Курбека.)

А д г а д к і: 1) кран — экран; 2) услон — слон; 3) гара — гараж.

40. Прачытайце жарт і лічылку. Параўнайце колькасць складоў, зычных і галосных у словах *сумка* і *торбачка*, у імёнах хлопчыкаў і ў назвах гатункаў яблык — *наліў, шафран, антон, апорт, дзічка*. Назавіце зычныя і галосныя літары ў кожным з гэтых слоў. З якіх гукаў, зычных ці галосных, яны пачынаюцца? Якія гукі першакласнік памылкова ўставіў у слова *сумка*?

— У першым класе ідзе ўрок чытання. Пятрок чытае подпіс пад малюнкам па літарах:

— Сы-у-мы-кы-а...

— Ну, і што атрымаецца?

— Торбачка.

ЛІЧЫЛКА

Нехта
Недзе
Яблыкі дзяліў:
— Табе, Федзя,— наліў,
Табе, Сцяпан,— шафран,
Табе, Сымон,— антон,
Табе, Пётр,— апорт.
Табе, сястрычка,— дзічка,
А табе, Даніла,
Не хапіла. *(М. Маляўка.)*

Губныя зычныя [*б*], [*б'*], [*п*], [*п'*], [*м*], [*м'*], [*в*], [*в'*], [*ф*], [*ф'*].

41. З дапамогай люстэрка вызначце, пры ўтварэнні якіх зычных гукаў працуюць губы. Прааналізуйце пачатковыя гукі наступных слоў: *тата, баба, белы, мама, медзь, дачка, сын, піць, папар, віхор, воўк*. Якія з іх вымаўляюцца з удзелам губ? Свае меркаванні адносна губнога характару зычных праверце на словах, у якіх губны зычны папярэднічае губным галосным [*о*] і [*у*]. (У такіх умовах характар вымаўлення зычнага робіцца асабліва выразным.) Прыгадайце скорагаворкі, у якіх словы «насычаны» губнымі зычнымі гукамі. У якім сэнсе гаворыцца, што «сказанае слова да губы не вернеш»? У якіх яшчэ прыказках пра мову таксама прыгадваюцца такія органы маўлення, як губы, язык, рот?

Д а в е д а ч н ы м а т э р ы я л. Калі перашкода струменя паветра, з дапамогай якога ўтвараюцца гукі, зроблена з удзелам губ, тады ўзнікаюць губныя зычныя гукі: [*ў*], [*м*], [*м'*]. Збліжаюцца або змыкаюцца губы пры ўтварэнні зычных гукаў [*б*], [*б'*], [*п*], [*п'*]. Пры збліжэнні або змыканні ніжняй губы з верх-

німі зубамі ўтвараюцца губна-зубныя зычныя гукі [*в*], [*ф*], [*в'*], [*ф'*]. З удзелам губ вымаўляюцца таксама галосныя гукі [*о*] і [*у*]. *Бор, бёрда* (тэкстыльнае), *пуга, Пётр, мулка, мёд, вольха, вёсачка, футра, фюзеляж. Пекар Пётр пёк пірог. Бык тупагубы, тупагубенькі бычок, у бычка бела губа была тупа. У барабаны барабанілі, барабанілі, папабарабаньвалі.* Прымаўка «Сказанае слова да губы не вернеш» ужываецца ў значэнні 'вымаўленыя словы ўжо пачуты, іх назад не вернеш'.

Ужыванне слова *губа* ў выразах пра мову тлумачыцца тым, што губы — актыўны орган маўлення. Параўнаем радкі Дануты Бічэль-Загнетавай:

Што маю наўме,
тое выкажуць губы —
сакрэтаў не маю.

Нямецкі педагог XVI ст. В. Ікельзамер раіў у тлумачэннях вучням карыстацца параўнаннямі і пры іх дапамозе апісваць тую фізіялагічную работу, якую трэба зрабіць для чыстага вымаўлення. На яго думку, гук [*б*] з адпаведным [*п*] трэба вымаўляць так: трымаць дыханне ў замкнёных вуснах, каб яно надзімала шчокі, як у флейтыста[1].

42. Выразна вымаўляйце гукі [*б*] і [*п*] у складах і словах. Становішча губ прасачыце ў люстэрку. Захоўвайце выразнымі ненаціскныя галосныя.

Ба́-ба-ба; бак, ба́нка, ба́ба, бара́н, бараба́н, ры́ба, вярба́, Лю́ба, вы́бар, по́бач.

Бо́; боб, бо́сы, бо́чка, бо́мкаць, бо́ўтаць.

Бу́-бу-бу; бу́да, будзіць, буды́нак, бурча́ць, бунтава́ць, бу́льката́ць, бура́к, ры́бу, вы́бух, вы́буяць.

Бэ́; бэз, бэ́лька, бэ́сціць, бэ́каць.

Бы́-бы-бы; бык, збыць, збыва́ць, былі́нка, быстрыня́, ры́бы, гу́бы, грыбы́, вы́быць, по́быт.

Па́-па-па; пан, па́нцыр, па́ра, па́ша, паваро́т, паблы́таць, пажы́ць, пакаха́ць, пану́ры, ка́па.

По́; по́бач, под, по́дпіс, по́зні, по́крык.

Пу́-пу-пу; пу́га, пу́дзіць, пук, пудлівы; пунсо́вы, пуска́ць, вы́пусціць, вы́путаць.

Пэ́; пэ́ндзлік, пэ́ўны, пэ́цкаць.

[1] Міцкевіч К. Методыка роднай мовы // Колас Я. Зб. тв.: У 14 т. Мн., 1976. Т. 12, С. 331.

43. Адгадайце загадкі. Запішыце адказы. Якімі зычнымі і якімі галоснымі і зычнымі гукамі адрозніваюцца словы-адгадкі?

1. З «е» —
Дружу
З будаўнікамі,
З «а» —
Купляй
У хлебнай краме. *(І. Курбека.)*

2. З глухім траву яна зразае,
Са звонкім — лісце аб'ядае.

3. З глухім я круглы, нібы
мячык,
Са звонкім — як агонь,
гарачы. *(В. Паўлоўская.)*

Адгадкі: 1) бетон — батон; 2) каса — каза; 3) шар — жар.

44. Вымаўляйце прыведзеныя словы з глухім губным на канцы.

Дуб, зруб, зуб, голуб, боб, лесаруб.

Выразна вымаўляйце пары беларускіх і рускіх слоў. Звярніце ўвагу, што ў беларускіх словах канцавы зычны цвёрды, а ў рускай — мяккі.

Бел.	Рус.
стэп	степь
сып	сыпь
сем	семь
восем	восемь

45. Вымаўляйце гукі, абазначаныя выдзеленымі літарамі, цвёрда.

Сы***п***це, дро***б***, не гор***б***ся, вось***м***, эконо***м***це.

46. Прачытайце скорагаворкі: спачатку па складах, потым не спыняючыся, а трэці раз хутка. Сачыце за выразнасцю вымаўлення, імкніцеся перадаць сэнс скорагаворкі.

У пустой птушкі пустая песня. Піліпаў Піліп прыпоўз да ліп і да ліпы прыліп. Пекар Пётр пёк пірог.

Пільшчыкі-пілавальшчыкі пілавалі піламі. Пілавалі, перапільвалі, наперапілоўвалі, пілаванне перапалавінілі.

У бубны бубнілі, бубнілі, панабубніваліся.
Бульба з булкай біліся, біліся, бульба булцы як дала, булка сплюшчылася.
Забіла б і баба лося, каб ёй удалося.
Бабін боб цвіце ў дошч, будзе бабе боб у боршч.

47. Прачытайце сказы, выразна вымаўляйце губныя зычныя.

Барыс будуе будынак. Дзе дубы, там будуць грыбы. Люба разбіла губу. На балоце згубіў боты. На балет бяру бінокль. У белага бычка белы бачок. Бяры бохан белага хлеба.

48. Адгадайце загадкі. Запішыце адгаданыя словы. Назавіце словы, у якіх ёсць гукі [*б*], [*п*], [*м*], [*в*], [*ў*].

1. Быў плавання стыль.
Стаў гладзіць тэкстыль.
Чынам якім? —
«Б» стаў глухім. *(І. Курбека.)*

2. Дзе яго сядзіба?
Дзе ён сам цяпер?
Плавае — як рыба,
Бегае — як звер. *(М. Маляўка.)*

3. Паўзукі паўзуць, рагачы вязуць; там на балоце будзем пугача калоці. 4. Спераду мыльца, ззаду кольца, а пасярэдзіне каўнерык. 5. Жоўты Піліп да палкі прыліп.

А д г а д к і: 1) брас — прас; 2) бабёр; 3) ехаць валамі па сена; 4) кот; 5) яблык.

49. Вымаўляйце выразна гукі [*в*], [*в'*] у складах і словах.

Ва́-ва-ва; Ва́ля, ва́жкі, ва́раны, дываны́, вавёрка, вадзі́чка, вайна́, стра́ва, по́вад, ла́ва, запра́ва, не́вад.
Во́; Во́лька, воўк, во́пратка, во́дар, во́блака, во́льны; во́чы, няво́ліць.
Ву́-ву-ву; ву́да, ву́галь, вуж, ву́зкі, ву́ліца, ву́ха, вуго́р, вужаня́, вузе́й, вузлава́ты, вучаніца, завушніца, павуці́на, за́вуч, вы́вучка.
Вэ́; вэ́люм, вэ́ндзіць, вэ́рхал.
Вы́-вы-вы; вы́біць, вы́быць, вы́валіць, выве́шваць, выво́дзіць, выво́зіць, выраза́ць, выпяка́ць, павыбяга́ць, тра́вы, ка́вы.

Вя́-вя-вя; вяз, вя́лы, свя́та, звя́заць, звяць, вялі́кі, вясе́нні, звяры́нец, звярну́ць, вярэ́дзіць, вы́вязаны, су́вязь.

Вё; вёрткі, вёсачка, свёкар.

Ві́-ві-ві; Ві́ка, сві́нка, свіст, паві́дла, паві́нен, світа́нак, завішча́ць, свісту́лька, павісе́ць, відаць, вы́віць, до́світак.

Ве́-ве-ве; све́тлы, све́чка, све́жы, све́дчыць, светлячо́к, вы́вернуць, вы́везці, вы́весіць.

50. Адгадайце загадкі. Запішыце адказы. Прасачыце ў люстэрку, ці рухаюцца губы пры вымаўленні пачатковых зычных гукаў. Якія словы ў загадцы пачынаюцца з гукаў [*п*], [*б*], [*в*]?

1. Пасажыраў
   Поўна хата
   Удалячынь імчыць.
   «В» на «п» змяні —
   Ў салдата
   Ўбачыш на плячы. *(І. Курбека.)*

2. У ваду ныра́е смела.
   Хатку ён будуе ўмела.
   Пад вадой і па вадзе
   Будаўніцтва ён вядзе. *(В. Жуковіч.)*

Адгадкі: 1) вагон — пагон; 2) бабёр.

51. Выразна вымаўляйце [*ў*].

Хадзіў учора — хадзіла ўчора; добры ўчынак — учынак добры; Валя ўбегла — кот убег; увядзём у хату — не ўвялі ў хату; увяжу добра — не ўвяжу добра; угаварыць цяжка — не ўгаварыць; дзед углядаўся — бабуля ўглядалася; сам ударыўся — сама ўдарылася; Змітрок узважыў — Марына ўзважыла.

52. Правільна вымаўляйце словы па-беларуску і па-руску. Параўнайце вымаўленне зычных у словах.

Даў — дал, хадзіў — ходил, браў — брал, любоў — любовь, быў — был, леў — лев, паспеў — поспел, кроў — кровь, адпраўце — отправьте, доўга — долго, стоўп — столб, дзіўны — дивный, воўк — волк, пісаў — писал, траўка — травка, праўда — правда.

53. Перакладзіце на беларускую мову. Сачыце за выразным вымаўленнем [*ў*]: *пел, шёлк, толстый, полный, стал, гнал, ходил, стол, вол, толк, палка, правда, сев, травка.*

54. Падбярыце да прыведзеных слоў аднакаранёвыя формы з рускай мовы: *праўда, траўка, удава, кроў, уверх, уніз, тоўсты, доўгі, жоўты, воўк, даў, чытаў, быў.* Зрабіце вывады аб тым, з якіх гукаў у беларускай мове развіўся гук [ў]. Што вядома пра час яго ўзнікнення?

55. Як вядома, народнай беларускай мове гук [ф] быў неўласцівы. Таму засваенне запазычаных слоў з гэтым гукам праходзіла паразнаму. Як пісаў М. Гусоўскі ў «Песні пра зубра» (Пераклад з лацінскай Я. Семяжона. Мн., 1973):

Лад алфавіта наш прашчур для ўласнай карысці
У грэкаў пазычыў і, гукі мясцовых гаворак
Зладзіўшы з ім, іншаземцам, застаўся сабою.

Прааналізуйце наступныя прыклады засваення гука [ф] з твораў перыяду станаўлення літаратурнай мовы: *фэльчар, афарбаваны* (Я. Колас): *портфэль* (К. Чорны); *фанэрны* (М. Зарэцкі); *пляшка* (Я. Купала); *коптачка, картопля* (Ц. Гартны); *хвэрба, хвіга, хвартух* (Я. Колас); *хвабрыка, хварба, хвабрычны, хвальбарковы, хванабэрна, хваса* (Ц. Гартны); *пахварбаваны* (П. Галавач); *Хвядос* (К. Крапіва); *хурман* (П. Галавач); *арытмэтыка, катадры, патосам, з ортаграфіяй, апатэозам, міталёгічнай, патасу* (Крамко І. І., Юрэвіч А. К., Яновіч А. І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы. С. 286). Якімі гукамі перадаваўся гук [ф] у запазычаных словах? Чым былі абумоўлены розныя спосабы яго перадачы на пісьме?

56. Вымаўляйце выразна гукі [ф], [ф'] у складах і ў словах. Яны вымаўляюцца так, быццам чалавек дзьме праз шчыліну.

Фа́-фа-фа; фа́рба, фа́брыка, фанта́н, фарфо́р, фарш, фасо́ля, фарту́х, фарсі́ць, фане́ра, фарбава́ць, ша́фа.

Фо́; фо́та, фо́кус, фо́ртка.

Фу́-фу; фу́ра, фу́тра, футбо́л, фуфа́йка.

Фэ́; [Ф'е́]дя, [ф'е́]рма, кафэ́.

Фі́-фі; фільм, фі́ніш, фі́нка, фі́рма, фігу́ра, фіна́нсы, фіра́нка, фія́лка, фіяле́тавы, фігурыст.

57. Прачытайце верш. Выпішыце словы з гукамі [ф] і [ф']. Растлумачце, што яны абазначаюць.

Ф забылася на ўрокі,
Фыркае, надзьмуўшы шчокі.
Як сур'ёзнай быць такой —
Смех за кожнаю шчакой.
Словаў з *Ф* ледзь цягне фура:
Фрэска, фарба, фэст, фігура.
Бачыла ў зімовы ранак
Футра фару з-за фіранак. *(Р. Барадулін.)*

58. Чытайце словы, звяртайце ўвагу на вымаўленне гука [*ф*] і спалучэнне гукаў [*хв*].

Хвост, фортка, ферма, хваля, хвастаць, фарсіць, хваста, фарсун, фартух, прафесія, хворы, сафа, хустка, ахвяра, хачу, ухвачу.

59. Прачытайце верш. Назавіце, у якіх словах і якія гукі замянілі гук [*ф*].

Без гуку й літары мы «эф»
жылі, казаць было не грэх
не фунт, а хунт, Філіп — Піліп,
хвартуна, хвабрыка, Сахвея;
усякі, мусіць, зразумее,
што ў сапраўды трывалай нацыі
сваіх спрадвек хапае сіл
сусветную цывілізацыю
на свой наламываць капыл. *(А. Русецкі.)*

60. Прачытайце сказы. Выразна вымаўляйце гукі [*в*], [*в'*], [*ў*], [*ф*], [*ф'*].

У Полацкай Спаса-Ефрасіннеўскай царкве прыгожыя фрэскі. Фэля выбрала фіялетавую фарфоравую вазу. Васіль пачаставаў Клаву свежымі вафлямі. Вера зварыла слівовае варэнне. Вінцук увечары працаваў на фабрыцы. Выдра павольна выйшла з вады. На ферме фатограф сфатаграфаваў Фёдара разам з Франяй. Віця нарваў букет фіялак. Воўк не выбіраючы авечак бярэ.

61. Параўнайце наступныя беларускія і рускія словы, зрабіце вывад аб ужыванні мяккіх губных зычных гукаў у канцы слова ў беларускай мове: *сып* (загадны лад ад дзеяслова *сыпаць*) — *сыпь, голуб — голубь, сем — семь, верф — верфь, кроў — кровь, любоў — любовь*. Прывядзіце прыклады, дзе гэтыя губныя гукі сустракаюцца ў сярэдзіне слоў перад зычнымі. У якой мове мяккія губныя сустракаюцца часцей?

Пярэднеязычныя зычныя [т], [д], [н], [н'], [н':]

62. Вымаўляйце дакладна гукі [*т*] і [*д*] у складах і ў словах. Сачыце, каб пярэдняя частка языка шчыльна прыціскалася да верхніх зубоў і потым адштурхоўвалася ад іх.

Да — та, до — то, ду — ту, дэ — тэ, ды — ты;
дам — там, дачка — тачка, дом — том, дома — То-

ма, душ — туш, двор — твор, плады — плыты, дэталь — тэатр.

63. Адгадайце загадкі. Запішыце адгадкі. Вызначце, у якіх словах ёсць гукі [*т*] і [*д*].

1. Ідзе тота каля плота, пытаецца ў жмуры: «Ці дома ляпа?» 2. Ішоў шалду-балду, узяў стрыкі-брыкі, як зачулі лапётнікі, сталі будзіць гарэтнікаў: «Уставайце, гарэтнікі, ды ганяйце шалду-балду, адбірайце стрыкі-брыкі». 3. Чатыры тычкі, дзве патычкі, сёмае памахайла.

Адгадкі: 1) воўк, кот, сабака; 2) воўк ухапіў у пастуха авечку. Той будзіў сабак, каб вярнулі авечку; 3) карова.

64. Прачытайце вершы. Пералічыце словы са звонкім [*д*] і з глухім [*т*]. Запішыце іх.

ЛЕТАХОД

1. Ад Новага году
Да Новага году
Я крылы гартую
Свайму летаходу.
Мне дадзены годы
Вялікай работы,
Далёкага лёту,
Гарачага поту.

Ад Новага году
Да Новага году
Ляціць летаход
У любую пагоду.
Хто смелы, збірайся
Са мною ў палёт!
Праз леты Планеты
Ляціць летаход. *(С. Папар.)*

2. Запытаўся я
У Люды:
— Люты — добры або люты?..
Шчыра адказала Люда:
— Люты, як мядзведзь,— няўклюда. *(С. Папар.)*

3. *Д* зрабілася, што кадка,
Трэба, трэба фіззарадка!
Падагнуўшы смешна ногі,
Прысядае да падлогі.

Дрэсіруюць доўга дога.
Дабяжыць дамоў дарога. *(Р. Барадулін.)*

65. Вымаўляйце словы па-беларуску і па-руску, звярніце ўвагу на цвёрдае вымаўленне [*т*] і [*д*] у беларускай мове.

Тэатр — театр, дэсант — десант, дэпутат — депутат, дыктоўка — диктант, дырэктар — директор, дывізія — дивизия, дыск — диск, тыгр — тигр, тыпавы — типовой, тыф — тиф, тэлевізар — телевизор, тэлеграма — телеграмма, тэмпература — температура.

66. Прачытайце прымаўкі. Звярніце ўвагу на вымаўленне [*д*] у сярэдзіне і на канцы слова.

Кожны гад мае свой яд. Трапіў у нерат — ні ўзад, ні ўперад. Дудар дудару дарма грае. Грамада за аднаго — і адзін за грамаду. Будзь здаровы на ўвесь год, як калядны лёд. Каб Кандрат ды вінават — у яго Агата вінавата.

67. Прачытайце пары беларускіх і рускіх слоў.

Ад лесу — от леса, ад акна — от окна, адліць — отлить, адняць — отнять, адарваць — оторвать, адыгрviцца — отыграться.

68. Прачытайце словы. Сачыце за тым, каб звонкі [*д*] перад наступнымі глухімі зычнымі і на канцы слова аглушаўся.

Адтуль, брыдкі, аладкі, кладка, салодкі, будка, мёд, лёд, рад, ход, зрэдку, перад, від, брыдкі, адсунуць, адтаваць, адсячы, адтапіць, адпусціць, прадказаць.

69. Спалучэнне гукаў [*д*] і [*т*] з [*с*] перад глухімі [*к*] і [*т*] вымаўляйце як [*ц*].

Гара[*ц*]кі (*арфагр.* гарадскі), грама[*ц*]кі (*арфагр.* грамадскі), сусе[*ц*]кі (*арфагр.* суседскі).

70. Спалучэнні [*дц*], [*тц*] вымаўляйце як падоўжаны [*ц:*].

Лю[*ц:*]ы (*арфагр.* людцы), ленінгра[*ц:*]ы (*арфагр.* ленінградцы), сі[*ц:*]о (*арфагр.* сітцо), селя[*ц:*]ы (*арфагр.* селядцы), у цё[*ц:*]ы (*арфагр.* у цётцы), на ло[*ц:*]ы (*арфагр.* на лодцы).

71. Спалучэнні [*дч*], [*шч*] вымаўляюцца як падоўжанае *ч*.

А[*ч:*]ай (*арфагр.* адчай), Навагру[*ч:*]ына (*арфагр.* Навагрудчына), па[*ч:*]аромхай (*арфагр.* пад чаромхай), а[*ч:*]аго (*арфагр.* ад чаго).

72. Скажыце, у сувязі з чым змяняецца вымаўленне чалавека пры насмарку. Прыгадайце, як вымаўляецца [*н*]. Трэба, каб рот

быў раскрыты адвольна, пярэдняя частка языка была шчыльна прыціснута да цвёрдага паднябення. У момант гучання зычнага [*н*] язык адштурхоўваецца ад цвёрдага паднябення, а паветра выходзіць праз шчыліну паміж зубамі і праз нос. Таму гук мае насавое адценне.

Выразна прачытайце прымаўкі і скорагаворкі з [*н*] і [*н'*].

Шумны, думны, ды не разумны. Нясмелага з няўмелым не распазнаеш. Ні налева ні направа, ні направа ні налева. Змяняў быка ў Мінску на індыка ў Пінску. Як дурніцы не чарніцы, дык чарніцы не дурніцы. Лянок не любіць лянот, лянот не любіць лянок. Ніна несла Нэлі ніткі.

73. Выразна вымаўляйце падоўжаны мяккі [*н:*].

Насе[*н':*]е (*арфагр.* насенне), вясе[*н':*]і (*арфагр.* вясенні), асе[*н':*]і (*арфагр.* асенні), карэ[*н':*]е (*арфагр.* карэнне), чыта[*н':*]е (*арфагр.* чытанне), змага[*н':*]е (*арфагр.* змаганне), здарэ[*н':*]е (*арфагр.* здарэнне), варэ[*н':*]е (*арфагр.* варэнне).

Пярэднеязычныя зычныя [с], [с'], [с':], [з], [з'], [з':], [ц], [ц':], [дз], [дз'], [дз':]

74. Вымаўляйце выразна гук [*с*]. Пры вымаўленні яго рот раскрыты адвольна, пярэдняя частка языка злёгку дакранаецца да ніжніх пярэдніх зубоў, бакі — да верхніх бакавых зубоў.

Сад, сам, сані, сала, каса, салома; сон, галасок, валасок, сок, сом, сонца, сотня, сохнуць, сочны; сук, суп, суд, суха, субота, посуд; сыграць, сын, сыпаць, сыр, сыты, сыходзіць; сэнс, сэрца; квас, клас, голас; воз, рос; вус, рыс; авёс, лес; рыс, ліс.

75. Прачытайце верш. У якіх яго словах ёсць гук [*с*]? Выразна вымаўляйце [*с*] і [*с'*].

Дружная сямейка:
Мама, тата, дзед,
Васілёк, Сяргейка,
Глеб і я, Міхед.

Будны дзень ці свята —
Смеху повен дом.
Толькі цеснавата
За адным сталом. *(М. Маляўка.)*

76. Вымаўляйце цвёрды [*с*] перад мяккімі [*г'*], [*к'*], [*х'*].

Скеміць, скідаць, скінуць, скіпідар, скіба, скібачка, сківіца, скіпець, скіпяціць, скіраваць, скіроўваць, скісаць, скіснуць, скіслы.

77. Спалучэнне *сч* вымаўляецца як [*шч*]:

Ра[*шч*]апляць (*арфагр.* расчапляць), ра[*шч*]аніць (*арфагр.* расчаніць), ра[*шч*]араваць (*арфагр.* расчараваць).

Прачытайце наступныя словы, сачыце за правільным вымаўленнем спалучэння *сч*.

Бесчалавечны, бясчулы, бясшумна, бясшэрсны, расчасаць, расчарціць, расчоска, расчуліць, расчыніць, расчырванецца, расчырыкацца, расчысціць, счакаць, счапіць, счарнелы, счарсцвець, счыняць, счысціць, счышчаць, счэпшчыца.

78. Прачытайце прыведзеныя словы. Прыгадайце, што [*с*] перад [*ш*] вымаўляецца як падоўжаны [*ш:*].

Бясшкодны, бясшвовы, сшыць, сшалець, сшараваць, сшываць, сшытак, сшыты, сшэрхлы, расшавяліцца, расшыраць, расшываць, расшыць.

79. Адкажыце на пытанні і запішыце адказы.

1. У назвах якіх лічбаў ёсць гук [*с*]?
2. У назвах якіх раслін ёсць гук [*с*]?
3. У назвах якой мэблі ёсць гук [*с*]?
4. У назвах якой садавіны ёсць гук [*с*]?
5. У назвах якіх хімічных элементаў ёсць гук [*с'*]?
6. У назвах якіх месяцаў і якіх дзён тыдня ёсць гукі [*с*] і [*с'*]?
7. У назвах якіх птушак ёсць гукі [*с*] і [*с'*]?

Словы для даведак: сем, восем, сто, сорак, семнаццаць, васемнаццаць, семсот, восемсот; салат, капуста, радыска; стол, стул, сафа; сліва, абрыкос, смародзіна; сера, серабро; студзень, верасень, сакавік, красавік, кастрычнік; серада, субота; сініца, бусел, сава, сіваваронка.

80. Вымаўляйце гук [*с'*] мякка, з шыпячым прыгукам.

Сі-се-сё-сю-ся; сі́ні, сі́ла, сівы́, сіні́чка, сіра́та, сіро́п; бу́сел, Се́ва, сезо́н, се́йбіт, секу́нда, се́кчы, селядзе́ц, се́мя, се́на, серабры́ць, серада́; сёлета, сёмы, сёння, сёрбаць; сюды́, паўсю́дна, сюрпры́з; сюсю́каць; ся́бар, сябе́, свяве́ц, сядзе́ць, сяке́ра, сяля́не, сямёра, сяўба́, сястра́, сячы́, сярэ́дні.

Ась-ось-усь-ысь; ісь-есь-ёсь-юсь-ясь; карáсь, вось, лось, гусь, рысь, узялíся, увéсь, ёсць, баю́ся, Ясь.

81. Прачытайце прыказкі, прыслоўі, скорагаворкі з гукамі [*с*], [*с'*]. Вывучыце іх на памяць.

Усякай справе свой час. Касі, каса, пакуль раса, раса далой, і мы дамоў. Пісаў пісака, пісаў, перапісваў, ды так і не напісаў. Усім па сем, гаспадару восем, а гаспадыні дзевяць, што добра дзеліць. Свой сячыся рубайся, а чужы не мяшайся. Мы самі з вусамі, адно нос не аброс. Зарабіў на соль салёнага селядца пасаліць. У савы савяня, у лася ласяня. Сем седакоў не воз, абы конь вёз.

82. Адгадайце загадкі. Пры чытанні сачыце за вымаўленнем гукаў [*с*] і [*с'*].

1. Вісіць сіта, не рукамі звіта. 2. Што ўзыходзіць без насення? 3. Лягла спаць Парася і на ўвесь свет расцяглася. 4. Вязушка вязе, сякачка сячэ, а мокры Марцін падкладае і сапе. 5. Зубасты Хвядор усю сцяну прапароў.

Адгадкі: 1) павуціна; 2) сонца; 3) дарога; 4) лыжка, зубы, язык; 5) свярдзёлак.

83. Прачытайце словы. Выразна вымаўляйце падоўжаныя мяккія гукі [*с'*] і [*з'*].

Бяссільна, Палессе, узлессе, Залессе, ссівеў, ссечаны, сселены, ссёрбаць, ссінець, рассеяць, рассек, калоссе, рыссю, разросся, разнёсся, мыешся, журышся, смяешся, бярэшся, маззю, граззю, рыззё.

84. Свісцячы [*с*] перад мяккімі зычнымі [*с'*], [*л'*], [*м'*], [*н'*], [*ц'*], [*п'*], [*в'*] вымаўляйце мякка. Прачытайце наступныя словы з [*с'*].

Бясследна, бяссмерце, след, слепнуць, слёзка, сліва, слізгаць, слімак, сліна; смелы, смерць, смех, смецце, смешна, смірна, смялейшы, смятана, смяяцца; снег, снедаць, снежань, сніцца, пракісне, цісне; сцежка, сценка, сцерагчы, сціснуць, сціхаць, сцюдзёна, сцюжа, сцяблінка, сцяг, сцячы, сесці, трэсці, пайсці; спевы, спелы, спешна, співаць; спінка, спісаць, спіца, спякота, спячыся, спяшацца; сведчыць, свежы, свет, светлаваты, свечка, свінарнік, Свір, свірчэць, свісток, свядомы, свята, святло, свяшчэнны.

85. Вымаўляйце гукі [*з*] і [*з'*] у складах і ў словах. Кончык языка хай прыціскаецца да ніжніх пярэдніх зубоў.

За-зо-зу-зы-зэ; забаўля́ць, забру́дзіць, за́вадзь, зада́ўга; зо́лак, зо́лата, зо́лкі, зо́рка, зо́рна; зуб, зубр, зу́бчык, зусі́м, зухава́ты; зыб, зымшы́ць, зына́чыць, зысці́, зычлі́вы, зы́чыць; зэ́длік, Зэ́льва, зэкано́міць.

Аз-оз-уз-ыз-эз; а́збука, аздарavéць, аздабля́ць; мароз́на, завоз́на; гарбу́зны; азы́злы; счэ́знуць.

86. Прачытайце наступныя словы. Звонкі зычны [*з*] перад мяккімі [*дз'*], [*л'*], [*з'*], [*в'*], [*б'*], [*м'*], [*н'*] вымаўляйце мякка.

Раздзел, здзек, здзельшчык, здзерці, здзіўлена, здзяцініцца; злева, злепіць, злёт, зліць, злічыць, ззяблы, ззянне; звязаць, звяно, звяраць, звяртаць, звярынец; збегчы, зберагаць, збіваць, збіраць, збіць; раздзел, змякчыць, змяніць, змяншаць, змярзаць, змятаць, змяць, змяшчаць, змяя; зневажаць, знемагчы, знесці, знізіць, знішчыць, знюхаць, зняважыць, зняволіць.

87. Прачытайце прыназоўнікавыя спалучэнні. Звонкі зычны [*з*] перад мяккімі [*п'*] і [*ц'*] вымаўляйце як [*с'*].

З пекла, з перцам, з пельменямі, з пенкай, з печы, з півоняй, з пякарні, з пяску, з пяньку, з пяром, з пячэры; з цемры, з цёплага, без цябе, без цеста, без ціны, без ціску, з цяпла, з цягніка, з цялём, з цяньку, з цёцяй.

88. Прачытайце прымаўкі. Гукі [*з*] і [*з'*] на канцы слова і перад глухімі зычнымі вымаўляйце як глухія [*с*] і [*с'*].

Сем седакоў не воз, абы конь вёз. Блізка то блізка, ды каб не было слізка. Нямазаны воз рыпіць, а мазаны ўраз бяжыць. Свае сабакі грызуцца — чужы не лезь. Каб рыбу есці, трэба ў ваду лезці.

89. Прачытайце словы і словазлучэнні. Звонкі [*з*] перад глухімі зычнымі *к, п, с, х, т, ц* вымаўляйце як [*с*].

Падмазка, блізка, з калена, з кніжкі, без клею; з пустога, з поля, цераз плот; без солі, з салам, без сэрца, з сынам, з холаду, з хаты, з хвоі, з хвалі; з татам, з Тамарай, з торфам, з Томска, з тортам, з тоўстым; з цырульні, з цырка, з цыганкай, з цыбулі, з цэха, з цукру, з цукеркай.

90. Прачытайце словазлучэнні. Звонкі [з] перад глухімі [ч] і [ш] вымаўляйце як [ш], а перад *ж, дж* як [ж].

З чаборам, з чайнікам, без чалавека, без чаплі, праз час, з часнаком, з чвэрці, з Чачэрска, без чоўна, з чужым, з Чукоткі; з чытальні.

З шакаладкай, з шашкамі, без шва, праз шкло, з шоўку, з шчанятамі, цераз маму, з шумам, з шэптам, з шэрсткай, з шэлестам, без шэршняў.

З жалейкай, з жалобай, праз жару, з жарабятамі, з Ждановічаў, без жалеза, без жарту, з жалудамі, з журбой, з жывёлай, праз жыта, без жыхароў, з жэрдкай, з жэстам.

91. Дайце адказы на пытанні і запішыце іх.

1. Якія беларускія імёны маюць гукі [с], [с'], [з], [з']?
2. У назвах якіх хатніх жывёл і птушак ёсць гукі [с], [с'], [з], [з']?
3. У назвах якіх звяроў ёсць гукі [с], [с'], [з], [з']?
4. У назвах якіх рыб ёсць гукі [с] і [с']?
5. У назвах якіх дрэў і траў ёсць гукі [з] і [з']?

Словы для даведак: 1) Саша, Алесь, Кастусь, Васіль, Ясік, Пятрусь, Зося, Зіна, Змітрок; 2) сабака, свіння, каза, казёл, гусак, гусь; 3) барсук, расамаха, ласка, рысь, зубр, заяц, казуля; 4) сазан, стронга, сом, мянтуз, язь; 5) бяроза, бузіна, лаза, язмін.

92. Выразна вымаўляйце гук [ц] у складах і словах. Сачыце, каб пярэдняя частка языка злёгку дакраналася да верхніх зубоў і адштурхоўвалася ад іх.

Ца-цо-цу-цы-цэ; цабэ́рак, цагля́ны, цалава́ць; цо́тны; ланцу́г, цу́да, цукро́вы, цура́цца; цыбу́ля, цырка́ч, цыру́льня, цыстэ́рна; цэ́бар, цэ́лы, цэме́нт, цэх.

Ац-оц-эц; пала́ц, матра́ц, ме́сяц, за́яц; мо́цны; сырэ́ц, кіта́ец, бае́ц.

93. Выразна вымаўляйце гук [ц'] у складах і словах. Прыгадайце, што пры вымаўленні [ц'] і [дз'] найбольш рухомай з'яўляецца сярэдняя частка языка, якая прыцягваецца да альвеол верхніх зубоў.

Ця-це-цё-цю-ці; цяга́ч, цягну́ць, ця́жка, цялё, цямно́; це́ла, це́мень, цень, цеплыня́, це́рціся; цёмна, цёпла, цёрка, цётка; цю́каць, цюль, цюльпа́н, цюфя́к; цікаць, ці́на, ціск, ці́ха, цішэ́ць.

Аць-ець-юць-іць; зламáць, пáраць, вáраць; кіпéць, гарэ́ць, мець, спець; пяю́ць, вязу́ць, бярýць, бягýць; зрабíць, стамíць, звóдзіць, касíць, вазíць.

94. Уважліва паслухайце пары слоў, вымаўленых па-беларуску і па-руску. Пры беларускім вымаўленні падняць сігнальную картку.

Цень — тень, цемя — темя, ціна — тина, цела — тело, ніць — нить, калоць — колоть, цярпець — терпеть, насіць — носить, цеста — тесто, цячы — течь, косці — кости.

95. Прачытайце прымаўкі і скорагаворкі. Выразна вымаўляйце гукі [ц], [ц'] і [ч].

Адгадайце загадкі.

Трэба нахіліцца, каб вады з крыніцы напіцца. Пытае марац, ці цёпла ў палец. Цецярук, цецярук, дзе твая цяцера? — Мая цяцера цецераняткам цеста месіць. Яму коцікам быць: на печы ляжаць, лыжкі лізаць. Хвасць хлеба не дасць. Да арла паляцела цяцера і папала цяцера арлу на вячэру. Твая маці і мая маці пяклі булкі ў адной хаце.

Цячэ, цячэ — не выцеча, бяжыць, бяжыць — не выбяжыць. Хто на лета апранаецца, а зімой адзення цураецца? Стаіць пані ў лясочку, мае чырвоную сарочку, хто ідзе, той паклоніцца.

Адгадкі: крыніца, дрэва, суніцы.

96. Прачытайце словы. Выразна вымаўляйце гукі [с], [ц], [с'], [ц'].

Цацка — цяць, сачы — сячы, сячы — цячы, цэла — цела, цані — цяні, сена — цэны, у ціне — сіні, сцэны — сцены, цадзіць — сядзіць, садзіць — сядзіць, месяц — месяць, сівец — сівець.

97. Прачытайце словы. Спалучэнне літар *дс*, у якім [д] з'яўляецца часткаю прыстаўкі ці прыназоўніка, вымаўляецца як [тс] або як [ц:], калі [д] выступае перад цвёрдым [с], і як падоўжаны мяккі [ц':], калі [д] ідзе перад [ц'].

Адсадзіць, падсушыць, адсадка, адсалютаваць, адсвечваць, адсвістаць, адсвяткаваць, адсейваць, адсёрбаць, адсесці, адсігналіць; падсабляць, падсабраць, падсадзіць, падсаладзіць; падсаліць, падсохнуць, падсыпаць, падцвісці, падцерабіць, падціраць, падціснуць.

98. Прачытайце словы. Спалучэнне [*д*] прыстаўкі ці прыназоўніка з наступнымі афрыкатамі [*ц*], [*ц'*] вымаўляецца як [*цц*] або [*ц'ц'*].

Адцэджаны, адцэнтраваць, адценне, адцерці, адцёрты, адціраць, адціскаць; адцурацца, адцэджваць, адцягаць, адцярпець, адцячы.

99. Прачытайце словы, спалучэнне *дч, тч* вымаўляйце як [*ч:*]; спалучэнне *чц* вымаўляйце як [*ц:*].

Навагрудчына, пад чаромхай, ад чаго, па звычцы, у хустачцы, у чашачцы, у спаднічцы.

100. Выразна, як адзін суцэльны гук, вымаўляйце гукі [*дз*] і [*дз'*] у складах і словах. Прыгадайце, што гук [*дз*] — адзіны просты гук, ён мае звонкую змычку, як [*д*] і як [*з*] — фрыкатыўны шум.

Дзынкаць, дзылінкаць, дзвынкаць, вэдзгаць, ксяндза, нэндза, пэндзаль.

Дзе-дзё-дзі-дзю-дзя; дзе́вачка, дзе́вяць, дзеся́так; дзёгаць, дзёрзкі; дзі́ва, дзік; дзю́бка, дзю́рка; дзя́дзечка, дзядзу́ля, дзяжу́рыць, дзяржа́ва, дзяліць, дзя́цел.

101. Прачытайце прымаўкі і скорагаворкі спачатку павольна, потым хутчэй. Звярніце ўвагу на вымаўленне гука [*дз'*].

Пабудзе ў вадзе і нямокры нідзе. Каб на дзятла не стралец, быў бы дзяцел маладзец. Дзяды і дзядзькі на дзядзінцы дзялілі дзялянкі. Дзятлы дзюбамі дзяўблі дрэва. Паддзямідзіў Кузьма Дзяміда, падкузьміў Дзямід Кузьму. Лепей сядзьма на калодзе, пагаворым аб пагодзе. Дзіна з Дзімай гуляюць з гадзіну: Дзіма знаходзіць Дзіну, а Дзіна — Дзіму.

102. Адгадайце загадкі. Запішыце адгадкі. Выразна вымаўляйце [*дз'*].

1. Шардзюрыла-бардзюрыла па-нямецку гаварыла, рогам траву ела.
2. Віся вісіць, ходзя ходзіць, віся ўпала, ходзя з'ела.

Адгадкі: 1) гусь; 2) вішня і свіння.

103. Змяніце словы так, каб на месцы [*т*] і [*д*] вымаўляліся гукі [*ц'*] і [*дз'*].

Цеста — у ..., рот — у ..., торт — на ..., палёт — у ..., флот — на ..., самалёт — у ..., салют — на ..., сад —

у ..., медзь — з ..., сход — на ..., бяда — у ..., вада —на ..., горад — у ..., ліст — на ..., гняздо — на ... .

104. Прачытайце словы і сказы. Аглушайце [*д͡з'*] на канцы слоў і перад глухімі зычнымі, азванчайце [*ц'*] перад звонкімі зычнымі.

Лебедзь, непагадзь, мядзведзь, медзь, ледзь; моладзь, малацьба, малацьбіт, барацьба, барацьбіт.

Не косіць Федзька, бо ў торбе рэдзька. Моладзь малацьбу любіць. Мядзведзь у непагадзь ледзь ходзіць. Федзька з дзядзькай працаваў на малацьбе. Дзядзька — добры малацьбіт. Родзька — чэмпіён школы па класічнай барацьбе.

105. Параўнайце гучанне беларускіх і рускіх слоў. Звярніце ўвагу на ўзмоцненую мяккасць беларускага гука [*д͡з'*].

Бел.	Рус.
ціна — Дзіна	тина — Дина
цікаць — дзікі	тикать — дикий
цінькаць — дзінькаць	тинькать — динькать
ціскі — Дзісна	тиски — Десна
ціхоня — дзічыцца	тихоня — дичиться
цень — дзень	тень — день
Церак — дзерава	Терек — дерево
цемень — Дзёма	темень — Дёма

106. Уважліва паслухайце. Пры беларускім вымаўленні падніміце сігнальную картку.

Пяць, пятьдесят, дзесяць, дзень, Дима, дзядзька, дзед, один, тень, сцюжа, весці, провести, дзеці.

107. Прачытайце словы. Выразна вымаўляйце падоўжаны зычны [*д͡з'*].

Стагоддзе, разводдзе, бязлюддзе, бязладдзе, гладдзю, суддзя, меддзю, у стагоддзі, разводдзю, роўняддзю.

Пярэднеязычныя шыпячыя [ш], [ж], [ч], [дж], [ш:], [ж:], [ч:]

108. Вымаўляйце выразна цвёрды [*ш*] у складах і ў словах.

Ша-шо-шу-шэ-шы; шафа, шабля, шар, каша, ігрушa; шоўк, шорах, шоргаць, шорты, шосты, шафёр; шуба, шукаць, шум, шурпаты, шушукацца, мушу, Са-

шу; шэпт, шэры, шэрстка, шэрсць, шэршань, шэсць, шэфы; шыба, шыбкі, шыйка, шыкнуць, шыла, шынель.

Аш-ош-уш-эш-ыш; наш, шалаш; вош, рошчаны; аркуш, душ; ідзеш, нешта, нясеш; рыштаванне, гладыш.

109. Прачытайце прымаўкі і скорагаворкі. Спачатку павольна, потым хутчэй. Выразна вымаўляйце [*ш*].

Паша Сашу пашыла папаху, Саша Пашы пашыў шапку. Пайшла Паша з шышкамі па шашы за Сашам: у Сашы каша, у кашы сала. Кошка мышы не таварыш. Згубіўшы большага, не шкадуй меншага. Пайшлі грошы на раскошы. На Сашы шапка, у шафе шуба. Гарошку хваліў і поп, і Ярошка, і я трошкі. Хвалілі патрохі, патрошку, ды перахвалілі Гарошку. Чым багацейшы, тым сквапнейшы.

110. Адкажыце на пытанні, адказы запішыце.

1. Што пашылі Машы на зіму? 2. Каго злавіла кошка? 3. Куды пайшоў Яша? 4. Хто водзіць машыну? 5. Хто ўмее шыць на швейнай машыне?

Адказы: 1) шубку; 2) мышку; 3) у школу; 4) шафёр; 5) швачка.

111. Прачытайце. Звяртайце ўвагу на вымаўленне гукаў [*ш*] і [*ш:*].

З нары выйшла мышка. Вушкі слухаюць, лапкі шкрабаюць. Для мышкі самы страшны звер — кошка. Яе ежа — зерне, крошкі, усяго патрошку. Шануй старэйшых, барані малодшых. З падстрэшша вылецеў верабейчык. Хто парасё ўкраў, таму ў вушшу пішчыць.

112. Прачытайце прымаўкі і сказы. Аглушайце [*ж*] на канцы слова і ў часціцы *ж*, калі яна ідзе пасля слова на галосны.

Узяўся за гуж, не кажы, што не дуж. Каб не ежка ды не адзежка, была б грошай поўная дзежка. Хлебсоль ясі, а праўду рэж. Дзе ж сабака схаваўся? Абодва ж адразу пачалі бегчы.

113. Прачытайце словы. На канцы слова і ў сярэдзіне слова перад глухімі зычнымі аглушайце [*ж*].

Вуж, смоўж, сцежка, цяжка, лыжка, прабежка, снежкі, спражка, сыраежка, важка, нябожчык, дзежка, кніжка, стужка.

114. Вымаўляйце выразна цвёрды гук [*ж*] у складах і словах.

Жа-жо-жу-жы-жэ; жа́ба, жава́ць, жар, жале́йка, жарабя́, жарто́ўны, жа́хацца; жо́луд, жо́ўты, жо́лаб; жуда́, жур, журба́, журави́ны, жучо́к; жы́ва, жывучы, жы́жа, жыр, жы́тны, жыццё; жэ́мчуг, жэ́рабя, жэ́рдка, жэ́ўжык.

115. Прачытайце прымаўкі. Выразна вымаўляйце гук [*ж*].

Чужымі рукамі толькі жар выграбаць. Малы жук ды вялікі гук. Дружба дружбаю, а служба службаю. Жабрак жабрака жабраваць вучыць. Жыта жаць не лыжкай хлябаць. З добрым дружы, а ліхіх сцеражыся. Бярыся дружна — не будзе натужна. Цяжка таму жыць, хто ад працы бяжыць. Не зважай на ўраджай, а жыта сей,— хлеб будзе. Зрабі не ў службу, а ў дружбу.

116. Адгадайце загадкі. Запішыце адгадкі. Звярніце ўвагу на вымаўленне гука [*ж*].

1. Жыве — ляжыць, памрэ — пабяжыць. 2. Адно бяжыць, другое ляжыць, а трэцяе нахіляецца. 3. Дзве дошчачкі самі бягуць, самі бягуць і мяне вязуць. 4. Руды грыб да хвой прыліп.

А д г а д к і: 1) снег; 2) рэчка, бераг, вярба; 3) лыжы; 4) рыжык.

117. Прачытайце жартоўныя вершы. Выразна вымаўляйце [*ж*]. Выпішыце словы, якія пачынаюцца з гука [*ж*].

1. Жытні сноп перавязалі
Перавяслам, як малое.
Жнеі дружна жыта зжалі —
Колецца іржышча злое.
Жыцень, Жыжаль, жарало,
Жнея, жораў, жур, жытло
Не абыдуцца без *Ж*.
Слухай жа, як конь іржэ. *(Р. Барадулін.)*

2. Жора
Ўчора
Пайшоў у Мажорава.
Жорны
Ў Жоры там:
Чорнае жэрала —

Жах! Колькі з жолаба
Жыцінак
З жэрла! *(С. Папар.)*

118. Адкажыце на пытанні. Запішыце адказы.

1. У назвах якіх птушак ёсць гук [*ж*]?
2. У назвах якіх жывёл ёсць гук [*ж*]?
3. У назвах якіх раслін ёсць гук [*ж*]?
4. У назвах якіх колераў прысутнічаюць гукі [*ж*], [*ш*], [*ч*]?
5. У назвах якіх дзеянняў ёсць гук [*ж*]?

Адказы: 1) журавель, жаўранак, крыжанка, жаўна; 2) вожык, кажан, жырафа; 3) жыта, журавіны, ружа, бружмель, пажарніца; 4) жоўты, шэры, чырвоны; 5) даўжэць, даражэць, жыць, жаўцець, мужнець.

119. Прачытайце загадкі. Выразна вымаўляйце гукі [*ж*] і [*ш*]. Запішыце адгадкі. Выпішыце словы з гукамі [*ж*] і [*ш*]. Гук [*з*] перад [*ж*] вымаўляйце як доўгі [*ж*].

1. Вузкі, быццам веташок,
Ён травы нажне мяшок,
А калісьці ў полі дбайна
Жыта жаў замест камбайна.

2. То ўперад, то ўзад, зжуе дрэва ў дробны мак.

Адгадкі: 1) серп; 2) піла.

120. Выразна і цвёрда вымаўляйце гук [*ч*] у складах і словах.

Ча́-ча-ча; час, чай, ча́пля, чапе́ц, чапля́ць, чаравічкі, чарапа́шка, чарні́ць, часо́вы, чаты́ры.

Чо́-чу́-чу; чо́рны, чо́рцік, чо́ўнік; чуб, чужа́к, чужы́, чуллівы, чу́хацца, пачуццё.

Чы-чы-чы; чыж, чыні́ць, чы́сты, чы́шчаны, начы́нка, чыгу́н, чырване́ць, чыро́к, чыта́ць, чыры́каць, мя́чык, клю́чык.

Чэ́-чэ; чэ́злы, чэсць, чэк, чэх, чэлю́скінец, чэ́мер, чэ́паць, чэ́пчык, чэ́рвень, чэ́рыкаўскі, чэчэ́нец.

Ач-оч-уч-еч-іч; бага́ч, ткач, памага́ч, плач; уро́чны, свято́чны, ноч; абру́ч, ключ; меч, печ, рэч; біч, кліч, лыч.

121. Прачытайце пары беларускіх і рускіх слоў. Беларускія словы вымаўляйце з цвёрдым [ч], а рускія з мяккім [ч'].

Бел.	Рус.	Бел.	Рус.
чай	чай	чэрпаць	черпать
чыгун	чугун	чарнець	чернеть
чыж	чиж	чорны	чёрный
чысты	чистый	чужы	чужой
чэпчык	чепчик	чэсны	честный

122. Адкажыце на пытанні. Запішыце адказы. Цвёрда вымаўляйце гук [ч].

1. У назвы якіх траў і кветак уваходзіць гук [ч]?
2. У якіх назвах збожжа ёсць гук [ч]?
3. У якіх назвах дрэў і хмызняку ёсць гук [ч]?
4. У якіх назвах насякомых ёсць гук [ч]?
5. У якіх назвах птушак ёсць гук [ч]?
6. У якіх назвах рыб ёсць гук [ч]?

Словы для даведак: чабор, гарлачык, чарот, чамярыца; ячмень, грэчка; парэчка, чарэшня; хрушч, чмель, пчала; крумкач, дзяркач, баранчык, чапля, шчыгол; шчупак, чырванапёрка, лешч.

123. Прачытайце прымаўкі і скорагаворкі. Спачатку павольна, потым хутка. Цвёрда вымаўляйце [ч].

У гультая і страха цячэ, і печ не пячэ. Рыбак рыбачыў, а рыбы не бачыў. Не плач: купіць мама калач. Чалавеча, чалавеча, чаму часам плачаш, а часам скачаш? Скокнула, скачыла, рэчку пераскачыла, ды хвосцік намачыла. Ніхто не бача, як сірата плача, але ўсякі бача, як сірата скача. Быць бычку на лычку, а цялушцы на вяровачцы. Воўча, воўча, сядзі моўча. Ці прачытаеш, ці вочы паламаеш. У няўмечкі не баляць ні ручкі, ні плечкі.

124. Адгадайце загадкі. Запішыце адгадкі. Цвёрда вымаўляйце [ч].

1. Ідзе на той свет — скача, з таго свету вяртаецца — плача. 2. Повен падпечак залатых яечак. 3. У маленькім гаршчочку кашка смачненькая. 4. Стаіць паненачка ў чырвонай сукеначцы, хто йдзе — паклоніцца. 5. Чырвоненькі пеўнічак у зямліцы спявае. 6. Каціўся клубочак, за клубочкам — торбачка, за торбачкай — нітачка. 7. Пад чарапочкам б'е чорт малаточкам.

Адгадкі: 1) вядро ў калодзежы; 2) жар, вуголле; 3) арэх; 4) ягада; 5) бурак; 6) кот; 7) гадзіннік.

125. Прачытайце вершы. Звярніце ўвагу на выразнае вымаўленне гука [*ч*].

1. *Ч* горбіць казырок таму,
Што ўсе з яго
«Чаго?»,
«Чаму?».
Чаму гудзе сярдзіта чмель?
Чаму чапляе човен мель?
Чаго,
Калі спадзе вада,
Чакае чапляў чарада?
Чаму чабор і чуб на *Ч*?
Чамучак-мучак шмат яшчэ. *(Р. Барадулін.)*

2. ЛІСІЧКА

Рыжая лісічка,
Воўчая сястрычка,
Не блукай
Ля хаты,
Мы табе не рады.
Бачу —
Хочаш кашы.
Гэта каша Машы.
Рыжая лісічка,
Воўчая сястрычка,
Не прыжмурвай
Вочы —
Маша есці хоча.
З'есць і лыжку,
І другую, і лісічку пачастуе. *(В. Шніп.)*

126. Прачытайце сказы. Цвёрда вымаўляйце спалучэнне [*шч*].

У шчупака забалела шчака. Шчоткай чышчу шчанят. У шчыкетніку зламалася дошчачка. Мароз шчыпле за шчочку. Звары боршч са шчавелю. Шчодры чалавек шчыра радуецца і чужому шчасцю. Шчабечуць у лесе птушкі. Шчыгол са шчыгліхай цэлы дзень кормяць шчыглянят. Пачысці ляшча і шчупака! Хрушч трушчыць лісце бярозы.

127. Прачытайце ўрывак з гістарычнай песні. Выразна і цвёрда вымаўляйце [ч].

Падыймалісь чорны хмары,
Неба пакрывалі,—
Прыхадзілі злы татары,
Пад Крычавым сталі.
Запалілі стары Крычаў,—
Канцы запалалі...

128. Прачытайце словы. Цвёрда вымаўляйце [ч] у спалучэннях зычных.

Чка-чку-чны; та́чка, ро́чка, да́чка, Га́лачка, гро́чка, ячме́нь, ру́чку, калю́чку, бо́чку, ка́чку, падру́чнік, со́нечны, сардо́чны, спрадве́чны, рачны́.

129. Праслухайце словы. Пры рускім вымаўленні падыміце кантрольную картку.

Вочы, рэчы, речи, очи, калючы, колючий, рачны, речной, печка, печ, печь, чысты, багач, богач, пальчык, ключык, мячик, число, чыжык, бочок, бачок.

130. Вывучыце на памяць скорагаворкі. Выпішыце словы з цвёрдым гукам [ч].

Чаплі-шызапёрачцы,
Чачотцы-танцорцы —
Неразлучнай парачцы
Прынясу я
Чарнічнага кісялю.
Дам цётачцы чаплі
Кавалачак вафлі.
А чачотцы — чачавіцы.
Табе ж, чачот,—
Чамярыцы.

(В. Вітка.)

Рыгорка на падворку
Знайшоў скорагаворку:
Печка-гняздзечка,
Там перапечка.
Ды перапечцы
Горача ў печцы,
І перапечка
Збегла з гняздзечка...
Скажы, скорагаворка,
Ці з'еў цябе Рыгорка?

(М. Маляўка.)

Пярэднеязычныя зычныя [л], [л'], [л':], [р]

131. Вымаўляйце выразна цвёрды зычны [л] у складах і ў словах:

Ла́-ла-ла; ла́дкі, ла́дна, лаз, ла́зіць, ла́зня, ла́йка, ла́пік, ла́пка, ла́саваць, ла́сы, ла́янка, лаба́ты, лавіць, лаго́дны, лагчы́нка, ладкава́ць, лажы́цца, лайда́чыць, лапушы́сты, лахма́ціцца, сі́ла, шко́ла, хала́т, сала́т.

Ло́-лэ; лоб, лом, ло́жак, лось, ло́дачка, ло́дарнічаць, ло́мка, ло́паць, ло́ўкі; ло́паць, увапро́лы, упро́лы.

Лу́-лу; лук, луг, луб, лу́бін, лу́жынка, лузга́, лубо́к, лугави́нка, лупава́ты, лупі́цца, лушпа́йка, лу́шчыць, клу́начак.

Лы́-лы-лы; лы́жка, лы́сы, лы́тка, лыч, лыжня́, лысава́ты, лысу́ха, палыма́ны, палыха́ць, клык.

Ал-ол-ул-эл-ыл; за́ла, вакза́л, сігна́л, кана́л; гол, арол, футбол; гул, бу́лка; бэ́лька, ме́лка; бы́лка, пыл, пылко́вы.

132. Прачытайце скорагаворкі і прымаўкі спачатку павольна, потым хутчэй. Выразна вымаўляйце гукі [*л*] і [*л'*]. Для выразнага вымаўлення асабліва трэба звяртаць увагу на месцазнаходжанне языка. Ён павінен быць каля верхніх пярэдніх зубоў.

Вол вала павалок па валоках. Пад полкай каўпак, пад каўпаком палка, каўпакі на палках, палкі ў палках. У Піліпа папілі ліпавага пітва. Учора гулі, сёння гулі — будзеш хадзіць без кашулі. Вялікі целам, ды малы дзелам. Глядзець вялікі, а малалікі. Караблі лавіравалі, лавіравалі, ды не вылавіравалі. Інжынеры нівеліравалі, нівеліравалі, ды не вынівеліравалі. Трымай галаву ў холадзе, а ногі ў цяпле — будзеш жыць век на зямлі. Выскачыў, як Піліп з канапель. Пілаваў Піліп палена з ліп. Мыла мама мылам Мілу. Палолі поле, палівалі, на перапёлак палявалі. Павел палоў поле, злавіў перапёлку ў доле. Зялёны-зялёны лён у бабулі — будзе Алесі з лёну кашуля.

133. Выразна вымаўляйце мяккія гукі [*л'*] і [*л':*] у складах і словах.

Лі́-лі-лі; лі́нія, лінь, лі́па, лі́пень, лі́тара, лі́чба, лі́ха, лі́шак, ліяна, лі́штва, паліва́ць, лізаць, лілея́, лімо́н, лічы́ць, па́ліва, палізаць, палі́ць, палі́ца.

Ля́-ля-ля; ля́лька, ля́мпа, лязг, ля́да, ля́пнуць, лясны́, лявёць, лякаць, ляжаць, лядо́к, ляпіць, лятучка, лячы́ць, ку́ля, Га́ля, ча́пля, Ва́ля, То́ля.

Лю́-лю-лё; лю́бая, лю́дзі, лю́дна, лю́лечка, лю́дскі, любіцелька, люля́ць, лю́стра, людае́д, лютава́ць, люцейшы, салю́т, кро́плю, куплю́, вярблю́д; Лёня, лёгка, лёд, лёжка, лётам, лётчык, лёх.

Аль-оль-уль-эль-ыль; альбо́м, жальба́, сталь; толь, павольна, толькі; ку́лька, руль, біру́лька; журавёль, мель, мадэ́ль, пасто́ль; стыль, бы́льнік, ва́більшчык, буты́ль.

Голле, галлё, Ілля́, зе́лле, вуголле, вясе́лле, во́дгулле.

134. Прачытайце апавяданне. Выпішыце словы, у якіх ёсць гукі [*л*] і [*р*].

МАЛАНКА І ГРОМ

У згодзе калісьці жылі Маланка і Гром. Любіла Маланка, калі хмары ўкрывалі неба і ажно чорным рабілася ўсё навокал.

А Гром, гледзячы на яе, шчыра радаваўся. Сябраваў ён з Маланкай. Ды неяк гарачая Маланка нізка над зямлёй шуганула і зачапіла дрэва. Загарэлася яно. Маланка ўзрадавалася і давай іншыя дрэвы паліць!

Гром разгневаўся на Маланку, пачаў сварыцца на яе, каб не паліла дрэў. Але Маланка не паслухалася Грому. Людзей крыўдзіць пачала, будынкі падпальваць.

І цяпер у навальніцу — толькі блісне Маланка, Гром ужо злуецца, сварыцца на яе.

Маланка яшчэ больш разыходзіцца — Гром голас павышае. І так да таго часу, пакуль не ўтаймуе ліхадзейку, пакуль не перастане сваволіць Маланка. Тады і Гром сціхае. Тут, глядзім, і дождж перастае.

А новая навальніца пачнецца — усё паўтараецца. Кароткая памяць у ліхой Маланкі! *(Ю. Ярмыш.)*

135. Прыдумайце такія сказы, каб у іх у кожным слове былі гукі [*л*] або [*л'*].

У з о р. На малюнку намаляваны белыя лілеі. Люба любіць гуляць. Галя лепіць з гліны ляльку. Валодзя купляе малочныя вафлі.

136. Адкажыце на пытанні. Запішыце адказы.

1. У якіх мужчынскіх імёнах ёсць гукі [*л*] і [*л'*]?
2. У якіх жаночых імёнах ёсць гукі [*л*] і [*л'*]?
3. У якіх назвах звяроў ёсць гукі [*л*] і [*л'*]?
4. У якіх назвах птушак ёсць гукі [*л*] і [*л'*]?
5. У якіх назвах рыб ёсць гукі [*л*] і [*л'*]?
6. У назвах якіх насякомых ёсць гукі [*л*] і [*л'*]?
7. У назвах якіх дрэў ёсць гукі [*л*] і [*л'*]?
8. У назвах якіх траў і кветак ёсць гукі [*л*] і [*л'*]?

А д к а з ы: 1) Мікола, Алесь, Толік, Базыль, Кароль, Валодзька; 2) Валя, Гэля, Алеся, Алёна, Волька,

Гануля, Аміля; 3) лось, алень, ласка, вярблюд, кракадзіл, леў, слон, малпа, казуля, антылопа, дэльфін, хахуля; 4) бусел, журавель, гіль, дзяцел, салавей, ляляк, лебедзь, шчыгол, ластаўка, галка, зязюля, перапёлка; 5) лінь, плотка, бялюга, укляя, лешчаўка; 6) слімак, матылёк, чмель, клоп, пчала, моль, тля, блыха; 7) ліпа, клён, вольха, яліна, таполя; 8) васілёк, палын, гарлачык, ландыш.

137. Прыдумайце дзесяць слоў, якія пачынаюцца з [*л*] і з [*л'*]; дзесяць слоў, у якіх [*л*] знаходзіцца ў сярэдзіне слова.

138. Да слоў з левага слупка падбярыце з правага словы з процілеглым значэннем. Вызначце, у якой пазіцыі ў слове знаходзяцца ў іх гукі [*л*] і [*л'*].

горкі	вясёлы
сумны	салодкі
правы	малады
стары	маленькі
вялікі	левы
добры	белы
чорны	злы
гарачы	халодны

139. Прачытайце гумарыстычны верш. Знайдзіце словы, якія адрозніваюцца толькі гукамі [*л*] і [*л'*].

Каля лесу бегла
ліска,
А насустрач лісцы
Лыска.
Папрасіла ліска
Лыску:
— Палюляй, сусед, калыску...
Але Лыска
ані блізка:
— Не люляў я лысянятак,
Што ж люляць мне лісянятак. *(Р. Барадулін.)*

140. Прачытайце загадкі. Запішыце адгадкі. Выразна вымаўляйце [*л*] і [*л'*].

1. За лесам-пералесам сіненькі агонь гарыць. 2. Адзін лье, другі п'е, трэці расце. 3. Белы — не снег, зялёны — не луг, кучаравы — не дзяўчына. 4. Якія ногі, такі ж нос, па балоту ходзіць скрозь, па балотах ён курлычыць, лягушат і жабак лічыць. 5. Ні калода

і ні пень, ды ляжыць цэлы дзень, не капае і не косіць, а есці просіць. 6. Бяжала, цякло і лягло пад шкло.

А д г а д к і: 1) лён; 2) дождж, сонца, трава; 3) бяроза; 4) жораў; 5) гультай; 6) вада і лёд.

141. Вымаўляйце выразна цвёрды [*р*] у складах і словах.

Ра́-ра-ра; ра́га, ра́да, ра́дасны, радзі́ць, ра́на, ра́ніць, раса́, рабі́на, рабо́та, равок, рага́ты, радні́ць, радчэ́й, ражо́к, разабра́ць, разадра́ць, разба́віць, разба́лаваць, разблы́таць, расі́нка.

Ру́-ру-ру; ру́бка, ру́жавы, ру́мзаць, рунь, ру́пець, рух, руды́, падару́нак, Мару́ся, руб і́ць, рублёвы, ружжо́, руйнава́ць, рука́, рухавічкі́, румя́ны, руса́к, рухавік, ручаі́нка, па́рус, уго́ру.

Ры́-ры-ры; ры́ба, ры́бка, ры́жы, рык, ры́ла, ры́нуць, ры́са, ры́ска, ры́ссю, стары́, крыніца, рыба́ліць, рыда́ць, рыдлёўка, рыпе́ць, рыхлі́ць, тво́ры, крыча́ць, крыва́вы, трыма́ць.

Рэ́-рэ-ро; рэ́бус, рэ́берны, крэ́йда, рэ́дзька, рэ́дка, рэ́залка, рэ́пка, рэ́ха, рэч, рэ́чка, рэ́шткі, рэ́я, рэ́шата, рэзеда́, рэ́згіны; рог, ро́гат, род, бяро́за, ро́здум, ро́зны, ро́зум, ро́лік, ро́ля, ро́ст, рот, роў, ро́ўны, ро́ўня.

Ар-ор-ур; фа́рба, па́рта, кама́р, гарбу́з, цу́кар; мо́рква, тхор, мато́р; ку́ртка, фу́рман, ску́рка, ту́ркаць, турма́.

Эр-ыр-ір-ор-ар; сэ́рца, пе́ршы, цуке́рка; жыр, сыр, шыр; брыгадзі́р, касі́р, І́рка, сці́рка, спірт; шафёр, манцёр, ліфцёр; му́ляр, цясля́р, кавя́рня.

142. Прачытайце словы па-беларуску і па-руску. Звярніце ўвагу на якасць гука [*р*] у абедзвюх мовах.

Бел.	Рус.	Бел.	Рус.
рака	река	рэдзька	редька
мора	море	рэпа	репа
рэшата	решето	рыс	рис
рабы	рябой	рэдкі	редкий

143. Праслухайце словы, прачытаныя па-руску і па-беларуску. Пры беларускім вымаўленні падыміце кантрольную картку.

Трэці, тры, вытри, третий, дремать, драмаць, три, дрыжаць, брыгада, брить, дрожать, бригада, брыць, приз, прынесці, прыз, принести.

144. Перакладзіце рускія словы на беларускую мову.

Репа, гречка, дверь, зверь, гиря, рябой, ряд, моряк, зарядка, варю, борюсь, трюм, дремать, крем, греметь, грести, пришить, прибить, перевезти, перегнать, пригреть, стеречь, беречь, тереть.

145. Прачытайце пары слоў, адрознівайце беларускае вымаўленне ад рускага.

Рад — ряд, парадак — порядок, бура — буря, грим — грым, Рым — Рим, рабы — рябой, бурю — буру, гару — горю.

146. Перакладзіце беларускія словы на рускую мову. Параўнайце вымаўленне [*р*] у роднасных словах.

Буквар, сухар, зорка, горка, Сібір, цяпер, дзвер, звер, градка, бруква, Сярожа, Андрэй, трум, рукзак, грыміць, серада, курыць.

147. Прачытайце прыказкі і прымаўкі. Выпішыце словы з цвёрдым [*р*].

Дзе няма ахвоты, там няма работы. І баран бы касіў, каб хто касу насіў. Чужымі рукамі толькі жар выграбаць. Дрэмлючы, нічога не выдрамлеш. І шыла, і мыла, і прала, і ткала — і ўсё языком. Яму раніцою росна, у поўдзень млосна, а ўвечары — камары кусаюць. Наш Андрэй за ўсіх мудрэй.

148. Перакладзіце на беларускую мову. Звярніце ўвагу на вымаўленне [*р*].

Ряд, берег, рыба, гиря, звери, моря, не верь, пожарь, свари, горький, аптекарь, крем, кривой, тревога, тридцать, забери, рябой, рябина, ремонт, Рита, варю, порю, редиска.

149. Прачытайце прымаўкі і скорагаворкі. Спачатку павольна, потым хутчэй. Выразна вымаўляйце [*р*] і [*л*].

Дудар дудару дарма грае. Трыццаць тры дрывасекі дроў трыццаць тры дрывотні надрывасечылі. Кроп у страве, страва на траве, трава на дварэ, дровы на дрывотні. На каптуры каптур, пад каптуром каптур — каптур пад каптур, каптур на каптур. Усе бабры дабры, адна выдра — ліха яе бяры. Панкратава карта ў Карпа, Карпава карта ў Панкрата. Падарыў Пан-

крат Карпу паркаль і шкарпэткі, паркаль пакралі, шкарпэткі парвалі. Калы трэба перакалоць, перакалаціць, пералапаціць. Ларыса рабіла лабараторныя работы ў лабараторыі. Лаўрэн на рэчцы лавіў рыбу. Ларыса варыла рыбу з лаўровым лістом. Рабая курка клюе крупкі. Не было акварэлі ў Валеры. Пры кастры — кара, пара карагодзіць ля кастра.

150. Адгадайце загадкі. Запішыце адгадкі. Выразна вымаўляйце гукі [*р*] і [*л*].

1. Ляжыць Рыгор паміж гор, лапушком пакрыты. 2. Чоран, ды не воран, рагат, ды не бык, шэсць ног без капыт, ляціць — вые, сядзе — зямлю рые. 3. Лёг вусаты, а ўстаў гарбаты. 4. Маленькі шарык пад лаўкаю шарыць.

Адгадкі: 1) агурок; 2) жук; 3) кот; 4) мыш.

151. Адкажыце на пытанні, запішыце адказы. Перакладзіце адказы на рускую мову. Прачытайце пытанні і адказы ўголас.

1. У назвах якой агародніны ёсць гук [*р*]?
2. У назвах якой садавіны ёсць гук [*р*]?
3. У назвах якіх траў ёсць гук [*р*]?
4. У якіх назвах хмызняку ёсць гук [*р*]?
5. У назвах якіх дрэў ёсць гук [*р*]?
6. У назвах якіх кветак ёсць гук [*р*]?
7. У назвах якіх грыбоў ёсць гук [*р*]?
8. У якіх мужчынскіх імёнах ёсць гук [*р*]?
9. У назвах якіх звяроў ёсць гук [*р*]?

Адказы: 1) морква, бурак, кроп, гарбуз, агурок; 2) ігруша, вінаград, абрыкос, гранат; 3) чабор, аер, чарот, крапіва, папараць, свірэпа, чамярыца, пажарніца; 4) арэшнік, бружмель, крушына, парэчка, чарэшня, агрэст; 5) граб, бяроза, рабіна, чаромха; 6) рамонак, вяргіня, гарлачык, ружа; 7) баравік, смаржок, рыжык, грузд, сыраежка, печурыца, гаварушка, мухамор; 8) Рыгор, Пятро, Пранак, Франак; 9) барсук, тхор, бабёр, гарнастай, зубр, крот, рысь, вавёрка, выдра, норка, расамаха.

152. Прачытайце загадкі ўголас. Запішыце адгадкі. Перакладзіце адгадкі на рускую мову.

1. Дождж ідзе, і ён расце. 2. Круціцца, хістаецца, ды берагоў трымаецца. 3. Ідзе ў гаршчок чорным,

а выходзіць чырвоным. 4. Чым канчаецца вечар і пачынаецца ранак? 5. Хатка ў пяці братоў: у чатырох адзін пакой, а найбольшы браток улез у асобны закуток. 6. У зямлі хавалася, гаспадыні дасталася, яна яе распранала і слёзы ўціра́ла. 7. Ні рак, ні рыба, ні звер, ні птушка. Звініць танюсенька прама ў вушка. Хто яго заб'е, той сваю кроў пралье. 8. Крутая гара, што не крок, то й нара. 9. Ляціць арліца па сіняму небу, крыла раскрыла, сонца закрыла. 10. У карабочак схаваліся драўляныя хлопцы. Белыя, здаровыя, усе чорнагаловыя.

Адгадкі: 1) грыб; 2) рэчка; 3) рак; 4) літара *р*; 5) рукавічка; 6) цыбуля; 7) камар; 8) драбіна; 9) хмара; 10) запалкі.

153. Прачытайце. Выразна вымаўляйце гукі [*р*] і [*л*].

Лак — рак, лама — рама, маліна — Марына, валіць — варыць, плавіць — правіць; вал — вар, жаль — жар, Лука — рука, шаль — шар, жалка — жарка, Валя — Вара, ліць — рыць.

154. Прачытайце прымаўкі і скорагаворкі. Выразна размяжоўвайце гукі [*р*] і [*л*].

Маладога кроў грэе. Жвавы, як рак на грэблі. Якая праца, такая і плата. Белыя рукі працы баяцца. Адна звычка гультаёў усіх: рабіць чужымі бакамі, а ляжаць на сваіх. Не пытайся, які гаспадар, калі вароты падаюць, а колы рыпяць.

Клара ў Валі грае на раялі. Рыла свіння тупарылая, увесь двор перарыла. Ляцеў перапел перад перапёлкаю, перад перапелянятамі. Піліп-Піліпок пад ліпай прылёг. Чорная варона трапіла лапкай у белую фарбу, нафарбавалася, перафарбавалася, паперафарбавалася.

Сярэднеязычны зычны [*й*]

155. Вымаўляйце дакладна гук [*й*] у складах і словах.

Йа́-йа-йа; я́блык, я́вар, я́года, яд, язь, я́кар, я́ма, яр, я́ркі, я́сень, я́слі, я́хта, я́шчарка, я́чка, ягня́, ядло́вец, ядна́ць, ядро́, язы́к, яліна, ямчэ́й, яно́т, япру́к, яравы́, яршы́ць, ястрабо́к, яхідна, ячме́нь, змяя́, Ра́я, Ма́я, твая́, паясы́, а́рмія, стая́к, ваяўні́чы, уявіцца, уяда́ць.

Йо-йу́-йу; ёкнуць, ёлка, ёлкі, ёмкі, ёрзаць, ёрш, ёсць, ёўня, раёк, раён, гаёк; уюн, уюро́к, гаю́ча, я ве́даю, Юля, Ю́рка, Юзік, пяю, гуля́ю.

Ие́-йі́-йі; е́дка, е́жа, е́здзіцца, е́лачка, е́льнік, е́нчыць, Ерэва́н, е́сці, Еўро́па, е́хаць, Егіпет, ездавы́, Езяры́шча, баец, прые́мны; іней, Іра, іхні, стаіць.

156. Перакладзіце беларускія словы на рускую мову. Вызначце, якім гукам яны адрозніваюцца.

Сіні, чорны, зялёны, жоўты, шэры, белы, светлы, родны, стары, малы, вялікі, горкі.

157. Выразна адрозніваючы вымаўленне гукаў [л'] і [й] у складах і словах.

Я-ля, ю-лю, ё-лё, ай-аль, ой-оль, уй-уль. Я-ля, ядá — ля́да, лядо́к — ядо́к, я́мка — ля́мка, лянóта — янóта, ля́мачка — я́мачка, ля́шка — Я́шка; Ю́лька — лю́лька, лю́та — ю́та, Калю́та — каю́та; ёд — лёд, ён — лён, паéсці — палéзці; кроль — крой, столь — стой; куй — куль.

158. Адкажыце на пытанні. Запішыце адказы.

1. У назвах якіх птушак гук [й] знаходзіцца ў канцы слова? у сярэдзіне слова?
2. У назвах якіх звяроў ёсць гук [й]?
3. У назвах якіх рыб і якіх паўзуноў ёсць гук [й]?
4. У назвах якіх дрэў ёсць гук [й]?
5. У якіх мужчынскіх імёнах ёсць гук [й]?
6. У якіх жаночых імёнах ёсць гук [й]?
7. У назвах якіх кветак ёсць гук [й]?
8. У якіх прозвішчах ёсць гук [й]?

Адказы: 1) верабей, салавей, бугай, сойка; 2) заяц, гарнастай, гіена, нутрыя; 3) язь, укляя, змяя, яшчарка, п'яўка; 4) ясень, хвоя, яліна, яблыня; 5) Ян, Мікалай, Фадзей, Аўгей, Яська; 6) Зоя, Рая, Тая, Еўдакія, Софія, Эмілія; 7) лілея, фіялка; 8) Бугаёў, Салееў, Дземянцей, Круглей, Бруй.

159. Прачытайце казку. Выпішыце словы з гукам [й].

ЯК КАТЫ ВАРЫЛІ ЮШКУ

Сабраліся аднойчы каты і пайшлі на раку рыбу лавіць. Налавілі яны рыбы, і кот Мітрафан запытаўся:

— Смажыць будзем ці юшку зварым?
— Юшку! — закрычалі каты.— Юшку!
Кот Мітрафан апусціў у кацёл печкуроў, кінуў туды рознай прыправы і сказаў:
— Няхай варыцца. А я прайдуся, адпачну трошкі.

(Я. Пархута.)

160. Прачытайце прымаўкі. Выпішыце словы, у якіх ёсць гук [ў].

Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы. Свой, не свой, а перад кіем не стой. Болей знай, ды меней бай. Добрая каша, ды малая чаша. Бывала, што й варона кукавала. Не ўздыхай: няма — і няхай. Хоць рыкае, але прывыкае. Пайшоў у госці да кума, аж ён дома. Душа мая не крывая: усё прымае. Дай бог чутае бачыць. Абы-які двойчы робіць, а скупы тройчы траціць.

Заднеязычныя зычныя [г], [г'], [к], [к'], [х], [х']

161. Вымаўляйце выразна гук [к] у складах і словах.

Ка́-ка-ка; ка́ва, ка́даўб, ка́дка, ка́пнуць, ка́ркаць, ка́рта, ка́шляць, каштоўны, кава́ль, кабі́на, кабе́рац, кабы́ла, кава́ць, кавун, кадушка, кажа́н, каза́, кайданы́, каласо́к, калаці́ць, калёсы, калма́ты, калыха́нка, кама́р, камя́к, капры́зіць, каршу́н.

Ко́-ку́-ку; ко́зачка, ко́зытна, ко́латы, ко́лер, ко́мін, конь, кошык; ку́заў, куль, кум, ку́раць, кува́ць, кукарэкнуць, кураня́ты, курады́мець.

Кі́-кі-кы; кій, кі́дкі, кі́нуць, кі́па, кі́ска, кі́слы, кіўну́ць, кі́шка, кішэ́ня, кіт, кірава́ць, ківа́цца, кідо́к, кілбаса́, кілі́м, кіно́, кіпе́ць, кіпцю́р, кірма́ш, кі́слы, кіяскёр, птушкі, ка́зкі, ба́йкі, навы́перадкі, узго́ркі; кыш, Кызылку́м.

Ке́-ке-кю; кедр, ке́ліх, ке́міць, ке́млівы, ке́пачка, ке́пска, ке́рпацца, кефі́р, ке́шкацца; кювет, кюры́.

Ак-ок-ук-ік-ык-ек; мак, рак, каза́к; сыно́к, сок, насо́к, пясо́к, мяшо́к, лясо́к, рок, змрок; жук, бук, павук, барсу́к; сто́лік; клю́чык, каўне́рык, ножык, бык, стык.

162. Закончыце сказы. Запішыце. Падкрэсліце літару [к], вызначце яе месца ў слове.

1. Певень кукарэкае. 2. Зязюля .... 3. Жураўлі .... 4. Бусел .... 5. Кнігаўка .... 6. Крачка .... 7. Лягушка .... 8. Сабака .... 9. Кот ....

Словы для даведак: куваць, курлыкаць, клекатаць, кігікаць, кракаць, квакаць, гаўкаць, мяўкаць.

163. Адкажыце на пытанні. Запішыце адказы. Вызначце месца гукаў [к] і [к'] у слове.

1. Назвы якіх дрэў і кустоў пачынаюцца гукамі [к], [к']? канчаюцца імі?
2. У назвах якіх палявых культур ёсць гук [к]?
3. Якія з назваў агародніны пачынаюцца з гука [к] і якія заканчваюцца ім?
4. У якіх назвах грыбоў ёсць гук [к]?
5. У назвах якіх птушак ёсць гук [к] у пачатку слова? у яго канцы? у сярэдзіне слова?
6. У назвах якіх звяроў ёсць гук [к]?
7. У назвах якіх насякомых ёсць гук [к] у пачатку слова? у яго канцы? у сярэдзіне слова?

Адказы: 1) кедр, клён, каліна, крушына; арэшнік; 2) канюшына, кукуруза, грэчка; 3) кроп, капуста; часнок, гурок, бурак; 4) абабак, баравік, махавік, масляк, сыраежка, апенька, ваўнянка, лісічка, зялёнка; 5) крумкач, коршак, кнігаўка, крыжанка; грак, шпак, ляляк; галка, дзяркач, ластаўка; 6) кракадзіл, крот, куніца, казуля, макака, вожык, шашок, ласка; 7) конік, камар, клоп; матылёк, павук; стрэлка, цвыркун.

164. Прачытайце скорагаворкі і прыслоўі, спачатку павольна, потым хутчэй. Назавіце словы з гукамі [к] і [к'].

Кулік ды чайку схапіў за чубайку, а чайка кігіча, ды згінь ты, куліча. Капылы перакапылілі, перавыкапылілі, капыты перакапыцілі, перавыкапыцілі. Кола выкалесілася, перавыкалесілася. Палукашак выкалукашыўся, перавыкалукашыўся. Кумка кумцы па сакрэту, а кумка ўсяму свету. Каму па каму, а каму два камы. Ішоў поп каля коп, каля капы, каля паўкапы.

165. Вымаўляйце выразна гук [г] у складах і ў словах. У канцы слова аглушайце [г].

Га́-га-га; гад, газ, гадзі́ць, гак, га́ньбіць, га́ўкаць, га́хнуць, гарэ́ць, агаро́дніна, гаро́х, гарт, габлява́ць, гаварыць, гадава́ць, гадзі́ннік, гадзю́ка, гаёк, газе́та, гайдану́ць, гайса́ць, галада́ць, галёкаць, галіна́, галубяня́, гаманлі́ва, ганарлі́вы, гарбу́н, гарбу́з, гаро́тны, гартава́ць.

Го́-гу́-гу; год, го́жа, го́йдацца, го́лад, го́лас, го́лле, го́луб, гон, го́нар, го́рад, го́ра, горб, го́рды, го́ркі, го́рны, горш, госць, го́цкаць; гуз, гу́ма, гу́рба, гурт, гу́сеніца, густ, гу́тарка, гу́чны, гугні́ць, гужава́ты, гульну́ць, гультяява́ць, гуля́ць, гуро́чнік, гусце́ць, гусяня́, гушкану́цца.

Гы-гэ́; гы́ркаць, гырканіна, гы́ркнуць; гэ́блік, гэ́ны, гэ́та, гэ́такі.

Аг-ог-уг-эг; багно́, лагчы́на, піро́г, плуг, бе́раг; рог, стог, твар о́г, бег.

Ге-гі-гю; гера́нь, геркуле́с, геро́й, ге́стка, геаграфія, генера́л; гі́бель, гі́бкі, гіпс, гігі́кнуць, гітары́ст, гісто́рык, гіяцы́нт; гюрза́.

166. Прачытайце пары беларускіх і рускіх слоў. Памятайце, што беларускі [*г*] не такі, як рускі. Пры яго вымаўленні рот адкрыты адвольна, язык ляжыць плоска, сярэдняя частка яго трошкі прыўзнімаецца да паднябення. Паветра з невялікім шумам і з голасам выходзіць у шчыліну паміж зубамі. Ён нагадвае гук [*х*], толькі вымаўляецца звонка.

Бел.	Рус.	Бел.	Рус.
гара	гора	грамада	громада
газ	газ	грозны	грозный
газета	газета	грубіць	грубить
галава	голова	губіць	губить
гвозд	гвоздь	гуляць	гулять
гнёт	гнёт	гусь	гусь
гневацца	гневаться	прагул	прогул

167. Прачытайце прымаўкі і скорагаворкі. Звярніце ўвагу на вымаўленне [*г*].

І тут гу-гу, і там гу-гу, і нічога разабраць не магу. Гаваркія галубы гулялі ў галубятні. Гаварыў, гаварыў, не дагаварыў, дагаворваў, ды загаварыўся. Той не можа быць другам, хто абыдзе ў бядзе кругам. Які розум, такая і гаворка. Байкі дзяцей гадуюць.

168. Прачытайце словы. Запомніце, што ў іх вымаўляецца выбухны [*г*], такі гук, які пашыраны ў рускай мове. Ён не такі працяглы, як [*г*] у большасці беларускіх слоў. Прыдумайце сказы з гэтымі словамі.

Гузік, ганак, гуз, гонты, гарнец.

169. Вымаўляйце выразна гук [*х*] у складах і словах.

Ха́-ха-ха; ха́та, хан, ха́пнуць, харч; ха́тні, хва́ля, хва́стаць, хва́тка, хваці́ць, хадакі́, хава́цца, хаке́й, халадзе́ць, халадо́к, хаце́цца, хваёвыя, хвала́, хвараві́ты.

Хо́-ху-ху́; ход, хо́лад, хо́піць, хор, хо́раша, хо́лада-ўстойлівы, хо́ванка, хо́рам, Хо́йнікі; ху́каць, ху́стка, ху́таць, ху́тка, худава́ты, худзе́ць, худы́, хусці́нка, ху́ткі, ху́ценька, ху́тацца.

Хе́-хі́-хі; хэк, Херсо́н, хі́біць, хілі́ць, хі́лы, хіну́цца, хіста́цца, хі́тры, хіхі́каць, хітру́ха.

Ах-ох-ух-ех-іх; пахлусі́ць, па́хмурна, пахмяля́цца, па́хнуць; ро́хкаць, мох, засо́х; ру́хнуць, дух, рух; чэх, цэх; подых, ціхмя́насць, сці́хнуць.

170. Прачытайце скорагаворкі і прымаўкі. Выразна вымаўляйце гукі [*х*], [*х'*], [*к*], [*к'*].

Гусі, гусі, гусяняты. У Ігната гусянят багата. Як Якімка, так і Хімка; а як Хімка, так і Якімка. Ох, ох, лепей удвох! Хай цябе няхай! Хадорка Хведара не хай! Ходзіць ціхенька, ды думае ліхенька. Няхай так, няхай сяк, няхай будзе з грэчкі мак. Захварэў чалавек, хварэў, хварэў, перахварэў ды нарэшце хваробу вылечыў. У рабоце «ох», а з'ясі за трох. Чыя адвага, тая і перамога. Губамі гавары, а рукамі рабі. Нёс Рыгор пірог праз парог, стаў на гарох, упаў на парог.

171. Адгадайце загадкі. Запішыце адгадкі. Звяртайце ўвагу на вымаўленне гукаў [*г*], [*г'*], [*х*], [*х'*].

1. У зялёнай абалонцы, а ўсярэдзіне, як сонца.
2. Рыкнуў воўк на сто гор, на тысячу гарадоў.
3. Ёсць шапка, але няма галавы, ёсць нага, але без чаравіка.
4. Па дне рэчкі ля крынічкі ходзяць чорныя нажнічкі. Ідуць у лазню чорнымі — вяртаюцца чырвонымі!

5. Калі з *к* я у пачатку,
   То жыву ў марской вадзе,
   Калі *к* на *г* ты зменіш,
   Зазелянею на зямле.

6. Не маржы і не дэльфіны
   Скокнулі з вады на льдзіны.
   Мо, ад сцюжы небаракі
   Апранулі з пер'я фракі?

Каб сагрэцца, памаленьку
Скачуць танец «летку-еньку».

Адгадкі: 1) арбуз; 2) гром; 3) грыб; 4) ракі; 5) краб, граб; 6) пінгвіны.

172. Прачытайце апавяданне. Выпішыце словы з гукамі [*г*], [*к*], [*х*].

ВАРОНА

Жыла-была ў пушчы Варона. Аднойчы яна пазнаёмілася з гусямі, што плавалі паблізу вёскі. І нібы падмянілі яе. Вярнулася пад родныя шаты і:

— Тэрмінова патрэбны маляр!

Прыбег Янот-маляр, а яна:

— Бяры квач і пабялі мае пёры!

Праз хвіліну паглядзелася Варона ў лужыну, задаволена каркнула і паляцела на рачулку:

— Паўзірайцеся, гусі! У чараду вашу хачу!

— Га-га-га! — зарагаталі гусі, а гусак Сімка сказаў:

— Ты, ш-шаноўная, ш-шалапутка!..

Варона нібы косткаю падавілася. А вярнулася дамоў, і там яе сароміць сталі:

— Краля!..

А яна:

— Га?

— Гэта здрада!

А яна:

— Га?

— Бач ты яе! — не вытрымалі сяброўкі.— Ужо і мовы матчынай цураецца, толькі па-гусінаму і гаворыць!.. Тады перабіралася б на раку. Толькі ці далёка заплывеш з імі?..

Белая Варона, якая нядаўна была шэрай, апусціла дзюбу і ўпершыню задумалася: «Сапраўды, ад сваіх адраклася і да чужых не прыбілася...» *(Я. Пархута.)*

173. Прачытайце ўрывак з верша. Выпішыце словы з гукамі [*г*], [*к*] і [*х*].

САНЕТ

Замёрзла ноччу шпаркая
крыніца;
Твая пара, зімовая нуда!

Цяпер няма ўжо руху ні
сляда,
І нават зверху слоем снег
лажыцца.
Ды ўсё дармо, бо там, пад ім,
струіцца
Магутная, жывучая вада.
Чакай! Яе йшчэ прыйдзе
чарада!
Здалее хваляў хор на вольны
свет прабіцца. *(М. Багдановіч.)*

174. Прачытайце верш Р. Барадуліна. Выпішыце словы, у якіх ёсць [*г*] — выбухны, падобны на рускі гук.

Глянь,
Сагнула даланю
Г, каб змераць глыбіню.
Дзе яно,
Глухое дно?
З галавой *Г* не відно.
Хай тваё звыкае вуха —
Г гучыць заўсёды глуха:
Гаць, гарбуз, гарлач, галіна,
Гол, гара, гагара, гліна.
Не забудзься ж і наконт
Словаў тых,
Дзе *Г* званчэе:
Ганак, гузік, розгі, гонт.
Гэта клопат грамацея. *(Р. Барадулін.)*

Гукапіс

Звычайна ў моўнай плыні ў словах сустракаюцца гукі рознай якасці, і паўторы нейкіх сярод іх не заўважаюцца. Аднак у мастацкіх творах для дасягнення пэўнага мастацкага эфекту ажыццяўляецца часам спецыяльны падбор гукаў. Насычаныя аднолькавымі гукамі, зычнымі і галоснымі, сказы і тэксты прыцягваюць да сябе больш значную ўвагу. Адзін са спосабаў гукавой арганізацыі маўлення, які належыць да гукавых паўтораў, называецца алітэрацыяй (лац. alliteratio, ад лац. ad 'да', 'пры' і littera — літара).

Алітэрацыя — паўтарэнне аднолькавых або блізкіх

зычных для ўзмацнення выразнасці мовы (часцей вершаванай), якое дасягаецца адпаведным падборам слоў. Такія словы, звязаныя алітэрацыяй, выдзяляюцца ў моўнай плыні, набываюць асаблівую інтанацыйную значнасць. Як стылявы прыём алітэрацыя з даўніх часоў ужываецца ў вусна-паэтычных творах і ў паэзіі. На алітэрацыі пабудаваны многія прымаўкі і прыказкі *(Ні да печы, ні да рэчы; Ні да рады, ні да звады)*, чыстагаворкі *(У пустой птушкі пустая песня)*, лічылкі, песенькі-забаўлянкі *(Чук-чук-чук, Налавіў дзед шчук, А баба плотак Ды пазвала цётак)*, калыханкі і інш.

Самым простым відам алітэрацыі з'яўляецца гукаперайманне — умоўная імітацыя гукаў з навакольнага асяроддзя фанетычнымі сродкамі пэўнай мовы: *ку-карэ́-ку, ж-ж-ж, ку-ку; ціў! кар! мяў-мяў! бах! плёх! хрась! тых! баў!* і інш. Прыгадаем урывак з твора І. Чыгрынава, у якім добра паказана, як беларусы чуюць некаторыя з галасоў прыроды:

Аднекуль прыляцеў дзяцел і сеў на сасну, што стаяла крокаў за дзесяць ад палатак.

— Стук-стук-стук, стук-стук-стук...

На зямлю пачала церушыцца сасновая кара.

«Канаплянкі»,— падумаў Аляксей.

Праз хвіліну на кусце жавіны, што буяў ля дашчанае сцяны ротнай капцёркі, запела берасцянка:

— Пінь-пінь, пінь-пінь...

Песня была звонкая, бадзёрая.

— Фыю... фыю... фыю...

— Ля-ля-ля,— не змаўкала берасцянка.— Дзі-дзі, дзі-дзі, ві-чую, ві-чую...

Аляксей ажно заслухаўся.

Уставала раніца. (І. Чыгрынаў. Самы шчаслівы чалавек.)

Гукаперайманні — вельмі старажытная частка слоўніка кожнай мовы. Таму цікава ведаць, што нават у блізкароднасных мовах адны і тыя ж з'явы прыроды, адны і тыя ж гукі выклікаюць розныя асацыяцыі. Напрыклад, бел. *кнігаўка* — птушка сямейства сяўцоў, якая жыве на балотах, сырых лугах, згодна з народным тлумачэннем, крычыць: *«кні-гі»*. Чэхі, у якіх яна завецца kniha, чуюць у яе крыку *«кні-кні»*. Такая ж птушка ў рускай мове (чибис) быццам бы пытаецца: *«Чьи? Чьи-вы?»* Яшчэ адзін прыклад. Беларускае слова *каня* зараз абазначае драпежную птуш-

ку сямейства яструбіных і кнігаўку. Больш старажытнае значэнне гэтага слова — першае, бо *канюк, канюка, канюх* — таксама каршун, і ў старажытных славян, у праславянскі час, словы *kan'a, kan'ukъ абазначалі драпежную птушку. Назва мае гукаперайманальнае паходжанне, бо птушка «вымаўляе» своеасаблівы манатонны піск; дакучлівы крык яе нагадвае слова *«піць»* (адсюль, дарэчы, і дзеяслоў *канькаць* — выпрошваць са слязьмі, дакучліва прасіць, паўтараць адно і тое ж). Піск кані і кнігаўкі вельмі падобны, таму каняй называюць яшчэ і кнігаўку.

Прытаіцца да моху русалка, лясун,
Каня вечнага «піць» не заводзіць.
Пад звон-песню жывучых гусляравых струн
Для ўсіх папараць-кветка ўзыходзіць.

(Я. Купала.)

Гукаперайманне адлюстравалася і ў вельмі старажытнай назве птушкі *бугай.* Начная балотная птушка сямейства чапляў была празвана так за тое, што вясной самец яе, апусціўшы дзюбу ў ваду, утварае вельмі гучныя гукі, падобныя да рову бугая. У Я. Коласа чытаем: *«...У балотах, між лесу, пераклікаліся бугаі, бухаючы, як у пустыя кадушкі».*

Гукаперайманне і яго адлюстраванне ў лексіцы — вельмі цікавая і прывабная лінгвістычная тэма, якую можна прапанаваць падрыхтаваць у якасці даклада на занятках факультатыву або лінгвістычнага гуртка. Можна прапанаваць вучням прааналізаваць такія рады дзеясловаў, як *кракаць, крумкаць, квактаць, кукарэкаць; кумкаць, крактаць, квакаць; чмякаць, цвякаць, хрумстаць; хрусцець, храбусцець*, а таксама назвы звяроў і птушак, утвораныя шляхам гукаперайманння.

Словы, звязаныя алітэрацыяй,— добры матэрыял для гука-літарнага аналізу. Яны робяць больш лёгкім і эфектыўным выдзяленне пэўных гукаў. Алітэрацыя звычайна выступае як першааснова далейшых гукавых асацыяцый. Аналіз вершаў, у якіх мае месца гэта з'ява, дазваляе лепш зразумець аўтарскую працу над словам.

Практыкаванні

1. Прачытайце ўрывак з верша Р. Барадуліна «Матылёк». Які зычны ў ім паўтараецца асабліва часта і чаму?

Лілею
млявы
плёс
люляе,
З-пад злежаных
аблок
здалёк
Ляціць віхлясты і бялявы
Пялёстак лёгкі —
матылёк.

2. Прачытайце верш. Выпішыце словы з літарай *ч*. Як вымаўляецца беларускі гук [ч]?

Скача чапля па балоце,
чачотачка — у чароце,
а чубаты чачот
топча, топча агарод.
Я чачота падпільную,
чапялою пачастую. *(В. Вітка.)*

3. Прачытайце верш. Вызначце, які зычны гук і з якой мэтай паўтараецца аўтарам.

ШПАЧОК

Пайшоў шпак на шпацыроўку,
Знайшоў хустку-кашміроўку.
А шпачыха завязала
І нічога не сказала.
Пайшоў шпак на шашу,
Знайшоў шапку малышу.
Харошая шапка,
Дзякуй табе, татка. *(В. Вітка.)*

4. Прачытайце верш. Вызначце, якія словы аб'ядноўваюцца адной літарай. Якая гэта літара? Які гук яна абазначае? Якія зацвярдзелыя зычныя ёсць у беларускай мове?

Штохвіліны на шашы
шумна, як на кірмашы.
Шоргат,
шорах,
шум птушыны.

За машынаю машына.
Нешта шэпча
шына шыне.

* * *

Шэпча шустрая шаша:
— Не спяшайцеся,
ша-ша! *(Р. Барадулін.)*

5. Прачытайце верш. Якія два зычныя гукі паўтараюцца ў ім найбольш часта? Якія зацвярдзелыя зычныя яшчэ ёсць у беларускай мове?

Драч-рвач,
зубны ўрач,
што за крык,
што за плач,
што за гам —
тарарам?
— Зубы рву
камарам,
каб не грызлі камары
доктаравай дзетвары. *(В. Вітка.)*

6. Прачытайце верш Р. Барадуліна «Загадкі на градках». Адгадайце загадкі. Які зычны гук часта паўтараецца ў першым чатырохрадкоўі? Які ў кожнай з загадак?

У гародзе каля градак
шмат цікавых ёсць загадак.
Той, хто градкі даглядае,
той загадкі адгадае.

От бабуля важна села
І глядзіць навокал смела.
У зямлю схавала лапаць,
як зачэпіш — будзеш
плакаць.
Гэта злосная бабуля
называецца ... .

У бабулі родны брат
ласкавейшы быццам,
а да слёз давесці рад,
так, як і сястрыца.
Ты не вельмі плач, сынок,
калі шчыплецца ... .

Не сыдзе з месца
ні на крок,
зарыўшыся ў пярыну.
Цярэбіць ціхі вецярок
зялёную чупрыну.
Ды выцягнуць з пярыны —
пачырванее небарак.
Вядома, што гэта ... .

Гэта што за важны туз,
хвост зялёны,
чэпкі вус?
Усім вядомы карапуз
Пузан Пузанавіч ... .

З вусамі, а не стары.
Зайздросныя вочы.
За што-небудзь на двары
ўчапіцца хоча.
Хопіць хітрасці на трох.
Ну, на тое ж ён ... .

Адгадкі: цыбуля, часнок, бурак, гарбуз, гарох.

Арфаэпія і графіка на ўроках мовы

Пры авалоданні чытаннем і пісьмом у I — IV класах дзеці засвойваюць асаблівасці беларускай графікі. За гэтыя гады яны вучацца на практыцы па літарах аднаўляць гучанне слова. Так, хаця націск графічна не адзначаецца, у кожным слове адзін са складовых галосных вымаўляецца больш гучна: *м/а́/ма, т/а́/та, маш/ы́/на.*

Аўтаматычна дзеці праводзяць памякчэнне зычных перад мяккімі ў спалучэннях і аглушэнне зычных на канцы слоў: *бэ/с/* — арфагр. *бэз; гаро/т/* — арфагр. *гарод; /с'н'/ег* — арфагр. *снег* і г. д. Правільнае чытанне з'яўляецца сведчаннем таго, што вучні добра засвоілі адпаведнасць літар пэўным гукам. Практыка пісьма прыводзіць да засваення таго, як гукавая форма слова перадаецца з дапамогай графічных сродкаў.

Таму фарміраванне арфаэпічных навыкаў мэтазгодна праводзіць адначасова з гука-літарным аналізам слоў, бо гэта будзе садзейнічаць засваенню гукавога

значэння літар і лепшаму разуменню розніцы паміж паняццямі «гук» і «літара».

Пісьмо і чытанне — складаныя дзеянні, якія змяшчаюць у сабе некалькі аперацый. Яны вызначаюцца фанетыкай, графікай і правіламі графікі мовы. Фарміраванне асобных аперацый прадугледжвае засваенне пэўных навучальных прыёмаў, якія потым у аўтаматызаваным выглядзе ўключаюцца ў склад асноўнага дзеяння.

Зразумела, што асноўная цяжкасць — гэта несупадзенне адзінак вымаўлення з графічнымі элементамі. Пры гэтым вызначэнне тых моўных адзінак, іх прыкмет і суадносін, аналізам якіх трэба авалодаць вучню, неабходна праводзіць на лінгвістычных падставах.

Напісанае слова — гэта мадэль вуснага слова. Але паспрабуем адказаць на такое пытанне: ці проста вуснае маўленне перадаць у пісьмовай форме? Першае пытанне, якое паўстае пры гэтым: як падзяліць неперарыўную моўную плынь на часткі, на пэўныя ланцужкі гукавых адзінак?

Калі чалавек ужо авалодаў пісьмом, яму цяжка зразумець, што гэта складаная задача. Але трэба памятаць, што кожны чалавек ад гукаў ідзе да літар. Спачатку для яго існуе толькі вуснае маўленне. Такое ж развіццё праходзіла ў сваім гістарычным жыцці і ўсё чалавецтва. Спачатку і для яго існавала толькі вуснае маўленне, і ўжо потым на берасцяных граматах, на гліняных дошчачках, на камянях, папірусе і паперы людзі пачалі «пераводзіць» гук у літару. І як кожнаму асобнаму чалавеку нялёгка даводзіцца пры авалоданні правіламі пісьма, так і чалавецтву цяжка было яму навучыцца.

Невыпадкова ў старажытнасці гукавая плынь успрымалася як неперарыўная. У скорапісе тэксты не былі падзелены на словы. Да XVI стагоддзя ў славянскім кірылаўскім пісьме падзел тэкстаў на словы не быў прыняты. У сувязі з гэтым прыгадаем некалькі памылковых запісаў вучняў малодшых класаў, якія сутыкаюцца з падзелам моўнай плыні пасля таго, як авалодалі правіламі абазначэння гукаў літарамі. *Новаяпрыгожаялялька ляжыць на стале. Мама купіла белыхлеб. Каця прыехала дабабулі намашыне.*

Прыведзеныя сказы, безумоўна, здзіўляюць нас, але ва ўсіх гэтых памылковых запісах ёсць пэўная

логіка. *Новая прыгожая лялька, белы хлеб* для малых — суцэльныя паняцці, таму яны і абазначылі іх адным словам. Не менш важна, відаць, для іх было тое, што цацка знаходзіцца на стале, таму і з'явіўся такі дзеяслоў — *ляжыцьнастале.*

У малодшых класах частка дзяцей пераканана, што *дзеньнараджэння* — адно слова. Неаднаразова даводзілася чуць: *Да майго дзеньнараджэння мне абяцалі купіць веласіпед* або *Мы былі ў Тані на дзеньнараджэнні.* Паведамленне настаўніцы, што гэта два словы і што першае з іх — звычайнае слова *дзень*, сустракаецца са здзіўленнем. Магчыма, дзеці маюць пры такім падыходзе рацыю, бо паняцце *месцанараджэнне* абазначаецца адным словам.

Псіхолаг Карпава паказала, што для дашкольнікаў ва ўзросце 4—6 гадоў задача выдзялення слоў у сказе і гукаў у слове — цяжкая справа. Таму «спробы дзяцей вылучыць у сказе словы зводзіліся да таго, што яны аналізавалі прадметны змест сітуацыі, выражаны ў сказе. У адных выпадках яны выдзялялі сэнсавыя групы перададзенай у сказе сітуацыі. Напрыклад, у сказе *Галя и Вова пошли гулять* дзеці выдзелілі на пытанне аб першым слове *Галя пошла гулять*, а на пытанне аб другім слове — *Вова пошёл гулять.* У сказе *Бабушка вяжет чулок* першым словам яны назвалі *бабушка*, а другім — *Бабушка вяжет чулок.* Некаторыя дзеці пачыналі выдзяляць у сказе назоўнікі і паза сітуацыяй, аднак, як і раней, мелі на ўвазе не асобныя словы, а названыя словамі рэчы і сітуацыі з гэтымі рэчамі... Эксперымент пацвердзіў, што на дадзеным этапе валодання мовай у дзяцей адсутнічае яснае ўяўленне аб адзінках мовы...»[1].

З гэтага вынікае, што для малодшых школьнікаў важнай з'яўляецца праца па пераарыенціроўцы іх з пераважна сэнсавага зместу маўлення на моўны.

Таму, каб не ўскладняць і без таго складаную з'яву, пры навучанні чытанню і пісьму лепш абапірацца на невялікія па працягласці словы, якія няцяжка выдзеліць з тэксту. Аперацыямі, неабходнымі пры чытанні, з'яўляюцца: 1) вызначэнне гука-літарных суадносін; 2) усведамленне адрозненняў у фігурах літар і знаёмства з правіламі абазначэння аднаго гука

[1] Савельева Т. М., Еленский Н. Г. Дар слова: Говорим по-русски... Гаворым па-беларуску... С. 30—31.

з дапамогай дзвюх літар; 3) узнаўленне акцэнтнарытмічнай структуры моўнага такта; 4) аднаўленне гукавой структуры слова; 5) самакантроль.

Пры навучанні пісьму вучню таксама неабходна прайсці праз цэлы рад вучэбных аперацый, шмат у чым агульных з тымі, якія неабходны пры чытанні. Так, па-першае, неабходна валодаць гукавым аналізам, які прадугледжвае адасабленне гукаў у слове і вызначэнне тых гукавых сегментаў і іх паслядоўнасцей, якія абазначаюцца пэўным графічным знакам.

На выдзяленне асобных гукаў з моўнай плыні накіраваны такія практыкаванні па гукавому аналізу, як: 1) пагукавое вымаўленне слоў; 2) параўнанне слоў па гукавому складу з боку колькасці і тоеснасці асобных гукаў; 3) класіфікацыя слоў па іх працягласці, па наяўнасці і адсутнасці ў іх пэўных гукаў і пэўных гукаў у пэўных пазіцыях; 4) прыдумванне слоў з пэўным гукам або гукамі.

Па-другое, трэба засвоіць правілы літарнай перадачы гукаў, свядома праводзіць адбор літар. Гэтаму спрыяюць практыкаванні, якія дазваляюць засвоіць разнастайныя схемы слоў з дапамогай складання слоў з фішак і інш.

Па-трэцяе, неабходна навучыцца праводзіць самакантроль, зверку напісанага слова з арыгіналам, рабіць паўторны аналіз: ад гука — да літары — і зноў да гука.

Фарміраванне навыкаў літаратурнага вымаўлення — працяглы працэс. Але няведанне норм вуснай літаратурнай мовы прыводзіць да таго, што ўзмацняецца ўплыў арфаграфіі, і вучні ў час вымаўлення максімальна арыентуюцца на графічны вобраз слова. Таму больш карысна развіваць моўны слых (які праяўляецца ў здольнасці правільна ўспрымаць гук на слых і вымаўляць яго) адначасова з выкладаннем правіл чытання і пісьма.

Маўленчы трэнаж неабходны на кожным уроку, пры гэтым асабліва важна сачыць за выразным артыкуляваннем спецыфічна беларускіх гукаў. Трывалыя арфаэпічныя навыкі фарміруюцца пры выпрацоўцы стэрэатыпаў чытання і пісьма, бо комплекс вымаўленчых звычак (артыкуляцыйных, арфаэпічных, акцэнтуацыйных, інтанацыйных) існуе ў сістэме.

Пры навучанні арфаэпіі побач з імітацыйна-супастаўляльным метадам неабходна выкарыстоўваць

і інфармацыйны (навучальны) метад, бо, як зазначае М. Г. Яленскі, дзеці недастаткова тонка і глыбока засвойваюць спецыфічныя артыкуляцыйныя рысы беларускай мовы, бо характэрныя асаблівасці часта лічацца дзецьмі нязначным удакладненнем звыклай артыкуляцыі[1].

Прыгадаем, што арфаэпія як асобны раздзел не выдзяляецца ў школьным курсе беларускай мовы, таму фарміраванне арфаэпічных навыкаў праводзіцца ў сувязі з вывучэннем праграмнага матэрыялу па фанетыцы і марфалогіі.

Арфаэпічныя ўменні і навыкі, прадугледжаныя праграмай, мэтанакіравана фарміруюцца на ўроках фанетыкі ў 5 класе. Пры гэтым аналіз навучальнага працэсу і вопыт выкладання беларускай мовы паказвае, што эфектыўнасць навучання арфаэпіі павышаецца, калі: 1) паведамляць школьнікам арфаэпічныя нормы сучаснай беларускай мовы, звесткі пра артыкуляцыю асобных гукаў; 2) выкарыстоўваць фанетычны і арфаэпічны разборы; 3) праводзіць арфаэпічныя практыкаванні[2]. Канешне, сістэматычнае вывучэнне фанетыкі пачынаецца ў V класе, але практычна ўжо ў пачатковых класах прыводзіліся вельмі важныя звесткі з гэтага раздзела. Што ўжо ведаюць дзеці? Тое, што: 1) словы складаюцца з гукаў; 2) гукі на пісьме абазначаюцца ўмоўнымі знакамі — літарамі; 3) гукі адрозніваюцца па сваёй якасці; 4) дыферэнцыруюцца дзве вялікія групы гукаў, галосныя і зычныя; 5) галосныя гукі ўтвараюць склады; 6) яны бываюць націскнымі і ненаціскнымі; 7) зычныя гукі падзяляюцца на цвёрдыя і мяккія, глухія і звонкія; 8) існуюць розныя спосабы абазначэння адных і тых жа гукаў.

Таму задача настаўніка ў V класе абагульніць, сістэматызаваць атрыманыя фанетычныя звесткі, паглыбіць іх, растлумачыць саму сутнасць суадносін паняццяў «гук» і «літара», выявіць, што ведаюць і ўмеюць вучні.

Вельмі важна, каб вучань атрымліваў фанетычныя веды такім чынам, які лепш бы садзейнічаў асэнсаванню розніцы паміж паняццямі гука і літары, другас-

---

[1] Яленскі М. Г. Метады і прыёмы фарміравання вымаўленчых навыкаў. С. 35.

[2] Новікава Т. Фарміраванне арфаэпічных навыкаў на ўроках фанетыкі ў V класе // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1989. № 8. С. 18—23.

насці літары ў адносінах да гука і засваенню прынятых норм абазначэння гукаў літарамі ў беларускай мове.

У сувязі з гэтым важна, каб фанетычны аналіз праводзіўся паралельна з засваенням норм вымаўлення. Як правільна падкрэслівае В. Ляшчынская, «фанетычны разбор слова не можа, не павінен ісці ад літарнага абазначэння слова да яго гукавога выражэння, паколькі пры гэтым вучні абыходзяцца без успрымання слова на слых, без выдзялення гукаў у слове шляхам іх вымаўлення, без выпрацоўкі арфаэпічных норм. Адбываецца не аналіз гукавога складу слова, а яго палітарнае чытанне. І як вынік — блытаніна, неадрозненне гукаў і літар, іх змешванне, а часам і замена гукаў літарамі»[1].

Напрамак навучання ад гука да літары падтрымліваецца практыкай перадавых педагогаў. Г. Ганіч, у прыватнасці, прапануе свой план вывучэння тэмы «Гукі і літары. Алфавіт». Ім прапаноўвалася такое заданне: прачытаць § 17, падрыхтаваць адказ з выкарыстаннем плана, напісанага на дошцы:

1. Значэнне літар.
2. Розніца паміж гукамі і літарамі.
3. Літары, якія не абазначаюць гукаў.
4. Колькасць галоўных літар і гукаў.
5. Колькасць літар, іх назвы.
6. Значэнне алфавіта.
7. Колькасць зычных гукаў, іх назвы[2].

Пры выкладанні гэтага параграфа можна выкарыстаць дадатковы матэрыял, прыцягнуць звесткі з іншых моў. Як вядома, само слова *алфавіт* паходзіць ад назваў дзвюх першых літар грэчаскага алфавіта: альфа (α) і віта (β). Беларуская *азбука* таксама ўтварылася ад назваў дзвюх першых літар славянскага алфавіта кірыліцы: *аз* і *букі*.

У «Граматыцы» Б. Тарашкевіча *азбука* яшчэ называецца *«альфабэтам»* або *«абэцэдай»* таксама ў сувязі з назвамі першых літар алфавіта: *альфа* і *бэта; а, бэ, цэ* (пачатак алфавіта ў лацініцы): «Усе літары мовы,

---

[1] Ляшчынская В. Яшчэ раз пра фанетычны разбор слова // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1989. № 8. С. 28.

[2] Ганіч Г. Самастойная работа вучняў і прывіццё ім навыкаў самаадукацыі // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1989. № 10. С. 15.

пералічаныя ў сталым парадку, называюцца азбукай (інакш альфабэтам або абэцэдай)[1]».

Кірыліца — старажытная славянская азбука. Яна была так названа ў гонар першага славянскага асветніка Кірылы і была створана на аснове грэчаскавізантыйскага ўстаўнога пісьма ў другой палове IX ст. На Русі яна распаўсюдзілася з прыняццем хрысціянства (988 г.). Кірыліца складалася з 43 літар; 24 былі запазычаны з грэчаскага алфавіта і 19 уведзены Кірылам для перадачы фанетычных асаблівасцей стараславянскай мовы. З XI па XVIII ст. у сувязі са змяненнем гукавога ладу мовы праходзіла змяненне складу літар кірылаўскага пісьма. Усе славянскія алфавіты развіліся на аснове кірыліцы.

Кірылаўскае пісьмо з нязначнымі змяненнямі выкарыстоўвалася на Беларусі на працягу XIV — XVII стст. З канца XVII ст. побач з кірыліцай пачалі пісаць па-беларуску лацінскімі літарамі, бо ў гэты час польскі сейм забараніў ужываць беларускую мову ў афіцыйным справаводстве, а Беларусь увайшла ў склад Рэчы Паспалітай. Лацінская графіка ў яе польскім варыянце мела ўжытак спачатку ў рукапісных, а потым і друкаваных тэкстах. Лацінскі алфавіт для беларускага пісьма выкарыстоўваўся да 30-х гг. XX ст. В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч пісалі свае творы лацініцай, некаторыя зборнікі твораў Я. Купалы і Я. Коласа таксама былі надрукаваны лацініцай.

Б. Тарашкевіч заўважае, што «побач з кірыліцай, хоць радзей, ужываецца ў беларускай мове лацініца. Вось лацінская абэцэда: a, b, c, ć, č, d, e, f, g, h, i, j, k, l, ł, m, n, ń, o, p, r, s, ś, š, t, u, ŭ, w, y, z, ž, ź»[2].

Размова аб тым, што беларускія тэксты пісаліся лацініцай, на ўроку карысная, бо яна пераконвае вучняў у тым, што пісьмо — з'ява другасная адносна гукавога маўлення. Можна прыгадаць і тое, што існуюць старажытнабеларускія тэксты, напісаныя арабскім пісьмом. Іх склалі татары, якія жылі на Беларусі і гаварылі па-беларуску, а пісалі па-арабску.

Практыкаванні на запіс беларускіх слоў лацінскімі літарамі, з якімі вучні знаёмяцца на ўроках замежнай мовы, таксама могуць спрыяць больш глыбокаму разуменню суадносін паняццяў «гук» і «літара».

---

[1] Тарашкевіч Б. Беларуская граматыка для школ. С. 47.

[2] Там жа. С. 49.

У перыяд фарміравання сучаснай беларускай літаратурнай мовы (з канца XIX ст.) ужываўся рускі грамадзянскі шрыфт. «Грамадзянкай» называўся кірылаўскі алфавіт, які ў 1708 г. быў рэфармаваны загадам Пятра Першага і якім друкаваліся афіцыйныя паперы, так званыя грамадзянскія акты. Старое кірылаўскае пісьмо было пакінута для царкоўных мэт, а для грамадзянскіх былі спрошчаны абрысы літар, выключаны літары, непатрэбныя для абазначэння рускіх гукаў.

Як трапна пісаў аб пятроўскай рэформе М. В. Ламаносаў, «пры Пятры не толькі баяры і баярыні, але і літары скінулі з сябе шырокія шубы і апрануліся ў летняе адзенне». Замена кірылаўскага шрыфту новым грамадзянскім была выклікана шырокім развіццём у пятроўскую эпоху выдання кніг грамадзянскага зместу, для якіх быў патрэбны больш просты і выразны шрыфт.

Працэс стварэння новага, грамадзянскага шрыфту быў складаным, меў розныя крыніцы, прайшоў некалькі этапаў[1]. Цікава адзначыць, што ў ім актыўны ўдзел прыняў беларус Ілья Капіевіч.

У асноўным алфавітна-літарны склад і графіка дарэвалюцыйнага рускага друкарскага шрыфту стабілізаваліся ў другой палове XVIII ст. пасля рэформ Акадэміі навук 1735, 1738 і 1758 гг. З 31 літары, якія перайшлі ў сучаснае рускае пісьмо з кірылаўскай азбукі, значна змянілася форма 8 кірылаўскіх літар.

Акрамя таго, у старажытнейшых кірылаўскіх рукапісах адсутнічаў падзел на вялікія і малыя літары. Выдзяленне вялікіх літар у асобны алфавіт (побач з малымі) упершыню з'явілася ў Расіі ў букварах XVII ст.

У беларускі варыянт алфавіта ў канцы XIX—пачатку XX ст. былі ўведзены літары *дз, дж, і, ў*, спалучэнне літар *шч*, раздзяляльны знак апостраф (') і былі выключаны літары *ѣ, и, щ, ъ*. Пошук найбольш удалых шляхоў адлюстравання гукавога ладу беларускай мовы на пісьме працягваўся доўгі час. Як гаворыцца ў паэме М. Гусоўскага:

> Лад алфавіта наш прашчур для ўласнай карысці
> У грэкаў пазычыў і гукі мясцовых гаворак
> Зладзіўшы з ім, іншаземцам, застаўся сабою...

[1] Шицгал А. Г. Графическая основа русского гражданского шрифта. М., 1947. Яго ж. Русский гражданский шрифт. М., 1959.

Выпрацаваны гістарычна алфавітны парадак літар выкарыстоўваецца на практыцы ў розных класіфікацыйных мэтах (абазначэнне класаў; кнігі ў бібліятэках па прозвішчах аўтараў у алфавітным парадку і г. д.). Прыведзеныя звесткі даюць магчымасць пераканаць у неабходнасці ведання алфавіта.

Сучасны беларускі алфавіт складаецца з 32 літар. Звесткі аб колькасці літар паведамляюцца вучням разам з назвамі літар. Аднак не ўсе беларускія даследчыкі згодны з такой лічбай. Часам называюць 34 літары. Гэта адбываецца тады, калі асобнымі літарамі лічацца *дж* і *дз*[1]. Але ў такім выпадку літары *дж, дз* пры размяшчэнні слоў паводле строгага алфавіта не прынята ўлічваць. Увядзенне складаных літар у алфавіт павялічыла б цяжкасці засваення гука-літарнага матэрыялу. Таму, відаць, не варта ў школьным навучанні лічыць *дж* і *дз* асобнымі літарамі.

Пры тлумачэнні значэння алфавіта настаўніку варта паведаміць вучням, што вуснай мовай можна карыстацца толькі ў прысутнасці таго чалавека, да якога звяртаюцца пры моўных зносінах, і толькі ў пэўны момант часу (тэлефон і апаратура для гуказапісу з'явіліся адносна нядаўна і не маюць яшчэ і зараз усеагульнага пашырэння). Аднак у чалавека са старажытных часоў існуе патрэбнасць у перадачы разнастайнай інфармацыі на значную адлегласць і на захаванне яе ў часе. Як знайсці шлях дамоў, папярэдзіць аб небяспецы, хваробе, смерці, замацаваць права на ўласнасць — усю гэту вельмі патрэбную для жыцця чалавека інфармацыю можна атрымаць з дапамогай пісьма. Для гэтага людзям трэба было дасягнуць папярэдняй дамоўленасці аб сродках перадачы розных неабходных звестак. Умоўныя графічныя знакі (малюнкі, іерогліфы, літары) дазваляюць уступаць людзям у зносіны, нават калі яны аддалены прасторай і часам.

У сваім гістарычным жыцці людзі паспрабавалі выкарыстаць некалькі відаў значкоў: малюнкі, іерогліфы, гукі. Пра іх можна правесці гутарку на занятках лінгвістычных гурткоў і пазакласных занятках.

Самы старажытны тып пісьма — піктаграфія (лац. pictus — намаляваны і graphō — пішу). Гэта малюн-

[1] Рагаўцоў В. І., Юрэвіч А. Л. Уводзіны ў мовазнаўства. Мн., 1987. С. 148.

кавае пісьмо. На піктаграмах фігуры жывёл, птушак і г. д. Сучасным прыкладам піктаграм з'яўляюцца малюнкі на шыльдах: бот на шавецкай майстэрні, булка на хлебным магазіне, чэрап са скрыжаванымі касцямі на будцы току высокага напружання, чырвоны крыж на машыне хуткай дапамогі і г. д. Каб растлумачыць змест такіх абазначэнняў, не трэба ведаць мову таго народа, у якога яны ўзніклі.

Наступны этап у развіцці пісьма — ідэаграфія (грэч. idea — ідэя і graphо — пішу) заснавана на перадачы піктаграмай паняццяў. Так, намаляваная нага стала абазначаць паняцце 'хадзіць'. Ператварэнне малюнкаў ва ўмоўныя знакі пісьма прывяло да ўзнікнення іерогліфаў (грэч. hieroglyphoi — свяшчэнныя пісьмёны). Спачатку кожны іерогліф абазначаў цэлае слова: *дзіця, змяя, сабака, дрэва* і г. д., потым ён мог перадаваць нейкі склад. Найбольш вядомае кітайскае пісьмо ўзнікла ў пачатку II тысячагоддзя да н. э. на аснове піктаграфіі. Сучаснае кітайскае пісьмо налічвае больш за 40 тысяч іерогліфаў, многія з якіх вельмі складаныя для засваення. Каб намаляваць нейкі іерогліф, трэба пэўным чынам правесці значную колькасць рысак (у сярэднім 11), у некаторых выпадках іх каля 50.

Таму большасць народаў свету карыстаецца больш простым і зручным гукавым пісьмом, у якім з дапамогай значкоў — літар — абазначаюцца гукі.

Такім чынам, існаванне пісьма, алфавіта ў пэўнага народа — сведчанне дастаткова высокага ўзроўню яго культурнага развіцця. Невыпадкова, што ў славянскіх краінах (асабліва ўрачыста ў Балгарыі) святкуецца Дзень славянскай пісьменнасці і што стваральнікі славянскага алфавіта Кірыл і Мефодзій праваслаўнай царквой лічацца святымі.

Поўная драматычных падзей гісторыя жыцця і дзейнасці стваральнікаў славянскай азбукі на працягу некалькіх стагоддзяў выклікае цікавасць у даследчыкаў і радавых чытачоў. Размова аб ёй у папулярнай форме можа быць карыснай на ўроках мовы і ў гурткавай рабоце. Матэрыялы для яе можна знайсці ў шэрагу прац[1], сярод якіх асабліва карыснай для школьных

[1] Истрин В. А. Развитие письма. М., 1961; Константинов Н. А. История русской азбуки // Знание — сила. 1953. № 1; Энговатов Н. Древнейшая русская азбука // Знание — сила. 1960. № 11.

мэт з'яўляецца выдадзеная ў серыі навукова-папулярнай літаратуры кніга В. А. Істрына «1100 лет славянскай азбукі» (М., 1988), якая абагульняе ўсе вядомыя звесткі.

Каб выпрацаваць практычныя навыкі гука-літарнага аналізу, трэба пры знаёмстве з правіламі літаратурнага вымаўлення замацоўваць навыкі гука-літарнага аналізу. Спачатку ён будзе тычыцца толькі пэўнай часткі слова, потым — слова цалкам. Прыгадаем, што, як слушна заўважыў П. Садоўскі, фанетычны разбор «толькі ўмоўна, па традыцыі лічыцца фанетычным. Больш дакладна такі аналіз трэба было б назваць фанетыка-графічным, або гука-літарным, таму што тут вучань аналізуе не толькі фанетычныя, гукавыя з'явы («тое, што мы гаворым і чуем»), але і літарныя, графічныя («тое, што мы пішам і бачым»). Акрамя таго, гэты разбор часам ідзе далей, за межы ізаляванага гука, у арфаэпію і нават у марфалогію»[1].

З элементамі фанетычнага запісу слова (транскрыпцыі) вучні знаёмяцца ў V класе. У гэты час паведамляецца, што пры фанетычным запісе гука, спалучэнняў гукаў або слова абазначэнне іх бярэцца ў квадратныя дужкі, мяккасць зычнага перадаецца знакам ['']: [*тáта*], [*ц'о́*]*ця*, [*ц'о́ц'а*].

На першым этапе вывучэння фанетыкі можна выкарыстоўваць найбольш просты матэрыял: такія словы, гукавы склад якіх максімальна набліжаецца да яго літарнага абазначэння. Спецыяльныя практыкаванні накіраваны на тое, каб вучні напрактыкаваліся ўслухоўвацца ў гучанне слова, выдзяляць гукі, дзяліць словы на склады, вызначаць націскны склад. Увагу вучняў пры такім спрошчаным аналізе можна накіроўваць не на ўсё слова, а толькі на яго частку: пачатак, канец, пэўную марфему. Якасць гукаў таксама можна вызначаць толькі па пэўных (не абавязкова ўсіх) характарыстыках: галосны ці зычны, мяккі зычны ці цвёрды і інш. Эканомны па часу выканання, такі аналіз можа выкарыстоўвацца пры праверцы дамашняга задання і пры вывучэнні іншых раздзелаў курса.

Спрошчаны фанетычны аналіз карысны пры засваенні арфаэпіі. Папярэдні арфаэпічны разбор слова

---

[1] Садоўскі П. В. Фанетычны разбор слова // Народная асвета. 1984. № 9. С. 46.

будзе спрыяць прадухіленню і выпраўленню маўленчых памылак. Мэтазгодна праводзіць частковы арфаэпічны разбор, каб увага вучняў засяроджвалася на гуках, вымаўленне якіх можа разыходзіцца з літаратурным або вымаўленне якіх не супадае з напісаннем.

Эфектыўным, на думку метадыстаў[1], з'яўляецца фанетычны разбор у вуснай форме, пры якім абмяркоўваецца, дзе вымаўленне не супадае з напісаннем і гэта з'ява абгрунтоўваецца адпаведнымі правіламі. Такі від фанетычнага разбору абуджае і актывізуе ўвагу вучняў да гукавой формы слова, вуснага выказвання, развівае маўленчы слых[2].

Узор вуснага фанетычнага разбору:
іней (поўны разбор)

1. Выразна вымаўляем і слухаем слова.
2. Называем паслядоўна гукі [*йі*н'*ей*].
3. Дзелім слова на склады: *і-ней*. У слове два склады, націскны склад — першы. Націск прыпадае на галосны [*і*], які выразна чуецца і ідзе пасля мяккага зычнага [*й*], асобна не абазначанага на пісьме. Такім чынам, літара *і* ў дадзеным выпадку служыць для абазначэння адразу двух гукаў, мяккага зычнага [*й*] і націскнога галоснага [*і*]. Націскны галосны [*і*] у пачатку слова вымаўляецца з прыстаўным зычным [*й*].
4. Другі склад пачынаецца зычным гукам [*н'*] — звонкім, мяккім, які абазначаецца літарай *эн*.
5. Галосны [*э*] ненаціскны, вымаўляецца выразна, абазначаны літарай *е*, таму што гук ідзе пасля мяккага зычнага.
6. Канцавы ў слове зычны гук [*й*] — звонкі, мяккі, абазначаны літарай *і* нескладовае.
7. У слове 5 гукаў і 4 літары.

спяваць (частковы разбор)

вусны	пісьмовы
1. У пачатку слова ідзе гук [*с'*] — зычны глухі, мяккі.	*/с'п'а/вáць*

[1] Яленскі М. Г. Фарміраванне вымаўленчых навыкаў на ўроках беларускай мовы і літаратуры. Метадычныя рэкамендацыі. Мн., 1982. С. 23; Піскун У. Ц. Фанетычны разбор на ўроку беларускай мовы // Выкладанне беларускай мовы і літаратуры. Мн., 1983.

[2] Новікава Т. Фарміраванне арфаэпічных навыкаў на ўроках фанетыкі ў V класе // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1989. № 8. С. 23—25.

2. Свісцячы [*с*] памякчаецца перад мяккім [*н'*].

3. Мяккасць пачатковага зычнага на пісьме не перадаецца.

радасць (частковы разбор)

вусны	пісьмовы
1. Зычны [*с'*] — глухі, мяккі, памякчаецца перад мяккім [*ц'*].	*ра́да/с'ц'/*
2. [*ц'*]—зычны, глухі, мяккі.	
3. Мяккасць [*с'*] на пісьме не перадаецца.	
4. Мяккасць [*ц'*] абазначана на пісьме літарай *ь*, якая гука не абазначае.	

Пры правядзенні спрошчанага фанетычнага аналізу можна абмежавацца некалькімі тыпамі заданняў:

1. Выразна вымаві слова, праслухай, як яно гучыць. (Варыянт задання: праслухай, як вымаўляе слова настаўнік, як яно гучыць у магнітафонным запісе, і паўтары яго.)
2. Вымаві выразна першы (другі, апошні) склад слова, вылучы першы гук склада, ахарактарызуй яго, абазнач умоўным значком; такім жа парадкам вызнач якасць названых (або падкрэсленых) складоў ці ўсіх складоў у слове.
3. Падлічы колькасць складоў у слове, гукаў у складзе і слове.

Уважлівае праслухоўванне слова — абавязковая перадумова паспяховага фанетычнага аналізу. Часам вучань не чуе ўсе гукі ў слове (аб гэтым, дарэчы, сведчыць скажонае вымаўленне паасобных слоў: *тра/л'е/бус (тралейбус), да/л'б/о (далібог)* і інш.). Таму патрэбна актывізацыя маўленчага слыху. Паслядоўнае называнне гукаў у слове для вучняў з'яўляецца складаным заданнем. Таму практыкаванні на пагукавы падзел слова, на параўнанне слоў рознай структуры трэба праводзіць працяглы час, з выкарыстаннем розных форм заняткаў паміж іншымі відамі работ. Магчымы «фанетычная размінка», «вусная пяцімінутка», «фанетычныя паўзы», «фанетычная за-

радка» і інш. Для павышэння цікавасці да гука-літарнага аналізу можна выкарыстаць таксама элементы тэлевізійных гульняў «Поле цудаў» і «Логас», якія вучні ахвотна глядзяць.

Парадак правядзення арфаэпічнага разбору нагадвае спрошчаны фанетычны аналіз:

1. Вымаві слова ў адпаведнасці з нормамі беларускай літаратурнай мовы.

2. Звярні ўвагу на вымаўленне вызначаных настаўнікам гукаў, іх спалучэнняў.

3. Растлумач, чаму гукі так вымаўляюцца.

Словы для спрошчанага фанетычнага аналізу і арфаэпічнага разбору падбіраюцца з улікам падрыхтоўкі вучняў. Школьны падручнік не дае агульнай схемы арфаэпічнага разбору, таму можна скарыстаць тыя яго ўзоры, якія былі прапанаваны Т. Новікавай.

Узоры арфаэпічнага разбору

вуснага	пісьмовага
На печцы	
1. *На пе́/ц/цы.* 2. Гук [*ч*] вымаўляецца як [*ц*]. 3. Шыпячы [*ч*] перад свісцячым [*ц*] вымаўляецца як свісцячы.	*на пе́/ц/цы* — [*ч*] → [*ц*]
Звініць	
1. */з'/вініць.* 2. Гук [*з*] перад мяккім [*в*] вымаўляецца як [*з'*]. 3. Свісцячы [*з*] перад мяккім [*в'*] вымаўляецца мякка. На пісьме такое вымаўленне не перадаецца.	*/з'/вініць* — [*з*] → [*з'*]

Прыгадаем, што звесткі аб найбольш цяжкіх выпадках вымаўлення беларускіх слоў настаўнік можа знайсці ў «Слоўніку беларускай мовы: Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне» пад рэдакцыяй М. В. Бірылы (Мн., 1987).

Калі ў напісанні слова ці яго формы адлюстроўваецца літаратурнае вымаўленне, у слоўніку арфаэпічная норма не падаецца. Калі літаратурнае вымаўленне слова ці формы не супадае з іх палітарным чы-

таннем, пасля загалоўнага слова ці пасля яго формы ў квадратных дужках падаецца вымаўленне: *дрогкасць [хкасьць], узвелічэнне [зьве] [ньне], узлезці [узьлесьці]*.

У слоўніку паказана вымаўленне спалучэнняў зычных, калі ў іх назіраецца асіміляцыя глухіх і звонкіх, цвёрдых і мяккіх, шыпячых і свісцячых, выбухных і афрыкатыўных зычных, а таксама паяўленне [*й*] перад [*і*]. Аглушэнне звонкіх зычных на канцы слова не перадаецца. Велічыня адрэзка слова, які падаецца ў квадратных дужках, абумоўлена складанасцю вымаўлення асобных частак слова.

Агрызнуцца зак., *-нуся, -нешся [з'несься]*... Як бачым, у слоўніку ў квадратных дужках асаблівасці вымаўлення перадаюцца агульнапрынятымі літарнымі сродкамі. Таму пры правядзенні фанетычнага аналізу або арфаэпічнага разбору настаўнік можа карыстацца імі як даведачным матэрыялам, а вучням прапаноўваць правесці іх гукавы запіс.

У слоўніку	Пры разборы
узлезці [узьлесьці]...	*[уз'л'éс'ц'і]*
давезці [сьці]...	*давé[с'ц']і*
барацьба [дзьб]...	*бара[дз'б]á*
сумленнасць [сьць], -цю	*сумлéнна[с'ц']*

Супастаўленне гукаў і літар, якое часткова праводзіцца пры спрошчаным аналізе, працягваецца пры вывучэнні розных тэм і дапамагае падрыхтавацца да больш складанага гука-літарнага, ці фанетыка-графічнага, разбору. Схема такога поўнага аналізу нагадвае схему папярэдняга, але ў ёй дабаўляецца тлумачэнне і робіцца запіс літары (ці літар), з дапамогай якой абазначаны кожны гук.

Згодна з падручнікам для IV класа школ з беларускай мовай навучання, аўтарамі якога з'яўляюцца В. П. Красней і Я. М. Лаўрэль (Мн., 1988. С. 131), трэба: 1) разбіць слова на склады, вылучыць і назваць націскны склад, а таксама гук, на які падае націск; 2) выдзеліць галосныя гукі; вызначыць, якія з іх націскныя і якія ненаціскныя, а таксама з дапамогай якіх літар яны абазначаны; 3) для зычных гукаў неабходна вызначыць, ці адносяцца яны да цвёрдых, мяккіх ці зацвярдзелых; звонкіх ці глухіх; свісцячых ці шыпячых і якімі літарамі яны абазначаны. Акрамя таго, вызначаецца колькасць гукаў і літар.

Узоры гука-літарнага аналізу

вясна — вяс-на́

гукі:		літары:	
[*в'*] — зычн. зв. мяк.		*в*	
[*а*] — гал.		*я*	
[*с*] — зычн. гл. цвёрд.		*с*	
[*н*] — зычн. зв. цвёрд.		*н*	
[*а*] — гал. нац.		*а*	
5 г.		5 л.	

дзядзька — дзя́дзь-ка

гукі:		літары:	
[*д͡з'*] — зычн. зв. мяк.		*д*	
		з	
[*а*] — гал. нац.		*я*	
[*ц'*] — зычн. гл. мяк.		*д*	не *ц, дзядзя*
		з	
		ь	
[*к*] — зычн. гл. цвёрд.		*к*	
[*а*] — гал.		*а*	
5 г.		8 л.	

Пры разглядзе слоў, у якіх склад гукаў і склад літар не супадаюць, замацоўваюцца правілы перадачы гукаў на пісьме, а таксама выпрацоўваецца навык вызначэння арфаграмы на слых. Каб пазбегнуць памылкі, трэба дакладна вызначыць літарны склад слова на падставе выкарыстання практычных навыкаў выдзялення гукаў, вызначэння іх пазіцыі, падбору апорнага слова, якое б дапамагло знайсці адпаведны арфаграфіі варыянт напісання.

Гука-літарны разбор — неабходны этап пры выпрацоўцы навыкаў выдзялення арфаграмы на слых, бо «арфаграфічная зоркасць — гэта не толькі ўменне выявіць арфаграму ў напісаным слове, але і ўменне выявіць арфаграму ў слове, успрынятым на слых»[1].

Прапанаваныя ніжэй практыкаванні накіраваны на засваенне арфаэпіі, графікі і арфаграфіі. Яны звязваюцца з адзначанымі тэмамі праграмы V класа, пашыраюць і ўскладняюць тыя заданні, якія былі прапанаваны для засваення вымаўлення асобных гукаў.

[1] Алгазина Н. И. О развитии орфографической зоркости // Русский язык в школе. 1981. № 3. С. 33.

Аднясенне да названых тэм не абазначае, аднак, таго, што практыкаванні нельга выкарыстаць пры вывучэнні іншага матэрыялу. З улікам падрыхтоўкі вучняў, іх знаёмства з тымі фанетычнымі з'явамі, якія адлюстроўваюцца ў прапанаваным матэрыяле, матэрыял практыкаванняў можна выкарыстоўваць у разнастайных мэтах.

Практыкаванні

Гукі і літары. Алфавіт

1. Адгадайце загадкі. Запішыце адгадкі. Назавіце па парадку літары беларускага алфавіту. Чаму кожнаму чалавеку трэба добра ведаць алфавіт?

1. ХТО ЁН?

Літары ён, як байцоў на парад,
Строгім парадкам паставіў у рад.
Усе яны пэўнае месца знайшлі там.
Як мы яго назавём? — ... *(В. Паўлоўская.)*

2. Якое слова складаецца з трох складоў, а называе ўсе беларускія літары?

А д г а д к а: алфавіт.

2. Прачытайце тэкст. Растлумачце сэнсавае падабенства слоў *азбука* і *алфавіт* і іх стылёвае адрозненне. Што называецца алфавітам?

Дзве першыя літары грэчаскага пісьма называліся *альфа* і *бэта* (у сярэднягрэчаскім вымаўленні — *віта*). Яны былі ўзяты ад фінікійцаў, якія карысталіся іерогліфамі. Першы ў радзе іерогліфаў меў выгляд галавы быка (бык па-фінікійску *алеф*), другі — выгляд дома *(бэт)*. Паступова гэтыя значкі сталі азначаць літары *а* і *б*. Спалучэнне *альфа* і *бэта (віта)* — *альфабэтас (альфавітас)*.

3. Прачытайце і запомніце выслоўі пра валоданне пісьмовай мовай. Растлумачце іх сэнс.

Як напішацца, так і прачытаецца. Пішы, пішы, рукой варушы, бо ў няўмекі — рукі калекі. З літары на літару — як з купіны на купіну. ці ты пісаў пяром, ці певень кіпцюром. Ці прачытаеш, ці вочы паламаеш. Напісаў пісака — каб чытаў сабака.

4. Прачытайце словы. Растлумачце, што яны абазначаюць. Колькі складоў, зычных і галосных гукаў і літар мае кожнае з гэтых слоў?

Бах! Плёх! Бом! Плясь! Хрась! Тых! Ш-ш-ш!

5. Прачытайце падзыўныя словы. Якіх хатніх жывёл імі падзываюць? Падлічыце, колькі галосных і колькі зычных літар мае кожнае слова.

Кось-кось! Тпроля-тпроля! Цёсь-цёсь! Тпрусь-тпрусь! Целя-целя! Дзю-дзю! Це-це! Шуш-шуш! Цюцю! Кыці-кыці! Ціп-ціп! Вуць-вуць!

6. Колькі складоў можа мець беларускае слова? Прыдумайце словы з рознай колькасцю складоў.

Узор адказу. У беларускай мове слова можа мець ад аднаго да дзесяці складоў: *дах, ха-та, ча-рапок, пе-ра-кі-даць, аб-шмаль-цо-ва-ны, на-ма-ры-но-ва-ны, пра-ку-ра-дым-лі-вац-ца, ін-ду-стры-я-лі-за-вац-ца, дэ-на-цы-я-на-лі-за-вац-ца, ін-тэр-на-цы-я-на-лі-за-цы-я. Складаныя словы часта бываюць шматскладовымі: дваццаціпяцітонны, народнагаспадарчы, водаразмеркавальнік, жывёлаадкормачны, агароднінаперапрацоўчы, проціbактэрыялагічная.*

7. Чым розняцца між сабой наступныя пары слоў?

1) Машына — шына, марак — рак, парадак — пара;
2) нясі — ясі, брама — рама;
3) сіла — ласі, камар — марка, ліпа — палі;
4) немы — нямы, рогавы — рагавы;
5) вужы — жыву, шына — нашы, рама — мара;
6) маяк — ямка, орган — нарог, сорам — мароз;
7) сон — нос, кот — ток, кат — так, кут — тук;
8) лічыць — лячыць. ганак — ранак, цёпла — цёмна;
9) дзед — дзень, брат — браць.

Узор адказу: Прыведзеныя пары слоў розняцца: 1) колькасцю складоў; 2) колькасцю гукаў; 3) паслядоўнасцю складоў; 4) якасцю гукаў; 5) паслядоўнасцю складоў і месцам націску; 6) паслядоўнасцю і якасцю гукаў; 7) паслядоўнасцю гукаў; прыведзеныя словы так званыя паліндромы: пры чытанні злева направа атрымоўваецца адно слова, а пры чытанні справа налева — іншае; 8) адным гукам і адной літарай; 9) адным гукам і колькасцю літар.

8. З прыведзенага спісу слоў выдзеліце тыя, што пачынаюцца: а) з аднаго і таго ж гука; б) з адной і той жа літары; в) з аднаго і таго ж гука, абазначанага адной і той жа літарай; г) з адной літары, але розных гукаў.

Ехаць, ёсць, іскра, іней, існаваць, іржа, йеменец, юнак, юшка, яблык, яечня, якасны, яліна.

Узор адказу. З аднаго і таго ж гука пачынаюцца словы: *[йе]хаць, [йо]сць, [йі]скра, [йі]ней, [йе]менец, [йу]нак, [йу]шка, [йа]блык, [йа]ечня, [йа]касны, [йа]ліна; [і]снаваць, [і]ржа.* З адной і той жа літары — *іскра, іней, існаваць, іржа; юнак, юшка; яблык, яечня, якасны, яліна.* З аднаго і таго ж гука, абазначанага адной і той жа літарай,— *іскра, іней; юнак, юшка; яблык, яечня, якасны, яліна.*

З адной літары, але розных гукаў: *іней — існаваць, іскра — іржа.*

9. Адгадайце загадкі. Запішыце адгадкі. Чым розняцца атрыманыя словы?

1. Насякомае
Нам знаёмае,
Джаліць меціцца
Ў твар.
Змяшай
Літары —
Яно, хітрае,
Дасць за грошы
Тавар.

2. Каб частка судна
Ды імем стала,
Не будзь марудны —
Работы мала:
Ану,
Мой дружа малады,
Вазьмі і перастаў
Склады!

Адгадкі: 1) камар — крама; 2) карма — Макар.

10. Якая беларуская літара ў пачатку слова хаваецца ў слоўніку ў іншай літары? Як і чаму яна гэта робіць?

Узор адказу. Губна-губны гук [ў̆] пазіцыйна чаргуецца з гукамі [у], [в], [л]. Чаргаванне [ў̆] з [у] абумоўлівае тое, што словы з пачатковым *ў̆* «хаваюцца» ў слоўніках за словы з пачатковым [у].

11. Якія зычныя гукі ў беларускай мове абазначаюцца з дапамогай спалучэнняў дзвюх літар? Калі замацаваліся такія абазначэнні ў беларускай мове?

Узор адказу. З дапамогай дзвюх літар у беларускай мове абазначаюцца гукі [д͡з'] і [д͡ж]. Па спосабу ўтварэння яны змычна-шчылінныя (спачатку паветраны струмень разрывае змычку, а потым праходзіць праз шчыліну, утвораную органамі маўлення).

Змычна-шчылінны характар гукаў перадаваўся на пісьме з дапамогай выкарыстання дзвюх літар, адна з якіх перадае змычны характар гука [*д*], а другая — шчылінны [*з*], [*ж*]. У памянёнай вышэй «Беларускай граматыцы для школ» Б. А. Тарашкевіча ўжо былі замацаваны абазначэнні *д͡ж* і *д͡з*.

Прыгадаем, што змычна-шчылінны гук [*ц'*], які зараз абазначаецца адной літарай, таксама пэўны час перадаваўся з дапамогай дзвюх літар — *тс*. У выданнях сярэдзіны XIX стагоддзя сустракаліся напісанні тыпу *погубитсь* 'пагубіць'. Напісанне *тсь* больш адпавядала гучанню беларускага гука [*ц'*], чым напісанне *ть*, якое не выкрывала яго шчылінны характар. Замацаванне для гэтых мэт літары *ц* было фанетычна абгрунтаваным, тым больш, што дзеканне і цеканне — важнейшыя рысы гукавога ладу беларускай мовы.

12. Колькі гукаў і якія абазначаюць выдзеленыя літары ў прыведзеных словах: *хаджу, прынаджваць, паджарыць; ксяндза, дзверы, дзвынкаць, дзьмухаць, падзол, падзямелле?*

13. Па сваёй ролі частка беларускіх літар нагадвае адна другую. Што агульнага маюць літары *з, е, ё, і, ю, я, ь?*

Узор адказу. Літары *е, ё, і, ю, я* і *ь* у радзе выпадкаў абазначаюць мяккасць папярэдніх зычных. Літара *з* у дыграфе *дз* перад галоснымі *е, ё, і, ю, я,* перад *ь* і перад зычным [*в'*] таксама падкрэслівае мяккае вымаўленне зычнага [*д͡з'*].

14. Побач з якімі літарамі літары *з* і *ж* часта губляюць сваё асноўнае гукавое значэнне?

Узор адказу. Гэта адбываецца ў спалучэннях *дз* і *дж*, дзе літары *з* і *ж* часцей абазначаюць не зычныя гукі [*з*] і [*ж*], але афрыкаты [*д͡з'*] і [*д͡ж*].

15. У 1918 годзе ў Мінску выйшла з друку кніга вершаў Алеся Гаруна «Матчын дар». Выдавецтва «Мастацкая літаратура» зрабіла ў 1988 годзе яе факсімільнае выданне, г. зн. друкарскімі сродкамі дакладна была адноўлена ўся графічная сістэма арыгінала (лацінскае fac simile 'зрабі падобнае'). Як вядома, частка гукавых асаблівасцей беларускай мовы ў часы стварэння вершаў перадавалася інакш, чым зараз. Параўнайце правапіс наступных груп слоў, узятых з гэтага выдання, з сучасным. Зрабіце вывады аб правілах абазначэння розных груп зычных гукаў на пісьме ў гэтым выданні.

1. Дау, роуны, даугі-даугі, зданняу, шоук, змоук.

2. Безкраснымі, безсьветнаго, безшчасны, безплеменнік, безканечнасьць, безскарбнаму.

3. У атказ, людзкой.

4. Сьпісау, сьпеу, сьнягі, сьвятой, позьніх, гусьляр, сьлед, сьвет, плясьці, нізьведаны, сьлёзы, косьць, шчасьця, чысьціу, жаласьці, сьцелецца, мядзьведзь, гасьцінец, цьвікі, сьлізнуу, у сьне, песьняр.

5. На зьянне (Дзіулюся я на зьянне ясных зорау...), пад'уладны.

6. Льос (Што жыць ні льос мне у вышыне нагорнай).

7. Пэрлінкі, пэрлы, гэніяльны, гэтманства, сфэр.

У з о р а д к а з у. У графічнай сістэме, якая ўжыта пры друкаванні вершаў Алеся Гаруна: 1) не было спецыяльнага знака для [ў]; 2) прыстаўка *без-* пісалася незалежна ад таго, як яна гучыць перад глухімі зычнымі гукамі (сучасныя напісанні: *бескаляровы, бессмяротны, беспрасветна, бессаромна)*; 3) непаслядоўна перадавалася глухасць — звонкасць зычных і ў іншых выпадках, у прыватнасці, у сярэдзіне слоў на стыку прыстаўкі і кораня, кораня і суфікса: пісалася па гучанню *ат-каз* (зараз *ад-каз*), але насуперак яму *люд-с-кой* (зараз *люд-ск-ой)*; 4) з дапамогай мяккага знака перадавалася асімілятыўная мяккасць зычных (г. зн. мяккасць зычных, якая ўзнікла пад уплывам суседніх мяккіх зычных гукаў); зараз таксама вымаўляецца */с'п'/ісаць (спісаць), /с'п'/еў (спеў), /с'в'/яты (святы), /с'в'/ет (свет), /с'н'/ег (снег), по/з'н'/іх (позніх), гу/с'л'/яр (гусляр), /с'л'/ед (след), пле/с'ц'/і (плесці), /з'в'/едаць (зведаць), /с'л/ёзы (слёзы), ко/с'ц'/ь (косць), шча/с'ц'/е (шчасце), чы/с'ц'/іць (чысціць), жала/с'л'/іва (жаласліва), /с'ц'/емішча (сцемішча), мя/дз'в'/едзь (мядзведзь), га/с'ц'/інец (гасцінец), /ц'в'/ікі (цвікі), /с'л'/ізнуў (слізнуў), у /с'н'/е (у сне), пя/с'н'/яр (пясняр)*, але ва ўсіх гэтых словах мяккі знак пасля літар *з, с, дз* не пішацца; 5) ужыванне апострафа і раздзяляльнага мяккага знака таксама не адпавядала сучасным правілам: апостраф пісаўся пасля прыстаўкі не перад ётаванай літарай *(пад'уладны)*, на месцы падоўжанага [з'] у слове *ззянне пісалася спалучэнне літар з+ь*; 6) мяккі знак часам ужываўся для абазначэння мяккасці зычнага гука перад наступным галосным [о], што зараз звычайна робіцца з дапамогай літары *ё: льос — лёс*; 7) у радзе запазычаных слоў зычныя гукі [п], [г], [ф] не памякчаліся: *пэрлы* — сучаснае *перлы,*

гэніяльны — сучаснае *геніяльны, сфэр* — сучаснае *сфер*. Такім чынам, на працягу апошніх сямідзесяці гадоў у гукавым выглядзе запазычаных слоў адбыліся прыкметныя змены.

16. Якія літары, галосныя ці зычныя, перадаюць больш звестак для таго, каб вылучыць кожнае канкрэтнае слова сярод іншых? Запішыце скарочана некалькі прозвішчаў беларускіх пісьменнікаў і паэтаў спачатку з дапамогай толькі тых літар, якія абазначаюць уваходзячыя ў слова зычныя гукі *(Бдл, Клс, Кпл, Пнчнк, Тнк, Шмкн)*, а потым выкарыстайце літары, якія абазначаюць толькі галосныя гукі, што ёсць у гэтых прозвішчах *(Яуя, Оа, Уаа, Ааа, а, Аяі)*. Пры якім запісе лягчэй здагадацца, што гэта за прозвішчы?

Узор адказу. Па зычных адгадаць слова лягчэй, чым па галосных. Гэта адбываецца таму, што зычных гукаў у мове больш, чым галосных. Яны разнастайныя як па свайму агульнаму складу, так і па магчымых спалучэннях у межах слова.

17. Параўнанне беларускіх форм з роднаснымі славянскімі дапамагае ўбачыць асаблівасці іх гучання. Разгледзьце наступныя пары беларускіх і рускіх слоў: *праўда — правда, траўка — травка, яна ўдава — она вдова, тоўсты — толстый, жоўты — жёлтый, воўк — волк, даў — дал, чытаў — читал*. Якім рускім гукам адпавядае ў беларускай мове гук [ў]?

Матэрыял для даведак. Як вынікае з прыведзеных прыкладаў, гук [ў] адпавядае гукам [в], [у] і [л] у рускай мове.

Змяненне [в] на [ў] старажытныя беларускія помнікі перадаюць яшчэ з XIII стагоддзя, хаця дакладна вызначыць, калі адбываўся гэты працэс, немагчыма, бо спецыяльнай літары для гука [ў] у той час не існавала. Акадэмік Я. Карскі першыя прыклады перадачы на пісьме змянення гука [л] на [ў] адносіць да XV ст. (Ф. Янкоўскі. Гістарычная граматыка беларускай мовы. С. 89—91). Ужыванне [ў] у беларускім маўленні з'яўляецца спецыфічнай і яскравай рысай гукавога ладу мовы.

Працяглую гісторыю мае замацаванне ў беларускім алфавіце спецыяльнага знака для гука [ў]. Абазначэнне яго з дапамогай літары *у* было лагічным з прычыны блізкасці гэтага гука да гука [ў] і існавання чаргаванняў з ім у пэўных пазіцыях. Пастаноўка над літарай *у* такога ж значка, як і над *й*, падкрэслівала яго санорнасць, непаўнату яго ўтварэння. Новая

літара «канкурыравала» з літарамі *в* і *ў* у выданнях канца XIX — пачатку XX стагоддзя і была замацавана «Беларускай граматыкай» Б. А. Тарашкевіча.

18. Які беларускі гук, перш чым з'явіцца ў пачатку слова, «глядзіць», якім гукам канчаецца папярэдняе слова?

Узор адказу. Гук */ў/* у пачатку слоў сустракаецца толькі ў тых выпадках, калі папярэдняе слова канчаецца на галосны і калі пасля яго няма знака прыпынку.

19. У Беларуска-расійскім (Вялікалітоўска-расійскім) слоўніку Я. Станкевіча, выдадзеным у Нью-Йорку, парадак літар адрозніваецца ад прынятага ў іншых беларускіх слоўніках. На думку аўтара, «парадак літараў кірыліцы беларускае, добра званае «капіеўкаю», мае быць гэткі: *о, а, э, б, г, х, д, е, ё, я, дз, дж, з, ж, і, й, к, л, м, н, ф, п, р, с, ш, т, в, у, ў, ь, ц, ч, ы, ю*». Чаму аўтар паставіў побач *о, а* і *э; е, ё* і *я; в, у* і *ў; г, г, х; дз, дж, з* і *ж; ш* і *с; ф* і *п*? Якімі гукавымі з'явамі можна растлумачыць такі парадак літарнага абазначэння гукаў?

Матэрыял для даведак. У кожную з пералічаных груп гукаў Я. Станкевіч аб'яднаў тыя з іх, што звязаны чаргаваннямі або паходжаннем. Сам ён такое аб'яднанне тлумачыць наступным чынам:

«1. Затым, што ў словах бывае *а* зь ненацісьненага *о*, то будзе лёгічна, каб і ў вабэцадзе *о* стаяла перад *а*, а таксама *е* перад *ё* і абедзьве гэтыя літары перад *я*.

2. Затым, што ў словах *ў* з *в* (*мова, прымаўка, размаўляць*) або *ў* з *у* (*навука*, але *наўчоны*), а не наадварот, парадак гэтых літараў мае быць гэткі: *в, у, ў*.

3. Чэхі, у каторых мававеда стаіць найвышай і тарнуецца ў жыцьцю практычным, такі самы прынялі парадак гэтых трох літараў (*г, г, х*).

4. Таксама ў вабэцадзе царкоўна-славянскай літара, званая *зело*, абазначаючая гук *дз*, стаіць ля літары, званай *зямля*, абазначаючая гук *з*.

5. *Дз, дж, з, ж* маюць стаяць разам дзеля блізіні вымовы гэтых гукаў да *дж* за *дз*, а *ж* за *з*, бо *дж* часта паходзе з *дз* (*хадзіць — хаджу*), а *ж* часта паходзе із *з* (*рэзаць — рэжу*). Зацемлю, што ў лацінічных абэцадах славянскіх *ж* стаіць за *з*.

6. *С, ш* маюць стаяць побач дзеля блізіні сваёй вымовы ды *ш* за *с*, бо *ш* часта паходзіць із *с* (*каса, касіць — кашу*). Таксама *с, ш* стаяць у мове чэскай.

7. *Ф* мае стаяць перад *п*, бо часта ў яго пераходзе (да прыкладу: *пасоля* паходзе з *фасоля, Панас* з *Афанас*)».

20. Адкажыце на пытанні-жарты.

1. У якім слове сто літар *г*, сто літар *л*, сто літар *й*? 2. Як можна каплю ператварыць у чаплю? 3. Як можна з рыбы атрымаць жыллё?

Адказы: 1) стог, стол, стой; 2) замяніць літару *к* на *ч*; 3) у слове *сом* першую літару замяніць на *д*.

Галосныя гукі. Правапіс *о, э, а*. Правапіс *е, ё, я*

21. У кнізе А. Мальдзіса «Восень пасярод вясны» (Мн., 1984) сустракаецца такі сказ: — *Ыш ты! — здзівіўся Грыва.* 1. Якое незвычайнае для беларускай мовы слова ўжываецца ў гэтым сказе? У чым яго адметнасць? 2. Якія пачатковыя галосныя літары ў беларускім слоўніку можна назваць беднымі? Якія — багатымі? Чаму?

Узор адказу. 1. У сказе сустракаецца незвычайнае слова з пачатковым гукам */ы/*: *ыш*. 2. Галосная літара *о* ў пачатку слова сустракаецца ў абмежаванай колькасці слоў. Гэта запазычанні або тыя словы, што з'яўляюцца дыялектнымі па паходжанню: *обер, обскі, ода, ом, омуль, онікс, опера* і г. д.

Літара *э* пачынае таксама пераважна запазычаныя словы і, хаця сярод іх вельмі прадуктыўная група складаных слоў з першай часткай *электра..., энерга...*, іх колькасць абмежаваная.

Багацейшымі ў параўнанні з *о* і *э* з'яўляюцца пачатковыя літары *а* і *у*, з якіх пачынаюцца шматлікія спрадвечна беларускія словы.

22. Якія галосныя, перш чым заняць месца ў слове, лічаць склады? З якога склада пачынаецца лічэнне?

Узор адказу. Ненаціскны галосны [*э*] пасля мяккіх зычных у першым складзе перад націскам гучыць як [*а*] і абазначаецца літарай *я*; у іншых ненаціскных складах ён захоўвае сваю якасць і абазначаецца літарай *е*.

Гук [*о*] пасля мяккіх зычных у першым пераднаціскным складзе змяняецца на [*'а*] і абазначаецца літарай *я: мёд — мядок*.

Важна вызначыць месцазнаходжанне гука адносна націскнога склада (лічаць склады ад яго): *вясна́ — вёсны — веснавы́, зямля́ — зе́млі — земляны́*.

23. Колькі гукаў і якія ўваходзяць у эмацыянальныя воклічы, падкрэсленыя ў наступных сказах? Якімі літарамі яны абазначаны?

Ай-я-яй! Якое харство! *(І. Шамякін.)* Эх! Шырыня якая!.. *(Т. Хадкевіч.)* У-у-ух, якая раскоша!.. *(М. Паслядовіч.)* Аж заходжуся ад болю! Оё-ёй! *(Я. Колас.)* Ну ж і бервяно а-е-е-е-е-й! *(Я. Колас.)*

24. Пра якое арфаграфічнае правіла гаворыцца ў вершы Ул. Верамейчыка? Прывядзіце прыклады, дзе ў аднакаранёвых словах пішуцца літары *е* і *я*.

Кожнай літарай, гукам
Трапеча нязломная мова мая.
Возьмем «е», што мужнее
У першым пад націскам складзе.
Вырастае з яго
Наша кроўнае моцнае пруткае «я» —
І тады ўжо ніхто
Нас ніколі нідзе не абразіць. *(Ул. Верамейчык.)*

25. Якія галосныя гукі, згубіўшы націск, змяняюць сваю якасць?

Узор адказу. Як вядома, гучанне і правапіс галосных змяняюцца ў залежнасці ад націску. Так, незалежна ад паходжання слова, пасля цвёрдых зычных гук [*о*] у ненаціскных складах не захоўваецца і перадаецца на пісьме праз *а: дом — дамы, стол — сталовая.*

Пасля цвёрдых зычных гук [*э*] ва ўсіх ненаціскных складах (за выключэннем складаных слоў і слоў іншамоўнага паходжання) абазначаецца на пісьме літарай *а: цагліна — цэгла, цана — бясцэнны.*

26. Розную пашыранасць маюць у беларускай мове галосныя гукі ў розных пазіцыях у слове. У гэтым лёгка пераканацца, узяўшы ў рукі слоўнік. Адкажыце з яго дапамогай на такія пытанні: які галосны гук не сустракаецца ў пачатку слова? Якія два галосныя гукі ўжываюцца ў гэтай пазіцыі абмежавана? З якога галоснага часта пачынаюцца беларускія словы?

Узор адказу. Пагартаўшы слоўнік, можна вызначыць, што ў пачатку слова ў беларускай мове не сустракаецца галосны гук [*ы*], таму і слоў, якія б пачыналіся з літары *ы*, няма. Абмежаваная колькасць слоў мае ў пачатку слова літару *о*, бо гук [*о*] вымаўляецца пераважна толькі пад націскам. Калі параўнаць, колькі старонак займаюць у слоўніку розныя галосныя літары, то атрымаецца, што шырэй ужываюцца ў пачатку слова гукі [*а*] і [*у*], менш часта [*і*] і [э].

27. Якія галосныя літары ўжываюцца для абазначэння мяккасці папярэдніх зычных? Прыдумайце пары слоў, у якіх адрозненне ў якасці зычных перадаецца з дапамогай такіх галосных.

Словы для даведак: садзі — сядзі, золкі — зёлкі, лук — люк, ныць — ніць, бэз — без.

28. У гісторыі беларускай літаратурнай мовы былі адзначаны спробы перадаваць мяккасць зычнага з дапамогай пастаноўкі мяккага знака перад галосным. У Жэневе ў 1881 годзе на беларускай мове быў выдадзены публіцыстычны твор «Пра багацце і беднасць». У ім для абазначэння мяккасці зычных перад галоснымі ўжываецца мяккі знак. Словы ў гэтым творы напісаны такім чынам: *ньесьецца, сьарод, льудзі, озьора.*

З гісторыі таксама вядомы шматлікія спробы абазначыць мяккасць зычнага перад *о* з дапамогай напісання *і, й* пасля адпаведнага зычнага: *сіостры, сьліозы, усіо, вйоскі, жнйом.* Чаму гэтыя спробы не атрымалі падтрымкі? Як зараз пішуцца словы *ньесьецца, сьарод, льудзі, озьора, сіостры, сьліозы, усіо, вйоскі, жнйом*? Які спосаб перадачы мяккасці зычных больш эканомны?

29. Прачытайце апавяданне Я. Коласа пра літару *і*. Параўнайце беларускую літару *і* з рускай і той, што ўжываецца ў лацінскім алфавіце. Што нагадваюць абрысы іншых літар, якія служаць для абазначэння галосных гукаў?

Ідучы сёння ў школу, я звярнуў увагу на слуп каля дарогі. Нарысуем гэты слуп на дошцы (на дошцы праводзіцца стаячая рыса — *і*). І вось бачу я — здалёк паказваецца птушачка. Яна борзда ляціць да слупа і пачынае над ім кружыцца. Нарысуем і гэта (над рыскаю ставіцца кропка). Я спыніўся і з цікавасцю стаў глядзець, што ж будзе далей. Птушачка некаторы час пакружылася над слупком, а потым піскнула «і-і-і» і паляцела. Дык вось, дзеці, калі вы ўбачыце ў кніжцы літару, падобную на наш слупок з птушкаю, то помніце, як пішчала птушачка. Гэта літара і будзе азначаць гук «і».

Даведачны матэрыял. Па Я. Коласу, *а* — «яйцо і кульбачка», *б* — «гарбузік з хвосцікам».

У лацінскім алфавіце, як і ў беларускім, літара *і* мае выгляд палачкі з кропкаю над ёй. Вядома, што ўжо М. В. Ламаносаў прапаноўваў выключыць з рускага алфавіта літару *і*, а яго паслядоўнік, вучоны-лінгвіст, прафесар Маскоўскага універсітэта А. А. Барсаў (1730—1791), аўтар Граматыкі, якая на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў была асноўным падручнікам рускай мовы, наадварот, прапаноўваў ужываць толькі літару *і*.

З беларускага алфавіта літара *и* выйшла з ужытку да XX ст.

30. Які галосны гук не сустракаецца ў беларускай мове ў пачатку слова? Якія два галосныя гукі ўжываюцца ў гэтай пазіцыі абмежавана? Які галосны часта сустракаецца ў пачатку беларускіх слоў?

Узор адказу. У пачатку слова ў беларускай мове не сустракаецца галосны *ы*. Абмежаваная колькасць слоў пачынаецца ў беларускай мове з літар *е* і *о* ў сувязі з тым, што гук [*о*] вымаўляецца пераважна толькі пад націскам. З усіх галосных найбольш часта ў пачатку слова сустракаецца гук [*а*]. Калі параўнаць, колькі старонак займаюць у слоўніку розныя галосныя літары, то атрымаецца, што шырэй ужываюцца літары *а* і *у*, менш часта *і* і *э*. Радзей словы пачынаюцца з *я, ю, о, е* і *ё*.

31. Якія галосныя літары ў беларускай і рускай мовах абазначаюць два гукі? У якой мове спіс галосных літар, што служаць для абазначэння двух гукаў, больш вялікі?

Узор адказу. У беларускай мове два гукі абазначаюць літары *е, ё, і, ю, я*, у рускай мове — *е, ё, ю, я*. У беларускай мове літара *і* можа абазначаць два гукі. Напрыклад, */йі/ней* 'іней', *вераб'/йі/*, 'вераб'і' і інш. У рускай мове літара *и* не можа абазначаць такое спалучэнне з двух гукаў.

32. Якая галосная літара ў беларускай мове можа абазначаць: а) два гукі адначасова, б) гук і мяккасць папярэдняга зычнага, в) два розныя галосныя гукі ў залежнасці ад пазіцыі?

Узор адказу. Літара *і*: 1) *салаў/йі/* 'салаўі'; 2) */п'і/ць* 'піць'; 3) *і* і *ы: ігра, /з ы/грой* 'з ігрой'.

33. Калі ў беларускай літаратурнай мове замацавалася літара *І і*?

Узор адказу. Пры станаўленні графічнай сістэмы беларускай літаратурнай мовы новага перыяду выкарыстоўваўся рускі алфавіт. Але ўжо ў рускім дарэвалюцыйным алфавіце літары *Ии* і *Ii* служылі для перадачы аднаго і таго ж гука. Па назіраннях А. Яновіч, выключэнне з беларускага алфавіта знака *Ии* адбылося толькі ў канцы першага дзесяцігоддзя XX ст. на старонках газеты «Наша ніва». (А. І. Яновіч. Станаўленне графічнай сістэмы беларускай літара-

турнай мовы новага перыяду // Беларуская лінгвістыка. Вып. 31. Мн., 1987.)

34. У якіх выпадках літары *е, ё, ю, я, і* абазначаюць два гукі: [*йэ*], [*йо*], [*йу*], [*йа*], [*йі*]?

У з о р а д к а з у. Літары служаць для абазначэння двух гукаў:

1) у пачатку слова */йе́/лка (елка), /йо́/мка (ёмка), /йу/р (юр), /йа́/мка (ямка), /йі/каць (ікаць)*;

2) у сярэдзіне слова і на канцы слоў пасля літар, якія абазначаюць галосныя гукі: *пра/йе́/хаць (праехаць), пра/йо́/м (праём), пя/йу́/ха (пяюха), ла́/йа/нка (лаянка), кра/йі́/на (краіна), сва/йе́/ (свае), сва/йо́/ (сваё), сва/йу́/ (сваю), сва/йа́/ (свая)*;

3) пасля апострафа ці раздзяляльнага мяккага знака: *п/йе́/са (п'еса), пад/йо́/м (пад'ём), п/йа́/ўка (п'яўка), інтэрв/йу́/ (інтэрв'ю), вераб/йі́/ны (вераб'іны, рэль/йе́/ф (рэльеф), канферансь/йе́/ (канферансье), міль/йо́/н (мільён), міль/йа/не́р (мільянер)*;

4) пасля *ў*: *Заслаў/йе/ (Заслаўе), разаў/йо́/м (разаўём), разаў/йу́/ (разаўю), салаў/йі/ (салаўі)*.

35. Чаму літары *е, ё, я, ю* называюцца ётавымі?

У з о р а д к а з у. Гэта назва ўзнікла ад абазначэння гука [*й*], які называецца «ётам», і падкрэслівае здольнасць гэтых літар перадаваць на пісьме гук [*й*] у спалучэнні з пэўным галосным: */й+э/ — е /й+о/ — ё, /й+а/ — я, /й+у/ — ю*. Пры вымаўленні гэтых спалучэнняў нельга забываць, што, па словах вядомага спецыяліста па выразнаму чытанню А. Каляды, «гучаць яны павінны вельмі лёгка», бо яны «складаюць тую непаўторную прыгажосць танюткіх музычных адценняў, якія напаўняюць нашу родную мову». (А. Каляда. Выразнае чытанне. Мн., 1970. С. 28.)

36. Параўнайце наступныя пары слоў. Вызначце, для абазначэння чаго служаць у іх літары *е, ё, я, і, ю*.

Бэз — без, воз — вёз, гэта — гета, зала — узяла, кыш — кішкі, ласкаць — ляскаць, мышы — Мішы, нос — нёс, пыл — піў, сюды — суды, фыркаць — фінка, хораша — хітры, цыкаць — цікаць.

37. Чым розніцца ўжыванне літары *ё* ў беларускай і рускай мовах?

Матэрыял для даведак. У адрозненне ад рускай графікі літара *ё* ў беларускім алфавіце знайшла больш шырокае ўжыванне. Яна (як абавязковае абазначэнне гука [*о*] пасля мяккіх зычных) была замацавана ў сістэме алфавіта, які прыведзены ў «Беларускай граматыцы» Б. А. Тарашкевіча. У рускім алфавіце літара *ё* з'явілася ў XVIII стагоддзі. Упершыню яе выкарыстаў пісьменнік М. М. Карамзін у 1797 годзе ў альманаху «Аоніды».

Да гэтага часу ў неабходных выпадках ужывалася лігатура (спалучэнне дзвюх літар) *іо*, але яна так і не ўвайшла ў алфавіт. У «Расійскай граматыцы» М. В. Ламаносава гаворыцца: «Букву *іо* почитать должно за двуписменное начертание из *і* и *о* и для того в азбуке на ряду ставить не должно; однако употреблять в нужных случаях». Да рэформы правапісу 1917—1918 гг. літара *Ёё* ў рускі алфавіт не ўводзілася. Зараз яна займае сёмае месца ў алфавіце, але тое, што *Ёё* «маладзейшая» за астатнія літары, знаходзіць сваё адлюстраванне пры яе выкарыстанні. Яна не ўжываецца пры класіфікацыйных абазначэннях (побач з адпаведнымі лічбамі) — ніхто не вучыцца, напрыклад, у 5-м класе «Ё». У Дэкрэце аб новым правапісе (снежань 1917 г.) ужыванне літары *Ёё* адзначалася як пажаданае, але не абавязковае. Калі ж гэты Дэкрэт быў надрукаваны ў другі раз (10 кастрычніка 1918 года), у ім пункт пра літару *Ёё* адсутнічаў. Але і гэта неадразу вырашыла складаны лёс літары ў рускай мове.

У снежні 1942 года паявіўся загад аб абавязковым ужыванні літары *Ёё* ў школьнай практыцы. Але практычна гэты загад не выконваецца з канца сарокавых — пачатку пяцідзесятых гадоў.

У «Правілах рускай арфаграфіі і пунктуацыі» (1956), якія дзейнічаюць зараз, пералічваюцца тыя абмежаваныя выпадкі, дзе ўжываецца літара *Ёё*.

Такое становішча не задавальняе ўсіх носьбітаў мовы. На камісіі па паэзіі VIII з'езда пісьменнікаў паэт Леў Ашанін выступіў з прапановай замацаваць ужыванне літары *Ёё*. Ён выступіў вельмі эмацыянальным абаронцам літары: «Дарагія таварышы, у нас укралі літару «ё», без якой паэзія жыць не можа!»

У беларускай мове літара *Ёё* ўжываецца абавязкова, і таму ніякіх цяжкасцей з абазначэннем гука [*о*] пасля мяккіх зычных не ўзнікае.

38. У беларускай і рускай мовах шмат слоў, якія з'яўляюцца іх агульнай спадчынай з таго часу, калі існавала адзіная праславянская мова. Параўн.: *вада — вода, малако — молоко, каласок — колосок, балота — болото, мароз — мороз, горад — город, камок — комок.* У абедзвюх мовах гэтыя словы гучаць падобна, але пішуцца па-рознаму. Чым яны розняцца ў вымаўленні? У якой мове «пакрыўджаны» гук [*а*] і ў якой мове «пакрыўджана» літара *о*?

Узор адказу. У беларускай мове ў прыведзеных словах у ненаціскных складах вымаўляецца галосны [*а*] — выразны, хаця і больш кароткі, чым адпаведны націскны гук. У рускай мове ў ненаціскных складах у гэтых словах вымаўляецца менш выразны гук. Таму можна лічыць, што гук [*а*] больш «пакрыўджаны» ў рускай мове. У беларускай жа мове «пакрыўджанай» з'яўляецца літара *о*, якая пішацца ў меншай колькасці слоў, чым у рускай мове, што звязана з рознымі прынцыпамі перадачы гукаў на пісьме.

39. Параўнайце гучанне беларускіх слоў *вясна, бяда, сястра, сляза, дзядок, сяло* з гучаннем рускіх слоў *весна, беда, сестра, слеза, дедок, село.* Які гук вымаўляецца ў першым пераднаціскным складзе пасля мяккіх зычных у беларускай і рускай мовах? У якой мове напісанне адпавядае вымаўленню, а ў якой — не? Падбярыце так пары беларускіх слоў, каб яны адрозніваліся толькі якасцю пераднаціскных галосных пасля мяккіх зычных і пры гэтым мелі розны сэнс. Абгрунтуйце неабходнасць выразнага вымаўлення ненаціскнога гука [*а*] пасля мяккіх зычных у першым пераднаціскным складзе.

Параўнайце вымаўленне галосных гукаў пасля мяккіх зычных у наступных скорагаворках: *Лезь, залезь, злезь* і *Дзяды і дзядзькі на дзядзінцы дзялілі дзялянкі.*

Узор адказу. У першым пераднаціскным складзе пасля мяккіх зычных у беларускай мове ў словах *вясна, бяда, сястра* і да т. п. выразна вымаўляецца [*а*], у рускай мове сярэдні гук між [*е*] і [*и*]: *в[и^{е}]сна, б[и^{е}]да, с[и^{е}]стра.*

40. Прачытайце словы. Выпішыце паасобку словы, у якіх літары *е, ё, ю, я* абазначаюць: 1) адзін гук; 2) два гукі.

Аб'ява, дзеці, людзі, яма, палёт, уецца, цёмна, юла, лінія, прыслоўе, з'ява, цяжкі, здароўе, льецца, елка, дзякуй, нюхаць, з'ездзіць, фатаграфія.

41. Выдзеліце спалучэнні галосных літар у наступных словах: *заараць, заалогія, прыазер'е, трыадзіны, трыо, выенчыць, выява, засваенне, пераядаць, наяўны, іанізаваць, ююба* (батанічная назва), *неабуты.* Колькі гукаў абазначаюць дзве галосныя літары ў гэтых словах? У якіх частках слова сустракаюцца спалучэнні галосных

гукаў? У якіх выпадках спалучэнні галосных утвараюцца ў спрадвечна беларускіх словах?

Узор адказу. У словах *зааараць, заалогія, прыазёрны, трыадзіны, трыо, іанізаваць, неабуты* спалучэнні з дзвюх галосных літар абазначаюць два *([аа], [ыа], [ыо], [иа], [эа])*, у словах *выява, засваенне, пераядаць, наяўны* — тры *([ыйа], [айе], [айа], [айа])*, у слове *ююба* — 4 гукі *([йуйу])*. У спрадвечна беларускіх словах спалучэнні галосных гукаў утвараюцца на стыку прыстаўкі і кораня *(зааараць, прыазёрны, неабуты)*, на стыку частак складанага слова *(трыадзіны)*. У запазычаных словах спалучэнні галосных гукаў ужываюцца і ў корані слова: *з[аа]логія, тр[ыо], [іа]нізаваць.*

42. Якое гукавое значэнне мае літара *і* ў наступных словах: *імшыць, іхні, заіка, Раіса, брат і сястра, сіні?*

Узор адказу. *[і]мшыць, [йі́]хні, за[йі́]ка, Ра[йі́]са, брат [ы], сястра, [с'ін'і].*

43. Якое гукавое значэнне маюць літары *ё, ю, я* ў пералічаных словах: *пад'ём, ёмкі, ёсць, лёгкі, лён, дзённік, паштальён; дзюба, зюзюкаць, раз'юшаны; б'ю, крыю, Юра; з'ядаць, з'ява, каньяк, маяк, явар, зялёны, нядзеля?*

Узор адказу. У сло́вах *пад'ём, ёмкі, ёсць, паштальён ё* абазначае 2 гукі — [*йо*]; у словах *лёгкі, лён, дзённік* — адзін [*о*] і мяккасць папярэдняга зычнага. У словах *дзюба, зюзюкаць ю* абазначае [*у*] і мяккасць папярэдняга зычнага; у словах *раз'юшаны, б'ю, крыю, Юра* — два гукі [*йу*]. У словах *з'ядаць, з'ява, каньяк, маяк, явар я* абазначае два гукі — [*йа*], у словах *зялёны, нядзеля* — галосны [*а*] і мяккасць папярэдняга зычнага.

44. У словах *контрігра, міжінстытуцкі, звышімперыялізм, педінстытут* сустракаюцца незвычайныя для беларускай мовы спалучэнні літар. Якія гэта спалучэнні і чаму яны магчымы?

Узор адказу. Незвычайнымі з'яўляюцца спалучэнні літар *рі, жі, шы, ді*, бо гукі [*ж*], [*ш*], [*р*] — зацвярдзелыя, пасля іх гук [*і*] не ўжываецца, што адпаведна перадаецца на пісьме. Таму спалучэнні літар *рі, шы, жі* сустракаюцца толькі ў невялікай групе новаўтвораных слоў пасля прыставак і часцінак *між-, звыш-, контр-* і ў некаторых складанаскарочаных сло-

вах. Пасля цвёрдага [*д*] вымаўляецца [*ы*], а перад [*і*] сустракаецца [*дз'*].

45. Які гук мае ўласную літару, але «эксплуатуе» для свайго абазначэння і іншыя літары?

Узор адказу. Гук [*й*] абазначаецца літарай *й*; у той жа час у спалучэннях з галоснымі гукамі ён перадаецца з дапамогай літар *і [йі́]нець; е — [йе́]хаць; ё — [йо́]лкі; ю — [йу́]шка; я — [йа]гня́.* В. І. Паўлоўская прапаноўвае наступны сказ, у якім адлюстраваны ўсе выпадкі ётавання: *Юля, ён з'еў мой яблык.* (В. І. Паўлоўская. Мова: цікава і займальна. Мн., 1989.)

46. Ці падабаецца галосным у беларускіх словах знаходзіцца па суседству? Колькі іх можа ісці адзін каля аднаго ў пачатку, сярэдзіне і на канцы слова?

Узор адказу. Для беларускай мовы спалучэнні толькі з галосных гукаў не з'яўляюцца характэрнымі. У пачатку і канцы слова сустракаюцца спалучэнні з двух *(Іаланта, аорта, Уайльд; алоэ, шоу, капрычыо)*, а ў сярэдзіне слова з двух *(заахаць, паэма, неэканомна)* і трох галосных гукаў *(відэаімпульс, стэрэаэкран, гідрааэрапорт)*.

47. Прачытайце словы і словазлучэнні. Выпішыце паасобку: 1) словы, у якіх у ненаціскных складах вымаўляецца [*э*]; 2) словы, у якіх у гэтай пазіцыі вымаўляецца гук, сярэдні паміж [*э*] і [*а*].

Снегавы, рэвалюцыя, зелень, селекцыянер, Жэнева, тэлевізар, Шаўчэнка, лямантаваць, Тэгеран, бегуны, ветракі, зенітка, водпаведзь, селянін, перон, святкаваць, семафор, семечка, селядзец, сезон, сенажаць, праўленне, серабро, цецярук, рыбацкае, сцэнарый, серыял, серэнада, сердаваць, сеньярыта, зеленавокі, Зеландыя, землякоп, зернетка, зефір, гектар, бензін, пятачок.

48. Прачытайце словазлучэнні. Вымаўляйце часціцу *не* і прыназоўнік *без* разам з наступнымі словамі. Звярніце ўвагу на вымаўленне гука пасля [*н'*] *(у не)* і [*б'*] *(у без)*. У якіх выпадках ён гучыць як [*'а*], у якіх — як [*'э*^{а}]? Прыдумайце свае прыклады такога вымаўлення.

Не мае, не пойдзе, не можна, не ловяць, не кажы, не пытайся, не было, не вучы, не буду, не знайшоў, не

хачу, не магу, не ведаю, не шуміць, не баліць, не слухаем.

Без адказу, без абароны, без верху, без верша, без весткі, без весялосці, без ветру, без ветэрана, без вечара, без вешалкі, без веялкі, без вітамінаў, без віхру, без вокан, без вітрыны, без духу, без вас, без хлеба.

49. Прачытайце словы. Прыгадайце, як вымаўляюцца гукі [*о*] і [*э*] у запазычаных словах.

Рэвалюцыя, трыо, адажыо, рэактар, сеанс, тэатр, акардэон, геолаг, Токіо.

50. Прачытайце прыказкі, вымаўляйце выразна [*'а*] і [*'а*^{э}] у часціцы *не* і прыназоўніку *без*.

Ад прыбытку галава не баліць. Без правадыра войска гіне. Няма тае хаткі, каб не было звадкі. На вярбе грушы не растуць. Не за сваю справу не бярыся. Не запрогшы, не паедзеш. Не пазнаўшы бяды, не ўчуеш дабра. Не хвалі сябе, няхай людзі пахваляць. Ад добрага не ўцякай і ліхога не рабі. Прыйшоў не званы, ідзі не гнаны. Без мукі няма навукі. Без гаспадара гумно плача, а без гаспадыні хата. Без клапоту і без поту наш брат не пражыве. Без працы няма чаго хлеба шукаці.

51. Прачытайце загадкі. Звярніце ўвагу на вымаўленне [*'э*], [*'а*] у ненаціскных словах.

1. Без языка жыве, не есць, не п'е, а гаворыць. 2. Зроду ён не есць, не п'е, песні голасна пяе, ці з урока, ці на ўрок ён падае свой галасок. 3. Без ног, а бяжыць, без голасу, а крычыць, вочы як колы, ды не бачыць нікога. 4. Аўсом не кормяць, пугай не гоняць, а як араць пачне — сем плугоў вязе. 5. Не крот, а капае, лап не мае, а сеянае з зямлі выкідае.

А д г а д к і: 1) радыё; 2) званок; 3) аўтамабіль; 4) трактар; 5) бульбакапалка.

52. Прачытайце загадкі. Выразна вымаўляйце часціцу *не* і прыназоўнік *без*.

1. Без ног бяжыць, без вачэй глядзіць. 2. Без сяк-еры, без кліна на рацэ мост зрабіў. 3. Белы, а не цукар, без ног, а ідзе. 4. Пад акенца падойдзе, не стукаючы,

не грукаючы, ад акенца адойдзе, не стукне, не грукне. 5. Зялёная, а не луг, белая, а не снег, кучаравая, а без валасоў. 6. Не агонь, а не схопіш — абпалішся. 7. Зелена — не елка, красна — ды не дзеўка, з хвастом — ды не мыш. 8. Не згубіла, а ўсё шукае, не хворая, а ўсё крэхча. 9. Не яздок, а са шпорамі, не стораж, а ўсіх будзіць. 10. Без станка і без рук, а кросны тчэ.

Адгадкі: 1) вада; 2) мароз, лёд; 3) снег; 4) дзень; 5) бяроза; 6) крапіва; 7) бурак; 8) свіння; 9) певень; 10) павук.

53. Прачытайце загадкі. Выразна вымаўляйце галосныя ў ненаціскных складах. Растлумачце правапіс літары *я*.

1. Бела бялява хвастом віляла, лясы ламала, горы стаўляла. 2. Брат брата сячэ — бела кроў цячэ. 3. Ляжайка ляжыць, па ёй таратайка бяжыць. 4. Вечарам прыляціць, усю ноч на зямлі праляжыць, а раніцай на неба паляціць. 5. Хоць у капелюшы, але галавы не мае. 6. За сцяной касцяной цецярук балбоча. 7. Сядзіць бабка ў хаце, а галава на хаце. 8. Вярхом сядаю, на каго не знаю, знаёмага ўбачу — адразу саскочу.

Адгадкі: 1) каса; 2) жорны і мука; 3) дарога і воз; 4) раса; 5) грыб; 6) язык; 7) печ і комін; 8) шапка.

54. А. П. Сумарокаў (1717—1777) выдзяляў «слиянные литары» *я* і *ю*. Чаму ён іх так назваў? Прыгадайце, якія гукі абазначаюцца гэтымі літарамі.

Узор адказу. Літары *я* і *ю* абазначаюць спалучэнне гукаў [*йа*], [*йу*] *(яма, Юля)* або гукі [*а*] і [*у*], якія ідуць пасля мяккіх зычных. Такім чынам, яны паказваюць, як гучаць, зліваюцца два гукі, што ідуць побач.

55. Прачытайце прыслоўі, узятыя з Беларускай граматыкі для школ Б. Тарашкевіча. Звярніце ўвагу на правапіс часціцы *не* і прыназоўніка *без*. Чым розніцца іх сучаснае напісанне? вымаўленне?

Ня слухаеш ківа, паслухаеш кія. Ня так шкода, як нявыгода. Абяцаная шапка на вушы ня лезе. Бяз штукі ня ступіць. Перад невадам рыбы ня ловяць. З незабітага лісу шубы ня шыюць. Што сабе ня міла, то й другому ня зыч. Грозен ды ня боязен. Лецейка ня ўлежна, дык уежна. Бела мыецца, ды ня чыста ходзіць. Ня дзіва, што малако сіва. Без падпалы дровы не гараць. Без ахвоты няма работы.

Цвёрдыя і мяккія зычныя. Правапіс мяккага знака

56. Параўнайце пачатковыя зычныя гукі ў наступных парах слоў: *бэз — без, воз — вёз, гэта — гета, забіць — зябіць, кыш — кішкі, ласкаць — ляскаць, мышы — Мішы, нос — нёс, пыл — піў, суды — сюды, фыркаць — фінка, хораша — хітры, цыкаць — цікаць.* Якія розныя зычныя гукі абазначаюцца з дапамогай літар *б, в, г, з, к, л, м, н, п, с, ф, х, ц*? Як перадаецца мяккасць зычных на пісьме? Што можна сказаць аб зычным, калі за ім ідуць на пісьме галосныя, абазначаныя літарамі *е, ё, ю, і, я*?

Узор адказу. У пачатку першага слова кожнай пары ідзе цвёрды зычны гук, а ў пачатку другога — адпаведны мяккі гук. Такім чынам, літара *б* служыць для абазначэння гукаў [*б*] і [*б'*]; *в* — [*в*] і [*в'*]; *г* — [*г*] і [*г'*]; *з* — [*з*] і [*з'*]; *к* — [*к*] і [*к'*]; *л* — [*л*] і [*л'*]; *м* — [*м*] і [*м'*]; *н* — [*н*] і [*н'*]; *п* — [*п*] і [*п'*]; *с* — [*с*] і [*с'*]; *ф* — [*ф*] і [*ф'*]; *х* — [*х*] і [*х'*]; *ц* — [*ц*] і [*ц'*], які паходзіць з [*т'*]. Мяккасць зычных на пісьме перадаецца з дапамогай мяккага знака і літар *е, ё, і, ю, я*. Яны ідуць пасля зычных, мяккасць якіх трэба абазначыць.

Не перадаецца на пісьме мяккасць гукаў [*з*], [*с*], [*ц*], [*дз*͡], калі яна ўзнікла пад уплывам мяккасці наступнага зычнага: *снег [с'н'эг], песня [п'э́с'н'а], дзве [дз'в'э]*.

57. Чаму літары *д, т, ж, ш, р, ч* не выкарыстоўваюцца для абазначэння мяккіх зычных гукаў?

58. Якая літара ў беларускай мове абазначае не асобны гук, а толькі ўказвае на якасць гукаў у пэўных словах? Ці з'яўляецца літарай апостраф? Якія, акрамя літар, графічныя сродкі ўваходзяць у беларускую графічную сістэму?

Узор адказу. На мяккасць зычных указвае напісанне пасля іх мяккага знака: *маленькі, пень, хадзіць, соль*. Надрадковы знак апостраф выконвае важную функцыю, бо паказвае, што ётавая літара, якая ідзе пасля яго, абазначае спалучэнне з двух гукаў: гука [*й*] і адпаведнага галоснага гука: *аб/йа́/ва* 'аб'ява', *надво́р/йа/* 'надвор'е', *вераб/йі/* 'вераб'і'. Апостраф не з'яўляецца літарай, але ён разам з іншымі знакамі і графічнымі сродкамі ўваходзіць у графічную сістэму беларускай мовы. У яе ўваходзяць таксама знакі прыпынку, злучок, знак націску, параграф або такія графічныя сродкі, як інтэрвалы паміж словамі; падкрэсліванне з дапамогай прамых, звілістых ці іншых ліній;

вылучэнне пэўных слоў з дапамогай спецыяльных шрыфтоў; разнастайныя спосабы скарочанага напісання слоў; ужыванне вялікіх літар; разбіўка тэксту на абзацы; матэматычныя знакі; лічбы; знакі нумароў і арыфметычных дзеянняў.

У «Нашай ніве» за 1906 г. ужываюцца напісанні з цвёрдым знакам *(абъявіў, падъехаў)*, але ў 1914 годзе падобныя словы пачалі пісаць з апострафам: *ад'ехалі, пад'ехалі.*

59. Параўнайце словы, якія пачынаюцца з гука [*й*]: *йеменка, есці, ёрш, іскрачка, юнацкі, яблык.* Зрабіце вывады аб спосабах перадачы гука [*й*] на пісьме. Колькі існуе такіх спосабаў? Падбярыце словы, у якіх гук [*й*] перадаецца ўсімі вызначанымі спосабамі ў сярэдзіне слова.

Узор адказу. З літары *й* у беларускай мове пачынаюцца словы, якія абазначаюць некаторыя назвы іншаземных населеных пунктаў *(Йаганесбург, Йакагама, Йашкар-Ала, Йелаўстан, Йемен, Йоркшыр)* і вытворныя ад гэтых назваў назоўнікі і прыметнікі *(йаганесбургскі, йакагамскі, йашкарскі, йеменец, йоркшыр, йоркшырскі)*. З прыведзенага ў заданні спіса слоў з літары *й* і гука [*й*] пачынаецца слова *йеменка.* Усе астатнія словы пачынаюцца з гука [*й*], які адначасова з гукамі [*э*], [*о*], [*і*], [*у*], [*а*] перадаецца з дапамогай літар *е, ё, і, ю, я.* Існуе 6 спосабаў абазначэння гука [*й*]. У сярэдзіне слова гук [*й*] абазначаецца літарамі *е (здароўе, заехаць, з'есці), ё (куп'ё, паёк, пугаўё), і (заінець, салаўіны, вераб'і), ю (баюся, пераўюцца, інтэрв'ю), я (выясніць, сям'я, салаўяня), й (пайсці, шыйкі).*

60. Праспрагайце дзеяслоў *пець.* Якія гукі абазначаюць літары *е, ё, я, ю* ў кожнай з форм? Параўнайце колькасць літар і колькасць гукаў у кожнай з форм. Чаму літары *е, ё, ю, я* называюць ётавымі?

Узор адказу. *Пяю, пяеш, пяе, пяём, пеяце, пяюць; пей, пейце: [п'айу́]; [п'айэ́ш]; [п'айэ́]; [п'айо́м]; [п'эйац'э́]; [п'айу́ц']; [п'эй]; [п'э́йц'э].* У большасці форм літар на адну менш, чым гукаў, толькі ў формах *пяюць, пей, пейце* колькасць літар і гукаў супадае.

Галосныя літары *я, ю, е, ё* служаць: 1) для абазначэння галосных гукаў [*а*], [*у*], [*э*], [*о*] і мяккасці зычных, якія ім папярэднічаюць; 2) для абазначэння зычнага гука [*й*] у спалучэнні з галоснымі гукамі [*а*],

[*о*], [*у*], [*э*]. Ётавымі літары называюцца таму, што яны могуць абазначаць гук [*й*], які называецца ётам.

61. У наступным спісе адшукайце словы, дзе гук [*й*] абазначаецца з дапамогай літар, якія адначасова ўжываюцца і для перадачы на пісьме галосных гукаў: *сена, веяць, зяваць, праезд, з'явіцца, бліснуць, праіснаваць, прайграць, праём, замёрзлы, з'езд, паіць, пайка, ёмка, лёс, п'яўка, Заслаўе, пяць, палёт, мільён, пець, п'еса, вераб'іны, біць, лаянка, разаўю, люты, ямка, ляпіць, елка, віць, ікаць.* Вызначце, у якіх чатырох пазіцыях сустракаецца гук [*й*], абазначаны літарамі *е, ё, ю, я, і.* (Звярніце ўвагу на тое, дзе знаходзіцца гук [*й*], у пачатку або сярэдзіне слова, а таксама на тое, пасля якіх літар і графічных знакаў ён пішацца.)

Ці можна абазначыць гук [*й*] літарамі *е, ё, ю, я, і* ў канцы слова? Калі была ўведзена літара *й* у рускі алфавіт?

Узор адказу. *Вé[йа]ць (веяць), пра[йэ́]зд (праезд), з'[йа]вíцца (з'явіцца), пра[йі]снавáць (праіснаваць), пра[йо́]м (праём), з'[йэ́]зд (з'езд), па[йі]ць (паіць), [йо́]мка (ёмка), п'[йа́]ўка (п'яўка), Заслáў[йэ] (Заслаўе), міль[йо́]н (мільён), п'[йэ́]са (п'еса), вераб'[йі́]ны (вераб'іны), ла́[йа]нка (лаянка), разаў[йу́] (разаўю).* Гук [*й*] абазначаецца літарамі *е, ё, ю, я, і*: 1) у пачатку слова: *[йэ́]лка (елка), [йо́]лкі (ёлкі), [йу]р (юр), [йа́]мка (ямка), [йі́]каць (ікаць)*; 2) у сярэдзіне слова пасля літар, якія абазначаюць галосныя гукі: *пра[йэ́]хаць (праехаць), пра[йо́]м (праём), пя[йу́]ха (пяюха), ла[йа]нка (лаянка), кра[йі́]на (краіна)*; 3) пасля апострафа ці раздзяляльнага мяккага знака: *п[йэ́]са (п'еса), пад[йо́]м (пад'ём), п[йа]ўка (п'яўка), інтэрв[йу́] (інтэрв'ю), вераб'[йі́]ны (вераб'іны), рэль[йэ́]ф (рэльеф), канферансь[йэ́] (канферансье), міль[йа]нер (мільянер)*; 4) пасля *ў*: *Заслáў[йэ] (Заслаўе), заў[йо́]м (заўём), заў[йу́]ць (заюць), салаў[йі́] (салаўі).*

Знак *й* для абазначэння адпаведнага гука старабеларускія друкары пачалі выкарыстоўваць у канцы XVI ст. «У гэтых адносінах беларуская пісьменнасць некалькі апярэдзіла рускую, у якой **літара** *й* адсутнічала аж да рэформы 1735 года».[1]

62. Якія літары не абазначаюць гукі? Для чаго выкарыстоўваюцца гэтыя літары? Прывядзіце прыклады.

---

[1] Булыка А. Развіццё арфаграфічнай сістэмы старажытнай беларускай мовы. Мн., 1970. С. 54.

63. Адкажыце на пытанні. Запішыце адказы.

1. У якіх імёнах вашых сяброў і знаёмых ёсць *ь*?
2. У якіх назвах дрэў і хмызняку ёсць *ь*?
3. У якіх назвах раслін ёсць *ь*?
4. У якіх назвах лічбаў ёсць *ь*?
5. У якіх назвах звяроў ёсць *ь*?
6. У якіх назвах птушак ёсць *ь*?
7. У якіх назвах рыб ёсць *ь*?
8. У якіх назвах насякомых ёсць *ь*?

Адказы: 1) Алесь, Ясь, Васіль, Карусь, Валодзька, Вольга, Зоська, Амілька, Ганулька; 2) ясень, вольха, бружмель; 3) хмель, зязюлька, ячмень, бульба, рэдзька; 4) пяць, шэсць, дзевяць, адзінаццаць, дванаццаць, шэсцьсот; 5) алень, рысь, лось; 6) журавель, гіль, лебедзь; 7) акунь, язь; 8) чмель, моль.

64. Адгадайце загадкі. Запішыце адгадкі. Якія мяккія зычныя ёсць у словах *мядзведзь* і *рысь*? Як перадаецца ў іх мяккасць зычных? Што будзе абазначаць слова *рысь*, калі яго напісаць без мяккага знака?

1. Не ляснік ды мае
Ў пушчы свой абход,
А з усіх прысмакаў
Надта любіць мёд.

2. Кошка вялікая,
Ды не мурлыкае —
На звяроў нападае
Драпежніца маладая.

(М. Маляўка.)

Адгадкі: 1) мядзведзь; 2) рысь.

65. Колькі літар у беларускім алфавіце могуць абазначаць цвёрдыя і мяккія зычныя гукі? Складзіце табліцу, у якой была б адлюстравана адпаведнасць гэтых літар цвёрдым і мяккім зычным гукам. Напрыклад:



і г. д.

Якія літары абазначаюць толькі цвёрдыя гукі? Якая літара абазначае толькі мяккі гук? Якія літары абазначаюць мяккасць папярэдняга гука?

66. Якія гукі абазначаюць літары *б, г, д, з, ж* і спалучэнні літар *дзь, зь* у канцы наступных слоў: *боб, бег, сад, сядзь, газ, залезь, Сож*? Прыдумайце словы, у якіх гэтыя літары абазначаюць такія ж гукі ў сярэдзіне слоў. Як утвараюцца звонкія і глухія зычныя гукі? Чым яны розняцца паміж сабой?

Узор адказу. У канцы пералічаных слоў літара *б* абазначае гук [*п*], *г* — [*х*], *д* — [*т*], *дзь* — [*ц'*], *з* — [*с*], *зь* — [*с'*], *ж* — [*ш*]: *зубкаваты, дрогка* (прысл.), *салодкі, дзядзькі, нізкі, злезці, сцежка.*

Пры ўтварэнні зычнага па-рознаму ўдзельнічаюць галасавыя і шумавыя крыніцы гука. Для адной групы зычных галоўным з'яўляецца голас, хаця ў іх прысутнічае і шум, для другіх — характэрна перавага шуму над голасам. Шумнымі з'яўляюцца ў беларускай мове гукі [*б*], [*б'*], [*п*], [*п'*], [*д*], [*т*], [*г*], [*к*], [*г'*], [*к'*], [*ф*], [*ф'*], [*з*], [*з'*], [*с*], [*с'*], [*ж*], [*ш*], [*х*], [*х'*], [*д͡ж*], [*д͡з*], [*д͡з'*], [*ч*], [*ц*], [*ц'*].

Але і пры іх утварэнні голас і шум адыгрываюць розную ролю. Звонкія зычныя вымаўляюцца пры адначасовым удзеле голасу і шуму, аднак голас пры гэтым пераважае. Глухія зычныя ўтвараюцца пры перавазе шуму. У беларускай мове існуюць наступныя пары зычных па звонкасці — глухасці: [*б*] — [*п*]; [*б'*] — [*п'*]; [*г*] (фрыкатыўны) — [*х*]; [*г'*] (фрыкатыўны) — [*х'*]; [*д*] — [*т*], [*д͡ж*] — [*ч*]; [*д͡з'*] — [*ц'*]; [*ж*] — [*ш*]; [*з*] — [*с*], [*з'*] — [*с'*].

67. Адгадайце загадку. Запішыце адказ. Чым адрозніваюцца запісаныя словы? Якія словы называюцца амонімамі?

Са звонкім гукам —
Кожны рады
Мяне ссушыць
Або спячы.
Калі ж з глухім —
Шукаюць рады,
Каб ад мяне як
Уцячы. *(І. Курбека.)*

Адгадка: грыб — грып.

68. Па-руску праславянскія словы **živьsь, *źivica, *źivotъ, *źito, *šiti, *šidlo, *širъ, *šigъ* пішуцца з літарай *и* пасля *ж* і *ш*, па-беларуску з літарай *ы*: *живец — жывец, живица — жывіца, живот — жывот, жито — жыта, шить — шыць, шило — шыла, шип — шып, широкий — шырокі.* Якое напісанне больш адпавядае сучаснаму вымаўленню? Якія яшчэ шыпячыя гукі ёсць у беларускай мове? Чым адрозніваецца ўжыванне шыпячых зычных ад свісцячых?

Узор адказу. Напісанне літары *ы* пасля літар *ж* і *ш* больш адпавядае вымаўленню, бо і ў беларускай, і ў рускай мовах гукі [*ж*] і [*ш*] зараз цвёрдыя!

Шыпячым, акрамя гукаў [*ж*] і [*ш*], з'яўляецца яшчэ гук [*ч*]. Шыпячымі гэтыя гукі называюцца па слыхавому ўражанню, якое яны выклікаюць. Свісцячымі называюцца зычныя гукі [*з*], [*з'*], [*с*], [с'], пры вымаўленні якіх струмень паветра ўтварае пэўнае «свісцячае» адценне (Б. А. Тарашкевіч называў гукі [*с*], [*з*], [*ц*], [*дз*͡] — «сычачыя»). Свісцячыя зычныя гукі ў адрозненне ад шыпячых бываюць цвёрдымі і мяккімі.

69. Чым у гукавым афармленні адрозніваюцца рускія і беларускія словы *щит* і *шчыт, щетина* і *шчаціна, щётка* і *шчотка, щебет* і *шчэбет, щепка* і *шчэпка*? Як гэта адрозненне перадаецца на пісьме?

У з о р а д к а з у. У пачатку рускіх слоў знаходзіцца змычна-шчылінны мяккі доўгі гук [*ш'*:], які на пісьме перадаецца літарай *щ*. Беларускія словы пачынаюцца са спалучэння двух цвёрдых шыпячых гукаў [*ш*]+[*ч*]. Зацвярдзенне гэтага спалучэння зычных адлюстроўваецца ў старажытных беларускіх помніках (Ф. Янкоўскі. Гістарычная граматыка беларускай мовы. Мн., 1983. С. 114).

70. Чаму некаторыя зычныя літары называюцца зацвярдзелымі?

М а т э р ы я л д л я д а в е д а к. Як вядома, у праславянскай мове, з якой узніклі ўсе славянскія мовы, шыпячыя зычныя і зычны *ц* былі толькі мяккія. Але ўжо на мяжы XIII—XIV стст. старажытныя беларускія помнікі адлюстроўваюць іх змяненне. Існуючае зацвярдзенне паказвае такія напісанні, як *іншыхъ, вожэня, кошэня, першыхъ, маючыхъ, выдаючы*. У XVI ст. усе шыпячыя зацвярдзелі. І ў наш час [*ж*], [*ш*], [*ч*] — толькі цвёрдыя. Зацвярдзенне [*ц*] беларускія помнікі паказваюць з XV ст.: *купецъ, цэною, тройцы*.

З улікам старой якасці зычных зараз былыя мяккія *ж, ш, ч, ц* называюць зацвярдзелымі. Але ў беларускай мове зараз існуе [*ц'*], які развіўся з былога [*т'*], таму літара *ц* можа абазначаць і [*ц*], і [*ц'*].

Зацвярдзелым называюць і зычны [*р*], хаця з гісторыі вядома, што ў агульнаславянскай мове ён быў і цвёрдым, і мяккім. Зацвярдзенне [*р'*] адбылося таксама вельмі рана, магчыма, яшчэ з дапісьмовых часоў. (Гл. Ф. Янкоўскі. Гістарычная граматыка беларускай мовы. Мн., 1983. С. 114—116.)

Склад і складападзел

З паняццем «склад» вучні знаёмяцца ў другім класе, а з самой з'явай яшчэ раней, пры навучанні чытанню. Больш падрабязна пытанні складападзелу абмяркоўваюцца пры гукавым разборы ў сувязі з засваеннем правіл пераносу слоў і на ўроках літаратуры пры засваенні вершаваных памераў.

Трэба адзначыць, што, як і ў адносінах да многіх іншых фанетычных паняццяў, у адносінах да склада існуюць шматлікія і супярэчлівыя погляды. Вядомы беларускі фанетыст А. І. Падлужны на гэты конт заўважае наступнае: «Склад — гэта найменшая вымаўленчая адзінка. Спробы больш дакладнага вызначэння гэтай адзінкі да гэтага часу беспаспяховыя, а гэта вызначэнне не дазваляе з пэўнасцю сказаць, што такое склад»[1]. Таму, на яго думку, варта на практыцы карыстацца толькі пэўна вызначанымі яго ўласцівасцямі. Сярод іх для беларускай мовы рэгулярна разглядаюцца наступныя:

1) абавязковым элементам склада з'яўляецца наяўнасць галоснага гука;

2) адзін галосны можа ўтвараць склад;

3) зычныя звычайна прымыкаюць у складзе да галоснага;

4) элементы склада вымаўляюцца злітна, не раздзяляюцца паміж сабою, як бы павольна ні вымаўляўся той або іншы адрэзак мовы;

5) склад не адносіцца да моўных адзінак, якія звязаны са значэннем.

У сувязі з гэтым для школы можна абмежавацца такім вызначэннем паняцця: «Гук або некалькі гукаў, што вымаўляюцца адным штуршком паветра, называюцца складам»[2]. Варта толькі дадаць, што гэты штуршок паветра — выдыхальны і што асновай склада з'яўляецца галосны гук, да якога могуць далучацца зычныя гукі (адзін ці некалькі).

Каб увідавочніць тое, што на кожны склад сапраўды прыпадае па аднаму штуршку паветра, можна прапанаваць правесці вопыт з запаленай свечкай.

---

[1] Крывіцкі А. А., Падлужны А. І. Практыкум па фанетыцы беларускай мовы. Мн., 1989. С. 77.

[2] Беларуская мова. Дапаможнік для абітурыентаў. Мн., 1992. С. 48.

Калі запаліць свечку, паднесці яе блізка да роту і вымавіць двухскладовае слова, то полымя свечкі здрыганецца два разы, калі аднаскладовае — адзін, калі трохскладовае — тры. Калі слова заканчваецца на націскны галосны, то полымя ад моцнага штуршка паветра можа нават пагаснуць.

У беларускім слове столькі складоў, колькі галосных гукаў. Такім чынам, колькасць зычных не ўплывае на колькасць складоў. У межах склада галосныя [*а*], [*э*], [*о*], [*у*], [*і*], [*ы*] могуць спалучацца з адным, двума, трыма і болей зычнымі. Заўважым таксама, што ў складзе зычныя могуць ісці як перад галоснымі, так і пасля іх. Прыгадаем такія аднаскладовыя словы, як *ці, я, дзе, мы, га, су,* у якіх галосныя спалучаюцца з адным папярэднім зычным, з сугучнымі аднаскладовымі словамі, дзе да галоснага зычныя далучаюцца з двух бакоў: *ціс, язь, дзень, мыш, гам, сум.*

У беларускай літаратурнай мове ў пачатку склада ўжываюцца і адзін *(жах)*, і два *(стогн, стос)*, і тры *(скручаны, стрэл)*, і чатыры *(пстрык)* зычныя гукі. Іх колькасць можа быць рознай і ў канцы склада: 1 — *сон, сыр*, 2 — *коўш, сэнс*, 3 — *тэкст, боршч* і г. д. Такім чынам, аднаскладовае слова можа змяшчаць тры (ЗЗГЗ: *здор, дбаць*; ЗГЗЗ: *густ*); чатыры (ЗГЗЗЗ: *поўсць*; ЗЗЗГЗ: *ксціць, ткнуць*; ЗЗГЗЗ: *стоўп, смоўж*), і нават пяць зычных гукаў (ЗЗЗЗГЗ: не *ўсплыць, ўздрыг*; ЗЗЗГЗЗ: *сквайр* (тытул)), якія разам з адным галосным ствараюць склад.

Па колькасці галосных гукаў у беларускай мове вызначаецца колькасць складоў. Словы бываюць аднаскладовымі і шматскладовымі, змяшчаюць ад аднаго да сямі галосных. Напрыклад, *звяць, дах, роў; та-та, згру-жаць, ба-ба; ма-шы-на, ба-ра-да, га-ва-рыць; за-ма-ру-дзіць, за-ме-ша-ны, а-ле-шы-на; за-ма-ля-ваны, вы-тлу-ма-ча-ны, у-ла-дар-ні-ца; за-ма-ры-на-ваны, пе-ра-шну-ра-ва-ны, пра-пар-цы-я-наль-на; пе-рафар-мі-ра-вац-ца, пе-ра-трэ-ні-ра-ва-ны, не-да-атрым-лі-вац-ца.*

У складаных словах колькасць складоў можа быць і яшчэ большай: *са-ма-лё-та-бу-даў-нік, вы-со-ка-меха-ні-за-ва-ны, свет-ла-а-ран-жа-вы, бла-кіт-на-ва-тасі-ні.*

Аднак больш пашыранымі ў беларускай літаратурнай мове з'яўляюцца аднаскладовыя, двухскладовыя і трохскладовыя словы. Іх часцей ужываюць у вус-

най мове. Пры развіцці дзіцячай мовы таксама спачатку ў ёй з'яўляюцца адна- і двухскладовыя словы *(на, дай, мама, ляля, цаца)*, а потым ужо шматскладовыя *(ма-шы-на)*. На пачатковых этапах авалодання лексікай дзеці ўтвараюць большасць першых сваіх слоў шляхам паўтора аднаго і таго ж склада *(ба-ба, та-та)*. Часцей пры гэтым першы склад рэалізуецца як націскны, а другі — як ненаціскны.

Галосны гук у складзе можа быць адзін (без зычных), пачынаць склад, ісці за зычнымі, знаходзіцца паміж імі: *а-рэ-шак, і-гру-ша, э-фір, эў-ка-ліпт.*

Склад, які канчаецца на галосны, называецца адкрытым: *са-ло-ма, ка-ро-ва, ва-ро-на, ва-ча-ня-ты*, а які канчаецца на зычны — закрытым: *гусь, гур-ток, аб-гляд, аб-віць.*

У беларускай мове існуе па некалькі тыпаў адкрытых і закрытых складоў: ЗГ, ЗЗГ, ЗЗЗГ, ЗЗЗЗГ *(не, два, стры-, пстры-)* і ГЗ, ЗГЗЗ, ЗГЗЗЗ *(аб, такт, цэнтр)*. Адкрытыя склады сустракаюцца ў беларускай мове больш часта, чым закрытыя. Яны магчымы ў пачатку, сярэдзіне і ў канцы слова.

У залежнасці ад месца ў слове выдзяляюцца пачатковыя і непачатковыя *(ка-ва-лак)*, канцавыя і неканцавыя склады. У беларускіх словах пачатковы склад звычайна выразны, больш гучны, чым астатнія. Канцавы ж склад менш выразны, не такі гучны, асабліва, калі ён змяшчае ненаціскны галосны. Увогуле пачатковы склад распазнаецца лепш, чым непачатковыя, а канцавы закрыты — горш, чым неканцавыя.

Вядома, што з вымаўленнем пачатковага склада звязан працэс слыхавога самаканторолю ў чалавека, калі ён гаворыць. Пры моўных захворваннях тыпу лаганеўрозу (заікання) гэты працэс слыхавога і кінестэзійнага самаканторолю артыкуляцыі парушаецца, што прыводзіць да парушэння артыкуляцыі слова. Іменна на першым складзе ў хворага адбываецца затрымка ў вымаўленні *(за-за-заяц)* у адрозненне ад астатніх складоў, якія вымаўляюцца нармальна.

На першы погляд, такая падрабязная характарыстыка склада з'яўляецца збыткоўнай, бо ў роднай мове чалавеку ўсё ўяўляецца натуральным і заканамерным. Аднак, калі параўнаць вядомыя мовы, то высветліцца, што прынцыпы арганізацыі складоў могуць у іх істотна адрозніваца.

Так, ва ўсіх мовах склад — гэта гукавая адзінка,

якая займае прамежкавае становішча паміж гукам і моўным тактам і мае свае вызначальныя прыкметы:

1. З пункту погляду моўна-рухальнага кіравання склад — гэта мінімальны ланцужок гукаў, унутры якога дзейнічаюць правілы сумеснага вымаўлення гукаў (т. зв. каартыкуляцыі) і размеркавання працягласцей паміж імі. Так, у беларускай мове можа адбывацца накладванне артыкуляцыі наступнага гука на папярэдні: калі ў складзе ёсць агублены галосны [*о*] і [*у*], то гэтую агубленасць набывае і папярэдні зычны. Працягласць гукаў таксама ўзаемазалежная ў складзе. З дапамогай спецыяльнай апаратуры гэта можна ўбачыць і зарэгістраваць. Самому можна ўбачыць розную агубленасць (скругленасць) губ пры вымаўленні зычных гукаў перад рознымі галоснымі з дапамогай люстэрка. Напрыклад, у такіх словах, як *тата* і *той*, губы перад галоснай [*о*] акругляюцца ўжо пры вымаўленні [*т*].

2. Мяркуецца таксама, што склад рэалізуецца не як паслядоўнасць з некалькіх гукаў, але як суцэльны артыкуляцыйны комплекс, які задаецца адзіным блокам нейрафізіялагічных каманд да мышцаў. Калі правесці параўнанне з будаўніцтвам, то склад створаны не з асобных цаглін (цагліна да цагліны), якія рабіліся кожная паасобку, але як блок, з аконным праёмам, які адразу рабілі так, каб было акно.

3. З пункту гледжання моўнай аэрадынамікі склад — мінімальны гукавы адрэзак, на які прыпадае ўзрастанне і спад велічыні паветранай плыні («дыхальны імпульс»).

4. У акустычным сігнале «дыхальнаму імпульсу» адпавядае ўзыходна-сыходная дуга гукавога ціску («хваля гучнасці»).

Такія ўласцівасці характарызуюць склад у любой мове. Аднак можна лепш зразумець, што рэальны змест паняцця склад у мовах свету неаднолькавы, калі прыгадаць наступныя факты.

У арабскай мове дапушчальнымі з'яўляюцца толькі склады тыпу «зычны+галосны» і «зычны +галосны+зычны». У нямецкай мове звонкія шумныя зычныя немагчымы ў канцы склада. У шведскай мове за кароткім галосным можа ісці толькі доўгі зычны, а за доўгім галосным — кароткі зычны. У лацінскай мове націск прыпадае на перадапошні склад, калі ён змя-

шчае доўгі галосны або заканчваецца на зычны, і на другі склад ад канца — у астатніх выпадках.

Тэндэнцыя да суаднясення складападзелу і марфемных граніц, якая часткова назіраецца ў славянскіх мовах, пры сваім паслядоўным ажыццяўленні можа прывесці да монасілабізму — супадзенню марфемы і склада. Як вядома, монаскладовасць (пераважная наяўнасць аднаскладовых слоў) з'яўляецца характэрнай для многіх кітайска-тыбецкіх моў. Наогул існуюць так званыя складовыя мовы, у якіх склад з'яўляецца сэнсаадрознівальнай адзінкай (большасць моў Кітая і Паўднёва-Ўсходняй Азіі). У такіх мовах склады маюць выразную ўнутраную структуру, і складападзел у іх адзначаны і не выклікае пярэчанняў[1].

Беларускія гукавыя паслядоўнасці заснаваны на чаргаванні вакалічных «вяршынь» і кансанантных «схілаў», пры гэтым складападзелы спалучэнняў зычных, змешчаных паміж галоснымі, не з'яўляюцца такімі відавочнымі і бясспрэчнымі, як у складовых мовах. У беларускай мове вяршыняй, ядром склада можа быць толькі галосны (параўн. з чэшскай мовай, дзе ядром склада можа быць і санант: чэш. vr̥-ba).

Вызначэнне межаў складоў ў слове называецца складападзелам. Пры ўспрыманні слоў на слых носьбіты беларускай мовы лёгка вызначаюць колькасць складоў. Аднак падзел на склады не выклікае цяжкасцей толькі тады, калі галосныя чаргуюцца з зычнымі *(ва-ро-на)*. У іншых выпадках, калі разам знаходзіцца некалькі зычных, правесці складападзел няпроста. Напрыклад, у слове *востры* магчыма некалькі варыянтаў падзелу на склады: *во-стры, востры, вост-ры.* Калі зыходзіць з прынятых вызначэнняў, то адназначна аддаць перавагу аднаму з прыведзеных варыянтаў нельга.

Існуе мноства тэорый, якія дазваляюць сфармуляваць пэўныя правілы складападзелу. Найбольш пашыранай і прынятай з'яўляецца так званая санорная тэорыя склада (яшчэ яе называюць тэорыяй узрастаючай гучнасці)[2]. Згодна з гэтай тэорыяй склад — гэта спалучэнне найбольш гучнага элемента з менш гучны-

[1] Касевич В. Б. Фонологические проблемы общего и восточного языкознания. М., 1983.

[2] Аванесов Р. И. Фонетика современного русского литературного языка. М., 1956. С. 41—46; Фанетыка беларускай літаратурнай мовы. С. 230—231.

мі. Усе гукі падзяляюцца на некалькі класаў па іх гучнасці. У адзін клас уваходзяць найбольш гучныя гукі — галосныя (ступень іх гучнасці можна абазначыць лічбай 5), у другі — санорныя (гучнасць 4), у трэці — змычныя шумныя зычныя (гучнасць 2) і чацвёрты — шчылінныя зычныя (гучнасць 1). Асноўны закон гэтай тэорыі сцвярджае, што пры пабудове непачатковых складоў гукі беларускай мовы спалучаюцца ў розныя паслядоўнасці, але заўсёды па прынцыпу ўзыходнай гучнасці, г. зн. зычныя гукі, якія папярэднічаюць у складзе галоснаму, ствараюць з ім узрастаючую па гучнасці паслядоўнасць. Складападзел адпавядае найбольш істотнаму памяншэнню гучнасці. Па сваёй гучнасці слова *востры* мае наступную схему *в*(4)*о*(5)*с*(1)*т*(2)*р*(4)*ы*(5) — 451245. Найбольш істотнае памяншэнне назіраецца паміж галосным *о*(5) і зычным *с*(1), таму складападзел робіцца ў гэтым месцы: *востры*. Гучнасць у абодвух складах узрастае. Калі ў слове спалучаюцца некалькі санорных зычных, то складападзел можа быць дваякі: 45445 *марна — марна* і *мар-на,* бо ён у абодвух выпадках не пярэчыць закону ўзыходнай гучнасці.

Пры збегу санорнага з шумнымі зычнымі складападзел адбываецца пасля санорнага 25415415 *(байчэйшы — бай-чэй-шы)*. Прыведзеная тэорыя не з'яўляецца адзінай. Прыгадаем яшчэ тэорыю мускульнага напружання акадэміка Л. У. Шчэрбы. Яна сцвярджае, што непадзельнасць склада вызначаецца імпульсам мускульнага напружання. Кожны імпульс складаецца з узмацнення, максімуму і паслаблення. Усе зычныя могуць быць або моцнаканцавымі — з узрастаннем мускульнага напружання ў канцы гучання, або моцнапачатковым — з узрастаннем напружання на яго пачатку, або двухвяршынным — з паслабленнем у сярэдзіне.

Мяжа склада будзе праходзіць у першым выпадку перад зычным, у другім — пасля яго, у трэцім — унутры яго[1]. Першыя два выпадкі не супярэчаць санорнай тэорыі, а трэці, як заўважае А. І. Падлужны, «адносіцца да падоўжаных зычных і не заўсёды адпавядае санорнай тэорыі»[2].

[1] Щерба Л. В. Фонетика французского языка. М., 1939. С. 75—76.

[2] Крывіцкі А. А., Падлужны А. І. Практыкум па фанетыцы беларускай мовы. Мн., 1989. С. 79.

Назіранні Л. У. Шчэрбы нельга адмаўляць, але пытанне складападзелу нельга вырашыць толькі на падставе гэтай тэорыі.

Рад карысных прапаноў па складападзелу быў выказаны і такімі буйнымі рускімі вучонымі, як А. Патэбня, А. Брок, Ф. дэ Сасюр, а ў наш час Л. Бандарка, С. Канзасаў. Аднак аналізаваць станоўчыя і адмоўныя бакі гэтых палажэнняў у нашай кнізе немэтазгодна, бо ў школьнай практыцы ўсё ж варта карыстацца пераважна бясспрэчнымі звесткамі, якія мае навука. Так, для школьнай практыкі непрымальным можна лічыць такі пункт погляду, згодна з якім складападзел заўсёды праходзіць пасля галоснага гука, хаця ён і мае дастатковае навуковае абгрунтаванне.[1] Таму прапанаваны вышэй кароткі агляд лінгвістычных тэорый меў на мэце пераканаць настаўніка ў тым, што пры агульнай нераспрацаванасці пытання можна не засяроджвацца на дакладным вызначэнні меж складоў у тых выпадках, калі ўнутры слова цяжкія для складападзелу групы зычных; вучняў варта прывучаць да таго складападзелу, які потым спатрэбіцца пры засваенні правіл пераносу слоў. Зразумела, што складападзел — з'ява лінгвістычная, аб'ектыўна існуючая ў мове, а падзел слоў пры пераносе з'яўляецца ўмоўным правілам пісьма. Аднак само паняцце «склад» практычна выкарыстоўваецца якраз пры пераносе і менш уплывае на іншыя фанетычныя і арфаграфічныя ўменні вучняў. Засваенне правіл пабудовы склада па ўзрастанню гучнасці было б складаным для вучняў, таму мэтазгодна разглядаць складовую і марфемную структуры слова. Важна, каб былі засвоены найбольш тыповыя рэгулярныя правілы складападзелу.

1. Калі ў слове зычныя і галосныя размешчаны па чарзе, складападзел праводзіцца паміж папярэднім і наступным зычным *(па-ка-та-лі, на-ка-сі-лі, палі-то)*.

2. Калі паміж галоснымі ёсць спалучэнне шумных зычных ці шумнага і санорнага, то складападзел праходзіць паміж зычных *(мят-ла, пош-та)*.

3. Калі паміж галоснымі ёсць спалучэнне санорнага зычнага з санорным або спалучэнне санорнага ці

[1] Бондарко Л. В. Звуковой строй современного русского языка. М., 1977.

[ў] і [ў] з шумным, то складападзел праходзіць паміж зычнымі: [ў] і [ў] адносяць да папярэдняга склада, а другі зычны — да наступнага *(гал-ка, жар-ты, памрэ, роў-ны, зай-чык)*.

4. Спалучэнні зычных гукаў у пачатку слова і ў канцы незалежна ад тыпу зычных, якія спалучаюцца, цалкам адносяцца да склада, утворанага суседнім галосным гукам *(зра-бі-ла, ка-лібр)*.

5. Складападзел на стыку марфем праводзіцца па тых жа правілах, што і не на стыку. Таму падзел слова на марфемы *(пад-ыгр-а-л-і)* можа не супадаць з падзелам яго на склады *(па-ды-гра-лі)*.

Што датычыцца апошняга правіла, то яго можна адразу скарэкціраваць з улікам правіл пераносу. Вядома, што пры пераносе слоў з прыстаўкамі нельга разбіваць аднаскладовую прыстаўку, калі за ёй ідзе зычная. Таму лепш адразу даваць вучням як узор больш пажаданага такі складападзел слоў з аднаскладовай прыстаўкай, пры якім яна ўваходзіць у асобны склад. Напрыклад, *без-дапаможны, над-будаваць, раз-мах.*

З таго, што пры пераносе слоў з прыстаўкамі нельга пакідаць у канцы радка пры прыстаўцы пачатковую частку кораня, калі яна не з'яўляецца складам, вынікае неабходнасць і пры складападзеле ўлічваць марфемную структуру слова. Больш пажадана дзяліць слова на склады так, каб гэта можна было выкарыстаць і пры пераносе слоў. Лепш: *аб-ста-ві-ны, ад-грабаць, на-браць, пад-крэс-ліць, рас-плес-ці,* а не: *абс-таві-ны, адг-ра-баць, наб-раць, падк-рэс-ліць, расплес-ці.*

Тое, што падзел на склады і на марфемы часам не супадае, можна паказаць на прыкладзе пераносу слоў з аднаскладовымі прыстаўкамі, за якімі ідуць галосныя. Такія прыстаўкі, як вядома, могуць разбівацца пераносам *(бе-за-ва-рый-ны, бе-зу-моў-на, па-да-коннік)*. У гэтым выпадку перанос слоў адбываецца па складах. Аднак тое, што гэтыя словы можна пераносіць і з захаваннем суцэльнасці прыстаўкі, сведчыць аб уплыве на складападзел марфемнай структуры слова. Правільным з'яўляецца і наступны перанос: *без-аварыйны, без-умоўна, пад-аконнік.*

Перавага паскладоваму пераносу аддаецца ў тых выпадках, калі за аднаскладовымі прыстаўкамі на зычную ідзе галосны *ы*, бо частку слова, якая пачы-

наецца з *ы*, пераносіць не дазваляецца. Правільна: *падыход, пады-ход,* а не *пад-ыход, ра-зыграць, разыграць,* а не *раз-ыграць, спа-дыспаду, спадыс-паду,* а не *спад-ыспаду, узы-сці, узыс-ці,* а не *уз-ысці.* Прынцып пераважнага пераносу з аднаго радка ў другі такіх частак слова, якія з'яўляюцца складамі, дзейнічае ў і тым выпадку, калі ў словах пасля прыставак ідуць *й* і *ў*.

У такіх словах літары *й, ў* застаюцца пры прыстаўцы, што адпавядае падзелу слоў на склады. Правільны пераносі: *дай-сці, дайс-ці, перай-сці, перайс-ці; заў-тра, заў-важыць, неў-раджайны, паў-тарыць, праў-нук* і г. д.

Разгляд пераносу слоў і складападзелу патрабуе яшчэ раз вярнуцца да таго, як суадносяцца паміж сабой гукі і літары.

Можна прапанаваць вучням самім адказаць на пытанне: «Чаму пры пераносе нельга аддзяляць *ь* (мяккі знак) і ' (апостраф) ад папярэдняй зычнай? Чаму нельга таксама раздзяляць афрыкаты *дж* і *дз*?» Для гэтага варта прапанаваць правесці фанетычны разбор такіх слоў, як, напрыклад, *бульба, вязьмо, аб'ява, бур'ян, саджанцы, радзіма,* і параўнаць, што атрымліваецца з абазначэннем гукаў пры правільным і няправільным пераносе.

Правільна:		Няправільна:
[бу́л'-ба]	буль-ба	бул-ьба
[в'аз'-мо́]	вязь-мо	вяз-ьмо
[аб-йа́ва]	аб'-ява	аб-'ява
[бур-йа́н]	бур'-ян	бур-'ян
[са́-д͡жанцы]	са-джанцы	сад-жанцы
[ра-дз'і́-ма]	радзі-ма ра-дзіма	рад-зіма

Варта запытацца: для чаго выкарыстоўваюцца мяккі знак і апостраф у прыведзеных словах? Якія гукі — цвёрдыя ці мяккія — ідуць перад *ь* і апострафам? Колькі гукаў абазначаюць спалучэнні літар *ль, зь, б', р', дж, дз*? Колькі гукаў абазначае літара *я*? Якія гукі ўваходзяць у той склад, што застаецца на адным радку, і ў той, што пераносіцца на другі радок? Адказы на гэтыя пытанні пакажуць, што правільны пераносі лепш адпавядае гукавой пабудове слова.

Для малодшых школьнікаў, па назіраннях псіхолагаў і метадыстаў, гук — «цяжкая адзінка мовы, таму

што ў маўленні гукі не гучаць ізалявана, а адзін за адным, з паўзамі паміж слоўнымі комплексамі, пры гэтым у розным суседстве яны вымаўляюцца пад уплывам аднаго на другі. Псіхалагічна дзецям цяжка раздзяляць цэлае на часткі, якія функцыяніруюць толькі ў адзінстве»[1]. Таму настаўніку неабходна вучыць пачатковым звесткам аб слове, складзе і гуку «не кожнаму паасобку, а так, як яны жывуць у мове — у адзінстве»[2].

Т. М. Савельева і Н. Г. Яленскі прапануюць узор гутаркі настаўніка, якую можна выкарыстаць пры тлумачэнні паняцця «склад» нават у першым класе.

«Вымавіце слова павольна. Напрыклад, [*до-м'ік*]. Тады чутна, як слова распадаецца на асобныя часткі. Гэта — склады. Якія словы вы хочаце падзяліць на склады? Падыміце рукі...

Калі падзел на склады просты, дзеці гэта робяць самастойна, але яны могуць назваць і словы складаныя для іх у вымаўленні. Не трэба адхіляць такія словы, у такім выпадку варта вымавіць слова разам з вучнем. Напрыклад, словы, дзе побач ідзе некалькі зычных: *кас-ма-наўт, аст-ра-наўты,* або словы, у якіх адзін галосны гук — *стол,* або слова з гукам [*й*]: [*йа-ма*] (яма).

Для чаго мы вучым склады? Мы рыхтуемся пісаць. У нас у беларускай мове ведаць склады вельмі важна. Ад іх залежыць правільнасць нашага пісьма, таму што пішуцца ў беларускай мове словы па складах. Будзем старацца вучыць склады? (Будзем.)

Падзяляюцца словы на склады лёгка. Давайце паслухаем які-небудзь склад. У слове *домік* вымавіце першы склад, а другі не трэба: [*до*]. А цяпер паслухайце, як я вымаўляю: [*д...о*]. Гэта гукі. Першы гук скажам разам: [*д*], а другі — [*о*]. Гукі гэта розныя: адзін гук зычны, а другі — галосны. У складзе абавязкова павінен быць галосны гук. Галосныя гукі вымаўляюцца лёгка. Іх можна цягнуць: [*о-о-о*], [*а-а-а*], [*у-у-у*], [*ы-ы-ы*], [*і-і-і*], [*э-э-э*]. Галосных гукаў усяго шэсць.

Многія з вас ужо ведаюць літары, трошкі чытаюць, хто не можа чытаць і не ведае літар, гэта не бяда, мы

---

[1] Савельева Т. М., Еленский Н. Г. Дар слова: Говорим по-русски... Гаворым па-беларуску... С. 69.

[2] Там жа. С. 67.

хутка навучымся. Гукі можна запісаць літарамі. Я буду вымаўляць галосны гук і запісваць на дошцы, а вы паўтарайце іх...

Зычныя гукі вымавіць цяжэй, іх нельга доўга цягнуць, напрыклад: [*д, м, н, в, р*...].

Зычных гукаў больш, чым галосных. Мы іх усе называць не будзем. Вы гукі вымаўляеце, калі гаворыце са мной або з сябрамі, вы іх усе ведаеце. Толькі зараз мы навучымся слухаць гукі. Я назаву які-небудзь зычны гук, а вы любы галосны, а потым вымавіце склад: Я называю [*м*]. А вы? —[*а*]. А цяпер вымавіце склад: [*ма*]. А калі да яго дадаць яшчэ адзін такі ж склад, якое слова атрымаецца? *(Мама.)* Я называю гук [*р*]. А вы які галосны назавяце? — [*ы*]. Скажам склад: [*ры*]. У якім слове ёсць такі склад? *(Рыба.)* Скажыце гэта слова па складах: [*ры-ба*]. А цяпер скажыце другі склад гэтага слова: [*ба*]. У складзе абавязкова павінен быць галосны. Правільна я кажу? Скажыце, які галосны гук? — [*а*]. А зычны? —[*б*]...»[1].

Лепшаму разуменню гукавой структуры слова садзейнічае абазначэнне гукаў з дапамогай спецыяльных кружкоў (незафарбаванага ○ для галосных гукаў і зафарбаванага для зычных гукаў ●) і наступнае схематычнае прадстаўленне слоў. Напрыклад, *сок* — ●○●, *каса* — ●○●○. Абазначэнне галосных у гукавых схемах дапамагае і пры выяўленні колькасці складоў. Колькі незафарбаваных кружкоў, столькі і складоў. Выкарыстанне ўмоўных абазначэнняў «можа надаць фанетычнаму практыкаванню характар гульні. Але спачатку неабходна навучыць дзяцей запісваць гукі слоў. Напрыклад, у першую чаргу кароткіх слоў: *сок* — ●○●, *вада* — ●○●○, *дом* — ●○●. Затым запісаць на дошцы схему, напрыклад ●○●, і папрасіць дзяцей назваць слова, якое змяшчае зычныя і галосныя гукі ў такой паслядоўнасці.

Але дзеці любяць і самі прыдумваць, асабліва, калі адгадваць будзе дарослы. Так, настаўнік можа сказаць, каб кожны з іх прыдумаў якое-небудзь кароткае слова і запісаў у сшытку гукавую схему. Калі ўсё будзе гатова, ён можа падняць руку, выйсці да дошкі

---

[1] Савельева Т. М., Еленский Н. Г. Дар слова: Говорим по-русски... Гаворым па-беларуску... С. 70.

і запісаць гэту схему для настаўніка. Хай настаўнік здагадаецца, якое слова можна назваць згодна гэтай схеме. Тут паміж настаўнікам і вучнем можа адбыцца гутарка ў тым выпадку, калі слова, задуманае вучнем, і слова, названае настаўнікам, не супадуць: «Чаму яны не супалі? Што тут галоўнае: адгадаць слова або правільна ўжыць гукі розных спалучэнняў, якіх многа, і таму слоў таксама можа быць многа?»[1]

Для маленькага школьніка правядзенне гукавога аналізу няпростая праца, але яна неабходна і яму па сілах. Многія настаўнікі падкрэсліваюць, што яе паспяховасць могуць забяспечыць розныя сродкі наглядасці.

1. Абазначэнне гукаў з дапамогай раней падрыхтаваных каляровых фішак (звычайна кардонныя кружкі).

2. Абазначэнне гукаў кропкамі (алоўкам на паперы або крэйдай на дошцы).

Да запісанай схемы можна звяртацца пастаянна на розных этапах гукавога разбору. Гэтымі сродкамі вучні могуць карыстацца ў I — III і IV класах да вывучэння тэмы «Фанетыка і графіка»[2].

Для зручнасці якасць гукаў перадаецца ўмоўнай фарбай: галосныя — чырвоным колерам, зычныя мяккія — сінім, цвёрдыя — чорным (простым алоўкам), зычныя звонкія перадаюцца незафарбаваным кружком таго ж колеру, якім была зроблена кропка першапачаткова. Напрыклад: у працэсе разбору вызначылі, што ў слове *вярба [в'арбá]* 5 гукаў, іх абазначылі кропкамі па парадку: простым алоўкам . . . . . вызначылі галосныя гукі і расфарбавалі кропкі, якія іх абазначаюць, чырвоным колерам . ○. . ○; потым вызначылі зычныя цвёрдыя і мяккія. Кропкі, якія абазначаюць мяккія зычныя, расфарбавалі сінім колерам, кропкі, якія абазначаюць цвёрдыя зычныя, расфарбоўваць не трэба. Так, у гукавой схеме слова *вярба* трэба зафарбаваць сінім колерам толькі першую кропку, якая абазначае гук [*в*]: — ⊙. . . . ; гукі [*р*], [*б*] — цвёрдыя, яны ўжо абазначаны простым алоўкам. Наступны этап: вызначэнне звонкіх і глухіх зыч-

[1] Савельева Т. М., Еленский Н. Г. Дар слова: Говорим по-русски... Гаворым па-беларуску... С. 71.

[2] Гребенкина Р. Т. Изучение в школе фонетики и графики русского языка. С. 11—12.

ных і перадача іх на схеме: з кропкі, якая абазначае гук [*в'*] (мяккі, звонкі), малюецца сінім алоўкам незафарбаваны кружок ○; з кропкі, якая абазначае гук [*р*] (цвёрды, звонкі), малюецца незафарбаваны кружок простым алоўкам ○; з кропкі, якая абазначае гук [*б*], (цвёрды, звонкі), таксама малюецца незафарбаваны кружок простым алоўкам. Атрымоўваецца наступная схема:



Па назіраннях Р. Т. Грабенкінай, «на першы погляд гэта апісанне можа здацца грувасткім, але першакласнікі вучацца складанню гукавых схем слоў паэтапна. Ім падабаецца такі занятак. Ён падобны на гульню, асэнсаваную і даступную»[1]. Калі прыняць такое абазначэнне слоў, то з яго дапамогай можна правесці падлік складоў па колькасці чырвоных кропак.

Пры навучанні вучняў шасцігадовага ўзросту асэнсаванню чытання прамых складоў, можна выкарыстаць дапаможнік «Акенцы», які распрацаваны Л. Я. Журавай у «Метадычных рэкамендацыях па навучанню шасцігадовых дзяцей грамаце, матэматыцы, азнаямленню з акаляючым сусветам у першым класе школы або падрыхтоўчай групе дзіцячага сада»[2]. Такі дапаможнік можна зрабіць з кардону. Для гэтага два лісты кардону прамавугольнай формы накладваюцца адзін на другі і сашчэпліваюцца па краях. У верхнім лісце выразаюцца два акенцы — адно для стужкі зычных літар, другое — для стужкі галосных літар. Затым выразаюцца дзве палоскі кардону. На адной з іх пішуцца чорным колерам зычныя ў той паслядоўнасці, як яны ідуць у буквары, на другой — чырвоным колерам пішуцца ўсе галосныя літары.

Палоскі ўкладаюцца паміж сашчэпленых лістоў кардону. У левым акенцы перасоўваюцца зычныя літары, у правым — галосныя.

---

[1] Гребенкина Р. Т. Изучение в школе фонетики и графики русского языка. С. 12.

[2] Журова Л. Е. Методические рекомендации по обучению шестилетних детей грамоте, математике, ознакомлению с окружающим миром в первом классе или подготовительной группе детского сада. М., 1986.



ч
г
дз
дж
ц
р

е
э
о
а
у
ы

Пры перасоўванні палоскі з галоснымі літарамі адносна якой-небудзь зычнай літары «дзеці не механічна (па памяці), а зусім асэнсавана ўтвараюць і чытаюць прамыя склады. Пры чытанні склада з дапамогай «акенцаў» дзіцяці спаквaля адкрываецца спосаб чытання склада, а значыць — і слова, якое пабудавана са складоў, што забяспечвае потым асэнсаванае чытанне наогул»[1].

Калі акенцы зрабіць больш і на палосках намаляваць ужо вядомыя склады, то шляхам пачарговага перасоўвання палосак можна ўтварыць розныя словы. Такім чынам, увідавочніваецца сам працэс утварэння слоў са складоў.

Замацаваць навыкі падзелу на склады дапамогуць практыкаванні, што зарыентаваны на гукавую арганізацыю слова.

Практыкаванні

1. У слове столькі ж складоў, колькі ў ім галосных. Прачытайце словы па складах. Колькі складоў у кожным слове?

Барана, воблака, полымя, араць, ступка, горла, ясень, яблык, жаваранак, чарвяк, ягня, абараняць, вадзіцель, бульбяная, унук, ястрабяня.

2. Прачытайце словы. Колькі галосных у кожным слове?

Вёска, дуб, дождж, воўк, выдра, рабро, морква, слон, столь, сад, цётка, вусны.

Замяніце словы так, каб у кожным з іх было на адзін склад больш. (Напрыклад, *за вёскаю, пад дубам.*)

3. Прачытайце словы па складах. Спішыце іх, падкрэсліце літары *я, ю, е, ё, і.* Якія гукі яны абазначаюць?

---

[1] Савельева Т. М., Еленский Н. Г. Дар слова: Говорим по-русски... Гаворым па-беларуску... С. 176—177.

Яч-мень, Ян-ка, я-вар, я-га-да, ю-нак, ю-ве-лір, юнга, ю-ны, е-жа, е-лач-ка, ен-чыць, е-хаць, ёл-кі, ё-лачны, ёр-шык, ёр-заць, іг-ла, і-гру-ша, і-ліс-ты, і-мя.

4. Разбіце на склады наступныя словы. Колькі літар і гукаў у кожным слове і ў кожным складзе?

Д'ябал, ёмкі, калісьці, дамоў, адзін, абцас, ён, яны, зубр, сябра, змяя, з'ядаць, разьбяр, раз'юшаны, ячны, маіх, маёмасць.

Майскі, найлепшы, лейка, майстар, няйначай, маўчаць, макаўка, крыўда, даўней, раўчук, зайграйце, жартаўнік, хвойка, ластаўка, коўдра, паўтарыць, коўзаць, малайцы, маляўнічы, пеўнік.

5. Прачытайце ўрывак з вершаванай казкі М. Маляўкі «Воўчая грамата, або Чаму воўк вые». Звярніце ўвагу на тое, як кошка падзяліла на склады словы з *ў* і *дз*. Спішыце. Падкрэсліце аднаскладовыя словы.

Лісток пад самым бокам
Духмяным хлебам пах,
І кошка краем вока
Прабегла па складах:
«Ваў-ку даз-во-ле-на
Ха-дзіць па ха-тах,
Вы-прош-ваць хлеб
У бед-ных і ба-га-тых».

6. Прачытайце словы па складах, спішыце іх і разбіце на склады для пераносу. Улічыце, што аддзяляць *ь* і апостраф ад папярэдняй зычнай нельга.

У з о р: *Буль-ба.*

Старэнькі, вазьмі, калісьці, кар'ера, львіца, льняны, набраць, гарэць, гультай, пальчык, вельмі, з'яўляцца, раз'яснець, з'яднаць, пад'ём, пад'езд, бур'ян.

7. Спішыце словы, разбіце іх на склады. Пасля кожнага слова ў дужках напішыце, колькі ў ім зычных гукаў.

Саджанцы, дажджы, дзікі, карабель, дагаджаць, пагадзіцца, ураджайны, заходзіць, зацвярдзець, буджу, будзільнік, падземны, падзубіць.

8. Прачытайце словы па складах. Якія з гэтых слоў нельга пераносіць з радка на радок?

Агонь, араты, араць, арол, іней, індык, ежа, вожык, ехаць, ёсць, ёўня, Юрась, ясень, Ядзя, Юля, зубр, твар.

9. Спішыце словы, разбіце іх на склады для пераносу.

Майстраваць, падзюбаць, надзьмуць, надзецца, падземка, абдзіраць, займаць, сапраўды, поўны, заўсёды, яшчэ, адзвінець, салаўі, падзываць.

10. Спішыце словы, падкрэсліце корань слова, разбіце іх на склады для пераносу.

Закрыць, прагляд, адзнака, набраць, адгрэбсці, расплёў, падглядзець, падгнілы, памножыць, падкрэсліць, надбаць, надгрызці, надклеіць.

11. Спішыце словы, разбіце іх для пераносу. Падкрэсліце прыстаўкі.

Зайграць, падысці, разыграць, сыграць, абагнаць, адамкнуць, падагрэць, розыгрыш, назбіраць, пазносіць, паскідваць, бездапаможны, надбудаваць, размах, набраць, расплесці, адграбаць, перайсці.

Гульні (па В. І. Паўлоўскай)

СКЛАД — НАЦІСК

Вядучы вымаўляе слова і паказвае на аднаго з удзельнікаў — той называе колькасць складоў у слове. Адказаў правільна — выходзіць да дошкі; памыліўся — застаецца на месцы. Гэта першы тур.

Другі праводзіцца з тымі, хто каля дошкі. Кожнаму чытаецца аднолькавая колькасць слоў (розных). Пасля кожнага слова воплескамі паказваецца колькасць складоў: ненаціскныя — далоні перад сабою, націскныя — уверсе. Правільна вызначыў — застаецца, памыліўся — вяртаецца за свой стол.

Трэці тур для тых, хто застаўся. Вядучы называе дзве лічбы: першая — колькасць складоў, другая — націскны склад (3—1; 4—3; 4—2 і г. д.). Потым звяртаецца да кожнага чытача па чарзе, кожны павінен за тры — пяць секунд вымавіць адпаведнае слова. Не паспеў — вяртаецца за стол (можна дамовіцца аб дзвюх або трох спробах). Застаюцца пераможцы трох тураў, якія вяртаюцца на месцы пад апладысменты астатніх.

КРОКІ

Двое становяцца сярод класа (пакоя, дарожкі), адлегласць паміж імі — крок. Пачынаюць па жэрабю.

Першы робіць крок уперад і гаворыць «пароль» — аднаскладовае слова (*на, пі, мы* і інш.), другі павінен адказаць двухскладовым (па дамоўленасці трохскладовым), у якім ёсць такі склад *(нага, сена, пісар, мыла, дамы)*. Паспеў за дзве-тры секунды — робіць крок уперад, а першы адступае на крок; не паспеў — першы зноў называе «пароль» (той жа ці іншы) і робіць крок уперад. Гульня канчаецца, калі адзін літаральна прыпрэ другога да сцяны (да канца дарожкі, да раней адзначанай рыскі і да т. п.). Да такой гульні трэба добра падрыхтавацца: назапасіць дастаткова слоў.

СКЛАДЫ НААДВАРОТ

Вядучы становіцца ў сярэдзіне круга ўдзельнікаў, называе слова і кідае мяч каму-небудзь з іх, той павінен кінуць мяч вядучаму і адказаць словам, памяняўшы месцамі склады: *рама — мара, вужы — жыву, ліжа — жалі, лаза — зала, ліса — салі, ліпа — палі, Шура — рашу* і інш. Вядучы павінен даваць і такія словы, з якіх новыя не ўтвараюцца: *вада, кава* і інш. Калі нехта «ўтварыў» такое слова, ён выходзіць з круга (або — па дамоўленасці — атрымлівае чорную фішку, штрафное ачко, у той час як за правільны адказ — белую) і вяртаецца назад толькі тады, калі сам выдумае патрэбнае слова для гульні.

НА ПАЛЬЦАХ...

Гульня праводзіцца так: вядучы чытае па складах словы — удзельнікі адразу ж паказваюць пальцамі, колькі літар у складзе (руку трымаць далонню да сябе; адна літара — указальны палец выпрастаны, астатнія ў кулаку; дзве літары — указальны і сярэдні і г. д.). Правільна падлічыў — атрымаў фішку.

Калі ўдзельнікаў пяць — сем, фішкі раздае сам вядучы; калі больш — яму патрэбен памочнік.

Пачынаць трэба з двухскладовых слоў, у кожным складзе — адна-дзве літары; затым паступова ўскладняць задачу: трохлітарны склад у двухскладовым слове, трохскладовыя словы з двухлітарнымі складамі, потым з трохлітарнымі; цяжэй за ўсё — аднаскладовае слова з чатырма-пяццю літарамі *(кран, склеп)* і двухскладовае, дзе ёсць такі склад *(скрэ-пер)*.

Больш цяжкія словы даваць дзецям немэтазгодна, а вось падлеткам — нават цікава — тут можна наладзіць маланкавую эстафету: першы ў шарэнзе дае такое слова суседу, той — наступнаму і г. д.; хто памыліўся — выходзіць з шарэнгі, паказаў правільна — застаецца і прапануе новае слова. Гульня доўжыцца, пакуль застанецца апошні — пераможца.

ПАЛОВА МАЯ — ПАЛОВА ТВАЯ

Адзін з удзельнікаў называе склад, другі адразу ж дадае свой склад, каб атрымалася слова, напрыклад: *па-ра, мо-ва.* Атрымалася — другі называе склад, першы дадае свой; не атрымалася — першы прадаўжае гульню. Умова: словы павінны быць двухскладовыя.

Перамагае той, хто ні разу не памыліцца. Ён і будзе пачынаць новы тур гульні з іншым складам.

Варыянты:

1. У гульні ўдзельнічаюць тры чалавекі: слова павінна мець тры склады. Цяжкасць у тым, што першы і асабліва другі павінны прадугледзець магчымасць заканчэння слова трэцім складам: *ма-ла-ко, маладзец, маладзік, малаец, маленькі, малпачка, мамачка, Манечка, маракі, масавы* і інш. У гэтым варыянце можа быць і больш за тры ўдзельнікі.

2. Колькасць гуляючых не абмяжоўваецца, кожны мае лісток паперы, загадзя падпісаны. На стале карткі, на кожнай — адзін склад; хто-небудзь выцягвае картку, паказвае ўсім склад, сядае на месца, і па сігналу вядучага (настаўніка) гульня пачынаецца: хто больш напіша слоў з гэтым пачатковым складам за дамоўлены час? Або наадварот: хто хутчэй напіша азначаную колькасць слоў? Вядучы павінен загадзя падрыхтаваць для ўліку кантрольны лісток. І яшчэ: можна дамовіцца, што склад будзе не першым, а другім[1].

---

[1] Паўлоўская В. І. Мова: цікава і займальна. Мн., 1989. С. 31—33.

СПРЫНТ ПА СКЛАДАХ

У кожнай камандзе столькі членаў, колькі можа сесці за адным сталом; каманд можа быць столькі, колькі сталоў.

Тур першы. Кожная каманда піша аднаскладовыя словы з *а* (*баль, на, пад, раз* і г. д.), час — тры мінуты, па сігнале лісток (калі пішуць усе на адным, але лепш пісаць на розных — дзеля эканоміі часу) здаецца ў журы, там выкрэсліваюцца паўтараныя ў гэтай камандзе словы і падлічваецца колькасць тых, што засталіся (для кожнай каманды асобна). Вынікі падводзіць журы.

Тур другі. Кожная каманда піша двухскладовыя словы з *а* (*мама, рамка, Шанхай* і г. д.). Запісваюць словы тыя, хто хутка і правільна піша. Падбіраюць словы ўсе члены каманды, нават і тыя, хто піша. Усе сочаць за правільнасцю запісаў і за тым, каб словы не паўтараліся. Журы правярае вынікі, а ўдзельнікі праводзяць наступны тур.

Тур трэці. Трохскладовыя словы з *а* (*сабака, Гавана* і г. д.). Лісткі каманды змацоўваюцца скрэпкай, перадаюцца ў журы для падвядзення вынікаў.

Тур чацвёрты. Чатырохскладовыя словы (*Кандалакша* і г. д.).

Можна праводзіць яшчэ пяты (*каракалпачка* і г. д.) і наступныя туры, але лепш у якасці дамашняга задання.

Час гульні трэба абмежаваць — аднолькавы для ўсіх тураў (3—5 мінут) або розны — па дамоўленасці. Лісткі здаюцца па сігнале. Ачкі налічваюцца ўсёй камандзе — па ачку за кожнае непаўторанае (у лістках гэтай каманды) слова. За памылку паўачка здымаецца.

Ёсць в а р ы я н т гульні, які называецца «вагончыкі». Склады ў словах — як вагоны ў цягніку: стаяць адзін за адным і злучаны рыскай-счэпкай. Кожны ўдзельнік на лісце піша любое аднаскладовае слова *(дождж),* пад ім — двухскладовае *(сшытак),* пад тым — трохскладовае *(ма-ла-ко)* і г. д. У каго атрымаецца самы доўгі «цягнік»?

Гульню можна праводзіць і так: выходзіць першы — гаворыць аднаскладовае слова, другі становіцца за ім, кладзе руку на яго плячо і прапануе двухскладовае слова, трэці — за ім і г. д. Трэба спяшацца, каб

«папасці» ў які-небудзь цягнік» (іх некалькі) і не застацца ў «тупіку». Як толькі цягнікі сфарміраваліся, усе зноў збіраюцца ў «дэпо» і пачынаюць нанова фарміраваць «цягнік»[1].

Лічылкі

Лічылкі, як вядома, чытаюцца звычайна па словах. Але можна прапанаваць аднаму вучню палічыць чатырох таварышаў так, каб на кожнага з іх выпадаў адзін склад. Астатнія пры гэтым сочаць за правільнасцю чытання. Калі замест склада вучань назваў слова, ён перастае быць вядучым, лічыць пачынае іншы. Лічылку вучань абірае па свайму густу, ці тую, што ведае сам, або якую прапануе настаўнік.

I. Раз, два, тры, ча-ты-ры.
Кош-ку гра-ма-це ву-чы-лі:
Не чы-таць, не пі-саць,
А за мыш-ка-мі ска-каць. *(В. Вітка.)*

II. Раз, два —
Спіць са-ва
У вя-лі-кім дуп-ле
На пу-хо-вым кры-ле.

Тры, ча-ты-ры —
Па сця-жын-цы мы-ша-нят-ка
Ко-ціць спе-лае зяр-нят-ка.
Пяць, шэсць —
У нор-ку лезь.
Як у-ба-чыць соў-ка,
Схо-піць мыш-ку лоў-ка.

Сем, во-сем —
Хут-ка во-сень,
А за во-сен-ню сня-гі
На-мя-туць сва-е ста-гі.

Дзе-вяць, дзе-сяць —
Све-ціць ме-сяц.
Мыш-ка ці-хень-ка ў кут-ку
Зер-не ме-ле на му-ку.

---

[1] Паўлоўская В. І. Мова: цікава і займальна. С. 46—47.

Па-пра-цу-е яш-чэ
Ды а-ла-дак на-пя-чэ. *(В. Коўтун.)*

Песні

Звярніце ўвагу, што часта песні спяваюць, расцягваюць па складах. Прапануйце прачытаць народныя песні па складах. Кожны рад — асобная каманда. Калі замест склада прачыталі слова ці няправільна разбілі слова на склады, раду даецца штрафное ачко. Пераможца той рад, у якога менш штрафных ачкоў. Вучні кожнага рада чытаюць песні па куплету і перадаюць тэкст па эстафеце.

I рад

ГО-ГО-ГО, КАЗА
(калядка, зімовая песня)

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэрая.
Наша козанька
Да й залатая.
Ну-тка, козанька,
Павярніся-тка,
Па новаму дому,
Па гаспадарскаму
Расхадзіся-тка.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэрая.
Козанька-каза,
Каза добрая,
Бо дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць
І расце карысць.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэрая.
Махні-тка хвастом,
Зародзіць жыта
Вялікім кустом
Пану нашаму,
Расхазяіну.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэрая.

Козанька-каза,
Каза добрая,
Бо дзе каза рогам,
Там жыта стогам,
Дзе каза нагой,
Там жыта капой.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэрая.
Ну-тка жа, каза,
Ты расхадзіся,
Развесяліся,
Пану добраму
Ты пакланіся.

Гаспадар ідзе,
Каўбасу нясе,
Сем кускоў сала,
Штоб каза ўстала,
Паўмеркі жыта,
Штоб каза была сыта,
Паўмеркі аўса,
Штоб каза расла.

II рад

ЖАВАРОНАЧКІ, ПРЫЛЯЦІЦЕ
(веснавая песня)

Жавароначкі, прыляціце,
Цёпла лецейка прынясіце,
А зімачку прыбярыце,
Бо зімачка надаела,
Нам хлебушак пераела.

Жавароначкі, прыляціце,
Зямлю-матушку абудзіце
І дожджыкам папаіце,
Каб травачкі парасцілі,
Каб волікаў накармілі.

Жавароначкі, прыляціце,
Цёпла лецейка прынясіце,
А зімачку прыбярыце,
Бо зімачка надаела,
Нам хлебушак пераела.

СЯГОННЯ Ў НАС ЗАЖЫНАЧКІ
(летняя песня)

Сягоння ў нас зажыначкі:
Жнейкі жыта зажыналі,
У снапочкі павязалі,
Свайго гаспадара
Снапамі звязалі.

Наш гаспадарок маладзенькі,
Яго конік вараненькі.
Ён на полі паязджае,
Сваіх жнейкаў аглядае:
— Жніце, жнейкі, не стаіце,
А сажаўшы, снапочкі павяжыце.

Наш гаспадарок маладзенькі,
Яго конік вараненькі,
Ён на полі паязджае,
Усё поле аб'ехаўшы,
Сваіх жнейкаў да й гукае:
— Жніце, жнейкі, не стаіце,
А пажаўшы, аддыхніце.

Загадкі

Некалькі вучняў па чарзе чытаюць па складах загадкі. Штрафное ачко даецца за няправільна вылучаны склад. У пераможцы меншая колькасць штрафных ачкоў.

Загадкі на тэму «Прырода і чалавек»

1. Як зайдзе ў дом, не выганіш калом, а пара прыходзіць — ён і сам уходзіць. *(Прамень сонца.)*
2. Без ног бяжыць, без вачэй глядзіць. *(Вада.)*
3. Стукае, грукае, а нідзе яго не відаць. *(Гром.)*
4. Нахмурыцца, насупіцца, у слёзы ўдарыцца — нічога не застанецца. *(Навальніца.)*
5. Вечарам нараджаецца, ноч жыве, а раніцай памірае. *(Раса.)*
6. Прыйшла чорна маці,
усіх паклала спаці. *(Ноч.)*

Н. Гілевіч.

То я яго збіраю,
То кідаю ў зямлю,
З ім сыты сам
бываю
І ўсіх людзей
кармлю. *(Збожжа.)*

В. Жуковіч.

Даўгавухі і касы,
Скача без аглядкі
ад ваўка і ад лісы.
Хто знайшоў адгадку? *(Заяц.)*

Д. Бічэль-Загнетава.

Восень пацеркі рассыпала на мох,
цэлы кош сабраў іх з мамаю Цімох
ды скрывіўся, паспытаўшы:
«Ох-ох-ох.»
Нават жменькі з'есці ягад ён не змог.
(Журавіны.)

А. Клышка.

Набраўшы ўсяго ў запазухі,
аж ледзь не пухне,—
вурчыць зіма на кухні. *(Халадзільнік.)*

Ці бачыў такое, суседзе?—
Пад дажджом
на парашуце
пагода едзе. *(Парасон.)*

Займальныя матэрыялы па тэме «Склад і складападзел»

«Дзіцячыя» словы ў мове

Маўленне дзіцяці пачынаецца са склада.

Першыя словы ўтвараюцца шляхам падваення аднаго і таго ж склада. Прыгадаем, як называюць малыя блізкіх, бацькоў, першыя рэчы, з якімі яны маюць справу: *ма-ма, та-та, ба-ба, ца-ца, ля-ля, ва-ва.* Так робяць не толькі беларускія, але і ўсе дзеці.

Слова *ба́ба* 'бабуля, старая жанчына' ёсць не толькі ў беларускай, але і ў рускай, украінскай, польскай, чэшскай, балгарскай, сербскай і харвацкай мовах. У «Этымалагічным слоўніку беларускай мовы» гаво-

рыцца, што «ўсе роднасныя з беларускім *баба* словы «па паходжанню з дзіцячай мовы»[1]. Аднак у італьянскай мове *babbo* — 'бацька', а не бабуля. Такім чынам, дзіцячае слова тут ужываецца для абазначэння іншай дарослай асобы.

Слова *вава* 'болька, балячка, рана' таксама ўжываецца ў дзіцячай мове, мяркуюць, што яно ўтварылася шляхам паўтора выклічніка *ва(й)*[2].

Вельмі шырока ў мовах распаўсюджана слова *мама* 'маці'. Яго ведаюць усе славяне, літоўцы, ірландцы, персы і грэкі. Праўда, гэта першае слова дзіцяці, як і *баба,* магло набываць у мовах і іншае значэнне: у старажытнасці немцы называлі так цётку (ст.-в.-ням. *(тиота),* а індыйцы — дзядзьку (ст.-інд. *тата*)[3].

Беларускія словы *ляля, лялька, лялечка* таксама старажытныя. Зараз слова *ляля* абазначае і дзіцячую цацку ў выглядзе чалавека, і малое дзіця, і немаўля, і прыгожанькае дзіцятка. Роднасныя і сугучныя з ім словы ёсць ва ўкраінскай, рускай, польскай, чэшскай, славацкай, сербскай і харвацкай мовах. Гэта слова ўзнікла ў дзіцячай мове яшчэ ў праславянскі час для наймення дзіцяці, маленькага чалавека. Потым яно набыло і іншыя значэнні: у славацкай мове, напрыклад, l'al'o — дурань, балван; у сербскай *ла́ло, ла́лко* — пяшчотная назва брата або старэйшага мужчыны ў доме, *лала, ла́ло* — бацька і імя, якім старыя называюць маладых, у балгарскай — *лало, лалко* — старшы брат (для малодшага), *лала* — цётка.

Аўтар польскага этымалагічнага слоўніка Слаўскі лічыць, што пазней *ляля* 'дзіця' стала абазначаць зрэнка, бо ў воку адбіваецца маленькі вобраз чалавека. Значэнне ж 'лялька' больш новае, яно ўзнікла ў гарадах у апошнія стагоддзі. Польскі лінгвіст Панятоўскі гаворыць аб тым, што чалавечыя фігуркі ў славян першапачаткова былі сімвалам памерлых продкаў, дзядоў; звычай трымаць лялькі (сімвалы) у хаце быў пашыраны яшчэ ў XIX ст. у Польшчы і заходняй Скандынавіі. Дзецям забаранялася з імі гуляць[4].

---

[1] Этымалагічны слоўнік беларускай мовы / Пад рэд. В. У. Мартынава. Т. 1. Мн., 1978. С. 245.

[2] Этымалагічны слоўнік беларускай мовы / Пад рэд. В. У. Мартынава. Т. 2. Мн., 1980. С. 11.

[3] Этымалагічны слоўнік беларускай мовы. Т. 6 / Уклад. В. У. Мартынаў. Мн., 1990. С. 208.

[4] Этымалагічны слоўнік беларускай мовы. Т. 6. С. 120.

Аб цікавым паходжанні гэтых слоў і аб тым, што яны ўтвораны шляхам падваення аднаго і таго ж слова можна паведаміць і пры разглядзе тэмы «Склад» і побач з іншымі практыкаваннямі ў мэтах развіцця мовы (у прыватнасці, па тэме «Сям'я»).

Націск

Націск — характэрная асаблівасць беларускага слова. Невыпадкова яго называюць стрыжнем, пульсам слова. Як біенне сэрца, націск суправаджае кожную фразу, і слухачы на яго звычайна не звяртаюць увагу. Аднак гэта адбываецца толькі пакуль ён правільны. Як пульс хворага чалавека, больш часты і больш рэдкі, сведчыць аб небяспецы для яго жыцця, так і скажоны, нязвыклы націск перашкаджае нармальнаму цячэнню моўнай плыні, прыводзіць да непаразумення паміж субяседнікамі.

Націск называюць стрыжнем слова, бо з яго дапамогай усе склады знітоўваюцца ў адно суцэльнае адзінства. Згодна з вызначэннем, націск — гэта выдзяленне ў маўленні з дапамогай фанетычных сродкаў адной з адзінак, якія з'яўляюцца аднароднымі і знаходзяцца ў пэўнай паслядоўнасці. У першую чаргу такой адзінкай з'яўляецца склад. Выдзяленне аднаго са складоў ажыццяўляецца ў беларускай мове з дапамогай падаўжэння галоснага націскнога склада, выразнасцю яго вымаўлення, што часта суправаджаецца і яго большай сілай гучання. Зычныя, якія ўваходзяць у націскны склад, таксама набываюць пэўныя рысы, і гэта дапамагае ўсяму націскному складу быць больш выразным, прыкметным, выдзеленым. Такім чынам, націск выяўляецца пры супастаўленні ўсіх складоў слова. Ён такая фанетычная рыса, якая ахоплівае адразу некалькі элементаў, у прыватнасці усе галосныя ў слове.

Па асноўнаму фанетычнаму кампаненту, з дапамогай якога ствараецца ў мове націск, адрозніваюць дынамічны, музыкальны і колькасны націск. Дынамічным, або эксціраторным, называюць націск тады, калі ён пераважна характарызуецца інтэнсіўнасцю, якая дасягаецца павелічэннем мускульнага напружання і ўзмацненнем выдыху.

Музыкальны націск той, што выкарыстоўвае для

выдзялення склада вышыню галасавога тону, можа рэалізавацца ў некалькіх разнавіднасцях (напрыклад, ва ўзыходнай або сыходнай).

Колькасны націск у якасці галоўнай фанетычнай прыкметы выкарыстоўвае працягласць галосных. У чыстым выглядзе такі націск не зафіксаваны ў мовах.

Звычайна ўсе тры прыгаданыя сродкі выдзялення складоў выкарыстоўваюцца адначасова, але яны маюць рознае значэнне ў розных мовах. Так, руская і англійская мовы лічацца мовамі з дынамічным націскам.

Як правіла, у асобнай мове выкарыстоўваецца адзін дамінантны тып націску. Аднак у шведскай мове адзначаецца і дынамічны, і музыкальны націск адначасова. Акрамя таго, у некаторых мовах (напрыклад, палеаазіяцкіх) націск наогул не адзначаецца.

У беларускім маўленні націскныя галосныя па сваёй працягласці, як правіла, даўжэйшыя за ненаціскныя. Павелічэнне размаху ваганняў націскнога галоснага, якое ў першым прыбліжэнні адпавядае павелічэнню гучнасці гука, не з'яўляецца пастаяннай прыкметай беларускага слоўнага націску. Яшчэ менш паслядоўна слоўны націск суадносіцца са змяненнем частаты асноўнага тону. Звычайна ў акустычным плане дынамічны націск характарызуецца большай гучнасцю націскнога склада. Ненаціскныя галосныя ў беларускай мове ацэньваюцца як менш гучныя ў параўнанні з націскнымі галоснымі. Але гучнасць галосных значна менш залежыць ад іх пазіцыі ў адносінах да націскнога склада, чым працягласць, бо яна больш звязваецца з пачаткам і канцом слова. Такім чынам, зараз з упэўненасцю можна гаварыць аб колькасна-дынамічным характары слоўнага націску ў беларускай літаратурнай мове, а не аб дынамічным, як гэта часам робіцца ў падручніках і нават навуковай літаратуры.

Па характару размяшчэння націску ў структуры слова націск у беларускай мове вызначаецца як свабодны. Ён можа прыпадаць на розныя склады ў словах. Напрыклад, *ва́жна, па́растак, ма́кавіна, вы́церушыцца, па́паратнікавы, вы́крышталізавацца; каса́, вячэ́ра, наку́плены, абме́ньвацца, праслёдавацельніца; прыганя́ць, павуці́нне, напало́ханы, высало́плівацца; апанава́ць, замацава́ны, дагаспада́рыцца; адзеравяне́ць, паперавыко́нваць, натуралізава́цца, дакапіталісты́чны, індустрыялізацыя; перааргані́зава́ць, перааранжыро́ўка* і інш.

Але шматскладовыя словы ў беларускай мове сустракаюцца звычайна ў розных стылях кніжнай мовы (навуковым, публіцыстычным, афіцыйным). У вусным маўленні і ў беларускіх мастацкіх тэкстах часцей сустракаюцца адна-, двух- і трохскладовыя словы.

Свабодны націск існуе не ва ўсіх мовах. Прыгадаем, што ў польскай мове ён заўсёды знаходзіцца на другім ад канца слова складзе, у чэшскай — на першым пачатковым складзе, у французскай — абавязкова на апошнім складзе.

Другой пазіцыйнай асаблівасцю беларускага слоўнага націску з'яўляецца тое, што ён рухомы, г. зн. пры словазмяненні можа перасоўвацца з адной марфемы на другую: *двор — на двары́, рука́ — ру́кі — рукі́.* Свабодны і рухомы націск робіцца індывідуальнай прыкметай пэўнага слова з усімі яго граматычнымі формамі або прыкметай пэўнага слова ў пэўнай форме. З дапамогай націску ў беларускай мове словы могуць адрознівацца па лексічнаму значэнню і па лексіка-граматычных значэннях.

Сярод слоў, якія маюць розную семантыку і адрозніваюцца толькі націскам, пераважная большасць — двух- і трохскладовыя. Часта сярод двухскладовых назоўнікаў акцэнтуацыйна спрадвечным беларускім проціпастаўляюцца запазычаныя і стылістычна абмежаваныя словы: *а́тлас* 'геаграф. ' — *атла́с* 'тэкстыльн.', *ка́рак* 'задняя частка шыі ў жывёлы і чалавека' — *кара́к* 'народнасць', *ка́са* 'білетная каса і інш.'— *каса́* 'доўгія заплеценыя валасы' і інш. Сярод проціпастаўленых акцэнтуацыйна двухскладовых дзеясловаў больш спрадвечна беларускіх слоў: *вадзі́ць,* 'памагаць ісці' — *ва́дзіць,* 'шкодзіць', *гадзіць* 'дагаджаць' — *га́дзіць* 'псаваць, брудзіць', *га́сіць* 'з размаху біць, удараць па чым.-н. ' — *гасі́ць* 'спыняць гарэнне, тушыць' і інш.

Менш шырока націск ужываецца як сродак дыферэнцыяцыі слоў, якія належаць да розных граматычных катэгорый, хаця адзначаюцца і такія выпадкі. Па націску проціпастаўлены асобныя назоўнікі і дзеясловы, прыметнікі і назоўнікі, злучнікі і назоўнікі, часціцы і займеннікі: *кі́пець* 'кіпцюр' — *кіпе́ць,* 'кіпець'; *па́мяць* 'памяць' — *памя́ць* 'змяць'; *спя́чы* 'той, хто спіць' — *спячы́* 'спячы'; *хіба́* (часціца, злучнік) — *хі́ба* 'нястача, недахоп'; *са́ма* 'усяго', 'у самы раз' — *сама́* 'яна сама' і інш.

Трохскладовыя назоўнікі і дзеясловы, якія адрозніваюцца па значэнню, таксама часам маюць толькі розную акцэнтуацыю. Напр., *артыкул* друк.— *артыкýл* ваен., *абурыць* 'выклікаць незадавальненне, гнеў' — *абýрыць* 'абваліць, абрушыць', *рáдзіцца* 'прасіць у каго-небудзь рады' — *радзíцца* 'нарадзіцца'.

Чатырохскладовых слоў, якія адрозніваюцца па сэнсу і па месцы націску, нямнога. Гэта група дзеясловаў, у якіх націск прыпадае на другі і трэці, другі і чацвёрты склады: *пракíдацца* 'кідацца некаторы час', 'з цяжкасцю, як-небудзь пражыць' — *пракідáцца* 'пададацца, трапляцца паміж чым-небудзь', 'праяўляцца (пра пачуцці, перажыванні)', *палáсаваць* 'пакарміць чым-небудзь смачным, пачаставаць ласункамі' — *паласавáць* 'рэзаць на палосы', 'удараць, біць чым-небудзь, пакідаючы на целе сляды ў выглядзе палос', 'бліскаць паласой агню, святла'.

Наогул аналіз пар слоў, што розняцца сэнсам і месцазнаходжаннем націску, паказвае іх адносную нешматлікасць. Так, у Беларуска-рускім слоўніку (М., 1962), які змяшчае каля 90 тысяч слоў, было знойдзена каля 150 пар слоў, проціпастаўленых па сэнсу і па сваёй акцэнтна-рытмічнай структуры.

Розніца ў месцы націску ў асобных формах, якія маюць падобны фанетычны склад, можа служыць для лексіка-граматычнай дыферэнцыяцыі слоў. Па націску адрозніваюцца дзеясловы незакончанага і закончанага трывання: *адразáць — адрэзаць, рассыпáць — рассы́паць, абкідáць — абкíдаць.*

У цэлым радзе выпадкаў у дзеясловах націск з'яўляецца сродкам адрознення неазначальнай формы і формы трэцяй асобы множнага і адзіночнага ліку будучага часу: *уручáць — урýчаць* (мн. л.), *заўважáць — заўвáжаць* (мн. л.), *абварыць — абвáрыць* (адз. л.), *абсушы́ць — абсýшыць* (адз. л.).

З дапамогай націску адрозніваюцца формы інфінітыва і формы трэцяй асобы адзіночнага ліку цяперашняга часу: *рабíць — рóбіць, сушы́ць — сýшыць, маніць — мáніць, масцíць — мóсціць.*

Націск з'яўляецца адзіным сродкам адрознення форм назоўнага склону множнага ліку і роднага склону адзіночнага ліку назоўнікаў жаночага роду на *-а, -я*: *велічы́ні* (мн. л., наз. скл.) — *велічыні́* (адз. л., ж. р., родн. скл.), *трáвы* (мн. л. наз. скл.) — *травы́* (адз. л., ж. р., родн. скл.).

Зрэдку націск можа таксама выкарыстоўвацца і як словаўтваральны сродак: *хлéвішча* 'месца, дзе стаяў хлеў' — *хлявíшча* 'вялікі хлеў'. Іншы раз зрух націску садзейнічае пераходу слова ў геаграфічныя назвы: *ніўкі* 'малыя палеткі' — *Ніўкі* 'назва вёскі' і інш. Прыведзеныя пары слоў увідавочніваюць сэнсаадрознівальную ролю націску. Яны дапамагаюць вучням зразумець, што месцазнаходжанне націскнога склада — важная прыкмета слова, ад якой залежыць сэнс выказвання. Падбор слоў, якія маюць тоесны гукавы склад і паслядоўнасць гукаў, але розны націск,— цікавы і карысны занятак. Можна прапанаваць вучням змяніць месцазнаходжанне націску ў такіх словах, як *вада, галіцца, дакладны, зараз, любы, немы, наспех, кавалі, гары, твары, насып, мазалі, складаў, настрыг, вязаў, успамінаў, жылы, частую, нашу* і паразважаць аб зменах у іх значэннях.

Прыгадаем, што словы і словаформы, якія маюць аднолькавае напісанне, але адрозніваюцца вымаўленнем (у тым ліку і месцам націску) і значэннем, называюцца амографамі. А яны разам з іншымі амонімамі вывучаюцца ў раздзеле «Лексіка». Амографы ў творах мастацкай літаратуры з'яўляюцца своеасаблівым сродкам мастацкага выражэння. Выкарыстанне іх у паэзіі выклікае ў чытача дадатковыя вобразныя асацыяцыі, робіць верш больш мілагучным і рыфмы багацейшымі. Часта выкарыстоўваюць амографы ў вершах Максім Лужанін, Ніл Гілевіч, Рыгор Барадулін і іншыя паэты. Некаторыя з іх можна прачытаць на ўроку, каб прыцягнуць увагу да гукавога выгляду слоў, разам з вучнямі правесці іх гука-літарны аналіз. Можна выкарыстаць, напрыклад, верш Максіма Лужаніна «Песня» і жартоўную падборку «Карацелькі-каламбуры» Ніла Гілевіча.

ПЕСНЯ

Былі *каралí* —
карáлі.
Былі ў каралеўны
карáлі.
Зладзеі *карáлі*
ўкралі,
За борам,
За морам
схавалі.

Былі *кавалі́* —
кава́лі,
Ды іх *каралі́*
цікавалі,
Што кепска замок
скавалі.
Гразілі кавальскую вёску
Спаліць, быццам свечку з воску.
Каб родных
не пакара́лі,
Паехаў каваль
па кара́лі.
Паехаў каваль
па хвалях,
І хвалі яго
пахавалі.
Як яблыні цвет
паскла́лі,
Другога за свет
паскла́лі,
Яго агарнула
змо́ра,
І гэты не выплыў
з мо́ра.
І людзі тады
цікавалі:
— А зброю яны
ці кава́лі?
Чаму ж каралёў
не кара́лі?
Чаму не знайшлі
ім мору?
Чаго вы паехалі
ў мора?
Чаму вы даліся,
каб хвалі
Такіх малайцоў
хавалі?
Тады расшчапіліся вусны:
— Радзіліся мы ў Беларусі.
Будуюць і кузні, і хаты
Там нашы сыны — каваляты.

Звычайна кожнае слова ў беларускай мове мае толькі адзін націск. Агульнаўжывальныя складаныя

словы, асабліва з невялікай па працягласці першай асновай, таксама маюць адзін націск. Напрыклад, *басано́гі, перш-на́перш, дабрабы́т, сыро́ватка, куро́дым, кулямёт* і інш.

У складаных шматскладовых словах, акрамя асноўнага націску, можа быць яшчэ і дадатковы, так званы пабочны націск: *во̀дазабеспячэ́нне, ільно̀валакно́, агні̀ста-чырво́ны, высо̀каэканамі́чны, до̀ўгацярпліві, мно̀гакаляро́вы, далёкася́жны, да̀лей-бо́лей, што̀хві́лі́ну, до̀браўпара́дкаваць* і г. д. Як правіла, пабочны націск, менш выразны за асноўны, прыпадае на першую частку складанага слова, а асноўны — на другую.

У моўнай плыні акцэнтна-рытмічная структура слоў (заўважым, што націск яшчэ называюць акцэнтам) змяняецца пад уплывам фразавай інтанацыі, таму пабочны націск можа знікаць. Так, у адных і тых жа словах ён захоўваецца пры выразным маўленні, калі размова ідзе ў сярэднім і павольным тэмпах, і губляецца пры хуткім тэмпе маўлення. Так, у выразным маўленні гучыць *«сямісот рублёў»*, у невыразным — *«сямісо̀т рублёў»*, і пры вельмі хуткім тэмпе нават *«сямісотрублёў»*.

Складаныя шматскладовыя словы больш уласцівы літаратурнай мове. Яны рэгулярна ўжываюцца ў тэрміналогіі. У пэўным сэнсе гэта штучныя па сваёй акцэнтна-рытмічнай структуры словы. Яны зрэдку ўжываюцца ў вусным маўленні, менш падлягаюць тым зменам, якія характэрны для бытавой лексікі. Вельмі часта састаўныя часткі такіх слоў захоўваюць пабочны націск (адзін або некалькі): *колерачуллівасць, круглашліфавальны, кукурузадрабілка, высокамалекулярны* і г. д. У гэтых словах узаемаўплыў састаўных частак нязначны. Калі ж сэнсавая самастойнасць адной з частак складанага слова губляецца або зацямняецца, то пабочны націск знікае: *сырадой, вадаём, самастойны.*

Аднак нельга лічыць, што ўзнікненне пабочнага націску ў слове тлумачыцца толькі структурна-семантычна або толькі спосабам утварэння складанага слова. Не менш важнай аказваецца для слоўнага націску яго рытмічная структура. Для беларускага маўлення не характэрны вялікія міжнаціскныя інтэрвалы. Таму, калі ў складаным слове перад асноўным націскам або

пасля яго ідзе шмат складоў з ненаціскнымі галоснымі, узнікае пабочны націск. Параўн.: *кроваачышчальны, кроватачыць* (але *крывапівец, крывасмок, крывацёк*), *новастворaны, новапабудаваны* (але *навагодні, навамодны*), *многазарадны, многастароннасць, многакаляровы* (але *мнагаводны, мнагабор'е*).

Паяўленне націску ў гэтым выпадку неабходна таксама таму, што згодна з арфаэпічнымі нормамі ненаціскныя галосныя трэба вымаўляць выразна, без якаснай рэдукцыі. Аднак гэта цяжка зрабіць, калі да аднаго націскнога далучаюцца чатыры-пяць пераднаціскных складоў. Такім чынам, узнікненне пабочнага націску ў шматскладовых складаных словах можа тлумачыцца рознымі прычынамі, фанетычнымі і нефанетычнымі. Пры гэтым можна назіраць узаемадзеянне адразу некалькіх спрыяльных фактараў. Так, у радзе слоў, якія належаць да спецыяльнай лексікі і ў якіх складаючыя асновы яшчэ асэнсоўваюцца як самастойныя, а перад асноўным націскам маецца тры-чатыры склады з ненаціскнымі галоснымі, узнікае пабочны націск: *агульнаабавязковасць, агульнаадукацыйны, азёрападобны, зоапалеанталогія, золатапрамысловы* і інш.

Акрамя складаных слоў, пабочны націск у беларускай літаратурнай мове маюць шматлікія складаныскарочаныя словы, якія ўзніклі шляхам злучэння часткі аднаго слова з поўным другім словам: *замдырэктара, агіткалектыў, тэхсакратар, тэхпрапаганда* і інш.

Тэндэнцыя да пэўнай перыядычнасці ў чаргаванні націскных і ненаціскных складоў у моўнай плыні, а таксама адносная семантычная самастойнасць пэўных словаўтваральных сродкаў у беларускай літаратурнай мове абумоўліваюць узнікненне пабочнага націску ў аднакаранёвых шматскладовых словах. Так, пабочны націск назіраецца ў шматскладовых словах з запазычанымі прыстаўкамі *архі- (архірэакцыйны), анты- (антымілітарысцкі, антынавуковы), контр- (контратакаваць, контррэвалюцыянер), транс- (транскантынентальны, трансатлантычны), супер- (супервокладка), ультра- (ультрамарынавы, ультрафіялетавы, ультрагукавы), дэ- (дэкваліфікавацца), дэз- (дэзарыентаваць, дэзарганізацыя), рэ- (рэарганізавацца, рэмілітарызацыя, рэкапітуляцыя), інтэр- (інтэрвакальны), экстра- (экстраардынарны).*

Кожная з гэтых прыставак мае сваё акрэсленае значэнне, якое істотным чынам уплывае на сэнс утвораных з яе дапамогай слоў. Напрыклад, *анты-* ў прыметніках мае значэнне 'накіраваны супраць таго, што абазначана непрыставачным прыметнікам' і да т. п. Акрамя таго, словы, да якіх далучаюцца гэтыя прыстаўкі, шматскладовыя, у большасці выпадкаў з асноўным націскам, блізкім да канца слова. Такім чынам, калі б у гэтых словах адсутнічаў пабочны націск, то націскному складу папярэднічалі б чатыры склады (і нават больш), што цяжка для вымаўлення. Прыгадаем, што свайго роду крытычнай велічынёю адлегласці паміж двума націскнымі складамі ў рытмічна арганізаваным тэксце з'яўляецца велічыня ў 2—3 склады, а таксама тое, што тэндэнцыя да пэўнай перыядычнасці націскных і ненаціскных складоў існуе ў большасці моў.

Пабочны націск узнікае на першым складзе шматскладовых аднакаранёвых слоў не толькі ў тым выпадку, калі яны ўтвораны з прыстаўкамі іншамоўнага паходжання. Яго можна назіраць і ў іншых прыставачных дзеясловах, часцей за ўсё ў тых, у якіх маецца пяць-шэсць складоў. У гэтых словах пабочны націск дапамагае шматскладоваму слову лепш прыстасавацца да патрабаванняў рытмічнай структуры фразы. Звычайна ў такіх выпадках пабочны націск падае на пачатковы склад, а асноўны — на апошні ці перадапошні, такім чынам утвараецца свайго роду рамачная канструкцыя акцэнтуацыі слова. Так, у дзеясловах з прыстаўкай *папа-* пабочны націск звычайна ўзнікае на першым складзе: *пáпакарчава́ць, пáпагаладава́ць, пàпагаласі́ць, пàпасудзі́цца, пàпаваро́чваць, пàпаструга́ць, пàпастраля́ць* і інш. Прыгадаем, што гэтыя дзеясловы маюць яркую экспрэсіўную афарбоўку і ўжываюцца пераважна ў гутарковай мове. Відаць, таму яны хутчэй за астатнія прыстасоўваюцца да гутарковай рытмікі. У тых жа выпадках, калі гэта прыстаўка далучаецца да слоў з асноўным націскам на першым складзе, пабочны націск не ўзнікае: *папабе́гаць, папагра́біць, папаво́рваць* і г. д. Размоўным характарам валодае таксама рад дзеясловаў, у якіх прыстаўкі *на-* і *па-* далучаюцца да прыставак *а-, аб-, ад-, вы-, за-, пера-, пра-, пры-, раз-*. Калі ў выніку гэтага атрымоўваюцца словы з вялікай колькасцю складоў перад націскным, тады на прыстаўкі *на-* і *па-* прыпадае

пабочны націск: *нàадрастáць, нàацярэ́бліваць, нàабчышчáць, нàвывалакáць, нàвыпілóўваць, нàперавалакáць, нàабкладáны, пàвыпірáць, пàвытыркáць, пàзавалакáць, пàпадпярáзваць, пàпрывалакáць, пàпрыпрагáць* і інш. Наогул, калі да дзеяслова, які мае вялікую колькасць складоў і блізкі да канца слова націск, далучаецца некалькі прыставак, вельмі верагодным робіцца з'яўленне на першай з пачатку слова прыстаўцы пабочнага націску: *нàзакантрактóўваць, нàперакідáць, нàпрактыкавáць, пàперавыкóнваць, нèдагавáрваць, нèабгрунтавáна, нèапублікавáны, нèпадрыхтавáць, нèпадпарадкавáны, нèпаінфармавáнасць, нèпераадóльны, пàдзарабóтак, сўпадпарадкóўваць* і г. д.

Такая ж з'ява назіраецца ў шматскладовых дзеясловах з прыстаўкай *пера-*. У большасці выпадкаў на гэту прыстаўку асноўны націск не прыпадае. Ён зафіксаваны толькі ў невялікай групе трох- і чатырохскладовых слоў, якія ўжываюцца пераважна як размоўныя *(пярэ́бары, пярэ́зімак, пярэ́куп, пярэ́рва)* або дыялектныя *(пярэ́бірак, пярэ́смык)*. Разам з тым прыстаўка *пера-* надзвычай прадуктыўная, мае шмат значэнняў і далучаецца да многіх шматскладовых асноў. Калі асноўны націск знаходзіцца ў словах з прыстаўкай *пера-* на чацвёртым, пятым і далей ад пачатку слова складзе, то пабочны націск узнікае на першай частцы прыстаўкі: *пèраштэмпелявáць, пèраразмеркавáць, пèраканструявáць, пèрагрупавáць, пèрадапытáць, пèракатавáць, пèрапрадавáцца, пèракартавáны, пèракіпяці́ць* і інш.

Пры складанай рытмічнай структуры пабочны націск прыпадае на аднаскладовыя прыстаўкі *без-, не-, між-, звыш-* і на першую частку прыставак *перад-, проці-, неда-, супраць-; бèзыніцыятыўны, нèплацежаздóльны, нèпрапарцыянáльны, нèрэалізавáны, нèспрактыкавáны, міжрэспубліка́нскі, звы̀шчалавéчы, звы̀шчуллі́вы, пèрадаперацыйны, пèраднавальні́чны, нèдаатрымáць, сўпрацьпастаўлéнне, сўпрацьалкагóльны* і інш.

Ёсць падставы гаварыць таксама і аб тым, што ў беларускай мове назіраецца яшчэ адна універсальная для ўсіх моў са свабодным націскам з'ява: у чатырохскладовых словах з націскам на чацвёртым і далей ад канца складзе (так званых гіпердактылічных) у

канцавых складах узнікае пабочны націск. Асабліва відавочнай гэта тэндэнцыя робіцца ў дзеясловах з націскной прыстаўкай *вы-: вы́балбатаць, вы́баранаваць, вы́будаваць, вы́гартаваць, вы́даткаваць, вы́карміцца, вы́кіраваць, вы́цвераліцца* і г. д. У гэтых дзеясловах пабочны націск узнікае на так званым акцэнтнагенным суфіксе, г. зн. на тым, на якім існуе асноўны націск у непрыставачных дзеясловах.

Такім чынам, размеркаванне пабочнага і асноўнага націску ў шматскладовых словах у беларускай літаратурнай мове выклікана, з аднаго боку, асаблівасцямі іх семантычнай і словаўтваральнай структуры, а з другога — рытмічнымі заканамернасцямі арганізацыі моўнай плыні. Імі у значнай ступені тлумачыцца мілагучнасць беларускага маўлення, бо па падліках В. П. Рагойшы сярэдняя складовая даўжыня слова — 3,27 склада (параўн.: 3,59— у рускім маўленні)[1].

Звычайна акцэнтна-рытмічная структура асобнага слова фарміруецца пад уплывам вымаўлення ўсёй фразы. Таму ступень выдзялення націскнога склада сярод астатніх залежыць ад інтанацыі, суседства розных слоў, у выніку чаго слова можа мець моцны або слабы націск, ці наогул яго губляць. Такім чынам, у моўнай плыні ўзнікаюць слабанаціскныя і нават ненаціскныя словы. Націск рэгулярна маюць паўназначныя словы — назоўнік, прыметнік, лічэбнік, дзеяслоў, прыслоўе. Службовыя словы, як правіла, самастойнага націску не маюць. Большасць з іх далучаецца да слоў з самастойным націскам, утварае з імі гукавое адзінства. Ненаціскныя словы, якія прымыкаюць да наступнага слова, называюцца праклітыкамі, а тыя, якія прымыкаюць да канца папярэдніх слоў — энклітыкамі.

Праклітыкамі найчасцей бываюць прыназоўнікі *(да ха́ты, перад вёскай, а се́май гадзіне, аб бе́раг, ад пра́цы, без вады́, да зор, за ле́та, ля фе́рмы, па со́нцу, са зру́ба, у ле́се, між дрэў, з-за стала, з-пад Налібо́к, з-па-над Нёмана, паўз гасці́нец)*. Выпадкі, калі націск падае на прыназоўнік, вельмі рэдкія. Напрыклад, *вобземлю, вобруку* (дзе прыназоўнік у функцыі прыстаўкі), *за́ нач, за́ лаб, по́ вуху* (параўн. *по́ўху*), *со́ смеху*. У асобных выпадках, звычайна ў адносна ўстойлівых

[1] Беларуская літаратура. Мн., 1986. Вып. 4. С. 87.

прыназоўнікавых канструкцыях, якія маюць экспрэсіўную афарбоўку і належаць да гутарковага стылю, націск таксама можа быць на прыназоўніку, напрыклад: *узя́ць за́ грудкі, не ба́чыць по́д насам, збіра́цца на́ нач.*

Энклітыкамі звычайна бываюць розныя часціцы (*прынёс жа, прачытаў бы*). Неаднаскладовыя невытворныя прыназоўнікі часта маюць уласны націск. Так, прыназоўнікі *дзеля, перад, цераз, каля, паміж* сустракаюцца і як праклітыкі, і як словы са слабым націскам: *дзеля яе́, дзеля гэ́тага,* але *дзеля́ забеспячэ́ння; каля ро́ўкі, каля по́ўначы,* але *каля́ перасяле́нцаў; перад і́м,* але *пе́рад доўгачака́най сустро́чай; паміж і́мі, паміж сабо́й,* але *паміж дэмакра́тамі і рэспубліка́нцамі* і г. д.

Прыназоўнікі, якія страцілі вытворнасць, але захоўваюць яшчэ марфалагічнае чляненне, таксама, калі яны маюць некалькі складоў, атрымоўваюць акцэнтнае выдзяленне пэўнага склада: *акрамя́ старо́й, апрача́ сакратара́, апро́ч усяго́, заме́ста бага́цця, нако́нт пра́цы, накшта́лт скрыжава́ння, павóдле даўжыні́, сяро́д лесу, падчас ава́рыі.*

Двух-, трох- і чатырохскладовыя прыназоўнікі прыслоўнага паходжання часцей за астатнія маюць самастойны націск: *аба́пал шля́ху, адно́сна спра́вы, акра́й ле́су, бліз́ка апо́ўначы, вако́л са́ду, збо́ку стала́, круго́м ха́ты, мі́ма ве́сніц, наабапа́л чыгу́нкі, наве́рсе воза, навóкал старшыні, наўко́ла стала́, напе́радзе палка́, напро́ці Макся́ма, насупро́ць Сымона, наўкру́г па́рку, непадалёку свайго дома, о́бак калідора, паабапа́л яе, паблі́зу горада, по́бліз сяла́, папе́радзе ўсіх, паўскра́й яру, про́ці сонца, цераз зямлю́, супро́ць ха́ты, углыб дому, узбоч дарогі, упо́перак ла́ўкі, ускра́й поля, усця́ж мяжы́.*

Пры гэтым, чым больш складаную ўласную акцэнтна-рытмічную структуру мае прыназоўнік, тым больш верагодна тое, што ў моўнай плыні ён захавае ўласны націск, тым менш здольны ён да прымыкання да іншых слоў. Параўн.: *насу́перак вы́гляду, насу́страч та́нкам, дзя́куючы бацька́м, адпаве́дна дамоўленасці, насу́страч Га́лі* і г. д.

Па сваіх паводзінах адносна націску да прыназоўнікаў набліжаюцца злучнікі і злучальныя словы, якія набываюць або губляюць націск у залежнасці ад

сваёй рытмічнай структуры, ад месцазнаходжання ў фразе, а таксама ад інфармацыйнай нагрузкі. Напрыклад: *Не думай, што́ бярэш у стылы свет. Падумай, што́ пакінеш на зямлі.* (Р. Барадулін. Жыццё пражыўшы...) (Націск на злучніку пастаўлены самім паэтам.)

Аднаскладовыя злучнікі, якія ўжываюцца ў параўнальных зваротах, пры аднародных членах сказа або пры аднародных сказах, вельмі часта ўжываюцца як праклітыкі: *як шкло, што пані, бы кнот, ці ты, ці ён, ні стуку, ні гоману* і г. д.

У складаных сказах ужываюцца ў якасці праклітыкаў аднаскладовыя злучнікі *каб* і *што*. Напрыклад: *Гаварыла зямля, што не хо́ча яна, каб пале́ арашала крывёю вайна, каб слеза́мі сірот засявалі яе.* (М. Танк. Дзённік міру.)

Вельмі часта выступаюць у якасці праклітыкаў і злучнікі, якія маюць размоўны характар або сустракаюцца ў гутарковай мове, такія, як *ды, дый, дык, адно ж: хлеб ды со́ль, туды́ дый дадо́му, запалі́ў дый кі́нуў,* і інш. Гэта з'ява назіраецца, мусіць, таму, што якраз у размоўным маўленні асабліва яскрава дзейнічае рытмічны фактар, які ўзмацняе тэндэнцыі да больш злітнага вымаўлення слоў. Прыгадаем, што калі ў стылёвых мэтах у вершах трэба асобна вызначыць злучнік, яго ставяць у асобны радок; у пачатак або ў канец радка. Напрыклад:

Цябе мазоль твой знойдзе,
Ды́
Адчуй, як ён свярбіць, цвярды.
Вядома, прэсны ён.
Адна́к,
Ты сам свой рассмакуй праснак. *(Р. Барадулін.)*

Ускладненне рытмічнай структуры злучнікаў і злучальных слоў, як і ў прыназоўніках, выклікае пастаноўку самастойнага націску. Найбольш рэгулярна ён адзначаецца, напрыклад, у састаўных злучніках. Яны складаюцца з некалькіх частак, якія, аднак, не ўсе выдзяляюцца націскам, але ўступаюць між сабой у складаныя з акцэнтуацыйнага пункту погляду адносіны. Праклітычны характар прымыкання і ў гэтым выпадку больш відавочны: *ды і, ды ◡ і ◡ то́, і ◡ то́, а ◡ то́, як ◡ то́лькі, ледзь ◡ то́лькі, чуць ◡ то́лькі, то́лькі ◡ што́, чуць абы ◡ то́лькі, перш ◡ чым, ране́й ◡ чым,*

а◡таму́, і◡таму́, а◡то́е, не◡то́, а◡не◡то́, тым◡не◡ме́нш, тым◡бо́льш, між◡ты́м, а◡і́менна, адным◡сло́вам, гэта◡зна́чыць і г. д. Выпадкі энклітычнага ўжывання часткі злучнікаў значна радзей: *пе́рш◡чым, ране́й◡чым, тады́◡як, я́к◡бы, для◡таго́◡каб, та́к◡што, затым◡што́, пасля◡таго◡як* і г. д.

Састаўныя злучнікі, якія не стаяць побач у сказе, асабліва шматскладовыя парныя злучнікі, часцей маюць два націскі: *не то́лькі... але́, не то́лькі... ко́лькі, не то́ што... але́ і.*

У тым выпадку, калі паміж злучнікамі, што знаходзяцца побач, у маўленні робіцца паўза, то магчымасць узнікнення націску на другой частцы састаўнога злучніка павялічваецца. Напрыклад: *Расліны тут заняпалі таму́, што́ панізіўся ўзровень вады ў глебе.* (М. Паслядовіч. Святло над Ліпскам).

Свае адметныя рысы мае акцэнтуацыя ў моўнай плыні трэцяй шматлікай катэгорыі службовых слоў — часціц. Хаця часціцы вельмі часта аказваюцца выключна неабходным элементам для правільнага разумення ўсяго выказвання, маюць большую пазіцыйную свабоду ў фразе, што павялічвае іх здольнасць мець самастойны націск, гэта катэгорыя службовых слоў таксама падпарадкоўваецца агульным рытмічным і сэнсавым заканамернасцям арганізацыі маўлення. Напрыклад, інфармацыйна моцнымі з'яўляюцца ў літаратурнай мове сцвярджальныя і адмоўныя часціцы, якія яшчэ больш рэгулярна выступаюць як словы-фразы: *Але. Так. Та-ак. Ага. Не (не-е). Ані. Ані-ні.*

Часціцы вельмі часта сустракаюцца ў спалучэнні з іншымі часціцамі або з іншымі службовымі часцінамі мовы. Гэта з'ява безумоўна садзейнічае таму, што па меншай меры адзін з членаў такога ланцужка службовых слоў пачынае набываць націск. *(А я́к жа! Во́сь калі прыехаў! Ву́нь яны дзе! Ву́нь што з ім! А вось гэ́тага не было! Але што́ гэта за лес?!)*

У вершах акцэнтуацыя службовых слоў абумоўлена заканамернасцямі вершаскладання. Яшчэ ў час нараджэння нацыянальнай паэзіі Ян Чачот звяртаў увагу на тое, што ў крывіцкай (г. зн. беларускай) мове «паэт не меў бы тут клопату з колькасцю складоў: ёсць самыя паслужлівыя *да, дый, дэй, ды, дэ, дык*... таму

што іх можна тры разы без сэнсавай неабходнасці дадаваць у адным радку»[1]. Такім чынам, ён падкрэсліваў дапаможны характар службовых часцін мовы і залежнасць націску ад астатніх элементаў паэтычнай фразы.

Неабходна таксама адзначыць, што літаратурная мова — гэта ўпарадкаваная, унармаваная форма народнай мовы, у якую словы трапляюць з розных гаворак. Літаратурная мова ўтвараецца на працягу значнага перыяду, і нармалізацыя заўсёды не з'яўляецца ў ёй вычарпальнай. Таму, хаця з пункту гледжання патрабаванняў да чысціні, культуры мовы, варыянты ў літаратурнай мове — непажаданая з'ява, яны маюць у ёй месца ў розных галінах, у тым ліку і ў акцэнтуацыі. У моўнай практыцы сустракаюцца варыянты націску адных і тых жа слоў, узнікненне якіх тлумачыцца пранікненнем у літаратурную мову дыялектных акцэнтных асаблівасцей, уплывам рускай мовы, няправільным засваенням месца націску ў запазычаных словах, дзеяннем аналогіі — узаемаўплывам акцэнтуацыі розных груп лексікі і словаформ аднаго слова. Напрыклад, з розных дыялектаў прыйшлі такія варыянты, як *аглóбля — аглабля́, гóлуб — галýб, ільняны́ — ільня́ны, мя́ккі — мяккі́, басіць — ба́сіць, мільга́ць — мі́льгаць, высóка — вы́сака, крыху́ — кры́ху.*

Існаванне акцэнталагічных дублетаў — у кожнай мове непажаданая з'ява, таму ўводзіць у літаратурную мову пэўныя дыялектныя формы трэба вельмі абачліва і асцярожна.

Варыянтны націск часта бывае ў словах, што запазычаны з іншых моў. Пры гэтым у частцы такіх слоў захоўваецца той націск, з якім яны ўжываліся ў мове-крыніцы, а ў іншых выпадках словы змянілі свой гукавы воблік. Так, слова *каталік* мае такі націск, які тыповы для польскай мовы — на перадапошнім складзе. Разам з тым шырока бытуе і адаптаванае на беларускай глебе слова *каталі́к* з націскам на апошнім складзе.

Часам словы з адной мовы трапляюць у другую праз нейкую трэцюю мову. Напрыклад, французскія словы *магазін, музыка* прыйшлі ў беларускую мову

---

[1] Пачынальнікі. Мн., 1977. С. 95. Цытуецца па: А. С. Яскевич. Ритмическая организация художественного текста. Мн., 1991. С. 143—148.

праз польскую мову. Вымаўленне *магазі́н* — з націскам на апошнім складзе — адпавядае французскай мове-крыніцы. Але ўплыў польскай мовы, праз якую адбывалася запазычанне, абумовіў таксама існаванне формы з націскам на другім ад канца слова складзе — *магази́н*.

Прывядзём невялікі спіс такіх запазычаных слоў, у якіх часам гучыць няправільны націск. Трэба вымаўляць *ае́р*, не *а́ер; азбе́ст*, а не *а́збест; алкаго́ль*, а не *а́лкагаль; ва́льдшнэп*, а не *вальдшнэ́п; гідрапрыво́д*, а не *гідрапры́вад; інструме́нт*, а не *інстру́мент; камба́йнер*, а не *камбайнёр; ка́тар*, а не *ката́р; ле́ктары*, а не *лектары́; ра́нча*, а не *ранчо́; рэкру́цкі*, а не *рэ́круцкі; цэ́нтнер*, а не *цэнтне́р*.

Увага да націску неабходна ў нашых умовах яшчэ і таму, што практычна кожны жыхар нашай рэспублікі сутыкаецца ў паўсядзённым жыцці з дзвюма блізкароднаснымі мовамі, у якіх шмат агульных слоў. Пад уплывам акцэнтных норм рускай літаратурнай мовы частка беларускіх слоў пачынае мець той націск, якім характарызуюцца роднасныя з імі рускія словы. Вымаўляюць *пасла́нец, до́суха, крапі́ва, на́валачкі, на захо́дзе сонца, гліняны, ма́ленькі, адзі́наццаць*, хаця па правілах трэба казаць *паслане́ц, дасу́ха, крапіва́, навало́чкі, на за́хадзе сонца, гліня́ны, малы́нькі, адзіна́цаць*.

Прыгадаем, што яшчэ ў 1831 годзе славуты лінгвіст А. Х. Востокаў даў такую параду наконт правільнага ўжывання націску: «Который же именно слог должно произносить с ударением, сему научаемся из употребления и из словаря, потому что не приискано еще на то определенных правил». Таму, каб спраўдзіць, які націск лічыцца зараз нарматыўным, можна выкарыстаць наступныя крыніцы: Слоўнік беларускай мовы: Арфаграфія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне/Пад рэд. М. В. Бірылы. Мн., 1987; Арашонкава Г. У., Лемцюгова В. П. Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы. Мн., 1987; Белорусско-русский паралексический словарь-справочник/Под ред. А. Е. Михневича. Мн., 1985; Бірыла М. В. Націск назоўнікаў у сучаснай беларускай мове. Мн., 1986; М. В. Бірыла. Слоўнік націску ў беларускай мове. Мн., 1992. Апошні змяшчае каля 5500 слоў, адрасуецца вучням старэйшых класаў, таму варта на яго звярнуць асаблівую ўвагу. У гэтым слоўніку змешчаны словы, для якіх уласціва акцэнтная

варыянтнасць, і словы, якія ў моўнай практыцы маюць адхіленні ад акцэнтнай нормы. Зразумела, што звесткі аб месцы націску ў лексіцы беларускай літаратурнай мовы ёсць у тлумачальным, арфаграфічным, рускабеларускім, беларуска-рускім і іншых перакладных слоўніках. Аднак у некаторых з гэтых слоўнікаў пры дастаткова поўным ахопе лексікі месца націску паказана звычайна толькі ў пачатковай форме зменлівых часцін мовы, а ў іншых формах не падаецца. У другіх слоўніках (напрыклад, арфаграфічных) уключана толькі лексіка, абумоўленая патрэбамі арфаграфіі.

«Слоўнік націску ў беларускай мове» — спецыяльны даведнік, у якім лексіка прадстаўлена выбарачна, што дае магчымасць звяртацца да яго ў асабліва складаных і спрэчных выпадках.

Адзін з патрыярхаў усходнеславянскіх граматык В. К. Традзьякоўскі падкрэсліваў, што «...привыкать надобно к правильному ударению с самого младенчества наслышкою». Таму праца па засваенню нарматыўнага вымаўлення беларускіх слоў павінна ажыццяўляцца на працягу ўсяго вывучэння беларускай мовы. Пераканаць вучняў у тым, што націск у беларускай мове — цэнтр слова, сродак аб'яднання гукаў, што яго варта параўнаць з дырыжорам, ад удалай працы якога залежыць добрае гучанне ўсяго аркестра, можна з дапамогай спецыяльных практыкаванняў. Для вучняў старэйшага школьнага ўзросту карысна было б прапанаваць падрыхтоўку спецыяльнага даклада ці паведамлення на тэму «Націск у беларускай літаратурнай мове», які можна зрабіць на ўроку або на занятках лінгвістычнага гуртка.

Практыкаванні

1. Прачытайце тэкст. У выдзеленых словах вызначце націскны склад і запішыце ў тры слупкі: 1) словы з націскам на першым складзе; 2) словы з націскам на другім складзе; 3) словы з націскам на апошнім складзе.

НАРАЧ

У **гушчары** старых бароў, як **сляза,** упаўшая з **неба,** блішчэла **вялікае возера. Вельмі прыгожым** яно **было.** Расказы пра яго **чароўнасць** ішлі ад паселішча да паселішча і нават у **далёкія** краіны заходзілі.

А яшчэ **казалі людзі,** што ў **вёсцы,** што прыляпілася да аднаго з берагоў возера, **жыла** дзяўчына-сіраціна

па імені Найрыта, а аднавяскоўцы звалі яе Нарай. **Вочы** яе **блакітныя,** колеру азёрнай хвалі, **заўсёды** ўсміхаліся. Залацістыя **валасы** тугой касой абкручвалі галаву. **Голас** у яе быў **высокі** і гучны. *(З народнай легенды.)*

2. Прачытайце словы спачатку з націскам на першым складзе, а потым на другім. Як розняцца пары такіх слоў па значэнню?

Буйны, гадзіць, галіна, закапаць, зараз, казачка, любы, марыцца, музыка, прыклад, раіць, саліць.

3. Прачытайце спіс слоў. Выпішыце словы, якія маюць націск на першым складзе.

Страха, вада, стрэхі, водны, чмялі, водбліск, апоўдні, лета, зіма, восень, ясень, вярба, елка, сосны, асіна, вольха, сцюжа, іней, грымоты, маці, папар, бацька, сястра, голас, вучань.

4. Знайдзіце ў сказах словы-амографы. Запішыце пары слоў і растлумачце, як змяняецца сэнс слова ад пераносу націску.

1. Усю ноч кавалі зброю. Кавалі працавалі вельмі старанна. 2. Марская прыстань была ўжо зусім блізка. Саша, прыстань да дзеда, хай зробіць свістульку. 3. Твары дзяўчынак былі чырвонымі ад марозу. Твары, мастак, без стомы свае прыгожыя карціны! 4. Ніна і Зося ўсюды ходзяць парай. Ніна, парай Зосі, як упрыгожыць пакой! 5. Са складаў у магазін прывезлі цукеркі, апельсіны, яблыкі. Ужо ў маленстве Рыгор складаў невялікія вершы.

5. Выпішыце выдзеленыя словы, расстаўце націск. Які склад у словах націскны? Звярніце ўвагу, як змяняецца сэнс слова ад націску.

1. **Каня** — драпежная птушка сямейства ястрабіных. У вёсцы няма **каня.** 2. На вокнах банка **краты. Краты** парылі ўсе буракі. 3. Дзед Ігара — **казак** з Кубані. Бабуля ведае многа **казак.** 4. У крыштальных **вазах** стаялі белыя ружы. На **вазах** каля рынку ляжалі гарбузы, бульба, морква, агуркі.

6. У словах замест кропак напішыце такую галосную літару, каб атрымаліся словы-амографы. Складзіце з гэтымі словамі кароткія сказы.

М..ка, к..ра, к..па, б..кі, в..зы, пл..ціна, д..мы, ..му.

7. Прачытайце словы, расстаўце ў іх націск.

Абапал, аер, багна, гектар, гурба, дзеяч, выпадак, кіламетр, касцяны, каршун, індустрыя, інструмент, кулінарыя, крапіва, на краі, квартал, мармур, таварыства, карабель, сестрына, цэнтнер, шпацыр, кідаеш, сантыметр, нехаця, ярына.

8. Прачытайце сказы, падкрэсліце словы-амаформы, растлумачце іх значэнне.

1. Дзяўчынкі сустрэліся раніцай і любаваліся раніцай. 2. Хлопчык сарваў ліпкі лісток з маладзенькай ліпкі. 3. Бабулі трэба спачатку паліць кветкі, а потым ужо паліць у печы. 4. Зараз я, урач-хірург, тэрмінова лячу ў аддаленую паўночную вёсачку да хворага, якога я лячу ад цяжкай хваробы.

9. Прачытайце скорагаворку. Якія словы ў ёй адрозніваюцца толькі націскам? Што яны значаць?

Каня каню канькала:
— Папі, конь, папі, конь.
Каню конь папікаў:
— Папі, каня, папі, каня!

10. Прачытайце выразна словы. Спішыце іх, падкрэсліце націскны склад.

Здарыцца, рэмень, рубель, цэмент, таварышы, упарадкаваць, худзенькі, эксперт, кідаеш, ушыркі, дыскант, дыспансер, атлас, музыка, прымус, накрыўка.

11. Прачытайце ўрывак з верша «Ручаінка». Звярніце ўвагу на націск у дзеяслове *тужыць*. Чаму ён ужыты ў радку два разы? Якое значэнне мае гэта слова?

Усю зіму мароз-марозка
Стужыць яе, стужыць
А яна —
бяжыць імкліва
І тужы́ць не ту́жыць. *(К. Кірэенка.)*

12. Прачытайце словы ўслых спачатку з націскам на першым складзе, а потым на другім. Якая розніца ў значэнні гэтых слоў? Складзіце і запішыце маленькія сказы з гэтымі словамі.

Замак, атлас, гары, каса, самы, падаў, валіць, губы, дуды, дугі, тушыць, травы.

13. Спішыце словы і падкрэсліце суфікс. Звярніце ўвагу, на якія суфіксы падае націск. Вусна складзіце два-тры сказы з некаторымі словамі (на выбар).

Маляр, сталяр, балаўніца, манцёр, шафёр, вахцёр, дырыжор, друкар, касцяны, шарсцяны, цагляны, кандуктар, дрывяны.

14. Прачытайце словы. Запомніце, як яны правільна вымаўляюцца. (Значэнні невядомых вучням слоў тлумачыць настаўнік.)

Момант, медыкаменты, эксперымент, дакумент, інструмент, пастамент, цэмент, кіламетр, сантыметр.

15. Прачытайце беларускія і рускія словы. Параўнайце месца націску ў абедзвюх мовах.

Бел.	Рус.
вярбá	вéрба
крапівá	крапúва
кíшка	кишкá
дóшка	доскá
пасля́	пóсле
дачкá	дóчка
нічóга	ничегó
пятля́	пéтля
малéнькі	мáленький
пóкрыва	покрóв
лóпух	лопýх

16. Прачытайце. Параўнайце, як гучаць дзеясловы ў парах. Якое значэнне перадаецца з дапамогай націску?

Адразáць — адрэ́заць, высыпáць — вы́сыпаць, закідáць — закíдаць, праціскáцца — праціскацца, абвары́ць — абвáрыць, заўважáць — заўвáжаць, валíць — вáліць, лячы́ць — лéчыць, мачы́ць — мóчыць, рабíць — рóбіць, сачы́ць — сóчыць, тушы́ць — тýшыць, хлусíць — хлýсіць.

Вусна складзіце чатыры сказы з дзеясловамі, узятымі з дзвюх пар слоў (на выбар).

17. Прачытайце словы. Выпішыце словы з націскам, які адпавядае літаратурнай норме.

Агéнт — áгент, аéр — áер, амяла́ — амёла, арáхіс — арахíс, аргумéнт — аргýмент, асака́ — асóка, бульбяны́ — бульбя́ны, вагáцца — вáгацца, вадзяны́ — вадзя́ны, валасяны́ — валася́ны, гектáр — гéк-

тар, дакуме́нт — даку́мент, і́лісты — іліс́ты, не́сла — нясла́, но́жніцы — нажні́цы, пасе́джанне — пасяджэ́нне.

18. Змяніце словы так, каб націск падаў на другі склад. Запішыце іх і пастаўце націск.

У з о р. *Двор — двары́, шэпт — шапчу́.*

Воўк, горад, стол, год, хлеў, лес, поезд, стрэл, нёс, вёў, плесці, бегчы.

19. Спішыце спачатку запазычаныя словы з націскам на першым складзе, пасля — на другім, нарэшце — на трэцім.

Семафор, рэспубліка, рэвалюцыя, піянер, сантыметр, кіламетр, дэвіз, гардэроб, ордэн, тэатр, тэлеграма, тэлефон, стадыён, кіёск, чэмпіён, біёлаг, заапарк, партрэт, камбайн, тэлевізар, паліто, калектыў.

20. Выпішыце ў адзін радок двухскладовыя словы, у другі — трохскладовыя, у трэці — чатырох- і пяціскладовыя словы. Пастаўце націск.

Міліцыянер, камбінезон, вестыбюль, экзамен, тэатр, экзаменатар, фільтр, аркестр, феерверк, брызент, тунель, інжынер, пыласос, мерыдыян, тэлевізар, булён, акардэон, брыльянт, тралейбус, фельчар, шкіпінар.

21. Пастаўце назоўнікі ў месным склоне. Запішыце, пастаўце націск, растлумачце правапіс канчаткаў.

Прыдумайце два-тры сказы з гэтымі словамі.

У з о р. *Рэчка — на рэ́чцы, рука — на руцэ́.*

Пушча, гара, груша, сонца, плячо, пяро, збожжа.

22. Пастаўце назоўнікі ў творным склоне. Запішыце. Пастаўце націск, растлумачце правапіс канчаткаў.

У з о р. *Чарóмха — чарóмхай, травá — травóй.*

Вясна, воля, краіна, частка, дарога, мяжа, праца, трава, песня, зямля, армія, сям'я, стая, надзея.

23. Пастаўце назоўнікі ў творным склоне. Запішыце, пастаўце націск, растлумачце правапіс канчаткаў.

У з о р. *Стол — сталóм, край — крáем.*

Рубель, вецер, семя, заданне, дзень, пакой, поле, жыццё, шчаўе, галлё, акно, сонца, полымя, сцяг.

24. Пастаўце назоўнікі ў месным склоне. Запішыце іх, пастаўце націск, падкрэсліце канчаткі.

У з о р. *Ве́цер — на вятры́, конь — на кані́.*

Гай, лес, дуб, бор, дождж, бераг, вір, кут, пакой, зараснік, гушчар, луг, садочак.

Прыдумайце два-тры сказы са словамі ў месным склоне.

25. Прачытайце пары слоў. Вызначце склон і лік кожнага слова.

Бра́там — брата́м, бе́рагам — берага́м, пачу́цці — у пачуцці́, велічы́ні — велічыні́, гу́бы — губы́, ду́ды — дуды́, тра́вы — травы́.

Прыдумайце і запішыце чатыры сказы з дзвюма парамі назоўнікаў.

26. Спішыце словы з прыстаўкамі *не- (ня-)*. Стаўце націск. Растлумачце правапіс галосных.

Непадзельны, непаладкі, непаседа, няветлівы, неразважлівы, непрыдатны, нядбайны, непакой, нястомны, нястача, неахайны, недарод, небяспека, неабходны, няўдача.

27. Ад слоў у адзіночным ліку ўтварыце формы множнага ліку. Спішыце, пастаўце націск. На якую частку слова ён падае ў кожным выпадку?

У з о р. *Ко́лас — каласы́.*

Ліст, камень, корань, прамень, палена, бервяно, крыло, сусед, чорт, калена, вока, плячо.

28. Пастаўце словы ў родным склоне множнага ліку. Спішыце, расстаўце націск.

У з о р. *Дуб — дубо́ў, план — пла́наў.*

Бацька, дождж, луг, агонь, пень, сяло, мора, бітва, пушча, вучань, зямля, госць, локаць, вольха, вогнішча, сэрца, гульня.

29. Прачытайце словы. Пастаўце націск. Растлумачце, як розняцца словы па месцы націску і па значэнні.

Каласы — калоссе, лісты — лісце, камяні — каменне, карані — карэнні, бярвёны — бярвенне, крылы — крылле, палены — паленне.

30. Пастаўце прыметнікі ў родным склоне адзіночнага ліку, спішыце. Расстаўце націск, падкрэсліце канчаткі, растлумачце іх правапіс.

Узор. *Густы́ — густо́га, но́вы — но́вага.*

Стары, гарачы, дарагі, горкі, сіні, белы, поўны, левы, малы, нізкі, вясёлы, добры, благі, былы, снежны, драўляны, жытны, хваёвы.

31. Пры дапамозе суфіксаў *-ейш-, -эйш-*, прыстаўкі *най-*, слоў *больш* і *самы* ўтварыце прыметнікі вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання. Запішыце. Расстаўце націск. Звярніце ўвагу, як змянілася месца націску.

Узор. *Белы — бялёйшы, найбялёйшы.*

Тонкі, блізкі, стары, горкі, дужы, лёгкі, чорны, светлы, салодкі, смелы, вузкі.

32. Прачытайце ўрывак з вершаванай казкі. Выпішыце выдзеленыя словы. Чаму іх нельга чытаць з іншым націскам? Як змяняецца сэнс слоў пры змене месца націску?

1. «За што сабака лае?» —
І кошцы крыўдна **ста́ла,**
Яна́ ў закутку, злая,
Сама́ на мыш напала.

2. А граматы не вернеш —
Згарэла без агню,
І воўк, гаротнік шэры,
Завыў упершыню.

3. У лапе кій-падмога
Ды торба **на баку́,**
Аднак да хат **дарога**
Заказана ваўку.

4. Разбегліся сябры —
Чужыя,
Ледзь жывыя.
І воўк з тае **пары**
Без хлеба ў лесе вые.

(М. Маляўка.)

Назавіце спачатку ўсе словы з націскам на першым складзе, а потым — з націскам на другім.

Гульні

АМОГРАФЫ

У гэтай гульні мы будзем мець справу з амографамі. Значэнне слоў-амографаў залежыць ад таго, на якім складзе мы зробім націск. А дзе яго трэба зрабіць, залежыць ад сэнсу сказа, у якім «жыве» слова.

Прачытайце словы *музыка, мука, кара, раса, прымус, гады*, запісаныя на картках. Назавіце націскныя склады. Складзіце з гэтымі словамі кароткія сказы. За кожны правільны сказ — па аднаму балу; дадаткова тры балы — першаму, хто правільна выканае заданне.

(Па В. І. Паўлоўскай.)

ДЗЕ САЛА?

1. Адзін вучань прачытаў: *у кашы мала сала.* Другі яго паправіў. Здагадайцеся, як прачытаў першы і што паправіў другі? І хто з іх памыліўся?

2. Дапішыце сказы:

1) *Купілі атлас і ...* 2) *Паглядзі: пара ...* 3) *Ён часта бываў у марах ...* 4) *Набліжалася ноч, і каты ...*

3. У словы *б?кі, пл?ціна, д?мы, в?зы, р?са* ўстаўце такую літару замест пытальніка, каб атрымаліся амографы; падбярыце да кожнага кантэкст.

Адказ. 1. Магчыма прачытаць і *ў ка́шы* (калі яе засмажылі салам), і *ў кашы́* (калі ў гэты кош сала паклалі).

2. Дадзеныя сказы таксама можна дапісаць парознаму.

Напрыклад: 1) *Купілі атла́с і пашылі з яго сукенку.— Перад экскурсіяй купілі геаграфічны а́тлас.* 2) *Саша часта бываў у марах там, дзе жыў у дзяцінстве.— Саша часта бываў у мара́х з экспедыцыямі.* 3) *Паглядзі: па́ра ідзе з чайніка.— Пара́ заварваць чай.* 4) *Набліжалася ноч, і ка́ты пачалі выклікаць зняволеных на допыт.— Набліжалася ноч, і каты́ пайшлі паляваць на мышэй.*

3. *Ба́кі — бакі́, пла́ціна — плаці́на, да́мы — дамы́, ва́зы — вазы́, ра́са — раса́.*

(Па В. І. Паўлоўскай.)

НЕЗРАЗУМЕЛЫЯ СКАЗЫ

На лістку паперы было напісана:

1) *Кулі ляцелі праз кулі.* 2) *Краты падлезлі пад краты.* 3) *Каралі каралі.*

Я прачытаў паперку, паціснуў плячыма — нічога не разумею! Навошта паўтараюцца адны і тыя ж словы? Бяссэнсіца нейкая...

Я ўжо хацеў выкінуць паперку, але раптам мне

стала не па сабе. А можа, тут зашыфравана нешта важнае? Ці не дапаможа мне хто-небудзь з вас разабрацца ў гэтай таямніцы?

А д к а з. 1) *Ку́лі ляцелі праз кулі́ саломы, што стаялі на полі.* 2) *Краты́ падлезлі пад кра́ты ў акенцах падвала і ўцяклі.* 3) *Каралі́ кара́лі непакорных.* Кантэкст дапамагае зразумець сэнс сказаў з амографамі.

(Па В. І. Паўлоўскай.)

Вывучэнне беларускай інтанацыі ў школе

Авалоданне арфаэпічнымі нормамі літаратурнай мовы, фарміраванне ўменняў і навыкаў звязнай вуснай мовы ў значнай ступені залежаць ад ведання правіл рытміка-меладычнай арганізацыі маўлення. Але ці добра ведаем мы асаблівасці беларускай інтанацыі? Якая яна? Чым розніцца ад той, што існуе ў блізкароднасных украінскай і рускай мовах? Ці істотныя гэтыя адрозненні?

Ул. Караткевіч, у якога адчуванне мовы было развіта і абвострана да вытанчанасці, пакінуў нам вельмі добрыя словы аб своеасаблівасцях гукавога ладу беларускай мовы: «Тыповага беларуса я досыць лёгка адрозню сярод іншых, хаця б ён яшчэ не сказаў ніводнага слова (калі скажа, тады ўжо, нават калі ён гаворыць на іншай мове і без акцэнта), яго лёгка пазнаць па асаблівай будове сказа, па тым, што колькі паветра набрана ў лёгкія, столькі і аддадзена, шчодра, да апошняга, нават з лішнімі словамі, каб мелодыя сказа была завершана. Ён не скажа: «Чым гэта скончыцца?», а скажа: «Дык чым, мо ўжо вы мне скажаце, скончыцца гэта — а, мо скажаце вы?»

Гэта тое, што ў абліччы, амаль няўлоўнае. Пераказаць яго цяжка...» *(Ул. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі.)*

У назіраннях пісьменніка трапна перадаецца адметнасць рытміка-меладычнай будовы беларускай мовы, яе ўстойлівасць, сувязь сінтаксісу з інтанацыяй, а таксама і тое, што асаблівасці вуснага маўлення цяжка перадаць апісальна. Але галоўнае ў працытаваным выказванні — гэта сцверджанне тыповасці і характэрнасці інтанацыі, якая дазваляе выявіць моўную прыналежнасць чалавека.

Сапраўды, у працэсе камунікацыі рытміка-меладычнай арганізацыі маўлення, г. зн. інтанацыі, адведзена велізарная роля. Без адпаведнай рытмічнай арганізацыі набор складоў так і застанецца малазразумелым і непатрэбным наборам складоў, якія, не ператварыўшыся, не «склаўшыся» ў словы, фразы, тэксты, не змогуць данесці да чалавека патрэбную інфармацыю. Калі чалавек слібізуе ('чытае марудна па складах'), ён парушае прынятыя нормы рытміка-меладычнай арганізацыі маўлення, і таму яму цяжка зразумець сэнс напісанага, слова рассыпаецца, не звязваецца ў адно цэлае.

Агульная накіраванасць рытміка-меладычнай арганізацыі маўлення — ствараць з гукаў, складоў, слоў суцэльныя моўныя адзінкі, якія перададуць слухачу разнастайную і багатую інфармацыю.

Кожны выкладчык роднай мовы і літаратуры сутыкаецца з асаблівасцямі інтанацыі ў класнай і гурткавай рабоце, пры ўласным выразным чытанні на ўроках[1]. Калі настаўнік здолее па-мастацку агучыць літаратурны твор, то ён хутчэй можа спадзявацца на эфектыўнасць педагагічнага ўплыву на вучняў.

Паўтарэнне агульнавядомых ісцін неабходна пры размове аб інтанацыі, бо, як і ўвесь комплекс пытанняў па беларускай прасодыі, пытанні выразнага чытання ў школе яшчэ не знайшлі дастаткова шырокага і глыбокага асвятлення ні на старонках навуковай, ні на старонках вучэбнай і метадычнай літаратуры. Практычна яшчэ не прааналізаваны ўзоры маўлення лепшых беларускіх артыстаў-дэкламатараў. Недастаткова ўвагі звернута на ўзоры вуснага маўлення лепшых выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры, сярод якіх ёсць выдатныя чытальнікі.

Калі ўлічыць, што поўнага і даступнага апісання рытміка-меладычнай структуры беларускай мовы не існуе, то ўвесь комплекс работы над фарміраваннем у вучняў інтанацыі пераносіцца на саміх выкладчыкаў. Адбор інтанацыйных узораў робіцца кожным настаўнікам, зыходзячы з яго асабістага моўнага чуцця.

Практычная неабходнасць поўнага апісання вуснага маўлення не выклікае ніякіх сумненняў. Аднак

---

[1] Параўн.: Гарыцкі Ул. Выкарыстанне фонахрэстаматыі на ўроках. Лірыка. Старэйшыя класы // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1991. № 7—8.

нераспрацаванасць навуковай тэорыі і цяжкасці выкарыстання тэхнічных сродкаў для вывучэння інтанацыі не спрыяюць хуткаму вызначэнню рытміка-меладычных асаблівасцей беларускага маўлення.

Вядомы даследчык інтанацыі славянскіх моў Т. М. Нікалаева неяк заўважыла, што «даныя беларускай мовы, як быццам бы дастаткова поўна прадстаўленыя, не заўсёды здаюцца цалкам дакладнымі»[1]. Гэтае ўяўленне тлумачыцца аўтарам цяжкасцямі параўнальнатыпалагічнага апісання блізкароднасных моў.

Але нельга лічыць, што зараз нельга пэўным чынам апісаць беларускую інтанацыю. Нават уважлівы яе аналіз з дапамогай такога старажытнага і праверанага стагоддзямі апарату, як чалавечае вуха, дазваляе сфармуляваць яе галоўныя асаблівасці.

Сапраўды, інтанацыя, згодна свайго вызначэння, (ад лац. intonare 'гучна вымаўляю') — сукупнасць фанетычных сродкаў, якія служаць для афармлення як адзінага цэлага фразы, а таксама яе асобных частак. Інтанацыя так арганізуе вуснае маўленне, каб яго лепш было ўспрымаць. Калі невыразна ўспрымаецца падзел пачутага на складаючыя часткі, то парушаецца і разуменне сэнсу выказвання. Кампазітар В. Асаф'еў так падкрэсліў ролю інтанацыі ў мове: «Думка, каб выразіцца праз гукі, робіцца інтанацыяй, інтаніруецца».

Без інтанацыі вуснае маўленне наогул не існуе. Калі часам гаворыцца, што чалавек «чытае без інтанацыі», гэта толькі абазначае, што ён чытае з невыразнай аднастайнай інтанацыяй, якая не адпавядае тэксту і робіць цяжкім яго ўспрыманне.

Вуснае паведамленне звычайна гучыць адзін раз, і яго трэба зразумець за вельмі кароткі час. Інтанацыя дапамагае: 1) вычленіць пэўныя адзінкі маўлення з агульнай моўнай плыні; 2) выдзеліць (з мэтай прыцягнуць увагу слухача) найбольш важныя і інфарматыўныя часткі выказвання; 3) перадаваць інфармацыю з патрэбнай для слухача хуткасцю, каб ён паспяваў і пачуць, і зразумець тое, што яму гаворыцца. Акрамя таго, у інтанацыі перадаецца фізіялагічны стан гаворачай асобы, яе эмацыянальнасць, адносіны да выказанага. Напрыклад, каб маўленне адбывалася

[1] Николаева Т. М. Фразовая интонация славянских языков. М., 1977. С. 101.

натуральна і плаўна, неабходна, каб гукаўтварэнне пэўным чынам супадала з рытмам дыхання. Калі з-за хваробы гэты рытм парушаецца, тады паяўляюцца інтанацыйныя памылкі: узнікаюць нечаканыя паўзы, змяняецца хуткасць артыкуляцыі, памяншаецца гучнасць маўлення, яе разборлівасць і г. д. Хворы чалавек гаворыць слабым прыцішаным голасам, больш павольна, чым звычайна, невыразна. Такім чынам, яго хвароба адбіваецца на рытміка-меладычным гучанні маўлення.

Голасам (а ў першую чаргу інтанацыяй) перадаюцца ў маўленні і чалавечыя пачуцці. Беларускія пісьменнікі пры перадачы на пісьме эмацыянальнага маўлення падкрэсліваюць асаблівае вымаўленне асобных слоў.

— *Віка, чуеш, Віка? Во тут адзін, выйдзі, паглядзі. Рамантык. У наш час — ра-а-м-а-антык. Дыназаўр, жывы дыназаўр. Ха-ха-ха.* (А. Дзятлаў. У вераснёвую ноч.)

— *А бо-жань-ка-а! — схапілася за галаву старая.— Што ж гэта яны з табою, Іванка, зрабілі?!* (В. Карамазаў. Супраць неба — на зямлі.)

— *Мі-калай...— гучыць недаверлівае, і тут жа хлынула, затапіла ўсё радасць: Міколка!* (Т. Бондар. Час, калі нас любілі.)

Для ўзмацнення значэння якога-небудзь слова ўжываецца расцягванне галосных, паўтор і ўзмацненне пэўных зычных: *чэ-эрці, д-д-урніца, с-спёка, няхай т-табе, паўню-ю..ткі, вялі-і..зны* і г. д.

Пісьменнікі адзначаюць таксама і тыя меладычныя змены, якія назіраюцца ў мове ўзрушанага чалавека.

Хаця Алекса хацеў сказаць гэта абыякавым голасам, але нешта ў ім самім здрыганулася, і голас на імгненне нібы пераламаўся, зазвінеў горыччу. (В. Іпатава. За морам Хвалынскім.)

Крык душы захлынуўся ў ціхім, як вінаватым шэпце:

— *Ну што вы, мае... маўчыце?* (В. Карамазаў. Супраць неба — на зямлі.)

Матэматык павярнуўся. Бачна было, што ён спалохаўся.

— *З кім маю гонар?*

— *Зараз я табе пакажу гонар, шкет ты марнаваны! — сказаў Шчукін, узяў матэматыка загрудкі, прыткнуў яго да плота, і наваколле напоўнілася адчайным енкам:*

— По какому праву?..

Гукі атрымаліся дрыготкія і ненатуральныя. Такімі гукамі крычаць не «По какому праву...», а «Людцы, ратуйце! Забіваюць!». (Л. Вашко. Кызючка.)

Апошні прыклад паказвае, што носьбіты мовы з пэўнай мелодыкай звязваюць пэўны сэнс: інтанацыя *«ратуйце!»*, а не самі словы — вось што было галоўным у фразе матэматыка. Яна была больш важнай у гэтай сітуацыі. Як заўважыў буйны фанетыст Л. Р. Зіндэр, «толькі агульнай абавязковасцю (зразумела, для данай мовы) кожнага, няхай самага тонкага, адцення інтанацыі можна растлумачыць той факт, што тысячы слухачоў увогуле аднолькава ўспрымаюць сказанае акцёрам, чытальнікам або аратарам»[1].

І гэта невыпадкова, бо чалавек карыстаецца вусным словам ад калыскі да глыбокай старасці. Больш таго, моўнае развіццё кожнага чалавека пачынаецца з авалодання інтанацыйнай сістэмай роднай мовы. Псіхолагі адзначаюць вельмі ранняе ўспрыманне дзецьмі інтанацыі дарослых, лічаць, што да канца першага года жыцця (раней, чым навучыцца хадзіць) дзіця ўжо засвойвае асноўныя рысы інтанацыйна-меладычнай структуры мовы.

Інтанацыя выкарыстоўваецца для таго, каб сэнсавы змест сказа, перададзеныя ў ім прэдыкатыўныя адносіны, камунікатыўнае значэнне і мадальнасць, а таксама лексічны склад і сінтаксічная пабудова атрымалі канкрэтнае ўвасабленне, абумоўленае характарам сітуацыі.

З дапамогай інтанацыі гаворачы і слухач проціпастаўляюць выказванні па іх мэце: апавяданне, волевыяўленне, пытанне. Інтанацыя можа спрыяць раскрыццю значэння фразы ў адпаведнасці з яе лексіка-граматычным складам, а можа надаваць фразе адваротны сэнс. Параўн. вымаўленую з рознай інтанацыяй фразу *Ты зробіш.* Калі яна гаворыцца нейтральна, то мае сэнс 'напэўна зробіш', калі ж іранічна, то абазначае 'цябе не дачакаешся', 'ты не зробіш'.

Апошні прыклад паказвае, што інтанацыя можа перадаваць спецыфічную, новую інфармацыю, якую не змяшчае лексіка-сінтаксічны склад выказвання. Дарэчы, слова *згода* ў залежнасці ад таго, з якой інтана-

[1] Зиндер Л. Р. Общая фонетика. М., 1979. С. 268.

цыяй яно вымаўлена, можа абазначаць і згоду, і сумненне, і папярэджанне, і інш.

Інтанацыя — з'ява, простая для ўспрымання, але яна складаецца з цэлага рада элементаў: мелодыкі, інтэнсіўнасці, тэмбру, адпаведнай працягласці моўных адзінак, пэўнага размяшчэння націску рознай сілы паміж словамі і паўз.

Заўважым, што інтанацыя і гукі складаюцца з адных і тых жа акустычных кампанентаў (асноўны тон, тэмбр, інтэнсіўнасць і працягласць гучання), але адны якасці і змяненні гэтых кампанентаў істотныя для гукаў, іншыя — для інтанацыі. Для адрознення гукаў у беларускай мове асаблівую значнасць набывае тэмбр, для прасодыі і інтанацыі — працягласць і рух тону.

Самым простым спосабам перадачы інтанацыі з'яўляецца пастаноўка паўз. У вусным маўленні гэта адбываецца шляхам перарыву гучання. Тая частка выказвання, якая не мае ўнутры паўз, вымаўляецца больш звязна і асобна ад іншых, што ідуць за паўзай.

У сучасным пісьме паўзы абазначаюцца рознай велічыні інтэрваламі, якія робяцца паміж асобнымі словамі, сказамі, абзацамі і разнастайнымі знакамі прыпынку. Варта яшчэ раз звярнуць увагу на тое, што, калі б словы пісаліся разам, гэта было б нязручна для ўспрымання, а ў некаторых выпадках магло б прывесці да непаразумення.

Перавага вуснага маўлення якраз у тым, што яно здольна данесці вялікую і разнастайную інфармацыю, якая не перададзена на пісьме.

Параўнальна сталымі адзнакамі пэўнай інтанацыі ў пісьмовым тэксце з'яўляюцца знакі прыпынку. Сама іх назва паказвае, што яны заўсёды абазначаюць паўзу, «прыпыняюць» словы, і такім чынам дапамагаюць дакладна зразумець сэнс сказанага. Рознае значэнне маюць пры наяўнасці і адсутнасці коскі, напрыклад, наступныя сказы: *Гэта, разумеецца, кепска* і *Гэта разумеецца кепска; Прыходзьце заўтра, сустрэнем* і *Прыходзьце, заўтра сустрэнем; Месцы для хворых, інвалідаў і пасажыраў з дзецьмі* і *Месцы для хворых інвалідаў і пасажыраў з дзецьмі.*

Кропка і коска ў першую чаргу перадаюць прысутнасць паўзы, бо наогул знакі прыпынку — гэта графічныя знакі, якія ўжываюцца ў пісьмовай форме мовы для яе дэкламацыйна-псіхалагічнага расчлянен-

ня, фразіроўкі, а таксама для перадачы тых асаблівасцей яе сінтаксічна-сэнсавага чляненне, якія нельга выразіць марфалагічнымі сродкамі і парадкам слоў.

Кропкай вылучаюцца сэнсава і сінтаксічна завершаныя часткі выказвання, якія пры агучванні павінны мець агульнае суцэльнае інтанацыйнае афармленне. Паўзы, што робяцца пры чытанні на месцы кропкі, звычайна даволі працяглыя. Прыгадаем, што ў старажытнасці для перадачы разнавіднасцей паўз выкарыстоўваліся кропкі вялікія і малыя або ў некаторых выпадках адначасова ставілася дзве, тры і нават чатыры кропкі адразу. У гэтай функцыі з кропкай спачатку «канкурыравалі» такія знакі, як крыж і хвалістая вертыкальная лінія (напрыклад, у XI стагоддзі).

Звернем увагу на тое, што ўсе астатнія знакі пунктуацыі ў сваёй графічнай аснове (за выключэннем рыскі і працяжніка) маюць кропку. Такім чынам яны перадаюць, як і кропка, што імі вылучана аб'яднаная інтанацыйна частка выказвання, пасля якой трэба пры чытанні рабіць паўзу.

Б. Тарашкевіч у Беларускай граматыцы для школ дае такое тлумачэнне тэрміна «знакі прыпынку»: «Знакі прыпынку маюць азначыць на пісьме тое, што ў мове выражаецца прыпынкам або зьменай голасу (інтанацыя)». Кропка, па яго тэрміналогіі «пункт» (.),— «знак найвялікшага прыпынку, паказвае, што думка і сказ зусім закончаныя. Найчасьцей ужываны знак, што нават прыклады лішнія»[1].

Коска таксама патрабуе ад чытальніка пастаноўку паўзы, але перарыў гучання ў гэтым выпадку можа быць не такім працяглым у параўнанні з тым, што робіцца на месцы кропкі. Коска сведчыць, што думка гаворачага не закончана, і ён будзе працягваць гаварыць. Таму звычайна яна суправаджаецца інтанацыяй незавершанасці, а ў слове, пасля якога стаіць коска, або ў адным-двух словах перад коскай, голас звычайна павышаецца. Па Б. Тарашкевічу, «коска (,) — знак найменшага прыпынку, паказвае, што думка і сказ ня скончыліся, што далей ідзе нейкае дапаўненьне або аб'ясьненьне»[2].

---

[1] Тарашкевіч Б. Беларуская граматыка для школ. Факсімільнае выданне. Мн., 1991. С. 131.

[2] Там жа.

З'явіўшыся ў старажытнарускіх помніках у XV стагоддзі, коска спачатку мела тыя ж функцыі, што і кропка. Але з цягам часу яна набыла сваё спецыфічнае значэнне і стала ўжывацца для раздзялення аднародных членаў сказа, простых сказаў, якія ўваходзяць у складаныя сказы рознага тыпу, галоўнага і даданага сказаў; для выдзялення адасобленых членаў сказа; у параўнальных зваротах; для аддзялення і выдзялення слоў, граматычна не звязаных з членамі сказа (пабочныя словы, зваротак, выклічнікі, сцвярджальныя, адмоўныя і пытальныя словы). Інтанацыйны змест коскі ва ўсіх гэтых выпадках аднолькавы. Яна паказвае, што выдзеленая ёю частка сказа, хаця і мае пэўнае самастойнае значэнне, але ўваходзіць у больш вялікае выказванне, не з'яўляецца завершанай.

Іншымі знакамі, якія ў першую чаргу служаць для абазначэння паўз рознай працягласці, з'яўляюцца двухкроп'е, кропка з коскай, шматкроп'е, дужкі і працяжнік.

Двухкроп'е набліжаецца пэўным чынам да коскі і таксама паказвае, што думка аўтара выказана не да канца. Незавершанасць, якую абазначае двухкроп'е, адрозніваецца ад той, якую абумоўлівае коска. Звычайна мяркуецца, што пасля двухкроп'я будзе ісці ўдакладненне або тлумачэнне папярэдняга выказвання. Напрыклад: *Вось скала: вертыкаль — сцяна, вертыкаль — стэла. Яна ўздымаецца ў неба адразу з вады. Ні падэшвы, ні падмурка. Можа, таму здаецца лёгкай, нібы пастаўлены на ваду ветразь. А далей яшчэ адна, у форме грабянца: зубы і шчыліны, зубы і шчыліны.* (В. Карамазаў. Глядзіце ў вочы лемура.) Параўнаем, як змяняецца сэнс сказаў пры замене косак на двухкроп'е. *Галя, адчувала маці, невыпадкова выклікала яе* і *Галя адчувала: маці невыпадкова выклікала яе. «Гэта жанчына,— казала сястры Вера,— ніколі не вернецца ў наш горад»* і *Гэта жанчына казала сястры: «Вера ніколі не вернецца ў наш горад».*

Камбінацыі з некалькіх кропак сустракаліся ўжо ў помніках беларускай пісьменнасці старажытнага перыяду і служылі для падзелу тэксту на часткі. Аднак прапанаваны ў кніжна-славянскай граматыцы Лаўрэнція Зізанія (1596) знак „двосрочие" (:) па сэнсу нагадваў кропку з коскай. У Мялеція Сматрыцкага гэты знак называўся «двоеточием», а з часоў

граматыкі Ламаносава ён ужо пачынае ўжывацца ў тых жа выпадках, як і цяпер: перад пералічэннем, калі яму папярэднічае абагульняючае слова; у бяззлучнікавых складаных сказах, калі другая частка раскрывае змест першай, удакладняе яе, указвае на прычыну таго, аб чым гаворыцца ў першай частцы; пасля аўтарскіх слоў, якія ўводзяць простую мову.

Кропка з коскай у залежнасці ад зместу тэксту можа мець значэнне кропкі ці коскі і адпаведным чынам перадавацца пры чытанні. Вельмі цікава растлумачыў правілы пастаноўкі кропкі з коскай чыноўнік Перакладзін з апавядання А. П. Чэхава «Клічнік»: «Дзе коскі мала, а кропкі многа, там трэба кропку з коскай». У гэтым тлумачэнні адзначана тое, што гэты пунктуацыйны знак часцей сустракаецца ў складаных сказах для аддзялення адносна самастойных частак, членаў перыядаў, як аб гэтым гаворыцца ў «Расійскай граматыцы» М. В. Ламаносава.

Шматкроп'е абазначае, што мова па розных прычынах перапынена, што трэба зрабіць паўзу. Вельмі трапна назваў шматкроп'е ў сваёй граматыцы Б. А. Тарашкевіч — «недаказ». Прычынамі недаказу могуць быць унутраныя перажыванні гаворачага. Тады для асобных частак фразы будзе адзначацца інтанацыя незавершанасці, часцей з павышэннем тону. Напрыклад: *Тады ... тады праваліся ты разам з ім.* (К. Крапіва. Партызаны.) У аўтарскай рэмарцы да гэтай фразы гаворыцца, што пры яе вымаўленні гаворачая асоба «захліпаецца ад злосці». Яе напружаны эмацыянальны стан і перадае паўза, інтанацыя незавершанасці.

Яшчэ адзін прыклад, з паэзіі, з верша Яўгеніі Янішчыц:

Грай жа, скрыпка!
...надта ж доўга
Ты вярталася дахаты.

У дадзеным выпадку шматкроп'е перадае паўзу, якая падкрэслівае ўзрушаны эмацыянальны стан паэтэсы, яе ацэнку падзей.

Часам перапыніць гутарку могуць нейкія знешнія абставіны. Такую сітуацыю на пісьме таксама адзначаюць з дапамогай шматкроп'я. Прыгадаем «Раскіданае гняздо» Янкі Купалы, з'яву VI з другога акта, у якой Марыля гаворыць з панічом.

Паніч. Позна ўжо, цётка!

М а р ы л я. О, чаму лепей не плыла атрута з маім малаком у той час, калі...

Пры апошніх словах паніча ўваходзіць Сымон з тапаром у руках, каторым увесь час пакручвае; Зоська першая ўгледзела Сымона і адышла ўбок.

Такім чынам, у гэтым выпадку гутарка перапынена з-за знешніх абставін.

Упершыню шматкроп'е пад назвай «знак пресекательный» прыведзена ў граматыцы А. Х. Вастокава (1831). Акрамя прыгаданых мэт перадачы незакончанасці, перарыва ў выказванні, абумоўленага хваляваннем гаворачага, самаперабівамі, іншымі пачуццямі, шматкроп'е ўжываецца ў цытатах, каб паказаць, што частка цытаты не прыводзіцца. У гэтым выпадку інтанацыйна шматкроп'е можа і не перадавацца перарывам гучання, калі застаўшаяся пры цытаванні частка цытаты гучыць, як адзіная суцэльная фраза. Напрыклад, цэлы абзац з рамана Валянціны Коўтун «Крыж міласэрнасці» гучыць наступным чынам: *«У грамадзе моладзі, што высыпала на тратуар і заспяшалася цераз вуліцу да будынка курсаў, Пётр Францавіч пазнаў сваіх — слухачак старэйшага курсу Любу Казанкіну, Лідзію Егунову, Таццяну Някрасаву і Алаізію Пашкевіч».* Цытата з яго выглядае так: *«У грамадзе моладзі... Пётр Францавіч пазнаў сваіх — слухачак старэйшага курсу Любу Казанкіну, Лідзію Егунову, Таццяну Някрасаву і Алаізію Пашкевіч».* Уся цытата гучыць як адзінае выказванне, і інтанацыйна шматкроп'е можа не перадавацца з дапамогай паўзы.

Працяжнік — пунктуацыйны знак, які пэўным чынам суадносіцца і са шматкроп'ем, і з двухкроп'ем, і з астатнімі знакамі і заўсёды перадае паўзу. Цікава, што ў рускай граматыцы знак прыпынку ў выглядзе гарызантальнай лініі ўпершыню ўведзены А. А. Барсавым, вучнем М. В. Ламаносава, і называўся «молчанкой». Рускі тэрмін «тире» суадносіцца з французскім tiret, якое ад tirer — цягнуць. Ён быў уведзены ва ўжыванне рускім пісьменнікам і гісторыкам Карамзіным. Беларускае слова *працяжнік* аднакаранёвае са словамі *працягны, цягнуць* і ў гэтых сваіх сувязях нагадвае французскае. Але па сэнсу, як і большасць іншых пунктуацыйных знакаў, працяжнік — гэта «малчанка». Ён можа паказваць, што ў сказе прапушчаны выказнік або іншыя члены, што адсутнічае звязка *ёсць*; можа перадаваць, што паміж членамі

сказа або паміж самастойнымі сказамі існуе рэзкае проціпастаўленне або процілегласць, што другі з іх выражае нечаканасць і г. д.

Інтанацыйнае распадзенне простага сказа на дзве часткі таксама перадаецца з дапамогай працяжніка. Наогул правілы яго пастаноўкі ўключаюць цэлы рад пунктаў, што сведчыць аб жывым працэсе ўваходжання гэтага знака ў пісьменнасць. Інтанацыйна пры агучванні сказы з працяжнікам звычайна афармляюцца як фразы з паўзай і са змяненнем руху тону голасу пасля гэтай паўзы. Напрыклад: *Настрою сябе іншы раз — усё, здаецца, рашылася. Ноч не сплю. А назаўтра — не.* (Т. Гарэлікава. Перыферыя.)

Значная інтанацыйная нагрузка працяжніка як знака прыпынку садзейнічае таму, што ім часта карыстаюцца аўтары, каб перадаць асаблівасці пабудовы свайго тэксту. Так, у паэтычным маўленні, калі лагічна выдзяляецца дзейнік ці выказнік, можа быць пастаўлены працяжнік нават у тых выпадках, якія не прадугледжаны правіламі. Пры адсутнасці дзеяслоўнай звязкі, калі дзейнік або выказнік выражаны займеннікам, таксама ставіцца працяжнік. Напрыклад:

Жыццё — яно камедыя і драма:
То ўсмешкамі, то громам паласне.
...
Жыццё — яно і выклік, і пытанне,
Пытаюся ў яго да нематы.

(Яўгенія Янішчыц.)

Калі перад выказнікам стаіць не дапасаваны да яго член сказа або пабочнае слова, злучнік ці часціца або пры выказніку ёсць параўнальныя словы *як, як быццам, нібы, што*, адмоўе *не: І шчырае — сумуе слова. Дзень прайшоў. І ноч — як сага. І дзвень — як чорны андарак. Спазнаць сябе ў самым горкім горы — І ні званка нікому. Ні — хады. Быць — і не збыцца пераправе!* (Яўгенія Янішчыц.)

У няпоўным сказе пастаноўка працяжніка залежыць ад наяўнасці паўзы і адпаведнай інтанацыі: *У тваіх далонях — Свет без мітусні.* (Віктар Ракаў.)

Ва ўсіх астатніх выпадках асаблівасці інтанацыі, аўтарскія паўзы таксама перадаюцца з дапамогай працяжніка. Напрыклад: *А ты, паэзія, як сад — Сама нагадваеш мне свята. Сплылі дарогі і світанні. Без рукавіц і — басанож. З даверам светлым і сурова*

У кожны твар глядзіцца мова З глыбінь, з купалляў нерастаўшых — мая, твая, балесна — наша! Па мелодыі, па промню — Пазнавала. (Яўгенія Янішчыц.)

Падрабязны разгляд такога кампанента інтанацыі, як паўза, не азначае, аднак, што для беларускай мовы ён мае нейкую перавагу перад іншымі акустычнымі сродкамі.

Кожны з фанетычных сродкаў, якія ў сваёй сукупнасці і суцэльнасці ўтвараюць інтанацыю фразы, вельмі цяжка адасобіць, бо ў маўленні яны дзейнічаюць усе разам. Да паўз як сродка ўтварэння пэўнай інтанацыі бліжэй за ўсё стаіць тэмп маўлення.

Выкарыстанне змяненняў тэмпу для выдзялення ў маўленні важнага і няважнага, новага і вядомага, актуальнага і неактуальнага назіраецца ва ўсіх усходнеславянскіх мовах. Звычайна больш важная ў пэўных адносінах інфармацыя вымаўляецца ў больш павольным тэмпе. Змяненні тэмпу выкарыстоўваюцца таксама для сэнсавага выдзялення пэўных слоў або словазлучэнняў. «Незвычайнае» месцазнаходжанне даданых членаў сказа падказвае, што іх трэба інтанацыйна і з дапамогай тэмпу выдзеліць. Так, дадатак вымаўляецца больш павольна тады, калі ён знаходзіцца ў прэпазіцыі, азначэнне ж — у постпазіцыі. Напрыклад, у фразе *Дыплом / я заслужыў, здаецца ж, галавою* (К. Крапіва) слова *дыплом* будзе вымаўляцца ў больш павольным тэмпе, чым гэта слова ў фразе *Я заслужыў дыплом, здаецца ж, галавою.*

З паняццем тэмпу маўлення звязаны найбольш істотныя адрозненні беларускай мовы ад рускай. Шматлікія даследаванні, праведзеныя рознымі вучонымі, паказалі, што беларускае маўленне адрозніваецца ад рускага і ўкраінскага больш павольным тэмпам[1].

Таму вельмі важна сачыць за тым, каб вучні прытрымліваліся больш павольнага тэмпу маўлення. Калі ж ён беспадстаўна хуткі, гэта можа прывесці да рэдукцыі галосных, да іх невыразнага вымаўлення. Дэфармацыя гукаў назіраецца ў такіх выпадках нават у вопытных дыктараў. Пры гэтым скажаюцца розныя часткі слова, што таксама недапушчальна. Для больш

---

[1] Типологія інтонації мовлення. Київ, 1977; Метлюк А. А. Просодия белорусского языка в условиях двуязычия: Учебн. пособие. Мн., 1982; Выгонная Л. Ц. Інтанацыя. Націск. Арфаэпія. Мн., 1991.

яскравага прадстаўлення аб гэтым можна выкарыстаць наступнае параўнанне, якое ў свой час прывёў вядомы рэжысёр К. Станіслаўскі. Ён гаварыў, што слова са скамячаным пачаткам нагадвае чалавека з расплюшчанай галавой, а слова з недагавораным канчаткам — чалавека з ампутаванымі нагамі.

Асаблівасці больш спакойнага, павольнага раскрыцця ў часе беларускага маўлення адзначаюць і радкі верша С. Панізніка «Кропка»:

Бегла кропка
Нетаропка.
А за ёю
Цэлы сказ
Нетаропка
бег да вас.

«Нетаропкая» — гэта тое вызначэнне, якое больш усяго да месца адносна беларускага маўлення. Невыпадкова ж усе яго даследчыкі падкрэслівалі напеўнасць беларускай мовы, якая абумоўлена захаваннем прапорцый рытмічнай структуры слоў, іх выразным спакойным вымаўленнем.

Сіла гучання асобных слоў у маўленні (інтэнсіўнасць) таксама з'яўляецца элементам інтанацыі. Націскныя склады (дакладней, іх складаўтваральныя часткі — націскныя галосныя) вызначаюцца большай даўжынёй і гучнасцю ў параўнанні з суседнімі ненацісknымі складамі. І справа тут не ў тым, вялікая ці малая гучнасць у націскнога галоснага, а ў тым, што гучнасць у яго большая ў параўнанні з гучнасцю астатніх галосных слова. Такім чынам, прасадычныя з'явы ахопліваюць сукупнасці суадносных элементаў маўлення.

У моўнай плыні з колькасных змяненняў прасадычных параметраў складаюцца лініі, «рысункі»: гукавышынны, рытмічны, дынамічны, тэмбравы, якія ў сваёй сукупнасці ствараюць інтанацыйную суцэльнасць, інтанацыю, мелодыю.

Нельга, каб усе галосныя ў слове былі аднолькава гучныя: націскны галосны павінны быць больш гучным. Нельга таксама дапускаць, каб усе словы ў фразе вымаўляліся аднолькава ціха або аднолькава гучна. Выдзяленне пэўнага слова большай працягласцю і гучнасцю дапамагае ўдакладніць сэнс фразы. Паставіўшы пэўнае слова пад лагічны націск, можна падкрэсліваць розныя сэнсавыя элементы выказвання.

Напрыклад: *Алеся прыехала ўчора (Алеся, а не нехта іншы). Алеся прыéхала ўчора (а не прыляцела). Алеся прыехала ўчóра (а не сёння).*

Нарэшце, сярод усіх прасадычных сродкаў найбольш важнай пры вырашэнні тых шматлікіх задач, што ўзнікаюць у маўленні перад інтанацыяй, з'яўляецца мелодыка, якая звычайна вызначаецца па руху асноўнага тону голасу. Гэта абумоўлена вялікімі магчымасцямі мелодыкі ў сэнсе змянення. Акустычна меладычныя характарыстыкі маўлення абумоўлены зменнем у часе самай нізкай складаючай у спектры гука — частатой асноўнага тону.

Мусіць, не варта раскрываць фізічны змест паняцця «мелодыка маўлення» ў школе (для таго каб вадзіць машыну, неабавязкова ведаць усе падрабязнасці яе канструкцыі). Але для тлумачэння яе зместу можна выкарыстаць міжпрадметныя сувязі. Так, пры вывучэнні ў школе музыкі і спеваў школьнікі карыстаюцца паняццем вышыня гукаў. Яны ведаюць, што ёсць гукі больш высокія і больш нізкія, што адну і тую ж песню можна выканаць больш высокім і больш нізкім голасам. Практычны змест паняццяў «павышэнне» і «паніжэнне» тону можа зразумець нават школьнік малодшых класаў.

Агульнапрынятых графічных сродкаў перадачы руху мелодыкі не існуе, аднак частку з тых, што сустракаюцца ў спецыяльных работах, можна выкарыстаць і ў школе. Так, у падручніках па выразнаму чытанню ўжываюцца наступныя графічныя абазначэнні: 1) націскныя словы падкрэсліваюцца адной суцэльнай лініяй, 2) словы, што патрабуюць больш значнага выдзялення лагічным націскам, падкрэслены дзвюма або трыма лініямі, 3) стрэлка, накіраваная ўверх, абазначае павышэнне голасу, 4) стрэлка, накіраваная ўніз,— паніжэнне голасу, 5) невялікая паўза перадаецца знакам ⊥, 6) вертыкальная рыска (|) ужываецца для абазначэння лагічнай паўзы, якая раздзяляе моўныя такты,7) дзве і тры вертыкальныя рыскі (||, |||) — для перадачы больш значных лагічных паўз, 8) V — для перадачы псіхалагічнай паўзы. Напрыклад:

Я ў мастацкім агародзе ↗

Толькі ↙ марная трава.

А якая? — смех, дый годзе:
Я — // пякучка-крапіва. (*К. Крапіва.*)[1]

Часам для перадачы адноснай вышыні складоў у тэксце выкарыстоўваецца іх размяшчэнне на розных радках. У гэтым выпадку лічыцца, што ніжні радок абазначае самы нізкі тон, а верхні — самы высокі. Напрыклад:

гэ́та *Гэта*
вось *чытаў* *ты*
А *чытаў.*

У розных вучэбных мэтах можна выкарыстаць абодва спосабы перадачы руху мелодыкі, хаця графічны паказ інтанацыі мае дапаможную ролю. Больш важным з'яўляецца дэманстрацыя ўзору пэўных фраз з адпаведнай інтанацыяй, спалучэнне слыхавой і зрокавай нагляднасці. Настаўнік можа сам правільна вымавіць фразы або даць паслухаць іх у грамзапісе.

Навучанне правільнаму інтанаванню варта праводзіць у тры этапы: 1) дэманстрацыя ўзору; 2) гутарка, у якой настаўнік тлумачыць асаблівасці прадэманстраванай інтанацыі, звяртае ўвагу на тэмп, вызначае месца паўз і слова, на якое падае лагічны націск, паказвае рух мелодыкі і 3) паўторнае імітацыйнае вымаўленне, чытанне сказаў вучнямі.

Для выражэння разнастайных моўных значэнняў і дасягнення шматлікіх камунікатыўных мэт выкарыстоўваецца цэлы рад змяненняў тону. У беларускай мове тон можа быць роўным, сыходным, узыходным, роўна-ўзыходным, роўна-сыходным, сыходна-ўзыходным, узыходна-сыходным. Для школьнай практыкі найбольш важнымі з'яўляюцца сыходны, узыходны і роўны тоны.

Сыходны тон літаратурнай мовы характарызуецца нярэзкім паніжэннем вышыні голасу на націскным складзе. Просты сыходны тон у беларускай мове звычайна назіраецца ў фразах, маючых значэнне пэўнасці, катэгарычнасці, завершанасці. Ён ужываецца ў

[1] Каляда А. Выразнае чытанне сатырычных вершаў, баек і драматычных твораў. Мн., 1973. С. 7—8.

сцверджаннях, спецыяльных і альтэрнатыўных пытаннях, загадах, воклічах, агульных пытаннях, а таксама ў просьбах і запрашэннях. Напрыклад: *Дзеці цяпер не сядзяць дома. Старая не спала ўсю ноч. Пачакай. Заходзьце. Заўтра. Так. Ён з цябе смяецца?* (Пытанне змяшчае сцвярджальны сэнс: напэўна смяецца.) *Хадземце ў хату!*

Паніжэнне голасу вельмі патрэбна пры вымаўленні апавядальных сказаў, таму на́ больш рэдкія выпадкі выкарыстання сыходнага тону ўвагу можна і не звяртаць.

Узыходны тон (павышэнне) часцей перадае няўпэўненасць, некатэгарычнасць, рознага віду пытанні. Напрыклад: *Прыйдзеш? Заўтра? Раніцай? Адзін? Дакладна? Ты сам бачыў?*

Каб лепш давесці, чым розняцца меладычна фразы з паніжэннем і павышэннем голасу, можна прапанаваць правесці іх параўнанне ў тых выпадках, калі яны маюць розны сэнс. Напрыклад:

раніцай? — Прыйдзеш

заўтра *заўтра*

Прыйдзеш *раніцай.*

Ты сам рашыў задачу? — *Ты сам рашыў задачу.*

Мы будзем чакаць — *Мы будзем чакаць*

бацьку? *бацьку.*

— *Паехалі?* — *Паехалі.*

— *Не, яшчэ збіраюцца.* — *Так, я бачыў, як машына пайшла.*

Апісанне тыповых рытма-меладычных фігур з павышэннем і паніжэннем тону варта спалучыць з тлумачэннем таго, якія знакі прыпынку ставяцца ў такіх выпадках.

Пытальнік ужываецца для выражэння рознага віду пытанняў, аб чым гаворыць і сама назва гэтага знака. Раней у яго функцыі выкарыстоўвалася кропка з коскай, што можна ўбачыць у кніжна-славянскіх граматыках Лаўрэнція Зізанія (1596) і Мялеція Сматрыцкага (1619), хаця графічны знак ? сустракаўся ўжо ў кнігах першай паловы XVI стагоддзя. Яго замацаванне на ўсходнеславянскай глебе звязана з «Расійскай граматыкай» М. В. Ламаносава. Пытальнымі

могуць быць розныя сказы: аднасастаўныя і двухсастаўныя, простыя і складаныя. Звычайна з дапамогай пытальных сказаў гаворачы імкнецца атрымаць нейкую інфармацыю, якую ён не мае. У мове існуюць пэўныя сродкі перадачы пытальнага характару сказаў. Гэта пытальныя часціцы, займеннікі, прыслоўі *(няўжо, які, куды)*, пэўны парадак слоў *(Пайшоў ён?)*. Але найбольш рэгулярна пытальны характар фразы перадаецца з дапамогай спецыяльнай інтанацыі.

У беларускай літаратурнай мове мелодыка ў пытальных фразах некалькі адрозніваецца ў сувязі з іх пабудовай. Інтанацыя пытальнай фразы без пытальнага слова адрозніваецца ад інтанацыі пытальных фраз з пытальным словам і са словам *А* ў пачатку фразы. У фразах без пытальнага слова мелодыка націскных складоў узыходная. *(Правяраў? Разумееш?)*. Павышэнне тону на націскным складзе і паніжэнне на паслянаціскных складах або павышэнне на націскным складзе з наступным паніжэннем на паслянаціскных складах і з дабаўленнем павышэння ў канцавым складзе адзначаецца ў фразах без пытальнага слова, калі яны маюць больш складаную структуру. *(А ты куды пайшоў? А таты не было ў магазіне? Яго можна есці?)*. Канцавое павышэнне апошняга склада нагадвае тую інтанацыю такіх фраз, якая адзначана ў польскай мове.

Мелодыка пытальнай фразы з пытальным словам у цэлым сыходная з двума цэнтрамі: павышэннем на націскным складзе пытальнага слова і пераломам — паніжэннем — на апошніх складах. *(Куды ты пойдзеш?)* У некаторых выпадках мелодыка пытальных фраз з пытальным словам набліжаецца да інтанацыі звычайнай пытальнай фразы. *(Чаго маўчыш?)* У параўнанні з інтанацыяй апавядальных фраз у пытальных фразах узмоцнены пачатак фразы, а канцавы націскны галосны можа быць і не выдзелены.

Асаблівае афармленне маюць пытальныя фразы, якія пачынаюцца са слова *А*... Здавалася б, якая

розніца, з чаго пачынаецца фраза? Але ў мове вельмі часта ўсё, што на першы погляд здаецца выпадковым, зусім невыпадковая з'ява. Напрыклад, у рускай мове, калі пытальная фраза пачынаецца са слова А, то яна мае адметную інтанацыю, абавязкова вызначаецца ўзыходнай мелодыкай. У адрозненне ад таго ў беларускай мове існуюць дзве меладычныя магчымасці для выражэння гэтага тыпу фраз: першы, які адпавядае рускаму *(Усе вялікія птушкі жывуць доўга. А арлы?)*, і другі, які характарызуецца паніжэннем мелодыкі ў націскным складзе і нагадвае пытанне з пытальным словам або апавядальную фразу. *(А арлы? А хмель?)*

Узыходна-сыходна-ўзыходны рух тону выкарыстоўваецца ў беларускай літаратурнай мове і для пытанняў, у якіх, акрамя запытання, перадаецца намер гаворачага не надакучваць таму, да каго ён звяртаецца з пытаннем. Напрыклад: *Вам прынесці кнігу заўтра?* Падкрэслім, што інтанацыйныя сродкі перадачы пытання ў беларускай мове вельмі разнастайныя, і яны прыкметна адрозніваюцца ад тых, якія характэрны для рускай мовы.

Яшчэ больш вялікай інтанацыйнай шматлікасцю вызначаюцца клічныя сказы, на канцы якіх ставіцца клічнік. У «Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (Мінск, 1959) гаворыцца, што «клічнік ставіцца ў канцы сказа, які вымаўляецца з клічнай інтанацыяй», а таксама «пасля звароткаў, якія стаяць у пачатку або ў канцы сказа, і пасля выклічнікаў, якія стаяць у пачатку або ў сярэдзіне сказа, калі гэтыя словы вымаўляюцца з клічнай інтанацыяй».

Клічныя сказы вельмі разнастайныя па зместу, бо ў іх выказванне думкі суправаджаецца выражэннем пачуццяў гаворачага. Яны перадаюць, як чалавек адносіцца да таго, аб чым гаворыць; якія пачуцці выклікаюць у яго розныя з'явы рэчаіснасці; з якой мэтай ён гаворыць. Параўн.: *Прыйшла Наталля* (паведамленне) і *прыйшла Наталля!* (нарэшце прыйшла; як добра, што яна прыйшла). Клічныя сказы змяшчаюць як станоўчыя адносіны да падзей, якія яны

абазначаюць, так і іх адмоўную ацэнку. Яны перадаюць такія пачуцці, як захапленне, спачуванне, узнёсласць, так і пагарду, абурэнне, іронію, спагаду: *Якая прыгажосць! Здраднік!*

Такія сказы перадаюць запрашэнне, загад, заклік да дзеяння: *Пойдзем разам! Калі ласка, забярыце! Праводзьце мяне! Пахадзіў бы ты сам!* Звычайна тое слова, што перадае галоўную інфармацыю клічнага сказа, займае ў ім першае месца. Параўн.: *Не магу зараз адказаць! Зараз не магу адказаць! Адказаць зараз не магу!*

Уваходжанне клічных сказаў у эмацыянальныя тэксты заўважана даўно. Прыгадаем, што ў кніжна-славянскай граматыцы Мялеція Сматрыцкага (1619) клічнік меў назву «удивная» — слова, роднаснае словам *дзіва, дзівіцца, здзіўляцца.* Правілы яго ўжывання ў «Расійскай граматыцы» М. В. Ламаносава вызначаліся наступным чынам: «удивительный» знак «...по удивлении поставляется».

Эмацыянальнасць маўлення — абавязковая перадумова ўзнікнення клічных фраз. Сапраўды, калі чалавек у горы ці ў радасці пытае аб нечым ці паведамляе, фраза ўсё роўна застаецца пытальнай або апавядальнай. Але калі клічны сказ чытаецца абыякава, ён губляе саму сваю сутнасць, перарабляецца ў нейкі іншы.

Беларуская назва — «клічнік» якраз перадае гэты змест: клічнік кліча, заклікае... Знешне клічны сказ можа супадаць з пытальным *(Якія нашы гады!)* або апавядальным *(Саша вярнуўся!)*, але меладычна ён будзе ад іх адрозніваццца.

У большасці выпадкаў мелодыка клічных фраз мае ў беларускай літаратурнай мове ўзыходна-сыходны («пяцелька») выгляд. Адпаведныя меладычныя фігуры існуюць таксама ў рускай і ўкраінскай мовах, але яны адрозніваюцца ад той, што маецца ў беларускай мове, хаця сэнс гэтых адрозненняў закранае больш складанае апісанне мелодыкі, таму мы не будзем на іх спыняцца.

Звычайна клічныя фразы вымаўляюцца больш моцна, пры гэтым інтэнсіўнасць большасці складоў са-

мая вялікая, якая звычайна ёсць у маўленні гаворачай асобы. Усе склады ў беларускай клічнай фразе даволі інтэнсіўныя, таму нават цяжка вызначыць, колькі ў ёй цэнтраў.

Можа быць адзін меладычны цэнтр, а можа быць два. Так, у фразах *Яго можна есці!* два цэнтры, на складах [*мо́*] і [*йэ́*], а ў фразе *Во каб усе дубы былі такія!* асабліва меладычна выдзяляюцца націскныя склады слоў *дубы* і *такія*.

Эмацыянальнасць клічных сказаў абумоўлівае тое, што яны амаль не ўжываюцца ў навуковым і афіцыйна-дзелавым стылях, але часта сустракаюцца ў размоўным стылі, публіцыстыцы, мове мастацкай літаратуры. Можна прапанаваць вучням прачытаць як клічныя фразы, напрыклад, фармуліроўкі з падручніка геаметрыі, накшталт: *Гіпербала — крывая лінія з ліку канічных сячэнняў*! Такое чытанне выклікае смех. (Прыгадаем з «Рэвізора» М. В. Гогаля: *Аляксандр Македонскі — вялікі чалавек, але навошта крэслы ламаць!*) Але варта нагадаць, што таксама смешна выглядае і той вучань, які верш з клічнымі сказамі чытае абыякава, роўным тонам. Пісьменнік, паэт не могуць у пісьмовай форме адлюстраваць усе тыя асаблівасці гучання радка, якія яны самі чуюць, таму нельга пазбаўляць тэкст тых найбольш значных арыенціраў, уведзеных аўтарамі,— знакаў прыпынку.

Вось як эмацыянальна гаварыў аб гэтым выдатны рускі фанетыст Л. У. Шчэрба: «Паэт чуе гук, і гэты гук адзін, у ім няма хістанняў; але паэт не мае іншых сродкаў перадаць нам яго, як гэтае недасканалае пісьмо, якое напалову ўтойвае ад нас «боскі» гук. Адсюль неабходнасць тлумачэння пісьма, перакладу яго ў гук...»[1]

Яго выказванне пераклікаецца са словамі вядомага паэта Рамона Гомеса дэ ла Серна, які сцвярджаў, што «аловак піша толькі цені слоў». Таму клічныя сказы з'яўляюцца тым, што ажыўляе мастацкі тэкст. У сувязі с гэтым можна прыгадаць верш С. Папара «Клічнік».

---

[1] Щерба Л. В. Избранные работы по русскому языку. М., 1957.

Многа іх у радку —
Знакаў,
Літар,
Лічбаў.
Як лісток на суку —
Самавіты клічнік!
У каго ён такі,
Лічаны, удаўся?
Да сябе ўсе радкі
Склікаць пастараўся,
Ох, як задаваўся:
— **Кнізе трэба клічнікі,**
Як акну — налічнікі.
Я вам не атопачак.
Нарадзіўся з кропачкай!
Без мяне і кліч не кліч,
І не будзе закліка...
Аж ахрып,
Нібыта сыч
На лясным экзамене:
Надта ж выхваляўся.
Быў бы ён
Вось такім
І цяпер удаленькім.
Рас-кры-ты-ка-ваў-ся.
Кім цяпер?
Пытальнікам! *(С. Папар.)*

Пры аналізе верша можна прапанаваць вучням растлумачыць, чаму клічнік «Да сябе ўсе радкі Склікаць пастараўся», навошта «Кнізе трэба клічнікі, Як акну — налічнікі», чаму без гэтага знака «кліч не кліч, і не будзе закліка...».

Карысна параўнаць сказы, якія тоесныя па свайму лексіка-граматычнаму складу, але ў залежнасці ад змены інтанацыі набываюць рознае значэнне. Напры-
↘ ↗ ↗ ↘
клад: *Пеця хворы.— Пеця хворы? — Пеця хворы! Падрыхтаваліся! Можна пачынаць! — Падрыхтаваліся? Можна пачынаць? — Падрыхтаваліся. Можна пачынаць. Глядзеў новы фільм? — Глядзеў новы фільм.— Глядзеў новы фільм! Саша прачытаў кнігу.— Саша прачытаў кнігу? — Саша прачытаў кнігу! Таня працуе.— Таня працуе? — Таня працуе!*

— *З якой ён вёскі?*

— *З якой ён вёскі! Ён гараджанін.*

У жывым маўленні інтанацыя розных сказаў можа часам быць вельмі блізкай. Напрыклад: *Ты... ты знаеш нашу мову? — хутчэй сцвярджальна, чым запытальна сказаў ён.* (В. Іпатава. За морам Хвалынскім).

Хіба мне паехаць?! (не змагу я паехаць, няма такой магчымасці, хаця і трэба) — *Хіба мне паехаць?* (самой паехаць).

Трэба мець на ўвазе, што з узрастаннем моўнай культуры паляпшаецца меладычнае абазначэнне граніц моўных адзінак, назіраецца большая разнастайнасць меладычных рысункаў, больш шырокае выкарыстанне і вар'іраванне паўз. Валоданне прасадычнымі нормамі садзейнічае замацаванню навыкаў правільнага вымаўлення і на гукавым узроўні. Акрамя таго, глыбокая арыгінальнасць і адметнасць беларускай гукавой сістэмы ў значнай ступені караніцца ў яе рытміка-меладычнай структуры. Таму фарміраванне дасканалага літаратурнага маўлення неабходна праводзіць адразу ў трох напрамках: арфаэпічным, акцэнталагічным і інтанацыйным.

Ніжэй прапануюцца практыкаванні, якія можна выкарыстаць пры працы над інтанацыяй у розных класах на ўроках беларускай мовы і літаратуры.

Дыдактычны матэрыял

Беларуская інтанацыя. Інтанацыя простых сказаў. Апавядальныя сказы

1. Прачытайце ўголас тэксты, якія складаюцца з апавядальных сказаў. У канцы кожнага сказа паніжайце голас і рабіце прыпынак, паўзу.

1. Ноччу на зямлю вярнуўся прымаразак. Ён прыпудрыў леташнюю траву, зашкліў лужынкі, падмаладзіў сонца. Усё зрабілася святочным і наўздзіў радасным. *(Я. Пархута.)*

2. На сонечным узлеску Празрыста зяюць вочы,
Апошні снег растаў. Нібы блакіт нябёс.
Вясёлыя пралескі Халоднай весняй ноччу
Зірнулі з-пад куста. Іх не кране мароз.

(М. Хведаровіч.)

Колькі сказаў у кожным урыўку? Чым яны аддзяляюцца адзін ад другога?

2. Прачытайце ўголас загадкі, якія пачынаюцца з простых апавядальных сказаў. Паніжайце голас у канцы сказаў. Звяртайце ўвагу на тое, з якога слова ў кожным сказе пачынаецца паніжэнне голасу.

У гародзе за кустом
Незвычайны вырас дом.
Трэба ратаваць гарод,
Бо жыве ў тым доме...

Яго пакінуў гаспадар
І сам паехаў на базар.
Ад дзвярэй ён ні на крок,
Бо завуць яго ... *(В. Шніп.)*

Адгадкі: крот, замок.

3. Прачытайце ўголас верш, які складаецца пераважна з апавядальных сказаў, сачыце за правільнасцю інтанацыі. Рабіце невялікія паўзы там, дзе пастаўлены рысачкі. Адзначце выпадкі, калі паўза перадаецца коскай, і дзе на месцы паўзы коскі няма.

ЖАВАРАНАК

1. Снег ляжыць на пляжы, /
Сонца — / рэдкі госць. //
А ў кватэры нашай /
Жаваранак ёсць. //
Позна ён кладзецца, /
Раненька ўстае. //
Цэлы дзень смяецца, /
Цэлы дзень пяе. //

2. За катом /аж скача, /
А папросіш: / «Ляж» — /
Кнігаўкай заплача /
Жаваранак наш. //
...Зноў з катом сваволіць, /
Зноў пяе зімой /
Жаваранак звонкі — /
Брацік меншы мой. // *(М. Маляўка.)*

4. Прачытайце ўголас загадку, запішыце яе. Адзначце рыскамі месцы, дзе трэба зрабіць паўзы.

Жывуць на пяці палічках
Сямёра блізнят-сястрычак,
Як быццам адна сям'я,
У кожнай сваё імя. *(Ноты.)*

(У. Мацвеенка.)

5. Падзяліце тэкст на сказы і выразна ўголас прачытайце.

Раніцай першакласніца Волечка ішла ў школу каля дарогі яна ўбачыла кветку рамонка ой, якая прыго-

жая Волечка працягнула руку, каб сарваць кветку і занесці ў школу але раптам яна ўбачыла на пялёстачку кропельку расы а ў кропельцы — сонца і блакітнае неба, і зялёная ніва, і высокая таполя — усё ў кропельцы заглядзелася Волечка на чароўную расінку і не сарвала кветкі. *(В. Сухамлінскі.)*

6. Прачытайце тэкст. Выдзяляйце большай сілай голасу выдзеленыя словы, рабіце паўзы.

Зялёны **востраў** у няспелым жытнім моры. Бярозы. З дарогі **туды,** у жыце, **дарожка.** Густая, нетаптаная трава. Абапал дэкаратыўныя кусты. То васілёк, то маладзенькі колас у траве.

Пад бярозамі — **помнік.** Тут **пахаваны** адразу дзве вёскі. **Сто сорак** чалавек. У ліпені **сорак другога.** *(Я. Брыль.)*

7. Прачытайце выразна загадкі. Якія словы ў кожным сказе трэба выдзяляць большай сілай голасу?

1. Грыбы збірае, сушыць,
Залезшы на яліну,
І лётае, як птушка,
З галіны на галіну.

2. Хвароба такая
У птаха ляснога:
Калі заспявае,
Не чуе нічога.

3. Ён калючы змалку,
Гэты маладзец,
Шмат іголак мае,
Толькі — не кравец.

4. На цэлы лес адна
Такія мае вочы:
Сляпая ўдзень яна,
Відушчая — уночы.

Адгадкі: 1) вавёрка; 2) глушэц; 3) вожык; 4) сава.

8. Прачытайце сказы. З дапамогай голасу выдзяляйце па чарзе кожнае слова сказа. Як змяняецца сэнс сказа?

Дайце мне вады (калі ласка, дайце). Дайце **мне** вады (мне, а не іншаму). Дайце мне **вады** (а не малака). Мікола прынёс хлеб. Мой бацька быў ляснічы. Малыя не сядзяць дома. Андрэй знарок ішоў павольна. Аднаму старому цяжка жыць. Хлопец пабег за вёску.

9. Адкажыце на пытанні. Якое слова ў адказе трэба выдзеліць з дапамогай голасу?

Калі скончылі працаваць? — Працаваць скончылі вечарам. Ці скончылі працаваць? — Працаваць скон-

чылі вечарам. Хто быў на рынку? — Дзед быў на рынку і купіў сабе яблык. Дзе быў дзед? — Дзед быў на рынку і купіў сабе яблык. Што купіў дзед? — Дзед быў на рынку і купіў сабе яблык. Каму дзед купіў яблык? — Дзед быў на рынку і купіў сабе яблык.

Пытальныя сказы

10. У пытальных сказах выражаюцца пытанні. Самае вялікае павышэнне голасу прыпадае на тое слова, якое перадае сэнс запытання. Напрыклад: ***Андрэй*** *знайшоў сумку? Андрэй* ***знайшоў*** *сумку? Андрэй знайшоў* ***сумку?***

Прачытайце сказы некалькі разоў з павышэннем голасу на выдзеленых словах. Як пры гэтым будзе змяняцца сэнс запытання?

1. **Маленькі** хлопчык заблудзіўся на балоце? Маленькі **хлопчык** заблудзіўся на балоце? Маленькі хлопчык **заблудзіўся** на балоце? Маленькі хлопчык заблудзіўся **на балоце? 2. Кот** выскачыў праз акно ў двор? Кот **выскачыў** праз акно ў двор? Кот выскачыў **праз акно** ў двор? Кот выскачыў праз акно **ў двор?** 3. **Алесь** пераехаў у горад на вучобу? Алесь **пераехаў** у горад на вучобу? Алесь пераехаў **у горад** на вучобу? Алесь пераехаў у горад **на вучобу?**

11. Прачытайце дадзены справа сказ пяць разоў так, каб адказаць на кожнае з пастаўленых у левым слупку пытанняў. Якое слова трэба выдзеліць голасам?

Хто добра прачытаў верш на вечары?	Андрэй добра прачытаў верш на вечары.
Што зрабіў Андрэй на вечары?	
Што прачытаў Андрэй на вечары?	
Як прачытаў Андрэй верш на вечары?	

12. Прачытайце пытальны сказ чатыры разы так, каб на пытанне можна было знайсці адказ у правым слупку.

Скрыпач выконвае беларускую музыку?	Беларускую музыку выконвае скрыпач.
	Выконвае.
	Так, пераважна беларускую.
	Так, музыку, а не песні.

Якое слова выдзяляецца ў пытальных сказах кожны раз?

13. Выразна прачытайце кожную пару сказаў — з пытальнай і апавядальнай інтанацыяй.

Бацькі прывезлі вясковыя ласункі? — Бацькі прывезлі вясковыя ласункі. Добра ўмеў страляць паляўнічы? — Добра ўмеў страляць паляўнічы. Збожжа асыпаецца? — Збожжа асыпаецца. Косцік пабег да бацькі? — Косцік пабег да бацькі. Пчала збірае мёд і з горкіх кветак? — Пчала збірае мёд і з горкіх кветак.

14. Дакончыце сказы, пастаўце патрэбны пунктуацыйны знак.

Калі ты прыйдзеш у ... Што настаўніца казала... Які стол трэба... Колькі гадоў дзядзька не быў... Чаго не хапае для ... Для чаго прынеслі ... Дзе растуць ... Адкуль атрымалі гэтыя ... Які хлопчык прыходзіў да ...

15. Прачытайце сказы. У кожным з іх падкрэсліце словы, якія выдзяляюцца павышэннем або паніжэннем голасу.

Турысты выехалі пад вечар? — Турысты выехалі пад вечар. Вучні прыходзілі са школы? — Вучні прыходзілі са школы. Хлопцы пабеглі на рэчку? — Хлопцы пабеглі на рэчку. Уперадзе таксама ішла машына? — Уперадзе таксама ішла машына. Учора луг дакасілі? — Учора луг дакасілі.

16. Прачытайце верш. Назавіце словы, якія вымаўляюцца з павышэннем і паніжэннем тону.

Хто там грукае ў акно?
Гэта вы, сінічкі?
Я прачнулася даўно,
Запляла касічкі. *(В. Вітка.)*

17. Прачытайце загадку. Назавіце пытальныя і апавядальныя сказы. На якіх словах павышаецца або паніжаецца тон?

Каля ціхае крыніцы
Збудаваны дом з ігліцы.
Можа, вам знаёмы ён?
Жыхароў у ім мільён.
Тут шчыруюць усе чыста —
Вось чаму навокал чыста. *(Мурашнік.)*

(У. Мацвеенка.)

18. Прачытайце народныя жарты. Выразна павышайце голас пры вымаўленні апошніх слоў у пытальных сказах, паніжайце — у апавядальных.

КАБ ЖА ВЕДАЎ

— Ты смелы? — пытаецца Цішка ў Колі.

— Смелы,— адказвае той.

— То чаму ж ты зайца спалохаўся, калі мы ў лес хадзілі?

— Дык я ж не ведаў, што гэта заяц.

ПРАТЭСТ

Маці вываравае бялізну. У хату ўваходзіць шасцігадовы Васёк і пытаецца:

— Што ты, мама, варыш?

— Бялізну.

— І мая кашуля таксама варыцца?

— Так, сынок.

Васёк трошкі падумаў і заяўляе:

— Вары не вары, мама, а сваю кашулю я ўсё роўна не буду есці.

19. Загадайце народныя загадкі. Якое слова трэба выдзеліць голасам у кожным сказе?

1. На чым знаку не паложыш? *(Вада.)* 2. Што бяжыць без повада? *(Вада.)* 3. Хто рук не мае, ног не мае, а дзверы адчыняе? *(Вецер.)* 4. Хто з хаты ў хату водзіць, а сама не заходзіць? *(Дарога.)* 5. Чырвоны колер, вінны смак, сэрца каменнае, што гэта такое? *(Вішня.)* 6. Што гэта за звер: шэсць ног, адзін хвост і дзве галавы? *(Чалавек на кані.)* 7. У каго вусы даўжэй за пана? *(У ячменю.)*

20. Выразна прачытайце жартоўныя дыялогі. Назавіце спачатку пытальныя, а потым апавядальныя сказы.

ЗДАГАДЛІВЫ ХЛОПЧЫК

— Мама, я ведаю, чаму падкоўваюць каня.

— Чаму, сынок?

— Каб ногі ў яго не мерзлі.

ЯШЧЭ НЕ ВЫПІЛІ

М а ц і. Ты змяніла ваду рыбкам у акварыуме?

Д а ч к а. Не, яны яшчэ не выпілі тую, што я ім учора наліла.

Дзед даў маленькай Юлі яблык.

Ю л і н а м а ц і. Дачушка, а што ж трэба сказаць за гэта?

Ю л я. Дзядуля, дай яшчэ і маме.

Пабуджальныя сказы

Пабуджальныя сказы вымаўляюцца з большай сілай голасу, з павышэннем тону на працягу ўсяго сказа або з павышэннем тону ў пачатку і паніжэннем яго ў канцы сказа.

Яскравая прыкмета пабуджальных сказаў — наяўнасць некалькіх моцна выдзеленых голасам слоў.

21. Прачытайце ўголас верш «Я сама». Выдзяляйце голасам, павышэннем тону апошнія словы ў радках.

— Хадзі, будзем апранацца...
— Я сама! Я сама!
— Хадзі, будзем умывацца...
— Я сама! Я сама!
— Дык хадзі хоць прычашу я...
— Я сама! Я сама!
Вось умеліца якая
Наша Танечка малая! *(І. Муравейка.)*

22. Прачытайце выразна вершы з пабуджальнымі сказамі. Назавіце словы, на якіх робіцца павышэнне тону.

1. Добры дзень, суседзі!
Будзем век сябрамі.
Добры дзень, суседкі!
Светлая зіма... *(П. Панчанка.)*

2. Не гасіце агнёў! Хай гараць весялей,
Хай палаюць іскрыста ў цьме ночы.
Не гасіце агнёў! Хай праменні ясней
Асвятляюць праспаныя вочы!.. *(А. Гурло.)*

3. Колькі шуму, колькі смеху,
Дзеда вылепілі з снегу! *(Н. Гілевіч.)*

23. З пабуджальнай інтанацыяй вымаўляйце ветлівыя словы.

Дзякуй! Вялікі дзякуй! Праходзьце, калі ласка! Не турбуйцеся, прашу Вас! Сардэчна запрашаем! Вітаем Вас! Дзень добры! Да пабачэння! Хай вам шчасціць!

Бывай! Да заўтра! Я ўдзячны вам! Прабачце, калі ласка! Даруйце!

24. Прачытайце выразна сказы. Як змяняецца іх сэнс ад змены інтанацыі?

Гэта твой бацька? — Гэта твой бацька!
Хто мяне шукае? — Хто мяне шукае!
Здарылася аварыя? — Здарылася аварыя!
Саша хоча піць? — Саша хоча піць!
Смачна было? — Смачна было!

25. Прыдумайце пабуджальныя сказы, якія б перадавалі з дапамогай інтанацыі: 1) радасць, задавальненне; 2) здзіўленне, абурэнне.

1. Цудоўна! Выдатна! Вось гэта навіна! 2. Не можа быць! Ты толькі падумай! Дзіва! Глядзі ж ты! Неверагодна! Сорам! Ганьба!

26. Прыдумайце пабуджальныя сказы, якія б перадавалі розныя пажаданні і віншаванні.

1. Жадаю вам шчасця! Беражы вас Бог! Добрай дарогі! Вясёлых свят! 2. Са святам! З днём нараджэння! З Новым годам!

Прачытайце тэкст. Растлумачце, у чым Петрусёк памыліўся пры чытанні.

Умець чытаць — вялікая справа. Аднойчы вечарам сабралася ўся сям'я. Петрусёк сеў на канапу да таты і стаў чытаць кніжку. Чытаў ён добра. Прачытаў першы сказ і спыніўся.

— Што ж ты змоўк? — запытаўся тата.

— Тата, тут жа кропка стаіць. Мне трэба спыніцца і памаўчаць.

Не паспелі ўсе зразумець словы Петруська, як ён працягваў чытаць далей. Але на гэты раз не сваім голасам, а закрычаў на ўсю кватэру.

— Чаго ты так крычыш, Петрусёк? — напалохалася мама.

— Нічога вы не разумееце. Тут жа ў канцы клічнік стаіць!

Добра, калі ўмееш чытаць. Але чытаць трэба ўмець. *(Паводле У. Краўчанкі.)*

Аднародныя члены сказа

Для аднародных членаў сказа характэрнай з'яўляецца інтанацыя пералічэння. Таму ўсе аднародныя члены сказа трэба вымаўляць на адным узроўні па інтэнсіўнасці і вышыні тону. Рух тону на аднародных членах сказа можа быць і роўным, і сыходным, і ўзыходным. Гэта залежыць ад тыпу сказаў, у якіх сустракаюцца аднародныя члены, і ад таго месца, якое яны займаюць у сказе. Для захавання адпаведнай інтанацыі трэба пры выразным чытанні рабіць паміж аднароднымі членамі прыкметныя паўзы.

27. Прачытайце выразна сказы. Знайдзіце ў іх аднародныя члены. Запомніце, што аднародныя члены вымаўляюцца з інтанацыяй пералічэння. Якія члены сказа могуць быць аднароднымі?

1. Белыя, блакітныя, чырвоныя кветкі стаялі на вокнах і сталах. 2. Зязюлі, шызаваронкі знішчаюць вусеняў, матылькоў-шаўкапрадаў. Хрушчоў, што лётаюць вечарам, ловяць начныя птушкі, казадоі і совы. Днём жукоў дзяўбуць шпакі, сойкі і іншыя птушкі. 3. У ліпені паспяваюць суніцы, парэчкі, чарніцы, маліна, касцяніцы... Паветра насычана пахамі траў, спелых ягад, смалістай хвоі. 4. У часы старадаўнія воўк, сабака, кошка і мыш жылі між сабою дружна, не былі ворагамі, адзін за аднаго стаялі і ні ў чым патрэбы не мелі. *(З народнага.)*

28. Прачытайце выразна прыказкі і прымаўкі. Запішыце іх, падкрэсліце аднародныя члены сказа. Паніжайце тон на апошнім аднародным члене сказа. Да якіх слоў адносяцца аднародныя члены ў кожным сказе?

Ліпень косіць і жне, доўга спаць не дае. Верасень агнём палае і ў лесе, і ў хаце. Прымаўкі ды прыказкі — мудрай мовы прывязкі.

29. Прачытайце выразна загадкі. Назавіце аднародныя члены сказа. Пасля якіх слоў трэба зрабіць паўзы? Да якіх агульных дзейнікаў адносяцца аднародныя выказнікі?

1. З вады нарадзіўся і ў ваду ператварыўся. *(Снег.)* 2. Са страхі морква вісіць, да зямлі не дастане, паху не мае, зімой вырастае. *(Ледзяшы.)* 3. Па хаце ходзіць, венікам водзіць. *(Кот.)*

4. Пер'я наелася,
у кашулю адзелася,

і спіць у ахвоту
начная істота.
Ляжыць, дзе і ты —
чатыры вухі, два жываты. *(Падушка.)*

А. Клышка.

5. Кожны мае з вас, рабяткі,
верных сябраў па дзесятку,
яны кормяць, апранаюць,
працаваць дапамагаюць. *(Пальцы.)*

Ён нарадзіўся на страсе,
Вялікім вырас пакрысе.
На сонцы грэцца ледзь пачаў,
Заплакаў моўчкі і прапаў. *(Лядзяш.)*

У. Мацвеенка.

30. Прачытайце выразна вершы. Назавіце аднародныя члены сказа. Вымаўляйце іх з інтанацыяй пералічэння, прасачыце за рухам тону.

1. ... У жыце,
У буслянцы,
У кветцы,
У траве —
Жыве Беларусь,
Жыве! *(А. Вольскі.)*

2. Бруіцца празрыстая рэчка,
Хаваецца ў ніцых кустах.
Наўкол зіхаціць пазалота —
На рэчцы, на пожні, у лістах. *(Я. Журба.)*

3. У векавечнай бацькаўшчыне клёны
Нячутна пачынаюць аблятаць
На рыжую траву, на мох зялёны,
На весніцы, на ціхі стаў, на гаць.

(Ул. Караткевіч.)

4. Колькі кветак ля ракі!
Сінія, як вочкі,
Незабудкі і браткі,
Смолкі і званочкі.

І мядунка, і герань,
Слёзкі, мята, кашка!

Сто букетаў назбіраць
Тут за дзень няцяжка. *(Н. Гілевіч.)*

31. Прачытайце выразна вершы. Назавіце аднародныя члены сказа, якія звязваюцца злучальнымі злучнікамі і інтанацыяй пералічэння і якія звязваюцца толькі інтанацыяй пералічэння.

1. У Полацку ў траўні і ў марцы
На цвінтары
І на таргу
Пра беднага Лазара старцы
Цягнулі даўжэзна тугу,
Пра землі,
Якія за морам,
Пра мукі Хрыстовы,
Пра Рым. *(Р. Барадулін.)*

2. Я на цямочку выйду ў поле
пад рогат дзікі, немы соў —
і пакланюся полю ў пояс,
прыцісну серп да каласоў. *(М. Стрыгалёў.)*

32. Прачытайце выразна загадкі. Вызначце аднародныя члены сказа. Якімі сродкамі яны звязваюцца паміж сабой? Назавіце спалучальныя, супраціўныя і размеркавальныя злучнікі. З якой інтанацыяй вымаўляюцца аднародныя члены сказа?

1. Рассцілалі, збіралі, тапталі, круцілі, ткалі і на стол заслалі. *(Абрус.)* 2. Шапкі пазбыўся і на зямлю зваліўся. *(Арэх.)* 3. Аснова саснова, а шкляны ток. *(Акно.)*. 4. Маленькі, але ўдаленькі, скрозь зямлю прайшоў і чырвоную шапачку знайшоў. *(Баравік.)* 5. Усё жыццё ходзіць, а з месца не сыходзіць. *(Гадзіннік.)* 6. На плечы ўскіну ды на сто вёрст адкіну. *(Дарога і воз.)* 7. Ні акон ні дзвярэй, а поўная хата людзей. *(Агурок.)* 8. Пакуль ляжыць, дык маўчыць, а памрэ — зараве. *(Лёд на рацэ.)* 9. То наперад, то назад, зжуе дрэва ў дробны мак. *(Піла.)* 10. Поўная бочачка вінца, ні варонкі, ні дзенца. *(Яйка.)*

33. Прачытайце сказы. Вызначце аднародныя члены сказа і абагульняючыя словы пры іх. Вымаўляйце аднародныя члены сказа з інтанацыяй пералічэння. Звярніце ўвагу на тое, што звычайна абагульняючае слова вымаўляецца з паніжэннем тону; рабіце паўзы паміж аднароднымі членамі сказа.

1. Андатра засяліла ў Брэсцкай вобласці шматлікія вадаёмы: рэкі, азёры і балоты. Звярок корміцца

маладымі сцяблінкамі і парасткамі розных раслін: асакі, чароту, трыснягу і рагозу.

2. Павінны мы сваім нашчадкам
Усё пакінуць, чым жылі:
І белы луг, і рэчку з кладкай,
І лес паўз жытнія палі. *(В. Гардзей.)*

Сказы з дзеепрыметнымі і дзеепрыслоўнымі зваротамі

Складанасць навучання інтанацыі можа тлумачыцца не толькі цяжкасцю авалодання рытміка-меладычнай мадэллю фразы, але і няўменнем звязаць інтанацыю з сінтаксічнай структурай сказаў. Вядома, што форма сказаў у значнай ступені арыентуе вучняў на выбар пэўнага спосабу існавання. Звычайна пэўныя сінтаксічныя канструкцыі інтануюцца аналагічным чынам. Таму трэба, каб тыповыя інтанацыйна-сінтаксічныя структуры былі засвоены, і вучні маглі іх самастойна ўзнаўляць пры чытанні.

Зразумела, што інтанацыя звязана з думкамі і пачуццямі чалавека, што інтанаванне фраз — натуральны працэс, які праходзіць інтуітыўна. Але, як сведчыць навучанне замежным мовам, інтанацыі можна навучыцца. Для гэтага трэба свядома звяртаць увагу на тое вымаўленне, што дэманструе настаўнік, і паўтараць яго.

Асноўнымі момантамі пры інтанаванні сказа з дзеепрыметнымі і дзеепрыслоўнымі зваротамі з'яўляюцца: па-першае, выдзяленне асобных частак сказа, па-другое, злітнае вымаўленне слоў, якія ўваходзяць у адзін зварот; па-трэцяе, захаванне правільных тонавых суадносін зваротаў з тымі словамі, да якіх яны адносяцца. Як правіла, рух тону павышаецца, калі сказ на звароце не завяршаецца, і паніжаецца, калі ён завяршае сказ.

34. Выразна прачытайце верш. Рысачкамі адзначце паўзы, з дапамогай якіх вылучаюцца часткі сказаў. Назавіце дзеепрыметнікі, якія трэба выдзяляць пры чытанні, і словы, да якіх гэтыя дзеепрыметнікі адносяцца.

У прадчуванні навальніцы
І бор, узветраны, аціх,
І чмель з ружовай медуніцы
Да схову, узрушаны, ляціць. *(А. Пісарык.)*

35. Прачытайце сказы, вызначце дзеепрыслоўныя і дзеепрыметныя звароты, іх значэнне і стылявую афарбоўку. Вымаўляйце іх з павышэннем тону, калі яны знаходзяцца ў сярэдзіне сказаў, і з паніжэннем — у канцы.

1. Пеця, шчыра кажучы, не любіў апекі. *(Х. Жычка.)* 2. Праўду кажучы, гэтае пытанне не вельмі турбавала Аліка. *(Т. Хадкевіч.)* 3. А таму, па праўдзе кажучы, і часу няма: вачаняты яго пільна ўтаропіліся ў акно. *(К. Крапіва.)* 4. Дзесяць разоў перадумаў я ўсё сваё жыццё, і магу сказаць, палажыўшы руку на сэрца: ні ў чым не вінаваты. *(К. Крапіва.)* 5. Знадворку замыкала дзверы на замок, каб злы чалавек, не ў благі час кажучы, не залез. *(З. Бядуля.)* 6. Каруокі вашыя ідуць. Адна ў адну, няўрокам кажучы, як лялькі. *(З. Бядуля.)*

Звярніце ўвагу на тое, што ў трох першых сказах звароты выкарыстоўваюцца гаворачым, каб пацвердзіць правільнасць сваіх думак, чыстасардэчнасць і шчырасць прызнання. У чацвёртым — характарызуе выказванне з боку схільнасці і шчырых адносін гаворачай асобы да прадмета паведамлення. У пятым і шостым сказах назіраецца афарбоўка выказванняў у размоўна-жартаўлівы тон з адценнем папярэджання, перасцярогі ад чаго-небудзь непрыемнага.

36. Прачытайце сказы. Вымаўляйце дзеепрыслоўныя звароты з павышэннем тону. Якое яны маюць значэнне? Да якога стылю належаць прыведзеныя сказы?

1. Інакш кажучы, прадалі той лес і зноў напісалі новую заяву: «Дай яшчэ». *(«Вожык».)* 2. Ды і вёсак, дакладна кажучы, няма: гэта адна вёска. *(Я. Брыль.)* 3. А я ж — адзіны ў іх сынок! Уласна кажучы, іх шчасцейка і слава... *(Э. Валасевіч.)* 4. Усе яны былі рухавыя, жывыя..., у дадатак да ўсяго гэтага, выражаючыся груба,— гладкія, падкормленыя і нейк па-свойму адзетыя. *(Я. Колас.)* 5. Гэтыя артыкулы іх здаюцца нашаму чытачу, мякка кажучы, мнагаслоўнымі. *(«Маладосць».)*

Якія са зваротаў азначаюць аўтарскую ацэнку стылю мовы і падкрэсліваюць, што пры выражэнні думкі можна выказаць тое самае, але па-другому, больш дакладна і правільна? Які мае значэнне 'гаворачы дакладней', 'па сутнасці'? Які змяшчае ацэнку выказвання з пункту гледжання не прынятых у грамадстве норм? Пры дапамозе якога гаворачая асоба падкрэслівае, што не дапускае ў сваім выказванні рэзкіх слоў, выразаў, ацэнак, пазбягае рэзкіх характарыстык, суджэнняў?

37. Прачытайце загадкі. Вызначце дзеепрыметнікі. Сачыце за правільнасцю націску і інтанацыі пры іх чытанні.

1. Сядзіць на хаце дзядок, выставіўшы гарбок. *(Крук у сцяне.)* 2. Брат з братам адным поясам спавіты. *(Жэрдкі ў плоце.)* 3. На нязмераным полі жывёлы незлічоныя, а пастух рагаты. *(Неба, зоркі, месяц.)* 4. Стары згорблены дзядок мае доўгі насок, сячэ лясок і складае ў снапок. *(Серп.)*

38. Прачытайце кожны сказ двойчы. Першы раз прачытайце дзеепрыметныя звароты без паўзы перад словамі, з якімі яны звязаны, другі раз — з такой паўзай. Як змяняецца сэнс сказаў пры розным падзеле? Пры якім чытанні інфармацыя, змешчаная ў зваротах, мае больш самастойнае значэнне? Якімі даданымі сказамі можна замяніць звароты пры першым і другім чытанні? У якасці прыкладу прааналізуйце першы сказ.

1. *Усю вайну праваяваўшы ў партызанах настаўнік карыстаецца асаблівай павагай. Настаўнік, усю вайну праваяваўшы ў партызанах, карыстаецца асаблівай павагай.— Настаўнік, які ўсю вайну праваяваў у партызанах, карыстаецца асаблівай павагай. Настаўнік карыстаецца асаблівай павагай, таму што праваяваў усю вайну ў партызанах.* 2. Адрэзаныя ад навакольных вёсак палачане трымаліся мужна. Адрэзаныя ад навакольных вёсак, палачане трымаліся мужна. 3. Сцежка вілася сярод балот па зарослых нізкім сасновым лесам пясчаных пагорачках. Сцежка вілася сярод балот, па пясчаных пагорачках, зарослых нізкім сасновым лесам. 4. Прыехаўшы з Масквы інжынер пайшоў да знаёмых. Інжынер, прыехаўшы з Масквы, пайшоў да знаёмых. 5. Далей на беразе сядзела яшчэ адна чакаўшая пераправы рота (усе роты чакалі пераправы). Далей на беразе сядзела яшчэ адна рота, чакаўшая пераправы (толькі адна рота чакала пераправы). 6. Трэцім, рашаючым і яўным доказам быў дзённік, знойдзены пры вобыску (два доказы не былі рашаючымі). Трэцім рашаючым і яўным доказам быў дзённік, знойдзены пры вобыску (усе тры доказы былі рашаючымі).

Часціцы

Часціцы як службовыя словы, якія перадаюць дадатковыя сэнсавыя адценні слоў, словазлучэнняў і сказаў, часта з'яўляюцца прыналежнасцю эмацыянальна афарбаванага маўлення. Таму трэба звяртаць

асаблівую ўвагу на інтанацыю, з якой вымаўляюцца такія сказы. Напрыклад, з дапамогай узаемадзеяння форм умоўнага ладу і інтанацыі адрозніваюцца пытальныя і апавядальныя сказы: *Міколка мог бы прыехаць.— Міколка мог бы прыехаць?*

Для змякчэння загаду формы ўмоўнага ладу ўжываюцца з апавядальнай інтанацыяй і маюць значэнне загаднага ладу: *Пасядзеў бы ты, Саша, з малымі.* (Параўн.: *Саша, пасядзі з малымі!*)

З дапамогай інтанацыі ў формах з пачатковай пазіцыяй дзеяслова таксама можна перадаць пэўныя адрозненні сэнсу. Напрыклад: *Сустрэў бы дзед нас! Абавязкова бы сустрэў! Трэба было толькі раней паведаміць!* (Першы сказ перадае магчымасць дзеяння і ўмовы, пры якіх яно можа адбыцца.) і *Сустрэў бы дзед нас! Ён унука хацеў пабачыць!* (Першы сказ перадае пажаданасць дзеяння і яго абгрунтаванне.)

Формы ўмоўнага ладу з часціцамі *бы (б)* ужываюцца пераважна з інтанацыяй незавершанасці (з узыходным рухам тону): *Давялося бы самому зварыць вячэру, Міхась бы зварыў.*

У сказах з часціцай *ні* з дапамогай інтанацыі адрозніваюцца непытальныя і пытальныя сказы: *Ні хмурынкі на небе! — Ні хмурынкі на небе? Ні разу не прыходзіў! — Ні разу не прыходзіў?*

Назіранні за тым, з якой інтанацыяй чытаюцца сказы з часціцамі, узбагачаюць лінгвістычныя веды вучняў.

39. Прачытайце сказы. Знайдзіце часціцы, вызначце іх разрад і групу. Прачытайце кожны сказ двойчы: з апавядальнай і пытальнай інтанацыяй.

1. Так, я ганаруся сваім калгасам. *(І. Шамякін.)* — Так, я ганаруся сваім калгасам? 2. Юзік ані не хоча есці. *(К. Чорны.)* — Юзік ані не хоча есці? 3. Ці мы сябры? Ці з сяла аднаго? *(А. Куляшоў.)* — Ці мы сябры, ці з сяла аднаго — гэта не мае значэння. 4. Бадай, лепш было бы ехаць.— Бадай, лепш было бы ехаць? 5. Ты схадзіў бы, Максімка, да іх, праведаў бы. *(І. Шамякін.)* — Ты схадзіў бы, Максімка, да іх, праведаў бы? 5. А птушачкі пяюць, аж заліваюцца. *(Я. Купала.)* — А птушачкі пяюць, аж заліваюцца?

6. Амаль пуста ў зале.— Амаль пуста ў зале? 7. Якраз столькі і было. Акурат у дзве гадзіны.— Якраз столькі і было? Акурат у дзве гадзіны? 8. Смех гэткі маюць толькі дзеці ды людзі з яснаю душой. *(М. Багдановіч.)* — Смех гэткі маюць толькі дзеці ды людзі з яснаю душой? 9. Унь там хата за карчамі... Унь кудзеліцца дымок. *(Я. Колас.)* — Унь там хата за карчамі? Унь кудзеліцца дымок?

40. Прачытайце сказы. Знайдзіце часціцы. Вызначце, якую функцыю выконваюць эмацыянальныя часціцы, з якой інтанацыяй вымаўляюцца сказы з такімі часціцамі. Якія адценні значэнняў перадаюць клічныя і ўзмацняльныя часціцы?

1. Бач, куды занесла нас! *(Я. Маўр.)*. 2. Ну ж і мароз — аж нос зрывае! *(Я. Колас.)* 3. Вось дык дапамог! Лепш бы мы самі зрабілі! 4. У мяне нават і ноты ёсць. *(К. Чорны.)* 5. Абяцаць дык абяцалі, а не прыйшлі. *(Ц. Гартны.)* 6. Э, дзе-небудзь ды знойдзеш і баравік. *(Я. Колас.)* 7. «Не так ужо дрэнна тут»,— падумаў Пракоп. *(Я. Колас.)*

41. Прачытайце дыялог. Знайдзіце часціцы. Скажыце, з якой інтанацыяй вымаўляецца кожны асобны сказ.

І ў гэты самы момант бразнулі клямкай дзверы. Зайшла мама. Убачыла маю галаву за комінам.

— Ты ўжо дома? — здзівілася.— А ці даўно?

— Толькі што... Хвілін пяць, як раздзеўся.

— Моцна змерз?

— Не надта. Так, трохі...

— А гэта што? — убачыўшы на грудзях у мяне акардэон, кіўнула галавою. *(Н. Гілевіч. Перажыўшы вайну.)*

Зваротак

Зваротак — слова або спалучэнне слоў, што абазначаюць асобу або прадмет, да якіх звяртаюцца з мовай. Асноўная функцыя зваротка — называнне таго, да каго накіравана маўленне — вельмі часта спалучаецца з перадачай пачуццяў гаворачага, якія выражаюцца з дапамогай інтанацыі.

Зваротак або ўключаецца ўнутр сказа, або непасрэдна адкрывае ці закрывае яго,— гэта абазначае, што ён не мае сталага месца ў сказе.

Ізаляваны зваротак — адзін або ў спалучэнні з

часціцамі, вымаўлены з адпаведнай інтанацыяй, можа выражаць заклік, пагрозу, здзіўленне.

Інтанацыйна зваротак выдзяляецца па-рознаму — перш за ўсё ў залежнасці ад яго месца ў сказе, а таксама ў залежнасці ад свайго склада. У пачатку сказа зваротак выдзяляецца ў асобную сінтагму і вымаўляецца з узмацненнем націску і з сыходным рухам тону. *А чаму табе, браце, не напісаць было? Дарагі госцейка, бярыце, ешце! Костусь, хіба я сам раскажу?*

Пры пералічэнні кожны са звароткаў выдзяляецца паўзамі і мае самастойную інтанацыю. *Алеся, Міхась, Генадзь, ідзіце бліжэй!*

42. Прачытайце жартоўны дыялог. Назавіце звароткі. Вызначце, чым яны выражаюцца.

— Марынка, ты вельмі непаслухмяная дзяўчынка, адны непрыемнасці праз цябе. Я ўся пасівела.

— Мамачка, калісьці ты, маленькая, таксама не слухалася. Паглядзі, колькі сівых валасоў у бабулі.

43. Прачытайце казку. Вызначце звароткі. Сачыце за інтанацыяй, рабіце паўзы, узмацняйце націск і паніжайце тон на зваротках.

Бацька і дарослы сын былі вялікімі гультаямі. Неяк ляжаць яны і назіраюць, як маці носіць мяшкі з бульбаю.

Бацька і кажа:

— Не бяры, Алеся, многа, на плечы не закінеш.

А сын падбадзёрвае:

— Нічога, мама, бяры, я паддам.

44. Прачытайце выразна сказы, назавіце звароткі. Пры чытанні звароткаў выдзяляйце іх паўзай і вымаўляйце з клічнай інтанацыяй.

1. Ну, то пагуляй яшчэ, Максімка, крыху. 2. Але, сынку, але, ты праўду кажаш! *(Я. Колас.)* 3. Мой родны кут, як ты мне мілы. *(Я. Колас.)* 4. Лес мой цёмны! Чым адплаціць я змагу табе, дружа? *(М. Танк.)* 5. Мы, мужыкі, браты вашыя, мы вам будзем гаварыць цэлую праўду, толькі слухайце нас! *(К. Каліноўскі.)* 6. Апсік, апсік, каточак, не хадзі ты ў садо-

чак... *(З народнага.)* 7. Лавіся, рыбка, вялікая і малая! *(З казкі.)*

45. Чытайце, сачыце за вымаўленнем сказаў. Растлумачце, чаму яны вымаўляюцца па-рознаму.

1. Дзеці, зразумелі ўмову задачы? Дзеці зразумелі ўмову задачы. Дзеці зразумелі ўмову задачы? Дзеці зразумелі ўмову задачы!

2. Дзяўчынкі, атрымалі падарунак ад дзеда? Дзяўчынкі атрымалі падарунак ад дзеда. Дзяўчынкі атрымалі падарунак ад дзеда? Дзяўчынкі атрымалі падарунак ад дзеда!

3. Хлопцы, пабачылі, як з буракоў вырабляюць цукар? Хлопцы пабачылі, як з буракоў вырабляюць цукар? Хлопцы, пабачылі, як з буракоў вырабляюць цукар. Хлопцы пабачылі, як з буракоў вырабляюць цукар!

Простая мова

У вымаўленні простая мова і словы аўтара адрозніваюцца інтанацыяй. Простую мову трэба вымаўляць так, як гэтыя словы вымаўляў бы той, каму яны належаць. Словы аўтара перад простаю мовай вымаўляюцца з інтанацыяй папярэджвання з выразнай паўзай у канцы. Пры гэтым вельмі часта яны вымаўляюцца трошкі хутчэй, з паніжэннем голасу, каб асноўная ўвага слухача прыцягвалася да простай мовы, а не да іх.

46. Прачытайце сказы з простаю мовай. Сачыце за тым, каб словы аўтара і простая мова інтанаваліся па-рознаму.

1. Фядоркаў загаварыў пра другое: «Хаця б ён там майго каня не падарваў з дрывамі гэтымі». *(П. Місько.)* 2. Але Хілюта толькі зморшчыўся і праз сцятыя зубы працадзіў: «Нікуды я з табою не пайду». *(Я. Сіпакоў.)* 3. Бабуля спачатку задумалася, а пасля махнула рукою: «Касі, сынок, як сабе хочаш». *(Я. Сіпакоў.)* 4. І Скарына ўспамінае Гіпакрата: «Мець шчасце — гэта значыць рабіць добрае, а так робяць людзі, што валодаюць ведамі». *(А. Лойка.)* 5.— Ды як ты? — Ігар і хацеў і не ведаў, як падступіцца да дзеда.— Нічога, бачыш, вярнуўся... Чаго ты стаіш? Прысядзь.— Можна і прысесці.— Сеў на стул, не спускаючы вачэй з дзеда. *(А. Кудравец.)*

47. Прачытайце верш. Сачыце за інтанацыяй пры вымаўленні простай мовы. Словы аўтара чытайце больш хутка і з менш выдзеленымі націскамі.

МАЦІ-ЗЯМЛЯ

Пытае вецер у раслінак:
— Чаму зіма вас не ўзяла?
І кажуць тысячы былінак:
— Мы ад зямельнага цяпла!
Пытае холад у крыніцы:
— Чаму цябе я не спыніў?
Яму адказвае вадзіца:
— З зямлі струменіць мой разліў.
Пытае бура старца-дуба:
— Чаму цябе я не зламлю?
І кажа дуб: — Я ўрос ў зямлю,
З зямлёю жыць у дружбе люба. *(Я. Колас.)*

Пабочныя і ўстаўныя словы, спалучэнні слоў і сказы

Сказ з'яўляецца асноўнай адзінкай мовы, з дапамогай якой выражаюцца паведамленні аб рэчаіснасці і адносіны да яе гаворачай асобы. Але для афармлення і выражэння гэтага служаць не толькі галоўныя і даданыя члены сказа або часткі яго, але і пабочныя элементы розных відаў. Яны перадаюць эмацыянальныя адносіны таго, хто гаворыць, да выказанай думкі, указваюць на ступень верагоднасці выказвання, крыніцу паведамлення, выяўляюць паслядоўнасць выкладу, сувязь з іншымі выказваннямі ў кантэксце.

Пабочныя элементы звязаны з асноўным сказам сэнсава-інтанацыйным спосабам. Такая сувязь робіць немагчымай вольную замену адных пабочных элементаў другімі, далёкімі па сэнсе. Пры такой замене можа парушыцца агульная сэнсавая накіраванасць сказа. Параўнаем:

Ну, вядома, седзячы тут многа чаго ведаць не будзеш. (Я. Колас.)

Ну, мабыць, седзячы тут многа чаго ведаць не будзеш.

У першым сказе выражаецца ўпэўненасць гаворачай асобы ў рэальнасці таго, аб чым паведамляецца. У другім пасля замены пабочнага слова *вядома* словам *мабыць* змест яго атрымаў значэнне няўпэўненасці, сумнення гаворачай асобы.

Значныя сэнсавыя змяненні ў сказе адбываюцца і тады, калі пабочныя элементы зусім апускаюцца. Больш таго, можа нават парушыцца логіка-граматычная сувязь паміж асобнымі выказваннямі цэлага кантэксту:

Сёлета, пэўна, на лядах... ставіць пачнеце прасторны калгасны пасёлак.

Сёлета на лядах ставіць пачнеце прасторны калгасны пасёлак.

(М. Танк.)

Без пабочнага слова сказ носіць характар катэгарычнага сцвярджэння факта.

У залежнасці ад суб'ектыўных адносін гаворачага тэкст інтанацыйна можа дзяліцца на розныя часткі. Пры гэтым паўзы рэгулярна выкарыстоўваюцца як сродак выдзялення пэўных частак сказа.

У сказах з пабочнымі словамі ў залежнасці ад інтанацыі змяняецца ступень сэнсавай нагрузкі гэтых слоў. Асноўным інтанацыйным сродкам для такіх змен служыць падзел сказа. Рознабаковымі бываюць змены ў сярэдзіне сказа. *Саша хворы, / і што яшчэ горш, / зусім адзін. Саша хворы і, / што яшчэ горш, / зусім адзін.*

Пры ўзмацненні эмацыянальнай нагрузкі пабочныя словы набываюць сваю асобную інтанацыйную афарбоўку. Параўн.: *Заўтра / — няўжо заўтра? / — мы паедзем у Крым. Заўтра / — няўжо заўтра! / — мы паедзем у Крым.*

Калі пабочныя словы толькі ўдакладняюць сэнс асноўнага сказа, то іх трэба вымаўляць з нейтральнай інтанацыяй, у больш хуткім тэмпе, без значных націскаў, тон на іх часам зніжаецца.

Сэнсава-інтанацыйная сувязь пабочных элементаў са сказам выступае найбольш выразна і ў большай ступені тады, калі яны адносяцца да асобных членаў сказа, якія маюць лагічны націск. Напрыклад, калі далучаюцца да дзейніка, выказніка, дапаўнення, азначэння або акалічнасці: *«Ды ты, аказваецца, добра ведаеш сельскую раніцу!» — усклікнуў Дзямід Сыч* (М. Паслядовіч); *Дубок, добра выканаўшы сваё заданне, вярнуўся, аднак, сумны, незадаволены* (М. Лынькоў); *Старшыня нахіляецца да Мірона Брыля, штось гаворыць, відаць, аб адчыненні сходу* (Я. Колас); *Малады, відаць, дужы, ён аб чымсьці ўвесь час думаў* (М. Лынькоў); *Вясной, як думалася Бадзей-*

ку, самы раз вярнуцца ў родную вёску (Я. Колас).

Пабочныя элементы могуць знаходзіцца і ў сэнсава-інтанацыйнай сувязі і з адасобленымі зваротамі, якія не стаяць пад націскам: *Выпрабоўваючы, мабыць, свае сілы, захапляючыся шырынёю прасторай, ён хутка збег з узгорку* (Э. Самуйлёнак).

Такім чынам, пабочныя элементы не з'яўляюцца ў сказе ізаляванымі. Іх сувязь са сказам сэнсава-інтанацыйная, і перадаць яе можна інтанацыйна. Пабочныя элементы амаль заўсёды вымаўляюцца ў адзінстве з усім сказам, яны не павінны рэзка выдзяляцца, на іх нельга рабіць рэзкае змяненне тону або тэмпу вымаўлення, але яны гучаць адасоблена за кошт паўз і пэўнага паскарэння вымаўлення.

48. Прачытайце сказы. Вызначце пабочныя словы, удакладніце, якія сэнсавыя адценні яны надаюць сказам. Выдзяляйце пабочныя словы з дапамогай паўз.

1. У санях сядзяць незнаёмыя людзі, відаць, здалёк. *(Я. Колас.)* 2. Пачатак быў зроблены і, трэба сказаць, пачатак нядрэнны... *(Я. Брыль.)* 3. Самыя небяспечныя мясціны, як здавалася дзеду, засталіся ззаду... *(Я. Колас.)* 4. Ну, каб не схлусіць, гэта было на самым уваходзе ў лес, дзе нашы сушні ў хмызняку стаяць. *(К. Чорны.)* 5. Праўда, Сцёпка стараўся ўпэўніць сябе, што нічога благога ў яго ўчынку не было. *(Я. Колас.)* 6. Гэта радавала Максіма, а галоўнае — зрабіла яго больш разважлівым і самакрытычным. *(І. Шамякін.)* 7. А дождж, і праўда, так і паўзе за каўнер. *(Я. Брыль.)*

49. Прачытайце сказы, вызначце пабочныя словы. Прыгадайце, якія яшчэ словы ўжываюцца пры далікатным, ветлівым звароце да субяседніка з просьбай зрабіць паслугу, выканаць прапанову, ажыццявіць тое, аб чым просяць.

1. Выбачайце, заўсёды забываюся, як завуць людзей па бацьку. *(З. Бядуля).* 2. На перапынку настаўніца адной матулі гаварыла так: «Ваш сын, прабачце, абібок, лайдак»... *(Э. Валасевіч.)* 3. Ну, а скажыце, будзьце ласкавы, каму свеціць ваш агонь? *(Я. Колас.)* 4. Адкажыце, зрабіце ласку, на тое, аб чым вас пытаюць. *(З. Бядуля.)* 5. Тыдні праз два, калі ласка, забірай сваю машыну. *(М. Паслядовіч.)*

50. Прачытайце сказы. Знайдзіце пабочныя словы: 1) якія паказваюць на ацэнку ступені дакладнасці думкі; 2) якія паказваюць на ацэнку ступені звычайнасці фактаў, што паведамляюцца; 3) якія выражаюць эмацыянальную ацэнку таго, аб чым гаворыцца ў сказе.

Правільна інтануйце пабочныя словы.

1. Відавочна, у гэтым запытанні яму пачулася штось падазронае... *(Я. Колас.)* 2. Не было, разумеецца, ні слупоў, ні канцоў на гэтай мяжы... *(З. Бядуля.)* 3. Гісторыя архітэктуры, па сутнасці, з'яўляецца гісторыяй яе набліжэння да чалавека. *(Ул. Карпаў.)* 4. Нехта, не сакрэт, як і ён, ляціць з гары, аж дух зацінае. *(І. Мележ.)* 5. У нас, бывала, у палку капэльмайстар дык навічкоў па два месяцы на гамах трымаў. *(К. Чорны.)* 6. Вось што, родныя,— сягоння, па заведзенаму звычаю, праводзім мы свята песні. *(П. Броўка.)* 7. На радасць Данілу, усе ўбачылі, што Віктар выглядаў лепш і страйней за Паўла. *(А. Кулакоўскі.)* 8. Але, на тое ліха, увайшоў нейкі чужы чалавек. *(З. Бядуля.)* 9. Ляшыў Мікіта жыта і, як на злосць, яму адну валы скрывілі баразну.

(Я. Купала.)

51. Прыдумайце сказы з пабочнымі словамі *безумоўна, бясспрэчна, сапраўды, разумеецца* і з антанімічнымі ім *напэўна, магчыма, здаецца, думаецца.* Якое значэнне надаюць гэтыя словы сказам?

Правільна інтануйце сказы з пабочнымі словамі.

52. Прачытайце сказы з пабочнымі словамі, якія паказваюць на адносіны да прыёму і спосабу выражэння думкі.

Якое значэнне яны надаюць сказам?

Дзе варта паставіць паўзы, каб правільна праінтанаваць пабочныя словы?

1. Ніхто вас не ведаў, і вы, сказаць, тымчасове, нікога не ведалі. *(К. Чорны.)* 2. І пакаціўся смех, і песня залунала ў хаце! Ну, карацей, адзначылі падзею як і трэба... *(Э. Валасевіч.)* 3. Ды і вёсак, дакладна кажучы, няма: гэта адна вёска. *(Я. Брыль.)* 4. Яны пайшлі, або, лепш сказаць, палезлі тою самаю дарогаю, што і раней, калі ішлі па паліва. *(Я. Маўр.)* 5. Карацей сказаць, Чыкілевічаў двор і дом сталі... штабам затонскага калгаснага руху. *(Я. Колас.)* 6. А я ж — адзіны ў іх сынок! Уласна кажучы, іх шчасцейка і слава... *(Э. Валасевіч.)*

53. Прачытайце сказы з пабочнымі словамі. Што яны паказваюць у сказах? Якія з іх перадаюць адмоўны пункт гледжання гаворачай асобы?

1. А гэты, з дазволу сказаць, начальнік раскіс. *(М. Лынькоў.)* 2. Тады мы пачулі, што называецца, сапраўдны смак барацьбы, калі разграмілі Мірскую паліцыю. *(Я. Брыль).* 3. Насця, што называецца, паднядзелілася, узлажыла капялюшык, разоў сорак крутнуўшыся перад люстэркам. *(Я. Колас.)* 4. Калгасны кладаўшчык Нупрэй жыў, як гаворыцца, у дастатку... *(Э. Валасевіч.)* 5. Лёгка сказаць, у якія два гады пабудаваць цэлы камбінат! 6. Турсевіч гэта — мой настаўнік і мой зямляк, прынамсі, аднае воласці. *(Я. Колас.)* 7. Праўда, гадоў Ігнату было не дужа багата, яму ішоў, усяго-на-ўсяго, васемнаццаты год. *(М. Лынькоў.)*

54. Прачытайце. Выдзяляйце інтанацыйна пабочныя сказы. Вызначце той дадатковы сэнс, які яны надаюць сказам (упэўненасць, няўпэўненасць, прадбачанне і г. д.).

1. Паладзя мая, вы самі ведаеце, добра ўмее сустракаць гасцей. *(М. Паслядовіч.)* 2. Яе трохі палохалі экзамены — ці мала што можа там здарыцца. *(Я. Колас.)* 3. Як тыя людзі кажуць, ты бярэш зямлі жменю, а яна цябе абдымае ўсяго... *(П. Броўка.)* 4. Між іншым, як дазнаўся дзед Талаш, і тая рота, дзе быў узводным Букрэй, паехала на Врангеля. *(Я. Колас.)* 5. А калісьці тут, як расказваюць старыя людзі, праўда, самі яны не помняць, быў мост. *(Я. Колас.)* 6. Але ты скажы — мне ты можаш сказаць праўду,— куды мне падацца, каб пабачыць твайго бацьку? *(Я. Колас.)* 7. Танкі вунь, людзі казалі, акапаліся пад Навагрудкам. *(Я. Брыль.)*

Літаратура для настаўніка

1. Варановіч З. Б. Фанетычны разбор // Методыка беларускай мовы. Мн., 1985.
2. Выгонная Л. Ц. Ад гука да літары. Мн., 1991.
3. Выгонная Л. Ц. Інтанацыя. Націск. Арфаэпія. Мн., 1991.
4. Дворак В. Абагульняльны ўрок па раздзеле «Фанетыка. Арфаэпія. Графіка» // Беларуская мова і літаратура ў школе, 1989. № 10. С. 20.
5. Каляда А. Выразнае чытанне. IV — VII класы. Мн., 1982.
6. Каляда А. Жывое слова настаўніка — сродак выхавання, адукацыі, навучання // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1989. № 6.
7. Кривицкий А. А., Михневич А. Е., Подлужный А. И. Белорусский язык для говорящих по-русски. Мн., 1990.
8. Лаўрэль Я. М., Прыймак Ж. Н., Раманцэвіч В. К. Алімпіяды па беларускай мове. Мн., 1987.
9. Ляшчынская В. Яшчэ раз пра фанетычны разбор слова // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1989. № 8.
10. Ляшчынская В. Мова вучыць і выхоўвае // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1990. № 4.
11. Новікава Т. Фарміраванне арфаэпічных навыкаў на ўроках фанетыкі ў V класе // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1989. № 8. С. 19—23.
12. Падлужны А. І., Чэкман В. М. Гукі беларускай мовы. Мн., 1973.
13. Паўлоўская В. І. Займальная граматыка. Мн., 1965.
14. Паўлоўская В. І. Займальны матэрыял па беларускай мове. Мн., 1970.
15. Піскун У. Ц. Фанетычны разбор на ўроках беларускай мовы // Выкладанне беларускай мовы і літаратуры: Зб. / Пад. рэд. М. А. Лазарука. Мн., 1983.
16. Садоўскі П. В. Фанетычны разбор слова // Народная асвета. 1984. № 9.
17. Тоцька Н. І. Фонетика української мови та її вивчення в початкових класах. К., 1976.
18. Фанетыка беларускай літаратурнай мовы / Пад рэд. А. І. Падлужнага. Мн., 1989.
19. Яленскі М. Г. Фарміраванне вымаўленчых навыкаў на ўроках беларускай мовы і літаратуры. Метадычныя рэкамендацыі. Мн., 1982.
20. Яленскі М. Г. Метады і прыёмы фарміравання маўленчых навыкаў // Выкладанне беларускай мовы і літаратуры. Мн., 1983.

ЗМЕСТ

Задачы вывучэння фанетыкі ў школе 3
Вывучэнне фанетыкі беларускай мовы ў малодшых класах 26
Артыкуляцыйныя характарыстыкі гукаў беларускай мовы . . 31
Галосныя гукі 36
Зычныя гукі 39
Практыкаванні 53
Гукапіс 100
Практыкаванні 103
Арфаэпія і графіка на ўроках мовы 105
Практыкаванні 121
Склад і складападзел 145
Практыкаванні 158
Гульні 160
Лічылкі 164
Песні 165
Загадкі 167
Займальныя матэрыялы па тэме «Склад і складападзел» 168
Націск 170
Практыкаванні 186
Гульні 192
Вывучэнне беларускай інтанацыі ў школе 194
Дыдактычны матэрыял 215
Літаратура для настаўніка 238

Выгонная Л. Ц.

В 92 Фанетыка беларускай мовы ў школе.— Мн.: Нар. асвета, 1995.— 240 с. (Б-ка настаўніка бел. мовы і літ.).

ISBN 985-03-0243-7.

Кніга змяшчае апісанне гукавога ладу беларускай мовы і яго інтанацыі ў тым аб'ёме, у якім яны вывучаюцца ў школе. Змешчаны заданні да асноўных раздзелаў фанетыкі.

Адрасуецца настаўнікам сярэдніх школ, ліцэяў, гімназій.

3720880826—023

В_____ 22—95 **ББК 74.268. 1 Беи**

М 303(03) — 95

Вучэбнае выданне

Выгонная Лілія Ціханаўна

ФАНЕТЫКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ШКОЛЕ

Загадчык рэдакцыі *А. А. Дзераш.* Рэдактар *А. І. Чыгрынава.* Вокладка мастака *М. Ф. Барэдыкі.* Мастацкі рэдактар *Л. У. Паўленка.* Тэхнічны рэдактар *М. І. Чаплавоцкая.* Карэктары *С. А. Яновіч, Т. М. Вядзернікава.*

Здадзена ў набор 25.10.94. Падпісана ў друк 22.03.95. Фармат $84\times108^{1}/_{32}$. Папера друк № 1. Гарнітура літаратурная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 12,6. Умоўн. фарба-адбіт. 12,81. Ул.-выд. арк. 12,7. Тыраж 8000 экз. Заказ 1434.

Выдавецтва «Народная асвета» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 4. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

Бібліятэка
настаўніка
беларускай мовы
і літаратуры